Саламея Пільштынова

АВАНТУРЫ МАЙГО ЖЫЦЦЯ














Станіслаў
Лопат









Саламея Пільштынова

АВАНТУРЫ МАЙГО ЖЫЦЦЯ



Саламея Пільштынова

АВАНТУРЫ МАЙГО ЖЫЦЦЯ

РАМАН



МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1993

ББК 84(2)1+84Бел1
П 32

Пераклад з польскай мовы *Міколы Хаустовіча*

Прадмова *Адама Мальдзіса*

Каментарыі *Мар'яна Пялчынскага*

Рэцэнзент *Валянцін Грыцкевіч*

Воспоминания новогрудской лекарки Соломеи Пильштыновой (Русецкой) содержанием напоминают приключенческий роман. За свою жизнь, полную неожиданностей и приключений, она побывала в различных странах и городах, ее принимали при дворах турецкого султана, российской императрицы Анны Иоановны, австрийского императора, князей Радзивиллов, Потоцких, Сангушек. Природный разум, смелость и находчивость позволяли ей с честью выходить из самых невероятных и опасных ситуаций.

П $\frac{4702510100-044}{М\ 302(03)-93}$ 124–91

ISBN 5-340-00762-6

© Пераклад. Хаустовіч М. В., 1993
© Прадмова. Мальдзіс А. І., 1993

НЕЗВЫЧАЙНЫЯ АВАНТУРЫ НАВАГРАДСКАЙ ЛЕКАРКІ

Гісторыя ведае нямала мастацкіх твораў, якія адначасова належаць двум суседнім літаратурам. Да іх ліку адносяцца і ўспаміны Саламеі Пільштыновай з Русецкіх, якія маюць па-барочнаму доўгую і квяцістую назву: «Пададзенае свету рэха заняткаў, падарожжа і жыцця майго авантураў на чэсць і хвалу П/ану/ Богу, у Святой Тройцы Адзінаму, і самой святой Маці Хрыста, пана майго, і ўсім святым». Гэтыя ўспаміны, датаваныя 1760 годам, доўгі час ляжалі ў рукапісе ў Кракаўскай Бібліятэцы імя Чартарыскіх, дзе многа «беларусікаў», і толькі ў 1957 г. былі выдадзены Р. Полякам[1]. Па сваёй мове «Рэха» найперш, безумоўна, належыць да польскай літаратуры. Аднак нам трэба тут улічыць таксама тое, што аўтарка гэтых успамінаў нарадзілася і жыла на Беларусі, у ваколіцах Наваградка, што ў яе польскай мове вельмі шмат беларусізмаў. Да таго ж гістарычныя абставіны склаліся так, што беларускія землі тады ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай, і таму польская мова была ў XVIII стагоддзі адной з літаратурных моваў Беларусі. Такім чынам, у мяне ёсць усе падставы сцвярджаць, што «Рэха» адначасова належыць як палякам, так і беларусам.

---

[1] Pilsztynowa Pegina Salomea z Rusieckich. Proceder podróży, życia mego awantur. Kraków, 1957.

Пасля выхаду з друку ўспаміны Саламеі Пільштыновай атрымалі высокую ацэнку польскіх і савецкіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў. Вядомы маскоўскі даследчык А. Ліпатаў лічыць, што гэты твор «вылучаецца на фоне багатай мемуарна-эпісталярнай спадчыны свайго часу жывасцю і непасрэднасцю размоўнага стылю апавядання, як правіла, свабоднага ад рытарычных нагрувашчанняў і ўтрыраванага выкарыстання паэтычных сродкаў і прыёмаў, што было так характэрна для эпохі сарматскага барока. Непадробная шчырасць спалучаецца з драматызмам асобных сцэн, яркасцю жанравых замалёвак, гумарам і лірычнасцю. Апісанні падзей, фактаў, рознага роду з'яў не засланяюць тут — у адрозненне ад большасці іншых вядомых мемуараў — вобраз і асобу самога аўтара — яго перажыванні, думкі і намеры, урэшце, асабістую драму»[1]. Каштоўнасць і непаўторнасць успамінам надае тое, што ў іх сціраецца грань «паміж рэгістрацыяй фактаў, падзей, выпадкаў і выпадковасцей з жыцця і ўзнаўленнем чалавечага лёсу, дзе гэтыя факты, падзеі, выпадкі і выпадковасці — фон, кантэкст, прычына жыццёвых перыпетый і духоўнай драмы асобы. У гэтым манера апавядання Русецкай-Пільштыновай збліжаецца з мастацкім тыпам узнаўлення, уласцівым раману»[2].

Кім жа напісана гэтае раманнае «Рэха»? Падрабязна характарызаваць яе аўтарку няма

---

[1] Липатов А. В. Формирование польского романа и европейская литература // Средневековье, Возрождение, Барокко. М., 1977. С. 228.

[2] Тамсама.

тут асаблівай патрэбы, бо толькі што выйшла першая навукова-папулярная біяграфія С. Пільштыновай, напісаная знаўцам лекарскай і мемуарнай літаратуры В. Грыцкевічам[1]. Таму абмяжуемся тут асноўнымі жыццёвымі момантамі.

Саламея Рэгіна Пільштынова з Русецкіх /1718 — пасля 1760/ пра месца свайго нараджэння піша так: «У маладым маім веку выдалі мяне бацькі /Яхім Русецкі/ замуж з Літвы /Літвой тады называлі і заходнюю частку Беларусі.— *А. М.*/, з Наваградскага ваяводства, за доктара Якуба Гальпіра... з якім у той жа год я паехала ў Стамбул». /Тут і далей: пераклад мой.— *А. М.*/ Мы не ведаем, ці была наша аўтарка шляхцянкай, ці, як дапускае З. Куховіч, мела «плябейскае паходжанне»[2]. Невядома таксама, ці атрымала яна хаця б пачатковую адукацыю /мы ведаем толькі з яе ж слоў, што ў маладосці яна «любіла страляць і заўсёды ў дарозе ў калясцы мела пісталеты і стрэльбы»/. Аднак была яна жанчына назіральная, кемлівая, разумная. Сама імкнулася да ведаў і хацела даць адукацыю /у гімназіі пры Пецярбургскай Акадэміі навук/ свайму сыну. Лёгка вывучыла турэцкую, рускую, нямецкую мовы. Аказаўшыся дзесьці каля 1731 года, у чатырнаццаць гадоў, у Стамбуле, яна прыглядалася да акулісцкай практыкі свайго мужа. Потым яе вучыў нейкі турак з Вавілона. Палонны італьянец паказаў ёй,

---

[1] Грыцкевіч В. П. Адысея наваградскай лекаркі: Саламея Русецкая. Мн., 1989.

[2] Kuchowicz Z. Wizerunki niepospolitych niewiast staropolskich XVI—XVIII wieku. Łódź, 1972. S. 299.

як пішуцца на лацінскай мове рэцэпты, падарыў колькі медыцынскіх даведнікаў. І тады Саламея сама ўзялася лячыць. Спярша баялася пацыентаў, ішла да іх пад прымусам. Потым стала давяраць інтуіцыі, вопыту народнай медыцыны /у цяжкія хвіліны ёй згадваліся адмысловыя прыёмы павітухі з Наваградчыны/. Рэкамендавала хворым захоўваць чысціню, больш рухацца. Паступова прыходзіла практыка. Саламея запісвала вынікі курацыі сваіх пацыентаў у спецыяльнай кнізе, якую збіралася выдаць. Сябе называла «доктарам медыцыны і акулісткай».

Ішлі гады. Імкненне да прыгод і неабходнасць зарабляць на хлеб гналі Саламею з горада ў горад, з краіны ў краіну. Гальпір неўзабаве памёр, пакінуўшы яе з маленькай дачкой. За маладой жанчынай стаў цікаваць князь Ракачы, але яна не без прыгод уцякла ад яго. Сустрэўшы пецярых аўстрыйскіх палонных, выкупіла іх з турэцкай няволі. І сярод іх — за трыста чырвонцаў — свайго будучага другога мужа афіцэра Юзафа Фартуната дэ Пільштына / Піхельштэйна/. Разам з ім у 1739 годзе вярнулася на радзіму, паступіла на службу да князя Міхала Радзівіла па мянушцы Рыбанька. У Нясвіжы паспяхова працягвала медыцынскую практыку. Адным словам, стала ці не першай на беларускіх землях жанчынай, якая «афіцыйна», не хаваючыся, жыла з лекарства.

Аднак аселае, спакойнае жыццё не задавальняла няўрымслівую жанчыну. Заручыўшыся рэкамендацыямі военачальнікаў і магнатаў, яна надумала паехаць з Беларусі ў Пецярбург, да імператрыцы Анны Іванаўны, каб з яе пратэк-

цыяй вярнуць некалькі «сваіх людзей», выкупленых ёю з турэцкага палону, але перахопленых па дарозе рускімі салдатамі. З Вільні праз Рыгу падарожніца дабралася /зноў з прыгодамі/ да рускай сталіцы. Там яна даволі лёгка пранікла ў царскі палац, заваявала давер імператрыцы, якая называла яе не інакш як «мой дружок», «Саламаніда Яфімаўна». Пільштынова ўвайшла ў курс усіх прыдворных падзей і інтрыг, усіх плётак. Яны пераказаны ва ўстаўных раздзелах-навелах «Авантура князёў Далгарукіх», «Гісторыя панавання Анны Іванаўны», «Авантура пра Мазепу» і інш.

Паўночная сталіца прыйшлася Пільштыновай даспадобы. Падарожніца захаплялася тварэннем Пятра I, аддавала належнае яго рэфарматарскай дзейнасці: «Гэты цар Пятро Аляксеевіч пры жыцці сваім край свой вельмі прыгожа і пахвальна сфармаваў. Першае: разбойнікаў і злых людзей так вынішчыў, што не тое што старых і маладых, але жонкі і дзеці прэч выразаць, каб злога зародку ў яго краіне не было, бо раней нельга было ні купцу, ні пану, ані якому чалавеку праехаць. Другое: даў колеры войску свайму і муштру ім загадаў вучыць, наняў дзеля моваў розных і полеру сваёй краіны розных мэтраў, а менавіта французаў, немцаў, італьянцаў і лацíннікаў, як я сама бачыла ў Пецярбургу, амаль у кожнага афіцэра або купца ёсць розныя мэтры і танцмайстры, амаль у кожным доме, а асабліва ў штабс-афіцэраў або ў міністраў. Розныя фабрыкі: сама я купляла аксаміт, градэтур /цяжкая шоўкавая тканіна.— *А. М.*/, залатыя галуны, залатыя кампанкі /фрэнзлі.— *А. М.*/ з пецярбургскай фабрыкі,

і там, дзе былі балоты, дрыгва, што за масты, каменныя і драўляныя і пяском роўна высыпаныя, на адной мілі пяць слупоў маляваных з надпісам па-маскоўску, па-нямецку і па-латыні, дзе ехаць і як далёка». Рускія парадкі Пільштынова параўноўвала з аўстрыйскімі, нямецкімі і турэцкімі.

Калі падарожніца намерылася пакінуць Пецярбург, руская імператрыца загадала вярнуць ёй выкупленых палонных /не так ужо істотна, што не тых самых/, выдаць са сваёй казны тысячу рублёў, мноства сувояў тканін, дванаццаць вялікіх і столькі ж малых сярэбраных кубкаў, а таксама тузін сурвэт з царскімі гербамі. А каб па дарозе жанчыну не абрабавалі разбойнікі, да яе прыставілі канвой. Вярталася яна дамоў з верай у сваю шчаслівую зорку.

Аднак зменлівая фартуна хутка зноў адвярнулася ад Пільштыновай. У Нясвіжы і Лахве на Палессі яна даведалася, што яе муж прагуляў некалькі тысяч злотых і ў дадатак «зламаў шлюбную веру». Да таго ж у няшчаснай жанчыны зноў адабралі яе палонных «туркаў». У хвіліны адчаю выспявае план новай «авантуры»: паехаць у Аўстрыю, знайсці мужавых сваякоў і спагнаць з іх грошы, заплачаныя за выкуп яго з палону. Пільштынова, хворая і цяжарная, рашуча выпраўляецца ў далёкую дарогу. Праўдай і няпраўдай пранікае праз кардоны, у каралеўскія палацы. У Брэслаўлі яна, відаць, з дапамогай самога Фрыдрыха II, атрымала пашпарт, каб праехаць праз Сілезію ў Аўстрыю, што была тады ў стане вайны з Прусіяй. Нарэшце падарожніца дабралася да Вены, дзе ў яе нарадзіўся сын. «Фартунка» нібыта зноў усміхаецца жанчы-

не. Купіўшы мужу дарагое адзенне, яна спяшаецца дамоў...

Па сваіх мастацкіх асаблівасцях «Рэха» Саламеі Пільштыновай належыць да пашыранага тады ў Еўропе стылю барока, якое было заснавана на рэзкіх кантрастах, дысанансах, нечаканых пераходах ад святла да ценю, ад радасці да смутку. Тое ж — і ў жыцці Пільштыновай, у яе дзённіку: ад шчасця да няшчасця і наадварот — заўсёды толькі адзін крок...

Муж, вядома, адказаў на яе падарункі «чорнай» няўдзячнасцю: выкраў яе дачку і падгаварыў слугу падсыпаць у Саламеіну талерку атруты. «Потым,— піша Пільштынова,— пан Езус мяне цудоўна вылечыў, але ў мяне павывальваліся зубы, вылезлі валасы, сталі ломкія ногці, нават уся скура з мяне злупілася». Аднак жанчына цярпліва пераносіць чарговае боскае наканаванне. Больш таго, пабачыўшы ў Нясвіжы Міхаіла Радзівіла Рыбаньку, слёзна просіць, каб ён усё ж выпусціў з турмы яе мужа...

Зноў некалькі дзён бясхмарнага сямейнага шчасця... Але пасля іх Пільштынова вырашыла канчаткова развесціся з мужам, цішком з'ехаць на ўкраінска-малдаўскія землі, каб яшчэ раз адшукаць сваіх «туркаў» /Рыбанька загадаў адаслаць іх назад на радзіму/. Ды Пільштын дагнаў яе ў Львове і зноў пачаў «авантуры». Адкрываецца новая старонка «прыгодніцкага рамана»: «Уцякла я адразу з экіпажа, пайшла ў касцёл, а з кацёла ў кляштар матак бернардзінак, а муж мой каханы цапнуў з экіпажа мой куфар з сукенкамі, з грашыма і г. д., што было там, і потым фурыі і сваркі чыніў з паннамі бернардзінкамі, дык так, што я ўжо таго шуму

выцерпець не магла і сама да яго выйшла да брамкі і казала: «Відаць, гэта воля П. Бога. На, вазьмі мяне і з'еш». І так мяне схапіў, пацягнуў да нейкіх рускіх могілак, дзе наняў сабе халупу, і там я з маім мужам некалькі тыдняў пражыла, і тое, што я здаўна ў паненак бернардзінак трымала, таксама ад іх выцягнуў і прагуляў, так што ў мяне зноў нічога не засталося».

Нарэшце наша зямлячка цалкам разарвала адносіны з Пільштынам, выправілася ў Турэччыну. Зноў лячыла пацыентаў. Зноў пераконвала ворагаў, што ў яе не «заечае сэрца» і заўсёды ёсць з сабой «пара набітых пістоляў». Ды раптам — новае падзенне, новая змена святла і ценю.

Вось яна, зусім убогая, сядзіць у кляштары і горка плача, успамінаючы нядаўняе мінулае: «На леташнія святы я была ў спакоі, у багатых сукенках, футрах, каштоўных камянях, жомчугу і г. д., а цяпер дрыжу ад холаду, не маючы нават футарка». З жалю жанчына так расхварэлася, што з ложка ўпала і тры дні на голай зямлі ляжала, трызнячы.

Цяжка пераказаць усе далейшыя прыгоды Пільштыновай. Развітаўшыся з другім мужам і вырашыўшы далей жыць «у сепарацыі», яна тым не менш прыняла заляцанні новага каханка — маладзейшага на сем год «пана І.М.Ц.З.», які аказаўся не лепшы, чым Пільштын. Некалькі гадоў ён жыў на ўсім гатовым. Саламея «заўсёды купляла яму кунтушы і жупаны, добрыя паясы, шаблі, пісталеты і коней». А ён піў, здраджваў — «толькі той талент меў, што меў вялікую цярплівасць». Баючыся лішняга сведкі, у час чарговага ад'езду лекаркі ён

замыкаў яе дзевяцігадовага сына «ў цёмны склеп... і забываў пра яго — так, што ледзь яму раз на тры дні хлеба даваў, і так гэтае дзіця на голай зямлі ляжала, пералякалася, апухла і з гэтага памерла». «Гультай» яшчэ колькі разоў ашукваў даверлівую жанчыну, выцягваў у яе грошы. Тады яна вырашыла, пераапрануўшыся сялянкаю, уцячы ад яго праз Кіеў у Расію. Ды каханак знайшоў яе і на Украіне. Таму Пільштынова трэці раз накіравалася ў Турцыю, дзе выкупляла /дзеля асабістай выгады/ палонных, гандлявала віном, карэннямі, літымі паясамі. Урэшце стала прыдворнай лекаркай-акулісткай у стамбульскім гарэме султана Мустафы, паспяхова карысталася там прыёмамі «псіхатэрапіі».

Жывучы ў Турцыі, у Стамбуле, Пільштынова ўважліва прыглядалася да побыту і нораваў туркаў. Яе апісанні здзіўляюць назіральнасцю, рэалістычнасцю дэталяў. У свае ўспаміны аўтарка ўключала і ўласныя разважанні аб розных рэлігіях, аб непазбежнасці прадвызначэння, і займальныя гісторыі, пачутыя ад іншых людзей. Аддаючы даніну густам барока, Пільштынова, дзіця свайго парадаксальнага веку, звычайна выбірала з чужых расказаў нязвыклае, цудоўнае. Гіпербалізавала пачутае. Часам любавалася жорсткасцю /дастаткова прыгадаць апісанне таго, як рымскі кесар ператвараў хрысціян у жывыя лямпы-паходні/.

Такім чынам, успаміны Саламеі Русецкай-Пільштыновай — унікальны дакумент свайго часу. Да іх цалкам стасуюцца словы рускіх даследчыкаў І. Янскай і В. Кардзіна пра тое, што часам «сам дакумент можа стаць літарату-

рай дзякуючы дзівоснай верагоднасці, выключным фактам, выдатнай асобе аўтара, нязвычнаму яго лёсу»[1].

Па сутнасці, «Рэха» — гэта раман-аўтабіяграфія, раман прыгод, дзе свабодная, «стыхійная» плынь апавядання перапыняецца ўстаўнымі навеламі.

Сама Пільштынова была неардынарнай індывідуальнасцю, рашучым і смелым чалавекам. Яе духоўны свет даволі багаты, а пачуцці — тонкія. У ёй змагаліся розныя супярэчлівыя пачаткі: цікавасць да свету і людзей, вынаходлівасць — і вера ў непазбежнасць лёсу, боскае прадвызначэнне; спачуванне да чужога гора — і жорсткасць; прага ціхага сямейнага шчасця, любоў да дзяцей — і прыроджанае імкненне да небяспечных прыгод, змены месца і абставін /з Турцыі падарожніца збіралася зрабіць, а можа, нават і здзейсніла паломніцтва ў Іерусалім і падарожжа ў Егіпет/.

Пільштынова даволі крытычна ставілася да тагачаснай рэчаіснасці, да «шляхецкай вольнасці» ў Рэчы Паспалітай. «Ах, мой Божа,— усклікала яна,— як мяне гэты свет прыгнятаў і залатая вольнасць польская». Крытыцызм нярэдка пераходзіў у самакрытыцызм. Пільштынова прызнавалася чытачу ў сваіх сапраўдных і ўяўных грахах /часам гіпербалізуючы іх/, у пазашлюбнай сувязі з каханкам, нібы кідаючы тым самым выклік тагачаснаму крывадушнаму грамадству. Выходзячы з гэтага, польскі гісто-

---

[1] Янская И., Кардин В. Человеческий документ и документальная литература // Вопросы литературы. 1979. № 8. С. 6.

рык і медык канца XIX стагоддзя I. Глятман назваў Пільштынову прататыпам «сапсаваных эмансіпатак». Але, мусіць, больш рацыі мае З. Куховіч, які бачыць тут пошукі «новай мадэлі жаночага шчасця».

Непаўторныя ўспаміны, і сваёй моваю. Як ужо гаварылася, Пільштынова не атрымала добрай адукацыі. Мусіць, таму, мова яе не засмечаная пашыранымі тады лацінізмамі. Затое ў ёй шмат беларусізмаў. Як адзначае польскі даследчык Р. Поляк, Пільштынова прытрымлівалася ў правапісе фанетычнага прынцыпу, не цуралася «правінцыялізмаў», пашыраных «на ўсходніх абшарах тагачаснай Рэчы Паспалітай». Да прыкладу, валошку яна падкрэслена называе васільком.

Урэшце, трэба адзначыць такую выключную акалічнасць. У адрозненне ад іншых мемуарыстаў Беларусі /асабліва XVII стагоддзя/ свае ўспаміны Пільштынова прызначала ўжо не дзецям і ўнукам, не для «хатняга чытання», а для друку.

У спецыяльнай прадмове «Да ласкавага чытача» недвухсэнсоўна сказана: «На чэсць і хвалу Пану Богу, у Святой Тройцы Адзінаму, ахвярую ўсё дрэннае і добрае, што я мела і выцерпела, маю мець і буду, усё гэта дзеля заслуг неба ахвярую, як таксама гэтую дрэнную кніжачку надумала я маёй уласнай рукой выпісаць і маім уласным коштам падаць да друку...» Аўтарка «Рэха» ўжо ўсведамляла літаратурную значнасць свайго твора, адрасавала яго грамадскасці.

«Авантуры» Саламеі Пільштыновай, папярэдніцы іншых славутых еўрапейскіх «аванту-

рыстаў», не згубілі ні гістарычна-пазнаваўчай, ні мастацкай каштоўнасці, вытрымалі выпрабаванне часам. Таму горача рэкамендую гэты твор увазе ласкавых чытачоў. Асабліва тых, хто прагны да прыгод і шануе гісторыю роднага краю.

Адам Мальдзіс

Саламея Пільштынова


АВАНТУРЫ МАЙГО ЖЫЦЦЯ


Капенгаген
Балтыйскае мора
Берлін
Прусія
Пруся
Рыга
Біржай
Крулевец (Кенігсберг)
Укмерге
Вільня
Вроцлаў
Беласток
Варшава
Радам
Навагрудак
Карэлічы
Менск
Віцебск
Брно
Люблін
Кракаў
Нясвіж
Вена
Грац
Любляна
Жолква
Лахва
Дубна
Горыца
Львоў
Кіеў
Бар
Камянец-Падольскі
Буда
Пешт
Хоцін
Магілёў-Падольскі
Яссы
Бялград
Факшаны
Дуброўнік
Ніш
Відзін
Галац
Пірат
Бухарэст
Сафія
Карлава
Русе
Пернік
Ямбал
Салонікі
Радамір
Пловдзіў (Філінбей)
Одрын
Чорнае мора
Стамбул

ДА ЛАСКАВАГА ЧЫТАЧА

На чэсць і хвалу Пану Богу, у Святой Тройцы Адзінаму, ахвярую ўсё кепскае і добрае, што мела і адпакутавала, маю і мець буду, усё гэта дзеля заслуг неба ахвярую, як таксама і гэтую кепскую кніжачку коштам падаць да друку, сам Пан Бог бачыць — не дзеля якойсьці маёй карысці ці пахвальбы, бо я пры гэтым не буду, таму што ўжо з Польшчай назаўсёды развіталася і тут, у Турцыі, жыць вырашыла, хіба што дзеля таго, каб іншыя, якія ведалі мяне, не дакаралі, што я, полька[1], маючы мужа і дзяцей у Польшчы, усе мае тыя часовыя пацехі пакінула, а сама адна ў чужы край без усялякае дапамогі і пацехі выправілася, каб жыць і памерці ў Бозе ў тым краі. Вось таму і хачу ў гэтай маёй кніжачцы паказаць пуціны майго жыцця і пакутаў. Крыўды, пагарды ад мужоў, дзяцей, і блізкіх, і лёкаяў маіх — яны выгналі мяне з Айчыны маёй, дык мілей мне тут жыць, у гэтай пустэльні, у спакоі, у ласцы Божай, чым у Польшчы. Усё гэта я, дасць Бог, апішу і да ўвагі мудрых людзей падам. Калі добра атрымаецца, няхай гэтым будзе Імя Божае ўслаўлена, а калі апішу як слабая, нецярплівая белагаловая[2], шчыра прашу прабачыць за маю працу ў сталым маім веку і за мае грошы, якія цяжка дасталіся і якія я з ласкі Божае выдаткавала на друкаванне гэтае кніжкі. Таксама шчыра прашу ў Святое Панны Марыі здароўя, а пасля і збаўлення.

A
M E
N



Раздзел першы

ПЕРШАЕ ПАДАРОЖЖА Ў СТАМБУЛ

У маладым веку маім выдалі мяне мае бацькі (Яўхім Русецкі) замуж з Літвы[1], ваяводства наваградскага, за лекара Якуба Гальпіра, з якім я гэтага ж года паехала ў Стамбул[2], і адразу прынятыя мы былі ў прыстойных людзей, бо ён быў надзвычай добры лекар медыцыны, і Пан Бог нас блаславіў, і да нас павярнулася Фартуна. Таго разу трапіўся нам адзін турак, вялікі багатыр, султанскі чаўш[3], які быў сляпы на абодва вокі і калека на абедзве рукі і абедзве нагі ўжо гадоў сем, і старгаваўся ён з маім мужам за пяцьсот леваў[4], каб той яго вылечыў. Адразу гэты турак-чаўш даў грошы майму мужу, а муж мой узяўся яго лячыць ды так добра і шчасліва вылечыў, што мог той сам чытаць і пісаць вачыма і рукамі сваімі і хадзіць нагамі, куды хацеў, нават без кійка. Пра гэта даведаўся імператар, султан Махмед[5], і шмат падарункаў атрымаў мой муж ад султана і стаў вельмі славутым лекарам у Стамбуле. Але той турак, аднак, яшчэ дэкокт[6] піў і лекі браў, бо яшчэ не скончылася — паводле звычаю — трохме-

сячнае лячэнне. Аднаго дня даў яму мой муж лекі вельмі добрыя і выпрабаваныя, але таго ж дня, як выпіў гэтыя лекі, памёр наш пацыент. Тады пачаліся нападкі і гвалт на майго мужа ад жонкі і дзяцей таго памёрлага турка, што абавязкова хацелі загаду задушыць майго мужа. Яны паслалі супліку[7] візіру[8], а ў той час быў кепскі візір, Ісмаіл-паша, які туркаў і хрысціян душыў, як кот мышэй. І вось укінулі майго мужа ў вязніцу, каб пасля пакараць смерцю.


А я ў той час вельмі цяжка хварэла на пошасць і чары. Адну нагу мела ўсохлую і карацейшую за другую на паўлокця[9], і ўсё цела нясцерпна балела. Аднак у такім цяжкім становішчы загадала нясці мяне ў сакеце[10] да вязніцы майго мужа і пыталася яго, што мне загадае чыніць. Ён даў мне параду, каб паслала супліку візіру, даводзячы бязвіннасць майго мужа, каб вызваліў яго з гэтае вязніцы. Так я і зрабіла. Казала напісаць турэцкую супліку і аддала яе візіру на Дыване[11] ў прысутнасці многіх людзей і атрымала адказ, каб прыйшла ў кінды[12], гэта значыць у час вячэрні, і забрала рэспонс[13]. Дык зноў казала занесці мяне ў час вячэрні і атрымала рэспонс праз лёкая візірскага, каб прыйшла ў палац візірскі ахшам карсы, гэта значыць увечары. Я вельмі здзівілася, што гэта за патрэба, каб я ўвечары па рэспонс хадзіць мусіла, а ўсе людзі яго ўдзень атрымліваюць. І зноў казала занесці мяне да вязніцы майго мужа і апавядала яму, што чула. І так мне мой муж адказаў: лепей найжахлівейшаю смерцю памерці, чым каб я ў яго адсутнасць схілілася да неабдуманага жыцця і запляміла сваё чыстае сумленне. Прыйшла ноч, і я загадала несці сябе дахаты.

Пераначаваўшы, я назаўтра загадала насіць мяне сюды-туды да ўплывовых паноў турэцкіх і добрых маіх прыяцеляў, каб мяне пamірылі з тымі дахвадзыя-

мі[14], гэта значыць з жонкаю і дзецьмі таго памерлага чаўша. І ледзь-ледзь вялікімі стараннямі і дапамогаю Божаю ўладкавала я гэтую справу за пяць тысяч леваў, гэта значыць дзесяць кес[15], бо ў кожнай кесе пяцьсот леваў, а кожны леў — чатыры тынфы[16]. Узяла я паперу ў судзе, паводле звычаяў турэцкіх, і быў вызвалены мой муж з вязніцы, і меў вялікую павагу да мяне за мае старанні і выдаткі.

Пасля праз некалькі месяцаў маімі стараннямі і даследаваннямі, з якое гэта прычыны памёр той наш пацыент, і мы так шмат мусілі за яго плаціць, дазналася я, што тыя апошнія лекі, ад якіх чаўш памёр, зрабілі ў Стамбуле ў адной аптэцы, паводле рэцэпту майго мужа, і там быў пры гэтым адзін габрай, лекар Фансека[17], і ён з зайздрасці ўкінуў у ступку, дзе гатаваліся лекі, атруты, і такім чынам памёр той турак. І казала я мужу майму, каб даў позву аптэкару, навошта ён дазволіў габраю атруту дабаўляць да лекаў. А муж мой адказаў мне: «Дзякуй Пану Богу, што мяне не пазбавілі жыцця. Добра, што на грашах скончылася».

Дык я ўпотай ад мужа майго і ў адсутнасць ягоную загадала напісаць добрую супліку з тлумачэннем прычыны смерці чаўша і пра мае дзесяць кес, што нападнікам[18] дала, а гэта па прычыне атруты, дадзенае лекарам-габраем Фансекам і аптэкарам Ёганам. І вось, маючы гатовую супліку, я загадала несці мяне ў сакеце на Дыван, на візірскі суд. Ужо ранейшага візіра Ізмаіла пазбавілі пасады, ужо другі, ласкавейшы, быў, Алі-паша, дык я дала яму маю супліку, і вусна мовіць мне была дадзена аўдыенцыя, чаго хачу. І распавядала, што я полька і прышлая ў іх краі, і шмат іншых слоў, якія неабходны ў гутарцы, і прасіла, каб аптэкар Ёган і габрай Фансека былі зараз пастаўлены перад вачамі маімі на суд, але



Echo
Na swiat podane
Procederu podroży y Życia mego
Awantur.
Na Cześć y Chwałę P. Bogu w Świętey Trójcy Jedynemu y Najświętszey
Matce Chrystusa Pana mego y Wszystkim
Świętym.
Przeze mnie Samę Wydana ta Książka
Salomei Reginy de Pilsztynowey
Medycyny Doktorki y Okulistki
w Roku 1760
w Stambule

Ex Catalogo Li... Witte ... Joannis Callonetti ...

Тытульны аркуш запісак
Саламеі Русецкай
(Стамбул, 1760).

прасіла, каб ім не казалі прычыну, за што іх клічуць да візіра, а гэта таму, каб яны не прыгатавалі довадаў супраць мяне. І вось праз паўтары гадзіны яны стаялі на Дыване ў пашы-капысы[19], гэта значыць у судовай зале, і тут жа адзін турэцкі сенатар адразу пачаў лекара і аптэкара лаяць, а я таксама пачала на іх наракаць: «За што вы такога прыстойнага чалавека, чаўша, са свету звялі вашаю атрутай і мяне пазбавілі 10 кес грошай і добрага імя мужа майго, бо па Стамбуле разышлося, што чаўш памёр ад Гальпіравых лекаў, і праз гэта людзі з агідаю ставяцца да яго».

Тут страх вялікі таго лекара Фансеку ахапіў, і пры людзях ён абяцаў мне аддаць тыя дзесяць кес і міласцю Божаю прасіў мяне, каб ужо тую справу забыла, бо чым далей пра тое будзе напамін, дык не тое што набытак, а і жыццё пакладзеш за тую справу. І яны залагодзілі суд некалькімі тысячамі, і мне вярнулі мае грошы, гэта значыць дзесяць кес.

Але муж мой, яснавяльможны пан Гальпір, не ведаў пра гэтую прыгоду, бо не быў дома, а за шэсць гадзін дарогі ад Стамбула лячыў аднаго грэчаскага князя. Як даведаўся, што я гэтую справу распачала, дык уцёк той жа гадзінаю без вестак аж да Брусы[20], горада турэцкага, і мусіла я за ім пасылаць і запэўніць, каб нічога не баяўся. То ён прыехаў і быў вельмі пацешаны[21].

NB. Прыпамінаю сабе яшчэ некаторыя стамбульскія авантуры, бо ўся гэтая кніжка напісана толькі да ўвагі волі Божае і дзеля людское пацехі. Вышэй памянёны габрай, лекар Фансека, быў маім непрыяцелем і атруціў майго пацыента, чаўш-пашу, і я мусіла даць дзесяць кес нападнікам, а пасля з дапамогай візіра і ласкі Пана Бога адабрала я ад яго мае 10 кес грошай, таму той лекар Фансека не адмовіўся ад помсты і задумаў, якім чынам перашкодзіць майму

шчасцю. І пайшоў ён да гэкім-пашы, гэта значыць да старэйшага імператарскага лекара, ад якога ўсе лекары залежаць і без ягонага дазволу аніводзін, нават найлепшы лекар, нікога лячыць не можа, пакуль ад гэкім-пашы тэстымоніума не возьме, йэта значыць дазволу. І вось на мяне лекар Фансека нагаварыў, што я нічога не ўмею ў лекарстве, а да таго ж і белагаловая, і каб мне пагрозамі забараніў, абы я не адважылася больш лячыць, хіба што толькі кабет, хворых на вочы, бо гэтыя хваробы я ўжо някепска ўмела лячыць, таму што мой муж яго мосць пан Гальпір быў надзвычай добры акуліст і навучыў мяне, і я ад іншага акуліста, турка з Бабілона, узяла асобныя патрэбныя веды.

Дык гэкім-паша запрасіў да сябе майго мужа і сурова загадаў яму, каб не дазваляў мне лячыць у Стамбуле нікога з мужчын, толькі белагаловых і то хворых на вочы. І я мусіла задавальняцца тым, што мне дазволілі. Але я мела адну пацыентку, жонку каваяра[22], якая некалькі гадоў не бачыла, і я яе з ласкі Пана Бога вылечыла. Пасля лячэння яна заплаціла, а тут, у Стамбуле, ёсць такі звычай, што адзін дзеля другога прыяцеля робіць зяфет, гэта значыць банкет, паводле патрэб і магчымасцей кожнага, і гэта, калі адбываецца летам, дык у італьянскім садзе. Дык пацыентка мая, жонка гандляра каваю, наняла дзве каляскі, села ў адну, узяла мяне і сваю дачку, выдадзеную замуж, і сына свайго, маладога прыгожага хлопца імем Фейзула. Ён меў дыяментавы гадзіннік, і аздоблены дыяментамі нож, і пярсцёнак, і футра сабалінае на сабе. У другой калясцы былі дзве яе нявольніцы і яе малыя дзеці, і ўзялі мы з сабою шмат добрых страў і цукровых сіропаў для піцця вады. А я загадала свайму лёкаю, каб дзеля мяне ўзяў дзве маленькія пляшачкі віна, і каб схаваў іх у каляс-

цы, і каб мая кадыня не бачыла. Мы былі ў садзе, а каляскі стаялі ля саду. Я пасля частавання выйшла нібыта па нешта і сказала майму лёкаю: «Дай мне адну пляшачку віна». І я выпіла яе, а другая поўная засталася.

Але ў Стамбуле існуе забарона піць і прадаваць віно, і таму частая і строгая варта ходзіць. І наткнулася варта на наш поезд, і знайшлі яны пляшку віна, а другую выпітую (але з вінным пахам), і пыталіся, хто гэта піў. Фурман сказаў: «Не ведаю». Пыталася варта, што гэта за белагаловыя з мужчынамі. Фурман сказаў: «Гэта яны нанялі ў мяне каляскі». Варта таго не ведае, што то маці з сынам і дачкою і я, іх лекарка, толькі кепскае пра нас думалі, мяркуючы, што той сын Фейзула — кепскі чалавек і мы, белагаловыя, людзі распусныя і дурных паводзінаў. Дык без цырымоніі пачалі яны яго, небараку, тармасіць на вачах у маці і адабралі гадзіннік, нож, сабалінае футра, а яго сопамі[23] ўзяліся біць, і ён пад вартаю пад арышт за тую правіну пайшоў. Гэты Фейзула быў пакаёвым пахолкам у стамбульскага янычар-агі[24] Сарыкчы-пашы, гэта значыць, што ён клапоціцца пра турбаны янычар-агі. А мяне выратаваў Бог ласкаю сваёю і строй мой польскі, бо я растлумачыла, што я хрысціянка і не турэцкая падданая, па прафесіі я лекарка, дык мяне ўсё-такі не забралі, а без перашкод адпусцілі. А вось тая мая пацыентка, а Фейзулы маці, вельмі горка пачала па сыну плакаць, турбавацца, і страшна ёй было дадому ехаць, бо яе муж, а Фейзулы бацька, колькі разоў забараняў: «Не бяры з сабою Фейзулу, бо ён ужо вялікі хлопец, небяспечна і непрыгожа з белагаловымі ў сад ездзіць». Таксама мой муж дома сурова забараніў мне з турчанкамі ў сад ехаць і віно браць, а калі частавацца, дык у турэцкай хаце, але не ў садзе. Таксама маці Фейзу-

лы самлела ад страты і знявагі сына, бо турчанцы пайсці за сынам жлуктаю вялікі сорам для маці, хоць наш Фейзула не тое што не піў, але і не бачыў ніколі віна. Інакш быць не можа: наканаваў лёс мне ратаваць яго з гэтае прыгоды.

Бяру я Пана Бога на дапамогу і адсылаю маці з дачкою, з нявольніцамі ў адной калясцы да яе дому, а сама сядаю ў другую каляску і еду на дапамогу Фейзуле, каб яго і ягоныя рэчы вывіндыкаваць[25]. І вось пад'ехала да брамы той вязніцы, дзе Фейзула пад арыштам быў, і прыйшла да чаўша-пашы (гэта *ad instar*[26] у нас у Польшчы капітан), што на гадвахце[27] быў, і прасіла яго вызваліць Фейзулу, і распавядала пра яго невінаватасць[28], што ён у садзе не быў з чужымі белагаловымі, а з роднаю маці, і сястрою, і з нявольніцамі сваёй маці, я ж хрысціянка, полька. Можна мне і з белагаловымі, і з мужчынамі гаварыць, бо і тут цяпер з васпанам размаўляю. Адказаў мне чаўш: «Гэта вельмі добра, пані лекарка, але ж добра ведаеце, што султан забараніў нават дома піць хрысціянам віно, а што тут бачу? У садзе з туркамі і турчанкамі п'юць віно! Гэта значная правіннасць, і апраўдання таму няма, а варта мая справядлівая, бо гэта не напад, а праўда, што віно знойдзена ў карэце пані лекаркі».

І тут я страшна сумелася. Баялася, каб ён не абвінаваціў мяне разам з Фейзулой, і прасіла Пана Бога, каб мне параіў, што трэба чыніць і казаць. І так яму сказала: «Пане міласцівы, я полька, дасканала не ведаю загадаў найяснейшага яго мосці султана, бо каб ведала, што забаронена хрысціянам віно піць, ахвотна б ад гэтага ўтрымлівалася. Я ўсё-такі чалавек, маю розум, не адважылася б у сваю карэту браць віно. Але ж падданыя султана, тутэйшыя стамбульскія абывацелі ведаюць добра, парадак знаюць. Трэба

тады знаць: хтосьці меў у кішэні віно ў пляшках і як убачыў варту, пабаяўся, каб у яго віна не знайшлі, дык, ідучы ля мае карэты, укінуў пляшкі з віном, а сам уцёк. Варта знайшла віно ў маёй карэце, думаючы, што піла альбо маці, альбо сястра, альбо сам Фейзула, альбо я. Не вер гэтаму, мілы пане». І вось з ласкі Пана Бога паверыў мне чаўш і падарыў мне тыя дзве пляшкі захоўваць эсэнсію, а Фейзулу адразу вызвалілі з-пад арышту і ўсе рэчы аддалі яму, што ў яго былі забралі, і пайшоў ён у спакоі да свае маці.

Мяне ж чаўш-паша просіць, каб наведала аднаго пацыента, ягонага зяця. Дык па просьбе чаўш-пашы пайшла я наведаць хворага ягонага зяця, бо ўсё гэта было ў палацы самога янычар-агі. Бачу яго змарнелага, учарнелага, кідаўся ён з кута ў кут ад болю. Пытаюся, што здарылася. Кажуць: «Ужо дзён пяць мачыцца, *salvo honore*[29], не ходзіць». Не гледзячы на гэта, узялася я лекаваць яго, каб хутчэй дахаты паехаць, а таксама з тае прычыны, што ў лекарстве яшчэ добра не разумела. І думала, што гэта дробязь. І так сказала: «Пашлі, вяльможны пан, са мною, да рабыні твае, чалавека, я дам добрыя і дзейсныя лекі». І развіталася з чаўшам і зяцем ягоным хворым, і села ў каляску, і еду дадому, а чаўшаў лёкай за мною ідзе па лекі для хворага зяця. Тут жа ля палаца сустракаюся я з мужам маім яго мосцю панам Гальпірам, які, лічачы, што я арыштаваная альбо ў тарпасе[30], паспяшаўся мне на дапамогу. Ён з крыкам кідаецца да мяне. Я яго супакойваю: «Сэрцам каханы мужу, не хвалюйся, няма тут нічога кепскага, а нам шкоднага. Дома распавяду пра гэтую прыгоду». Тады мой муж пайшоў да сваіх пацыентаў, а я з лёкаем чаўша паехала дахаты.

Прыехаўшы дахаты, думаю, што за лекі таму пацыенту, чаўшаваму зяцю, даць. Мяркую сабе: «Па-



Сабор св. Сафіі
(цяпер мусульманская мячэць Айя-Сафія)
у Стамбуле.

раюся пасля з мужам маім», а тым часам адчыніла шафу і паглядзела на слоікі з сіропамі і знайшла адзін слоік не абвязаны, без подпісу. Лічачы, што гэта *siropus violarum*[31], наліла ў слоік і так сказала лёкаю: «Як хутчэй ідзі, і адразу няхай ён адну лыжачку лекаў вып'е з каваю, у час вячэрні — другую, кладучыся спаць, возьме няхай трэцюю лыжачку, а заўтра ранi-

цаю няхай ягамосць па мяне прышле». Дык той лёкай узяў сіроп і пайшоў у палац свайго пана, і вось гэты сіроп на тры часткі падзялілі і далі выпіць хвораму паводле маёй парады. Тут вяртаецца мой муж. Я апавядаю прыгоды сённяшняга дня з Фейзулою і з яго вызваленнем па маёй просьбе, пры тым паведаміла пра таго новага пацыента, што так цяжка хварэе ў палацы янычар-агі, зяця чаўша Орта. Як мой муж пачуў, што я дала сіроп таму хвораму, дык моцна здзівіўся і вельмі наракаў на мяне, кажучы: «О, неразумная белагаловая! А не ведаеш пра тое, што табе назаўсёды забаранілі гекім-паша лекаваць мужчын, а пагатоў такога хворага, у якога і кроплі няма жыцця? Сам гекім-паша, гэта значыць галоўны султанскі лекар, лячыў яго і шмат іншых слаўных стамбульскіх лекараў. Давалі яму размаітыя добрыя медыкаменты, а не дапамагло. І я сам там у яго быў, і не захацеў нічога даваць яму, баючыся скуткаў, бо гэты чалавек сваю хваробу не зможа адолець. А цяпер гэты чалавек памрэ ад свае ўласнае хваробы, а наш непрыяцель, лекар Фансека, пойдзе да гекім-пашы і скажа, што яе мосць пані Гальпірова, лекарка, якой ваша мосць забаранілі лячыць мужчын, цяпер *de novo*[32] загубіла прыстойнага чалавека сваімі недасканалымі лекамі».

Я вельмі шкадавала, што такое ўчыніла, бо не ведала, што галоўны лекар сам яго лячыў. А, урэшце, што мела чыніць? З плачам звярнулася да апекі ў Святое Тройцы Адзінага Бога. Журботная, не вячэраўшы, пайшла спаць. Меркавала: «Дасць Бог, заўтра раніцаю ўцяку куды-небудзь і схаваюся ад гарачае рукі, пасля, Пан Бог добры, неяк перажыву і гэтае няшчасце». З тым і заснула. А тут ужо і дзень, а тут ужо і каляска ля брамы ад яго мосці пана чаўша Орта, каб прыехала лячыць ягонага зяця. Ах, мой Божа, як я спалохалася! Думала, што яны мяне

толькі звесці хочуць, а пасля пакараюць. Воляй-няволяй мусіла паехаць, бо іх трое па мяне прыехала; пасля спыніліся мы ля палаца стамбульскага янычарагі. Выйшла я з каляскі, іду ў пакой да хворага і азіраюся: дзе катафалк, дзе труна, але мяне цудоўна прынялі і прывялі ў пакой, дзе быў хворы. Ажно мяне ён вітае і запрашае сесці і так мовіць: «Я ўчора цябе ад болю і слабасці не пазнаў, думаў, што гэта мужчына лекар (я была ў каўпаку), але цяпер бачу, што ты белагаловая». І так мне сказаў: «Пасля першага прыёму тых лекаў надзвычай вялікая рэзь была, пасля другога разу і трэцяга вялікі камень выпаў і крывавай мачы потым шмат выйшла, я ўжо крыху ачуняў, прашу і далей лячыць мяне».

Я тут у душы дзякую Пану Богу за ягоную ласку і міласэрнасць да мяне і так кажу: «Ваша мосць, з дапамогаю Пана Бога магу пана вылечыць, толькі мне не дазволена, бо маю суровую забарону ад яго мосці пана гэкім-пашы, каб нікога не лячыла, і прашу мець усё гэта ў сакрэце, каб гэкім-паша не даведаўся». Дык той чаўш-Орта адказаў: «А хто каму забароніць лячыць? Не бойся, пані лекарка, хоць бы зяць мой, барані Божа, і памёр». Пад прысягаю сваёй веры абяцаў мне ніколі не наракаць, нават не казаць нікому, што я лячыла яго.

Сэрца Бог мне даў мужнае, а не палахлівае. Я абяцала і далей лячыць яго, не зважаючы на мужа, толькі, аднак, пакрыёма ад мужа давала далей *balsam kopaiba*[33], ванны і пластыр. І вось я таго пацыента шчасліва і добра вылечыла. Я лічу так, што да мяне яго розныя добрыя лекары лячылі, але Пан Бог не аб'явіў гадзіну, калі ён ачуняе, а я на гатовае лекі свае, хоць і кепскія, дала, і тады прыйшоў час, і Бог дапамог праз мяне. Тут зазірнула ў слоік, з якога давала *siropus violarum*, а быў слоік неабвязаны, аж


там шмат нападала жукоў ці хрушчоў з вельмі вялікімі рагамі, і ці магло б гэта дапамагчы? Усё гэта я волі Найвышэйшага Бога прыпісваю.

Пасля лекаў аднаго дня прысылаюць па мяне, і я паехала ў палац янычар-агі. І прасілі прабачэння, што яны — людзі не багатыя, толькі лёкаі, бо мой пацыент быў капітан абазы, гэта значыць шатны[34], і даў мне за лекі 40 чырвоных злотых і прыгожую хустку, і так мне казаў, што мяне ў пана янычар-агі моцна хвалілі і добра рэкамендавалі. І тут жа мяне адвялі да самога янычар-агі, які мяне добра прыняў паводле звычаю: кава, тытунь да люлькі, ружовая гарэлка, каб крапліць і *lignum aloes*[35], каб кадзіць, і бясконца ён мне дзякаваў за свайго шатнага, і падараваў мне цыбук[36] срэбраны за 25 леваў і срэбраны паднос, а на ім дванаццаць срэбраных зарфаў, гэта значыць кілішкаў, і дванаццаць філіжанак выдатных з парцаляны, і даў мне свайго прыстойнага лёкая і ліст да галоўнага лекара, надзвычай хвалячы мяне і просячы за мяне, каб даў мне тэсціp, гэта значыць патэнт, каб мне можна было паўсюль у Стамбуле і мужчын лячыць, і засведчыў гэты светлы яго мосць пан янычар-ага, што я ягоная прыдворная лекарка. І так я паехала з прыдворным янычар-агі да гекім-пашы, і той аддаў ліст султанскаму лекару і хваліў мяне перад ім. І вось яго мосць пан гекім-паша (быў то стары, але прыгожы француз, які з нейкае прычыны стаў туркам, і цяпер ён галоўны султанскі лекар) мне так мовіў: «Бачу, што ты маладая белагаловая, а лекарскай навукі і мужчыну трэба доўга вучыцца. А калі ж ты так дасканала лекаваць навучылася?» Сказала праўду: «З дапамогаю Пана Бога і за тое толькі бяруся, што ўмею». Ён мне: «А што найлепш умееш?» Адказваю: «З дапамогаю Пана Бога, хоць бы хто і дваццаць гадоў не бачыў, дык і яго вылечу». Сказаў стары

лекар: «Вельмі добра. Ёсць тут у маім доме старая белагаловая, мамка майго сына, сляпая ўжо сем гадоў. Калі яе вылечыш, дык ужо паверу табе і сам буду цябе рэкамендаваць найвышэйшым стамбульскім панам». І вось ён завёў мяне ў той пакой, дзе была сляпая белагаловая, і ўзялася я яе лячыць, і мне Пан Бог дапамог, і я вылечыла яе дасканала і добра за сорак дзён.

Пасля я засталася лекаркаю ў доме гекім-пашы. А там быў адзін турак, імам, гэта значыць султанскі капелан, і быў ён вельмі прыгожы чалавек, малады, разумны, вучоны, багаты, меў надзвычай прыемны голас і заўсёды мусіў быць ля султана, бо яго султан вельмі шанаваў. Але Пан Бог пакараў яго, пачалі гнайнікі псаваць твар таму імаму, дык ён ужо не мог быць ля султана, толькі ў сваім пакоі. І вось даў мне на лекі гекім-паша таго султанскага імама. І я з дапамогаю Пана Бога і з парадамі майго мужа ўзяла яго пад свой нагляд[37] і шчасліва вылечыла, і пасля гэтага стаў яшчэ больш паважаць мяне гекім-паша, апрача таго, туркі неахвотна да сваіх жонак і да сваіх дачок пускаюць лекараў-мужчын, дык мяне ён пасылаў заўсёды да вялікіх турчанак, паняў тутэйшых. Пасля сказаў мне: «Гэта і для мяне нязручна, і для васпані, што далёка ад нас жывеш». І загадаў гекім-паша пашукаць мне жытло і аптэку непадалёк ад свайго палаца. А найбліжэйшаю і найпрыстойнейшаю была аптэка і кватэра лекара габрая Фансекі, што быў маім даўнім вялікім непрыяцелем. Гэты дом і аптэку нядаўна купіў Фансека за дзесяць кес. Дык вось гекім-паша адаслаў яму дзесяць кес, а аптэку і дом загадаў за тры дні вызваліць, бо лёкаі загад мелі такі: калі самахоць не выберацца, дык павінны яны ўсе бутлі і слоікі паразбіваць. Такім чынам той лекар выбраўся, а я з дапамогаю Пана Бога ў дом і аптэку пераехала

і амаль што цэлую аптэку мела з ласкі гекім-пашы, бо ён меў султанскую аптэку і мог даць усё, што каму хацеў. А лекар Фансека мне яму капаў, а сам, небарака, у яе ўваліўся, бо гэта было незвычайна для людзей, што тут у Стамбуле белагаловым не дазваляецца за парог ступіць, а мне можна было ў аптэцы сядзець сярод такога вялікага людскога шуму, ды яшчэ ў доме ў лекара Фансекі. Ледзь габрай не ашалеў.





МАЯ ДРУГАЯ АВАНТУРА Ў СТАМБУЛЕ

Я таму карысталася поспехам у людзей, што па-чалавечы абыходзілася з імі, і вельмі імкнулася, каб дасканала сваё рамяство ведаць, і пачало шмат людзей лячыцца ў мяне. Я ў той час жыла ў Батачы[38] непадалёку ад Фенеру[39], і там жа побач жылі два лекары-габраі, адзін зваўся Самсон, а другі — Эбеулу; яны зайздросцілі майму шчасцю, бо я шмат пацыентаў мела.

Штодзённа пад'язджала да мяне шмат турэцкіх калясак, пунсовым ды іншых колераў сукном знадворку абцягнутых, а ў той час была я вельмі маладая, семнаццаці гадоў, ды мела залатыя манеле[40] на руках за сто чырвоных злотых, на шыі на шнурках трыста чырвоных злотых, на галаве каштоўнасці, дыяментавыя пярсцёнкі, дыяментавыя кульцы[41] ды іншае з ласкі Пана Бога — вопратку надзвычай багатую.

Але Стамбул горад надзвычай пышны і вялікі, і ёсць там розныя людзі, дык вось задумалі два туркі, янычары[42], апрануцца як белагаловыя, і ёсць тут у Стамбуле звычай, што белагаловыя завязваюць твар

хусткамі, толькі вочы відаць; нанялі яны каляску турэцкую і прыехалі да мяне, просячы да сябе і кажучы, што маці іх цяжарная і хворая вельмі, каб я паехала ў дом іхні і дала ёй якія лекі. «Тут недалёка,— казалі,— у Эгіпе[43]» — і давалі мне тры чырвоныя злотыя за дарогу.

Але Пан Бог не хацеў маёй смерці. Я тлумачыла ім, што ўжо дзве гадзіны, як прыехала па мяне каляска ад беднае кадыні[44], якая мае хворыя вочы, і я мушу туды ехаць. І не змаглі яны ўпрасіць мяне да свае кампаніі. А суседка-лекарка, жонка Эбеулы, адазвалася, лямантуючы, што яна адмысловая лекарка, а на мяне крычала, што я не ўмею нічога. Я тыя словы апрахандавала[45], села ў каляску і паехала лячыць сваю бедную кадыню, а тая габрайка-лекарка паехала з двума янычарамі, узяўшы тры чырвоныя злотыя за дарогу, і выстраілася пышна, бо тут звычай, што і старыя, і маладыя вельмі багата ў золаце і ў каштоўнасцях заўсёды ходзяць.

Дык вось завязлі яны тую лекарку ў свой дом і там зарэзалі, а ўсе ейныя рэчы, што ў яе былі, на пяцьсот чырвоных злотых забралі, а труп у кучы конскага гною на сваім падворку закапалі. Але гэтая габрайка-лекарка мела сына-турка, які служыў у султанскім двары.


Ён паслаў супліку, каб яму можна было паўсюль у Стамбуле шукаць сваю маці. І атрымаў ферман[46], гэта значыць ардынанс, і як узяўся старанна і шчыра шукаць, дык знайшоў сваю маці ў кучы гною і яшчэ турэцкае дзіця двухгадовае, што мела шапачку, па-турэцку — фэз, а на ёй дзвесце чырвоных злотых.

За гэты фэз замардавалі дзіця. І знайшлі ў тым гноі хлопца-падлетка пятнаццацігадовага, які прадаваў тульбэнты, гэта значыць шалікі і хусткі,

для белагаловых, і меў ён багата такіх хустак, а яны каштавалі пяцьсот леваў. За гэты тавар і замардавалі хлопца-грэка.

І напаткаў іх прысуд: разбойнікаў пакараць смерцю, а іхні двор раскідаць. А мяне Пан Езус выратаваў.





ТРЭЦЯЯ АВАНТУРА Ў СТАМБУЛЕ. 1735 ГОД

Другі габрай-лекар, сусед мой, які зваўся Самсон, быў таксама мой вялікі непрыяцель. Не ведаючы, што ўчыніць ад злосці здароўю майму і набытку, наважыўся на такое. Загадаў ён украсці ў мяне патынак[47] адзін гафтаваны, у якім я штодзень хадзіла, і з тым патынкам нейкія чары, закляцці чыніў; была ж я і без таго цяжка хворая на пошасць, а той бязбожны габрай яшчэ прырабіў, што ў мяне рукі і ногі адняліся, а таксама і розум чалавечы, бо мне здавалася, што я дзіця, што павінна ў калысцы ляжаць, і мусілі мне калыску падрыхтаваць, паслаць і калыхаць. Калі знянацку ўбачу руку альбо нагу сваю, дык усчыняю гвалт: «Забярыце ад мяне гэтыя чужыя рукі і ногі!» Я лічыла, што павінна мець рукі і ногі як гадавалае дзіцё. Мужа і найвярнейшых лёкаяў так ненавідзела, што дзеля Бога прасіла, каб яны ад мяне прэч адышлі, бо мне здавалася, што яны маюць у руках аголеныя палашы і хочуць мяне засекчы і ўсё, што ёсць у доме, пазабіраць. Калі хацела ў акно якое зазірнуць, дык бачыла нейкае страшыдла ў абліччы старога чалавека, які

меў надзвычай доўгую бараду, а валасы — як тоўстыя ніткі.

І так я дзень і ноч баялася таго прывіда, што дзевяць месяцаў не спала, толькі з ласкі Пана Бога такую палёгку мела ў сваёй хваробе, што нейкі Юзаф, хлопец простага стану, знайшоўся ў Стамбуле. Ён здаваўся ў маіх вачах такім, што я на свеце не бачыла нікога мужнейшага, разумнейшага і вярнейшага. У першую сустрэчу з ім я скардзілася на мужа і лёкаяў сваіх, што хочуць забіць мяне і ўсё пазабіраць, і прасіла яго, таго Юзафа, дзеля Бога, каб служыў у мяне і тое чыніў, што я яму загадаю. Ды і тое прасіла, каб ніколі не спаў, каб на нас не напалі і не забілі. Гэта ён ахвотна паабяцаў, і загадала яму набіць дзве пары пісталетаў і мовіла: «Не зважай, што я хворая; мы ўдваіх нікому не дамося». А тут свае ўласнае рукі баялася, бо лічыла, што яна чужая. Добра, што Юзаф мог мяне пераканаць, і я на чвэрць гадзіны ў тры дні засынала часам, бо ён казаў: «Я не сплю, вартую. Засні, ваша мосць пані». Я на ягоныя ўгаворы крыху засынала, а гэты Юзаф меў маіх шэсцьсот чырвоных злотых, якія былі схаваныя пад падушкамі, і добра, што гэты прыстойны чалавек не ўцёк. Юзаф мусіў дзень і ноч сядзець ля мяне з набітымі пісталетамі. Цэлых 9 месяцаў цярпела я такія нягоды, ні есці, ні піць не магла, толькі каву і суровы боб, і то адно часам, і пры тым ад доўгага ляжання пайшлі па маім целе пролежні.

У гэты час, паводле Волі Божае, там, у Стамбуле, быў адзін вельмі багаты купец з Мысыру, гэта значыць з Егіпта, і вельмі добра знаўся ён па зорках. Ён па сваёй патрэбе сачыў за зоркамі, калі будзе памысна выязджаць са Стамбула на караблі ў Егіпет. І вось зразумеў ці то сваім умельствам, ці то дзякуючы чарнакніжніцтву, дзе мой дом, і адкуль я, і чаму так



Турак і турчанка на фоне Стамбула.
Гравюра XVIII ст.

дзіўна хварэю. І вось проста прыйшоў у мой пакой, пышна апрануты, з некалькімі чухадарамі, гэта значыць лёкаямі (я гэтага чалавека ніколі не бачыла), і так мовіў мне: «Шкада мне цябе і твае маладосці, бо ты ў Стамбул прыехала здаровая, а тут паганыя габраі на тваё здароўе замахнуліся і зусім хочуць звесці са свету хутка». Я адказала яму: «Не думаю, што гэта ад чалавека, бо я ні з кім не сваруся, нікому не зайздрошчу». Але той турак так мне мовіў:

«Можаш мне верыць: тое, што кажу, праўда». І ён распавядаў: «Укралі ў цябе адзін гафтаваны патынак і закапалі ў зямлі з закляццем, і пакуль той патынак гніе, ты будзеш хварэць, а як згніе дазвання, дык тады памрэш». І так мне мовіў: «Нічога ад цябе не хачу, ніякае ўзнагароды, толькі тую кашулю, якая цяпер на табе». Хоць я заўсёды нашу не грубую, а паўядвабную, але мне брыдка, што яна вельмі нікчэмная, і тут яшчэ капрызнічаю, што не магу сваіх рук і ног бачыць, бо калі спавітая ці хоць добра накрытая, дык кажу разумна. І вось той турак сам сваімі рукамі і з тым Юзафам схапілі мяне, як ваўкі, і паставілі на ногі, і даў мне той турак нейкае кадзенне, і так мне здалося, што на мяне сто карцоў сухога гароху высыпалі з шумам ды крыкам па ўсім целе. Як гэты шум суціх, паклалі мяне і кашулю знялі і, як раней, укрылі далікатна. Пасля гэтага страх, які мела ад сваіх рук і ног, адступіў, і я сказала таму турку: «Нагнаў ты на мяне, пане каханы, апрахензіі[48], калі пра мой патынак мовіў, бо я сама добра памятаю, што ён прапаў». А ён мне адказаў: «Дасць Пан Бог, заўтра прынясу табе твой патынак».

Тут жа паклікала я свайго мужа, бо і пра мужа добрыя думкі ў мяне з'явіліся, што ні мой муж, ні лёкаі мае не прагнуць забіць мяне. Дык вось прыйшоў ён да мяне, і я распавядала яму пра абяцанне вярнуць патынак, і так мовіў мой муж: «Калі гэта сапраўды будзе так, дык той турак вялікай эстымы[49] варты, а калі не — трэба яго кіем з дому выгнаць, што кашулю вышальбераваў[50]».

І вось назаўтра прыходзіць той турак і прыносіць мне мой страчаны патынак і нейкую гліняную місачку, усярэдзіне ўсю чыста спісаную інкаўстам[51] па-турэцку. І сказаў мне: «Што толькі будзеш піць, дык з гэтае місачкі пі і штодзень будзеш пачувацца лепей». А на

мужа майго страшна гневаўся, што кепска пра яго гаварыў, быццам быў пры тым і кожнае слова чуў. З таго часу штодзённа альбо кожны трэці дзень ён заходзіў да мяне і заўсёды зазіраў у тую місачку, ці ўсе тыя літары ўжо сцёрліся. А я сапраўды штодзень, дзякуючы Пану Богу, значна лепшала. Нарэшце ўжо і аднае літары не засталося ў місачцы, і ён загадаў свайму чалавеку разам з маім пайсці да таго габрая, лекара Самсона, і спытаць пра яго. Адказалі ягоныя лёкаі, што такога і такога дня ён захварэў, а сёння раніцай, са страхам, нейкаю дзіўнаю смерцю памёр.

Як даведалася пра гэта, незвычайна сумелася, і мучыла мяне сумленне, што піла з тае місачкі, але не ведала, што ён гнаў на смерць майго непрыяцеля, а мне вяртаў здароўе. У гэты час прыйшоў мой муж, маючы ў руках пяць локцяў вельмі добрага сукна і дванаццаць локцяў венецкага атласу, хочучы падараваць гэтаму турку, егіпецкаму купцу, за ягоныя шчырыя клопаты пра маё здароўе, але той крыху насварыўся на майго мужа, а падарункаў не хацеў браць. Мовіў: «Не дзеля грошай я працую, маю сваіх тры тысячы кес толькі на адным караблі». Што ні чыніў, усё дзеля Пана Бога. Я зусім ачуняла, толькі на нагу не магла ступіць з тае прычыны, што яна ад пошасці сапсаваная была, дык я на мыліцах хадзіла. Але ён мяне дзеля Бога прасіў, наказваючы, каб са Стамбула выехала, бо мяне габраі з зайздрасці зноў зачаруюць. Дык пастанавіла я выехаць са Стамбула, хоць і насуперак волі майго мужа, бо ён палюбіў Стамбул.





ЦУД, ЯКІ МНЕ ВОЛЯ БОЖАЯ НА ПАЧАТКУ ЛЕКАРСКАЕ ПРАКТЫКІ ДЗІВОСНА ПАСЛАЛА

З прычыны доўгае хваробы, хімер ад гэтае хваробы і вялікіх выдаткаў майго мужа, які лячыў мяне і плаціў іншым лекарам за маё лячэнне, я надакучыла яму, бо дзень і ноч настойвала, што не хачу больш жыць у Стамбуле, баюся бо габрайскіх чараў, а муж мой быў рэлігіі лютаранскае альбо пратэстанскае, цяжка было яго перараканаць, што ад чараў можа чалавек і памерці. А я зазнала такое, дык і верыла. Тады ён, угневаны, забраў усю, што меў, маёмасць, большую частку якой захоўваў употай ад мяне ў сваіх добрых прыяцеляў, а саму мяне пакінуў без грошай, строяў і аксэсуараў у Стамбуле, толькі загадаў даваць штотыдзень адзін чырвоны злоты. Я адразу ж аб'явіла, што паеду ў Польшчу.

Як толькі асобныя незычлівыя людзі пачулі, што я збіраюся ехаць, дык неадкладна мяне арыштавалі, сцвярджаючы, што мой муж вінен ім сто леваў. І тут Пан Бог даў мне добрага прыяцеля, друкара, што кнігі выдае, нязнатнага шляхціца, і ён мне пазычыў сто леваў пад распіску, і заплаціла я тыя фальшывыя

даўгі, і наняла каляску за трыццаць леваў ад Стамбула да Адрыянопаля[52], аднак грошай на дарогу і заплаціць за каляску няма, лекарства яшчэ дасканала не ведаю і не практыкавала. У той час наведала я аднаго турка, добрага свайго прыяцеля, якога звалі Махмед-ага, касаб-пашу, гэта значыць султанскага мясніка. Ён меў жонку, польку, некалі ўкрадзеную і прададзеную, але ўжо старую. Гэты чалавек падараваў мне дзеля Бога дукат *valoris*[53] 5, і дробнымі 8 тынфаў, і вельмі добры сівы баранок і блаславіў мяне, каб мне Пан Бог дапамог, каб з гэтае драбніцы шмат багацця мела. І вось развіталася я з гэтымі маімі добрымі прыяцелямі, бо хоць і мела шмат іншых: каталікаў, паноў і знаёмых прыяцеляў, але ніхто мне не дапамог. Дык вось, спадзеючыся на Пана Бога, сядаю ў каляску, узяўшы сваю маленькую дачушку Канстанцыю Гальпірову, якой не было і двух годзікаў, і старога чалавека, калеку-жабрака татарына, што крыху ведаў польскую мову, бо калі быў ён купцом, часта прыязджаў у Польшчу. І з гэтае прычыны стаў ён маім знаёмым і казаў: «Як змагу, буду служыць твайму сіроцтву».

І вось мы, дзякуй Богу, прыехалі ў Адрыянопаль, пышны горад. Плачучы, прасіла ў Пана Бога дапамогі і парады, дзе ўзяць трыццаць леваў за каляску, гэта значыць сто дваццаць тынфаў, а тут яшчэ трэба дом наняць і іншыя выдаткі. Як толькі мы спыніліся на рынку, так адразу нас людзі, кожны асобна, запрашае ў дом свой на жыхарства. Пад'ехалі мы да аднаго дому, і далі нам чатыры пакоі *a parte*[54], засланыя аксамітнымі ўзгалоўямі, і адразу медны столік быў застаўлены добраю ежаю, і вось мы, дзякуй Богу, абедалі. За жыллё я дамовілася даваць 16 тынфаў у месяц, а ежу ў карчме браць, а пасля разам за месяц заплаціць. А фурман, і слова не сказаўшы, рэчы мае зняў, а сам,



Панарама сталіцы Асманскае імперыі на пачатку XVIII ст.

забраўшы коней і каляску, паехаў. Праз сем тыдняў толькі прыйшоў па свае заслужаныя трыццаць леваў.

А я на мыліцах яшчэ хаджу, бо яшчэ тая рана ад пошасці не загаілася, і жылы ссохліся ад ляжання, і адна нага карацейшая за другую на паўлокця. Схуднела, змарнела ад хваробы, ад дарогі, ад клопатаў ды ад злыбяды і калецтва ў чужым краі. Дык пражыўшы дні тры, кажу свайму лёкаю Юзафу-

татарыну, каб наняў мне турэцкую каляску, бо хачу заўтра паехаць у лазню: у Турцыі надзвычай добрыя лазні. І вось мой лёкай пайшоў і наняў каляску, каб назаўтра паехаць у лазню.

У тую ноч бачыла я ў сне сваю адну вельмі добрую знаёмую і пры жыцці шчырую сяброўку, якая яшчэ ў дзяцінстве памерла; прынесла яна мне слоік мазі і раіла, з вясёлым тварам сцвярджаючы, што гэтая мазь дапаможа маёй назе. Я ўзяла і абяцала ў лазні намазацца. Пасля кажу: «Распавядай мне, якая гэта мазь? Я стакраць лепшымі нагу націрала». Яна мне сказала, што гэта звычайная мазь цырульніка. Прачнуўшыся, я патрабую ад свайго лёкая зялёную мазь, што мне далі ўначы. Ён здзіўляўся, адкуль тая мазь, таксама і я, паразважаўшы, што гэта было ў сне, але добра памятаючы, як тая мазь робіцца, зрабіла такую самую, і нагадвала яна колерам тую, што бачыла ў сне.

І вось паехала я ў лазню разам са сваёй дачушкаю і з гаспадыняю дому, дзе кватаравала, і нагу сваю скалечаную памазала колькі разоў той маззю, і тут у лазні з дапамогаю Пана Езуса адчула палёгку, седзячы, магла выцягнуць і стаць роўна на дзве нагі, але баялася, паводле турэцкіх звычаяў, падзіву і нічога не казала. І зноў на мыліцах выйшла з лазні і села ў прылазніку між прыгожых, здаровых, пышна ўбраных белагаловых, бо тут такі звычай, што як на шлюб альбо на вяселле, так белагаловыя апранаюцца і ў лазню. Бо тут такая традыцыя: белагаловыя сядзяць зачыненыя, нідзе не ходзяць, хіба толькі з мужавага дазволу, а дачка з дазволу бацькі можа пайсці ў лазню і там адна адну бачыць, і цешацца, ядуць і п'юць, могуць і танчыць, і спяваць.

Тыя багатыя пані пачалі мяне хваліць і да сябе запрашаюць, жадаючы бліжэй пазнаёміцца, за што

я Пану Езусу дзякавала. Тут кажа мне адна старая белагаловая, аднаго шаўца маці: «Пані лекарка, наведай майго хворага сына, які ўжо год хварэе на крывавую дызентэрыю і ўжо мае сухоты. Заплачу гэтыя чатыры тынфы за каляску». Я цешылася, што тая белагаловая заплоціць за каляску, і адразу ж паехала з ёй у яе дом, да яе хворага сына. Толькі я да таго шаўца-грэка зайшла, як ён стаў мовіць па-турэцку: «Я ведаю добра, што мяне гэтая пані лекарка з дапамогаю Пана Бога добра вылечыць, толькі ж вы не хочаце даць ёй цяпер грошы ў рукі, бо баіцеся: грошы возьме, а мяне не вылечыць. Пані лекарка таксама баіцца, што свае грошы на мяне, хворага, выдаткуе, а я ёй, можа, не заплачу. Дык вось гэтае ваша скнарства давяло мяне да такога стану, бо і іншыя лекары ўжо даўно б мяне вылечылі ад гэтае хваробы, калі б ім наперад заплацілі». Адказалі маці і жонка гэтага пацыента: «Рабі што хочаш». Так ім мовіў хворы: «Дайце мне тую скрынку; там у мяне ў хусцінцы сто леваў, гэта значыць чатырыста тынфаў, усе парамі, бо ў тынфе 10 пар». І гэтыя грошы хацеў мне аддаць, а я па-турэцку ўжо ўмела і разумела, што кажа, хоць размаўляла з людзьмі з дапамогаю свайго лёкая Юзафа Крыміля, бо стары быў у мяне за тлумача; дык я так яму адказваю: «Дай мне цяпер сто леваў на лекарскія выдаткі, тады вазьмуся лячыць цябе, а як вылечу, дасі мне бакшыш, гэта значыць падарунак». Хворы шавец адразу з хусцінкаю разам аддаў, не лічачы, тыя сто леваў, запэўніваючы, што там акурат столькі.

Узяла я тыя грошы, і прыехала дахаты, і прасіла Пана Бога дапамагчы таму хвораму, і так думала сама сабе: «Калі вылечу, слава Богу, а калі не вылечу, грошы трэба будзе аддаць, але сёння выратую сябе ад нястачы, а пасля Пан Бог дапаможа мне, тады

і аддам». І вось дзеля Пана Бога ўзялася яго лячыць. Чым і як яго лячыла — тут не варта гаварыць. Дасць Пан Бог, ужо маю напісаную лекарскую кнігу[55] і надрукую яе, там будзе апісана яго лячэнне. Праз сорак дзён па волі Божай ачуняў ён ад свае хваробы, а я атрымала шмат падарункаў, колькі можа даць бедны чалавек, і мой лёкай Юзаф Крыміль меў боты і чаравікі на свае патрэбы. І такую мне той бедны чалавек учыніў вялікую эстымацыю, што мела я шмат прыстойных і карысных пацыентаў.





ШТО Я МЕЛА АД СЛЯПЫХ ПА ВОЛІ БОЖАЕ

Тут у Адрыянопалі быў стары турак, сляпы ўжо больш за дзесяць гадоў. Ён дамовіўся са мною за дзвесце тынфаў з той умовою, каб мог сам толькі хадзіць і есці. Займаўся ён тым, што цыбукі рабіў, а рабіць турэцкія цыбукі — гэта далікатнае рамяство. Яны надта доўгія і тонкія, рознакаляровыя, і ён гэтым сваім рамяслом зноў заняўся, зноў так далікатна лакіраваў, нібыта меў гадоў дваццаць. Гэты сляпы турак, што так добра ў мяне вылечыўся, учыніў мне вялікую эстымацыю ў сляпых людзей.

Таксама ў Адрыянопалі быў адзін чалавек, які зваўся хаджы[56] Маргарыт. Клікалі яго так таму, бо ён хадзіў на багамолле ў Ерусалім. І гэты чалавек меў замужнюю дачку, сляпую больш за дзесяць гадоў, і яна была з ім, з бацькам сваім, на разнастайных фэстах. Распавядала мне, што была там, ля тых дубоў, дзе святы Абрам сядзеў некалі і Святая Тройца наведала яго. І была ў Ерусаліме ля Труны Божае ў час Ушэсця Божага, але ад слепаты не магла быць у ерусалімскім касцёле з прычыны вялікага натоўпу лю-

дзей. Дык вось яе вывелі на галерэю і пасадзілі ў адным з кутоў, і там яна задрамала. І бачыла такі сон, што Прачыстая Маці прыйшла да яе і нейкую белагаловую, узяўшы за руку, прывяла і так мовіла: «Едзь дзеля Бога дадому. Гэтая белагаловая, якую бачыш ля мяне, прыйдзе ў свой час у Адрыянопаль і вылечыць твае вочы». І вось гэтая белагаловая, якую звалі Анастасія, дачка хаджы Маргарыта, што спала ў Ерусаліме на касцельнай галерэі, была суцешана тым сном і абяцаннем Прачыстае Маці, што будзе бачыць, і вярнулася дадому ў Адрыянопаль.

Пасля гэтага сну гадоў праз пяць я прыехала ў Адрыянопаль і дамовілася з яе мужам і бацькам за пяцьсот леваў, гэта значыць за 2500 тынфаў, каб тую сляпую белагаловую Анастасію вылечыла. І так яе вылечыла шчасліва, што яна золатам вышываць магла. Дык вось калі ўпершыню яна пачала бачыць, далі ёй у рукі абраз Святое Панны Марыі, і яна з вялікай пашанаю пацалавала яго, а пасля ўзняла вочы на мяне і з вялікай радасцю вымавіла: «Ойча мой мілы!» — і мужу — «Памятаеце мой сон, які я бачыла ў Ерусаліме, калі Прачыстая Маці прывяла да мяне нейкую белагаловую, запэўніваючы, што тая мне вочы адкрые і вылечыць? Вось і бачу я твар і постаць, нават вопратку і строй яе». За што мы ўсе Пану Богу дзякавалі.





ГАБРАЙ-КУПЕЦ У АДРЫЯНОПАЛІ

Жыў нейкі габрай у Біліградзе[57] і меў надзвычай прыгожага, вучонага сына, прытым быў вялікі багатыр. Сына, якога звалі Леві, бацька ў гадоў дваццаць ажаніў з адной дзяўчынаю-габрайкаю, а пасля праз колькі месяцаў па вяселлі адаслалі гэтага беднага Леві ў Відынь[58] на вучобу. Ён у Відыні забавіўся каля года. Ягоная жонка з нуды па мужу памерла. Даведаўся Леві, што яго жонка памерла, таксама цяжка захварэў. Бацькі забралі яго з Відыня назад у Біліград. Леві дзень і ноч бяжыць на магілу да жонкі. Яны бачаць, што сын іх вар'яцее пасля жончынае смерці ад гарачага пачуцця. Бяруць яны свайго сына і едуць з ім у Адрыянопаль і гвалтам жэняць, але ён да гэтай другой жонкі і пальцам не дакрануўся.

У той час была я ў Адрыянопалі, прасілі яны ў мяне парады, а гэтую гісторыю распавядаў мне сам Леві, з чаго ён мае такую апрахензію [59] сэрца і безупынную млоснасць, трымценне рук і ўсіх органаў ды бяссонне. І я, што магла і разумела ў падмацавальных сродках і лекавым пітве, усё ўжывала дзеля яго лекавання; не менш 1000 леваў на лекі ён выдаткаваў, пасыла-

ючы ў стамбульскія аптэкі з маімі рэцэптамі. Бачыў Бог і сам Леві, як я клапацілася пра ягонае здароўе, бо мне самой шкада было яго, а быў ён праўдзівы, і пры тым мовіў мне: «Калі б я быў здаровы, дык забраў бы свае грошы (якіх меў 5000 кес) і стаў бы хрысціянінам, пабудаваў бы касцёл і кляштар, каб без жонкі на свеце жыць».

Але ж наш добры Леві з кожным днём слабеў, і вось аднойчы ён запрасіў да сябе двух прыстойных туркаў і мяне, адлічыў мне пяцьсот леваў і тканіны са свае крамы на дзве пары сукенак і мовіў: «Слабею ад кары Пана Бога, але баюся, што пасля мае смерці не захочуць мае бацькі заплаціць за тваю працу і клопаты пра маё здароўе». І заплаціў за мяне сто леваў, якія была я вінна ў Стамбуле вышэй памянёнаму друкару, і распіску маю аддаў мне ў рукі, а мяне прасіў, каб рэшту даравала яму на Страшным Судзе Божым[60]. Назаўтра ён памёр. Бог ведае, дзе ягоная душа. Відаць, духам ён быў ахрышчаны, зямля яму пухам, аман.

І вось з ласкі Божае зарабіўшы колькі тысяч, я выехала з Адрыянопаля, а пасля паехала ў Ямбул[61]. Ямбул — гэта горад, дзе жывуць султаны, гэта значыць сыны татарскага хана. І быў адзін султан, які зваўся Алімгірэй, і меў ён хворую жонку і сына хворага. Гэты султан прыслаў па мяне каляску і дзесяць татар канвою; прывезлі мяне ў Ямбул, і вылечыла я жонку і сына Алімгірэй султана, і даў ён мне тысячу леваў, чэркескую сукенку, невялічкую каляску, коней і адвёз мяне ў Татар-Пазарджык[62].

У Татар-Пазарджыку лячыла я жонку нейкага Ібрагіма-эфендзі[63]. Той Ібрагім-эфендзі мае ў сваім уладанні ўсе плантацыі рысу[64], што толькі ёсць ва Урумелі[65], і ён мне добра заплаціў і адвёз мяне ў Філіпбей[66].

У Філіпбеі (гэта Македонія) нарадзіўся Аляксандр Македонскі, а горад таму завецца Філіпбей, што бацька Аляксандра Македонскага зваўся Філіп, і ў гонар яго названы горад. Горад стаіць на рэчцы Мерыч[67], і ў гэтым горадзе камендант называецца назыр[68]. Дзе называецца паша[69], альбо янычар-ага, альбо хасекі[70], альбо бастанджы-паша [71], альбо муселім[72], альбо ваявода, альбо супаша[73], а ў Філіпбеі — назыр, вялікі пан, які меў сем сыноў і дачку. І вось ад кары Пана Бога ўсе ягоныя сыны заўчаснаю смерцю паўміралі. Адзін упаў з каня і зламаў карак, другі з акна выпаў, трэці сярод трыццаці чухадараў, *alias*[74] лёкаяў, з чаўна ў рэчку Мерыч упаў і патануў, чацвёртага сабакі маленькага разарвалі, шосты[75] згарэў у калысцы без усялякае шкоды ў доме, сёмага сам бацька незнарок застрэліў. Засталася толькі адна дачушка гадоў на сем, але хваравітая, і быццам бы на глісты. Назырава жонка вельмі прасіла ў мяне лекаў для дачушкі, але бацька дзіцяці, назыр, не хацеў дазваляць лячыць сваю дачушку. Аднак маці вельмі хацела яе лячыць. Я ж, не маючы нічога лепшага, як *elixir proprietatis*[76], а гэта вельмі кепскія лекі, але на глісты добрыя, наліла ў малую пляшачку і дала таму дзіцяці з каваю колькі кропель выпіць. А праз дзве гадзіны гэтае апошняе дзіця памерла, ад чаго я мела вялікі смутак і страх, але не магла нічога іншага прыдумаць, як прыйшоўшы на выклік назыра ў ягоны палац і, дзякуй Богу, маючы таго эліксіру палову лыжачкі, выпіла яго ў прысутнасці назыра. Гэты турак, раззлаваўшыся на сваю жонку за здарэнне з гэтымі лекамі, выхапіў шаблю і хацеў яе забіць. А я яго супакоіла, і ён мне з ласкі Пана Бога і слова кепскага не сказаў.



ПАДАРОЖЖА З ФІЛІПБЕЯ Ў САФІЮ

Ехаць дарогаю праз высокія горы з Філіпбея ў Сафію ніякім чынам нельга з возам, толькі верхам, дык я купіла сабе каня за 400 тынфаў, справіла сабе турэцкую мужчынскую вопратку і наняла дзесяць коней, каб перавезці мае рэчы і для лёкаяў, а яшчэ знайшлі мы 30 вершнікаў, якія з намі ў гурце паехалі ў Сафію. І вось на той дарозе, што завецца Балканы, нечакана нападае на нас адзін разбойнік, бярэ майго каня за цуглі і кажа: «Кланяюся, пані лекарка, куды едзеш з маленькаю дачушкаю і з набыткам сваім?» Я яму: «Я не лекарка, я мужчына, еду па панскіх справах». Ён мне: «Ведаю цябе добра, ты — пані лекарка, і чаму канвою не маеш?» Я здагадалася, што гэта славуты разбойнік Сары Гусейн-ага, бо я пра яго шмат разоў чула, што ён адзін і на сто мужоў выходзіць адважна. І так я яму аказала: «Мілы пане, аднак, мяне не стане, і калі б наняла і 500 канвойных, бо я чула пра годнага кавалера Сары Гусейна-агу. Яго не стрымае ніякі канвой, а два-тры чалавекі, што з іх?» Тут турак засмяяўся і кажа: «Я той разбойнік, Сары Гусейн-ага, проша, вашамосць пані,

са мною разам у дом мой, я ж маю жонку і дзяцей, сыноў і дачок і жыву ў горадзе Карлаве[77]». Я ж прашу яго: «Пане мілы, не разлучай мяне з маёй кампаніяй», але ён мне абяцае і прысягае, што забірае мяне толькі дзеля таго, каб пазнаёміць са сваёй жонкаю і добрымі прыяцелямі.

І вось разлучыў ён мяне з маімі падарожнымі, таварышамі, толькі мяне, і дачушку маю, і трох чалавек, якіх я сабе прыняла — Лео Астаповіча, Лукаша Дабравольскага, і хлопца, і набытак мой, што мела з ласкі Божае, і 10 коней. Узяўшы ўсё гэта, ён свіснуў, і адразу перад ім з'явіўся другі турак, падобны да яго, бо быў гэта ягоны сын, і так мовіў ён свайму сыну: «Аллаха уманэт», гэта значыць: «Гэтую белагаловую даручаю Богу і твайму пільнаму старанню, каб з гонарам яе разам з ейным набыткам у дом наш прывёў і сваёй маці даручыў, а таксама асобны двор прыстойны з усялякімі выгодамі даў». Воляй-няволяй мусіла я з тым туркам-разбойнікам, сынам Сары Гусейнагі, ехаць да дому ягонага, у горад Карлава. Тры дні і тры ночы ехалі мы праз горы і лясы, без дарогі і сцежкі за тым туркам і двума лёкаямі ягонымі. І так ён нам у дарозе казаў: «Не бойцеся нас, мы вам Богам на дапамогу прысланыя. Мой бацька з кампасіі[78], бярэ вяльможную паню на нейкі час да сябе, бо вас іншыя разбойнікі ў тым лесе пазабівалі б так, як тых 20 вершнікаў[79], што з вамі з Філіпбея выехалі». Так і было, як мы даведаліся, усіх іх забілі, а там былі туркі, грэкі і армяне.

Мы шчасліва дабраліся да Карлава. Карлава — горад у цэнтральнай Балгарыі. Ён месціцца ў такой нізіне, што, калі спускаешся да яго, здаецца, што спускаешся з неба на дол; мы вакол горада разоў колькі сцежкамі аб'ехалі, каб зручней наблізіцца да яго, і ўсе пехатою ішлі да дому Сары Гусейна-агі.



Напад разбойнікаў на дарозе.
Паводле сярэднявечнай гравюры.


І так мовіў сын да маці: «Маці мая, бацька гэтую пані лекарку даручыў Богу і тваім клопатам. Глядзі, каб гэтых гасцей з чужога краю па-чалавечы ў доме тваім прыняла і ўсялякія выгоды стварыла ў ежы, у пітве, ва ўсім, што толькі быць можа для госця». Я Гусейнавай руку пацалавала і з плачам аддалася на яе волю, а Пана Бога шчыра прасіла пра выбаўленне з гэтай няволі.

Былі мы тут прынятыя з ласкі Божае вельмі міла, мелі ўсялякія выгоды ў ежы, у пітве, у спакойным жыцці, бо нам далі *a parte* домік і штодня хадзілі мы ў лазню, і я на свеце столькі крыніц не бачыла, як у Карлаве. Адны воды з гор у горад льюцца струменямі, і ў кожным двары ёсць там млынок і лазня, іншыя воды, што ў лазню ідуць, гарачыя, як мяркую, ці не з гары Этны, з якое заўсёды агонь выскоквае. На адным падворку і халодная, як лёд, і гарачая вада струменіць.

Пасля, праз дзён колькі, прыехаў проста да майго панадворку гаспадар, Сары Гусейн-ага, спешыўся і зайшоў у пакой. Я сама хацела яму боты з ног сцягнуць, але ён ні ў якім разе мне гэтага не дазволіў. Ягоны чалавек разуў яго, і ён сеў на дыване, абапершыся на ўзгалоўе, і пытаўся, як я маюся, ці добра мне, за што яму я шчыра дзякавала, але заўзята з плачам прасіла, каб мяне, нявінную белагаловую, адпусціў і дазволіў ехаць у Сафію. І ён неадкладна паабяцаў і прысягнуў мне, што з гонарам і з эскортам да Сафіі давязе, толькі што цяпер вельмі небяспечна гэта праз нягоднікаў, бо і тых, усю нашу кампанію, разбойнікі пазабівалі. Выказаў мне і тое, што хоча, каб я палячыла бацьку ягонага зяця, які таксама тут у Карлаве жыве і шэсць гадоў на ногі не становіцца, а чалавек ён стары. Другі довад, што ён сам мае слязлівыя вочы, і хацеў бы вылечыць гэтую чырванава-

тасць вачэй. Я з ахвотаю паабяцала яму за сорак дзён вылечыць цалкам, але ён мне сказаў. «Я ні ў якім разе сорак дзён на адным месцы сядзець не магу, бо баюся султана», што заўсёды за ім конны атрад сочыць, каб яго злавіць і пакараць смерцю. Тады я шчыра запытала ў яго: «Мілы пане, бачу такога прыстойнага кавалера, ты даволі багаты і шляхетны, а навошта ж тады ты займаешся разбоем?» Адказвае: «У мяне 300 вершнікаў, якім мушу грошы плаціць». Кажу: «Распусці іх». Адказвае: «Баюся султана». Кажу: «Пакарыся яго мосці султану». Адказвае мне Сары Гусейнага: «Ужо гэтае шчасце я спрабаваў, бо маю добрага прыяцеля сярод султанавых прыдворных». І гэты прыяцель доўга з султанам пра Гусейна размаўляў, і мовіў той прыдворны: «Найяснейшы султан, Сары Гусейн, слынны разбойнік, мой вялікі прыяцель, і я яго запэўню сваім лістом, і сюды ў Стамбул паклічу, і скажу: «Цябе султан хоча пашою прызначыць і з гонарам на пасаду паслаць», а пасля, найяснейшы султан, загадай яго задушыць». А султан з вялікай радасцю адказаў: «Ах, добра, калі можаш, паведамі Гусейну, абяцай яму, што і візірам зраблю, няхай толькі самахоць у Стамбул прыедзе, і загадаю я яго пакараць смерцю». Дык вось, так мой добры прыяцель даведаўся з вуснаў султана, што хоча мяне, Гусейна, пакараць смерцю, бо іначай павінен быў султан мовіць: «Калі Гусейн хоча быць добрым чалавекам і адступіць ад гвалтоўніцтва, я яму ўсю віну дарую і зраблю яго пашою альбо янычар-агою». «Але султан хцівы, хоча мяне, Гусейна, забіць, і вось, папярэджаны я прыяцелем маім, султанавым прыдворным, каб я, Гусейн, быў заўсёды асцярожны з султанам, і таму мушу ўжо і далей такое разбойніцкае жыццё весці дзеля суфіцыенцыі[80] тых 300 чалавек і выратавання майго жыцця».

І вось я дзеля Бога пражыла 60 дзён у Карлаве ў спакоі і вылечыла таго турка Сердана, бацьку, альбо свёкра Гусейнавага сына, што мог на мыліцах паўсюль хадзіць, і зарабіла шэсцьсот леваў у Карлаве, і з гонарам экскартаваў мяне Сары Гусейн-ага дзеля Бога ў Сафію.





Я ПРЫЕХАЛА Ў САФІЮ

У Сафіі застала я вялікага пашу Кюпру-улу[81], бо ў той час турэцкі султан вёў вайну на тры бакі: з персамі ў Бабілоніі, з маскалямі (пад Бабадагіо стаяла войска расійскае)[82], з імператарам Карлам шостым[83] у Нысе[84], калі генерал Зекендорф[85], знянацку з нямецкім войскам увайшоў у Нысу і ўдала захапіў гэтую выдатную фартэцыю з туркамі, з жонкамі, з дзецьмі і з маёмасцю, са зброяю, шмат пораху, куль, армат ці бомб і таксама ўдала захапіў Ныскую правінцыю. А мяне ўзялі да пашы ў гарэм за лекарку. У гарэм — гэта значыць у апартаменты белагаловых, да жонкі і дзяцей Кюпры-улу-пашы. І адразу мне ён прызначыў у год сто леваў пенсіі і тайн[86], гэта значыць хлеб, віно, мяса, рыс, каву, цукар, мёд, свечкі, сена, фураж і іншае, і, дзякуй Богу, добра мне было ў тым двары.

А мой муж, яго мосць пан Гальпір, лекар медыцыны, які ўсё ў мяне забраўшы і ў сваіх добрых прыяцеляў схаваўшы, быў пакінуў мяне кульгавую, не са Стамбула прыехаў у Сафію, а з Салонікаў, з Босніі на мінеральныя воды[87], якія (надзвычай добрыя!) ёсць у Сафіі; Пан Езус так яго пакараў, што рукі і ногі яму пакруціла і ўвесь у больках быў і сам як мог

ратаваў сябе. Нарэшце запрасіў лекара-італьянца, які быў надта дасведчаны, бо быў лекарам на мальтыйскім караблі. Караю Божай быў захоплены той карабель з усімі вайскоўцамі ў няволю турэцкім караблём, і ўсе прывезены ў Стамбул. Тыя нявольнікі, што з мальтыйскіх караблёў трапляюць у турэцкую няволю, ніколі выкупленымі быць не могуць і, пакуль жывыя, мусяць быць у Стамбуле ў няволі. Удзень робяць, што ім загадаюць, а на ноч іх на ланцуг бяруць, і ёсць для іх асобная вязніца, дзе іх сотні і тысячы заставацца мусяць, аж пакуль жывыя. Маюць яны хлеб, прызначаны з султанскае ласкі, і па тынфу на тыдзень пенсіі. Усе іншыя нявольнікі, ці то султанскія, ці то іншых туркаў, жывуць пад наглядам, гэта людзі гонару, умельства, вучонасці, добрых манераў, спакойнай натуры, нават з нявольніка ён можа пашою і нават візірам стаць, часта такое і здаралася, і я сама бачыла. Але ж тыя нявольнікі, што трапляюць з мальтыйскіх караблёў у турэцкую няволю, нават іншае імя маюць, бо іншыя нявольнікі завуцца куле, гэта значыць нявольнік, а мальтыйскі завецца пайзан.

Дык вось, я не ведаю, якім чынам уцёк з султанскае няволі адзін пайзан, вялікі лекар, і пазнаёміўся ў Босніі з маім мужам, яго мосцю панам Якубам Гальпірам. А муж мой быў вельмі хворы, і ім параілі, каб у Сафію паехалі на мінеральныя воды, тут ён лячыў кантрактуры[88] органаў, *alias* рук і ног. Яны выпадкова прыехалі, а пра тое ніхто не ведаў, што я ў Сафіі, у гарэме пашы, гэта значыць сярод фраўцымеру[89]. А я мела асобны домік для выгод сваіх і для дачкі, Канстанцыі Гальпіроўны, і для слуг маіх. Даведаўшыся добра пра маю бытнасць, што я тут у Сафіі, мой муж загадаў сваім людзям несці яго на дыване да мяне. І вось прынеслі яго да мяне, а тут звычай у ту-

рэцкім краі, што ні сталоў, ні зэдляў у хаце няма, толькі на падлозе на дыванах сядзяць, дык мой муж, упаўшы мне ў ногі, ногі мае абняў, а я разгневалася: адкуль гэты пацыент, што мне так дакучае. Аж бедны мой муж жаласным голасам закрычаў: «Белагаловая, Бог з табою» — некалькі разоў, і я ледзь яго пазнала. З барадою, сам такі скалечаны, мізэрны. І вось як адпазнала я мужа, абое мы моцна плакалі, а пасля аддаліся на ласку Божую, пра лячэнне майго мужа падумаць трэба было. А муж мой бачыць, што і без яго ласкі і дапамогі Бог мой і пан мой забяспечыў мяне, бачыць парадак і чысціню ў доме, лёкаяў, коней, каляскі, сукенкі і пры тым пацыентаў і пашану сярод годных людзей. І так я сказала: «Каханы мужу, дарую я табе ўсе крыўды і знявагі, што мяне хворую і бедную і ў даўгах у Стамбуле пакінуў, а цяпер, як змагу, служыць і дапамагчы табе гатовая. Але ж хвароба вашае мосці пана іншых лекаў вымагае, чым маё ўмельства, бо я толькі акулістка і лекарка, як умела, так з дапамогаю Пана Бога людзям дапамагала, а тут *Merkuriusz solwacja*[90], гэтага я яшчэ не практыкавала. Ты ж, аднак, сам лекар добры, і твой цяперашні калега, пайзан, лекар, сам вашая мосць пан клапаціся пра сябе».

А муж мой кажа: «Ні свайго ўмельства, ні пайзана-лекара парадаў не хачу, толькі, прынамсі, як ведаеш і разумееш, лячы мяне». І вось я ад гэтага загаду лячыць свайго мужа была вельмі засмучана, бо першая мая практыка мае быць на маім мужу, дык я даверылася на Святую Тройцу і пачала лячыць майго мужа і, як магла, прасіла пайзана-лекара, каб мяне навучыў таму, чаго я не ведала. З ласкі Божай ён цалкам ачуняў і, пажыўшы колькі тыдняў са мною ў Сафіі, здаровы вярнуўся да пашы свайго ў Боснію, бо мусіў і быў абавязаны, таму што быў раковым[91] лекарам,

па-другое, усю ці палову сваёй маёмасці пакінуў там у пашы.

І вось шчасліва паехаў у Боснію, а мне пакінуў пайзана-лекара, каб мяне навучаў лекарству, і пакінуў мне кнігі лекарскія: *«Concordancia et Mulerisztal»*, *«Minsycht»*, гербарый[92] і іншыя кнігі. А той лекар-пайзан выдатна навучыў мяне рэцэпты, перскрыпцыі на-лаціне пісаць са знакамі лекарскімі і зёлкі, ледзь не ўсе, што ўваходзяць у лекі, на-лаціне, і што можна было з добрых перскрыпцый на размаітыя хваробы даў мне, бо быў ён чалавек добры, хрысціянін-каталік, пасля з пэўнай аказіяй у Стамбул паехаў, а пасля са Стамбула ў Смірну[93], а са Смірны ў Легорны[94] і так шчасліва ў край свой вярнуўся.

Муж мой, яго мосць пан Якуб Гальпір, таксама шчасліва заехаў у Боснію да свайго пашы, але мусіў адтуль у Стамбул ехаць па свае рэчы, а пасля з імі да мяне ў Сафію, але ж воля і наканаванне Пана Бога па-іншаму хацелі. Як прыехаў, заразіўся пошасцю і памёр. І вось дайшла да мяне вестка пра смерць майго мужа. Тут і смутак, жалоба, асірацела я з малым дзіцём, дачкою маёю Канстанцыяй, тут і войны з усіх бакоў, няма каго паслаць па тыя рэчы, што ў Босніі засталіся. А пасля і той паша памёр, каму мой муж служыў, дык і засталася я на сваім месцы ў пашы Кюпру-улу.

Хварэючы ў старасці цэлы год на ліхаманку, той мой паша іншага хлеба не еў, а толькі ячменны, бо казаў, што грэшны чалавек не лепшы за жывёлу і павінен есці ячменны хлеб. Ён ніколі не еў 10 ці 20 страў, хоць вялікі быў пан: напрыклад, сёння булён, а назаўтра смажаніну, а паслязаўтра фрыкасэ[95], гэта значыць, калі еў, дык еў у адзін дзень адну страву, хоць у туркаў няма ніякіх забаронаў. Калі хто хоча, дык шмат жонак мець можа: чатыры шлюб-

ныя, а 99 можа мець купленых нявольніц. Але мой паша Кюпру-улу толькі адну жонку меў і меў з ёю некалькі дзяцей, але яны памерлі, толькі дзве дачкі засталіся. Жонка ягоная, баючыся, каб муж ейны не ажаніўся праз адсутнасць дзяцей з іншаю, паслала з Сафіі ў Стамбул свайго маршалка купіць дзвюх як мага прыгажэйшых дзяўчат. Той купіў па 1000 леваў за кожную. Дык вось жонка пашы сама з імі і са мною разам пайшлі ў лазню і загадала тых дзяўчат чыста вымыць, заплясці, вельмі дарагія сукенкі апрануць і каштоўнасці на іх начапіць; іх абедзвюх убраўшы, яна паслала сваё негрыцяня да пашы, просячы яго, каб прыйшоў. Той быў ласкавы пан, адразу са свайго пакоя ў пакой да жонкі прыйшоў. А жонка, узяўшы яго за руку, пацалавала, кажучы такія словы: «Пане мой і бацька мой, адклікніся на маю просьбу і прымі за дар ад мяне дзвюх нявольніц. Даю іх табе, няхай цябе Пан Бог з імі блаславіць, каб табе сыноў і дачок нарадзілі, бо я, грэшная, не маю шчасця выгадаваць сына на дапамогу табе і імені твайму». І вось гэты добры муж, з увагаю выслухаўшы словы жончыны, падзякаваў ёй і сказаў: «Аднак ты паняй і гаспадыняй заўсёды будзеш у маім доме». І пайшоўшы, хутка прыйшоў і пытаўся: «А дзе мае новыя нарачоныя?» А жонка кажа: «Вось». Ён выхапіў бізун і загадаў мурыну-еўнуху трымаць, а сам, як мог, біў па галаве, па грудзях, дзе папала тых дзяўчат і казаў: «А ці належыць вам у каштоўнасцях хадзіць і ў такіх сукенках ды так бессаромна ўсміхацца мне? Пані ваша ад смутнага сэрца па дзецях вымушана гэта чыніць, але вам, лярвы, належыць на кухні служыць і посуд мыць, а не маімі жонкамі быць». А жонцы кажа: «Як ты наважылася мне такое мовіць, каб я з гэтымі малпамі дзяцей меў? Якіх бы сыноў гэтая лярва нарадзіла і дачок? Крый мяне Божа ад гэтых спа-

кус! Калі мне Пан Бог з табою, мая каханая жонка, не даў сыноў, дык я і ад іншае жонкі не хачу. Мілейшая мне твая чыстая старасць, бо маладосць са мною пралічыла, чым гэтых лярваў бессаромная маладосць». Дзяўчаты распрануліся, пабралі мамусовыя каптаны і пайшлі на кухню.

Тым часам прыйшоў загад ад яго мосці султана са Стамбула, каб мой паша пайшоў з войскам і абавязкова назад забраў у немцаў фартэцыю Ныса, якую захапіў генерал Зекендорф. А той Зекендорф за колькі тыдняў перад гэтым заключыў пакт з балгарамі і сербамі, гэта значыць з воласцю, ці правінцыяй, Ныскай, бо ў гэтай мясцовасці жыхароў было (на пяцьдзесят міляў з гарадамі, і мястэчкамі, і вёскамі) некалькі мільёнаў людзей, багатых, вельмі мужных, маладых, спрытных, як і старых, і белагаловых, і дзяцей. Кожны з нас можа пра гэта меркаваць, гледзячы на прастору ад Біліграда і ледзь не да Сафіі. Гэтыя ўсе воласці падняліся на туркаў, бо той генерал Зекендорф так мовіў тым нявінным людзям: «Не бойцеся туркаў, дапамагайце мне. Я ўжо Нысу ўзяў, вазьму я Сафію і Відынь турэцкі[96], нават і Стамбул». І вось гэтыя бедныя хрысціяне паверылі генералу Зекендорфу, узбунтаваліся супраць туркаў і выразалі іх некалькі тысяч, а той генерал, узяўшы ад аднаго пашы 10 000 чырвоных злотых, без усялякіх прычын загадаў падняць трывогу, ціха выйшаў са сваімі немцамі з Нысы і накіраваўся ў Нямеччыну, а ключы Ныскае фартэцыі адаслаў майму пашы Кюпрулу. А мой паша быў хворы, дык ключы Ныскае фартэцыі яму пад падушку паклалі.

Тым часам зноў прыйшоў новы загад ад турэцкага султана, каб за той мяцеж, што яго падданыя паднялі на свайго пана, туркі іх таксама тры дні і тры ночы забівалі, пачынаючы ад васемнаццацігадовага

хлопца да пяцідзесяцігадовага мужчыны. А тых, каму 60, альбо 70, альбо 80 гадоў, не рушылі, таксама як і хлопцаў ад года да 18-ці не чапалі, толькі ў няволю бралі і жонак, і дзяўчат, і ўсіх кабет старых. І так сталася, што туркі забівалі хрысціян тры дні і тры ночы ў палях, у лясах, у хатах, дзе толькі знаходзілі. І мой паша меў такі загад ад турэцкага султана, што той хоча бачыць, колькі яго падданых у гэтай крывавай вайне загіне, і таму загадаў мой паша туркам толькі галовы хрысціянскія звозіць у Сафію для падліку, колькі забіта, і турэцкаму султану пра гэта даць рэспонс. І бачыла я кару Пана Бога на бедных хрысціян, бо такая была гара галоў хрысціянскіх, быццам велізарная карчма. Наверх па тых галовах лезці — патрэбны былі драбіны, бо за кожную хрысціянскую галаву даў паша адзін чырвоны злоты. Дык туркі па палях і лясах ездзілі з вялікімі кашамі і галовы ўжо забітых хрысціянаў адрэзвалі і ў Сафію прывозілі, а тут пасля тых трох дзён старым людзям і малым дзецям можна было шукаць бацькоў і братоў сваіх, як і бацькам можна было шукаць галовы сыноў сваіх. Ах, мой Божа, колькі я ў той час жалю і страху мела, калі была ў тым горадзе, аднак ні ў мяне, ні ў людзей маіх і волас з галавы не ўпаў, і слова кепскага не чулі мы ад туркаў.

Быў там чалавек адзін шаноўны, святар праваслаўны, *alias* епіскап, бо яго праваслаўныя ўладыкаю звалі, і яго ў той мітусні павесілі. А пра іншае, што бачыла, чула, не кажу, толькі тое паведамлю: адчула вялікую агіду да пашы, што загадаў уладыку павесіць. Гэта вельмі маё сэрца засмуціла, і я развіталася з яго мосцю пашою. Узяўшы ардынанс, я паехала ў турэцкі Відынь.

Шчасліва даехала я верхам, апрануўшыся памужчынску, як турак-янычар, і спынілася ў хане[97],



*План горада Відзіна
і выгляд аўстрыйскага лагера пад ім.
Фрагмент гравюры
сярэдзіны XVIII ст.*

гэта значыць у аўстэрыі, і хацела сабе дом наняць, але цяжка было, хоць бы ты 100 чырвоных злотых на месяц даў за домік, дык усё роўна нельга было знайсці. Дык была вельмі маркотная, бо белагаловай цяжка адной жыць у хане, бо тут не знойдзеш пакоя. Гэта было таму, што стаяла тут вялікае войска турэцкае, яны па сто чалавек хрысціян зганялі ў кожны дом, а ў дамы хрысціянскія сяліліся туркі, бо было гэта зімою, а простыя янычары, *alias* вайскоўцы пад шатрамі ў полі каля Відыня стаялі, бо генерал

Дамніц[98], прывёў пад Відынь турэцкі свае рэгіменты[99], прагнучы ўзяць рэванш, што Зекендорф схібіў, тое генерал Дамніц хацеў паправіць. Пад Краёвай[100] з-за кары Божае не ўдалася яму бітва, бо ледзь сам з некалькімі штабнымі афіцэрамі выратаваўся, а астатніх немцаў туркі на полі бою пазабівалі, а некаторых у палон узялі. Я бачыла 200 нямецкіх афіцэраў і гэмайнаў[101] адным ланцугом за шыі акаваных, якіх вялі праз Відынь.

Звычай кепскі ёсць у асобных народаў, што і жонкі, і дзеці ідуць на вайну, і вось усе гуртам — жонкі і дзеці — трапляюць у палон, і бачыла я ці мала ў кожным доме нявольніка, альбо нявольніцу, альбо дзіця ў няволі турэцкай. І захапілі ў той час Біліград, Будым[102], Краёву і шмат без ліку гарадоў і вёсак нямецкіх і венгерскіх, што і цяпер туркам належаць.

Пасля заканчэння той вайны пасябравала я з адным туркам, палкоўнікам, які паехаў на вайну, *alias* у наезд, па-турэцку завецца гэта чэта, а мне аддаў той палкоўнік свой пакой, поўны легуміны[103], свечак, дроў, усяго, што патрэбна, і чатырох нявольнікаў ягоных, каб мне служылі. У гэтым памяшканні мела я спакой і добрых пацыентаў. Пазнаўшыся з людзьмі, пазнаёмілася я з адным шаноўным туркам, якога звалі Мехмет-ага Кулулу. Ён купіў з тых нямецкіх нявольнікаў 30 афіцэраў і афіцэршаў і мне таксама раіў, каб і я купіла колькі нявольнікаў нямецкіх, афіцэраў, бо мела б з гэтага сабе выгаду, і славу ў людзей, і ласку ў Бога. Доўга мяне не трэба было перадконваць, і я набыла ў аднаго турка пяць асоб: чатырох мужчын і адну даму. Імёны мужчын: Караль Яравіна, Тэадор Котнер, Антоні Ермянціні. Гэтыя трое былі афіцэрамі, паручнікамі. Чацвёрты быў харунжы, зваўся ён Юзаф Фартунат дэ Пільштын, і адна дама паручнікава. За гэтых чатырох мужчын і

адну даму мусіла даць восемсот чырвоных злотых. Заплаціла і ўзяла сваіх нявольнікаў да сябе. Дала ім асобны пакой, забяспечвала іх ежаю, пітвом, адзеннем. А той турак Кулулу, што меў 30 нявольнікаў-немцаў, атрымаў у відынскага пашы Гайваз Мехмета ардынанс сабе і мне, каб можна было нашым нявольнікам у Нямеччыну лісты пісаць, паведамляючы пра сябе, што, дзякуй Богу, цэлыя засталіся ў той крывавай вайне, адно што трапілі ў няволю турэцкую і просяць грошы на выкуп. Бо гэтыя немцы, якіх у Кулулу было 30, а ў мяне пяцёра, былі ўсе афіцэры годныя, багатыя, адны мелі бацькоў, іншыя братоў, сясцёр, сваякоў, маёнткі. Тыя 30 мужчын, што былі ў Кулулу, старгаваліся за кожнага асобна па дзвесце пяцьдзесят чырвоных злотых, а я за сваіх пяць асоб дала 800 чырвоных злотых. І мы старгаваліся, каб мне яны, мае нявольнікі, далі 1200 чырвоных злотых і падарункаў на 300 чырвоных злотых. Быў пасланы кур'ер з лістамі з турэцкага Відыня аж у імператарскую Вену ў Аўстрыі. Дык вось адразу грошы турку Мехмету-агу Кулулу прыслалі на мяжу правільна, а мне за маіх нявольнікаў 900 чырвоных злотых і падарункі: сукна, тры пары парыжскіх пісталетаў і шмат іншае галантарэі. Тады я кажу нявольнікам маім: «Аднак жа, панове мае, мы старгаваліся за 1200 чырвоных злотых, а чаму ж толькі 900 чырвоных злотых даяце?» Растлумачылі мне, што «адзін наш афіцэр, Юзаф Фартунат дэ Пільштын, жыве далёка ад Вены, мусіць пошта ісці праз Грац, Штаермарк, Ніжнюю Карніёлію, Верхнюю Карніёлію да Лайбаху[104], да мястэчка Бігільштэйн, адкуль імя мае Пільштын. Там жывуць гэтага ягамосця бацькі, але лісты ягоныя так хутка не дайшлі, таму за ягомосць пана Юзафа Фартуната дэ Пільштын грошай няма». Адказваю я: «Калі грошай няма, дык ваша-

мосці з Богам едзьце ў свой край, а яго мосць пан Юзаф дэ Пільштын можа мне паслужыць у кампаніі, а вы, вашамосці, старайцеся, каб за яго дайшлі мне 300 чырвоных злотых, тады я ягамосця звольню ад паслуг мне».

Тыя афіцэры, што былі ў турка Кулулу і ў мяне, усе паехалі з канвоем да нямецкай мяжы, і там наш вікіл, гэта значыць пасол, атрымаў на мяжы грошы, а іх мосці паноў афіцэраў адпусціў у Нямеччыну, а грошы нам аддаў: турку Кулулу з падарункамі 10 000 чырвоных злотых, а мне 900 чырвоных злотых і падарункі, а яго мосць пан Юзаф дэ Пільштын застаўся ў мяне ў турэцкім Відыні над Дунаем да часу, пакуль мне за гэтага ягамосця, пана Пільштына, грошы ад бацькоў на выкуп не прыйдуць. А ён быў чалавек разумны, добрай адукацыі, вучыўся ў школах рымскіх, легорскіх, венскіх і меў дыплом з пячаткамі. Цвярозым, паслухмяным, ціхім і пабожным здаўся ён мне.





КНЯЗЬ РАКАЦЫ

Тым часам прыехаў сюды ў Відынь князь Юзаф Ракацы[105], каралевіч угорскі, князь трансільванскі, які быў раней у хрысціянскай Вене ў палоне ў імператара Карла шостага. Бацька ягоны, князь Ракацы, быў выгнаны імператарам з Венгрыі ў Турцыю з каралеваю сваёй і жыў да канца свайго жыцця ў Тэкірдагі ля Чорнага мора[106], атрымліваў вялікую пенсію ад турэцкага султана сабе і графу Чакі[107], якога я добра ведала, а таксама баронам, капітанам і іншым са свайго двара. Родны брат графа Чакі быў кардыналам у Рыме, і дагэтуль шмат венграў у Тэкердагі, а па-грэцку — Радос, атрымліваюць пенсіі ад цяперашняга султана Мустафы[108].

І вось гэты светлы князь Ракацы, каралевіч угорскі, прыехаў з імператарскае Вены ў Відынь турэцкі толькі з адным чалавекам, хворы, бо мусіў уцякаць ад хрысціянскага імператара, з няволі. А брат ягоны родны, Аляксандр Ракацы, і цяпер у Парыжы. Юзаф Ракацы ўцёк да турак, прагнучы дапамогі ад турэцкага султана, каб вярнуць каралеўства свайго бацькі, Венгрыю і Трансільванію. Хрысціянскі імператар Карл шосты загадаў другога брата Аляксандра Ра-

кацы аскапіць, і ў Парыж быў адасланы той яснавяльможны князь Аляксандр Ракацы, каралевіч угорскі.

А ў Відыні турэцкім застаўся князь Юзаф Ракацы, старэйшы брат, які меў гадоў 29, і, уцёкшы ад імператара Карла, як я казала, нязнатны шляхціц і хворы, кашляў, харкаючы крывёю, змучаны дарогаю і страхам, спыніўся такі хворы ў адной хане, гэта значыць аўстэрыі. А вялікі паша, учтурлу-паша, што азначае — судовы паша, якога звалі Гайваз Мехмет-паша, у той час быў у Відыні турэцкім. Ён паклапаціўся пра князя Ракацы, паклікаў мяне да сябе, даў мне адразу чатырыста тынфаў і прасіў мяне, каб лячыла князя Ракацы. Дык я паехала на сваёй калясцы да каралевіча ўгорскага і бачыла ягоную слабасць і ўбоства; з дапамогаю тлумача заўсёды мы з ім размаўлялі, бо быў ён вялікай навукі і хрысціянскай набожнасці, быў прававерны католік рымскі. І вось я добра вылечыла яго за 30 дзён.

Пасля Гайваз Мехмет-паша паслаў кур'ера адмысловага да найяснейшага яго мосці султана паведаміць, што каралевіч угорскі ўцёк у ягоны край і шукае ў яго пратэкцыі і дапамогі. Дык турэцкі султан прыслаў таму найяснейшаму Юзафу Ракацы, каралевічу ўгорскаму, князю трансільванскаму, адразу тры тысячы кес грошай. Шматлікіх колераў бачыла я ў свеце аксаміт: кармазынавы[109], зялёны, жоўты, чорны, блакітны, пунсовы, фіялетавы, вішнёвы, гранатавы; амарантавы[110] — такія апранахі меў каралевіч Ракацы, з залатымі галунамі і дыяментавымі аплікамі кожнае сподняе, капялюшы, угорскія шапкі, сабаліныя футры пад плашчы і вопратку, сабаліныя шапкі ўгорскія, упрыгожаныя дыяментамі, табакеркі, таксама рознага колеру аксаміт з залатымі галунамі і махрою, і абіўка з аксаміту разнастайных колераў, пакоі абабітыя таксама залатымі і срэбнымі галунамі,


каляскі, цугі, выдатныя коні, шоры срэбраныя, пазалочаныя і паўсрэбраныя на ядвабных тасьмах, верхавыя коні, сёдлы, збруя залатая з каштоўнасцямі, людзі са стравусавымі пёрамі, а пёры дыяментамі аздобленыя. Такіх меў людзей ён дваццаць чатыры і надзвычай шмат галантарэі, гадзіннікаў, табакерак, кніг і ксяндза-капелана. І ўсе тыя венгры, што былі ў Тэкірдагі, лёкаі ягонага бацькі і яснавяльможны граф Чакі, ды іншыя бароны і капітаны да яго прыехалі, і асобная пенсія і тайн ішлі на яго са скарбу турэцкага султана, і так стаў ён з ласкі Пана Бога і з ласкі султанскае значным каралевічам угорскім. І даў яму султан турэцкі сто тысяч янычараў для захопу ўгорскае зямлі і трансільванскае, дык мой пацыент, светлы і найяснейшы каралевіч угорскі, цалкам быў задаволены.

А як прыйшоў да спакойнага жыцця і спрыяльных вынікаў, светлы князь ужо інакшы стаў, ужо ранейшае набажэнства і ўслаўленне хрысціянскай веры забыў пры такім добрым жыцці і значных дастатках, ужо пакрысе пачаў з дарогі і ад праўды адыходзіць, гэта, маўляў, непатрэбныя свавольствы, дзе і мне асобныя непатрэбныя і бессаромныя словы дасталіся пры размаітых абяцаннях — звычайна як і свет хлуслівы абяцае. Я ж найяснейшаму каралевічу адказвала: «Не роўня я вашай каралеўскай мосці, Ваша каралеўская мосць — манарх, а я бедная белагаловая лекарка. Ведаю, што са мною шлюбу не возьмеш, а калі і возьмеш, дык толькі дзеля абразы Божае, а пасля маладосць маю, і нявіннасць маю, і сорам мой прыродны ў ганьбу мне павернеш і фурману альбо лёкаю свайму ў жонкі аддасі. О, не дай Божа, найяснейшы каралевічу, мне такога розуму і бессаромнасці насупраць Бога і свету. Я даволі багатая, калі жыву па-хрысціянску, маю што есці, што

піць, у чым хадзіць, у чым паехаць і грошы на патрэбу з ласкі Божае. Вока паўсюль бачыць, ніхто дакараць не можа ні ў чым мяне, я маладая белагаловая, дасць мне Бог яшчэ і мужа пры пачцівым хрысціянскім жыцці, а Ваша каралеўская мосць адступі ад таго намеру ў гэтым чужым краі і чужой веры». Але дарэмна пагражаў мне, што пашле да пашы, просячы маёй рукі, дамагаючыся мяне, быццам я не полька, а ўгорка. Я сказала: «А як жа то быць можа, каб Ваша каралеўская мосць казаў на мяне, што я ўгорка, а я полька. Не абавязана служыць і не падданая Вашае княжацкае мосці». Адказаў мне яго мосць князь: «Найяснейшы султан турэцкі даў мне столькі дабра, а праз цябе аднае белагаловае, полькі, не захоча Ракацы пазбаўляць свае павагі».

І так я зразумела, што мне цяжка будзе далей пярэчыць яму, гэтаму заўзятаму чалавеку. Найлепей мне ціха з Відыня турэцкага выехаць і пазбыцца гэтага непатрэбнага амарата. Дык пацiху наняла невялічкі карабель і паехала ў Рушчук[111] Дунаем. Але ж не магла распавядаць пра тое, што еду, да таго ж не была ў пашы і не ўзяла пашпарта ад страху, каб князь Ракацы не даведаўся пра мяне і не перашкодзіў у гэтай вандроўцы.





ПАДАРОЖЖА І ПРЫГОДЫ Ў РУШЧУКУ

З імем Пана Езуса Хрыстуса ўкрыжаванага еду я Дунаем у чаўне ў Рушчук. Але ўсё ж даведаўся пра мой выезд князь яго мосць Ракацы і адразу паслаў свайго тлумача да Гайваз Мехмет-пашы, абгаворваючы мяне, што я шпег. А ў той час крывавыя войны былі, і шмат зусім нявінных людзей загадаў паша пакараць лютай смерцю за шпегаўства. Дык адразу ж адправіў ардынанс Гайваз Мехмет-паша, каб за мной паслалі пагоню і калі мяне нагоняць, дык вярнуць назад у Відынь турэцкі і аддаць мяне ў рукі светлага князя яго мосці Ракацы. А было так. Выправіў князь пагоню за мною Дунаем, двух туркаў, і яны мяне дагналі, але я ў той час спала. І пыталіся тыя туркі: «Ці плыве ў гэтым караблі пані лекарка?» А лёкаі мае, бачачы, што я сплю, такі адказ далі: «Няма тут пані лекаркі». Дык гэтая пагоня проста паехала ў Рушчук, і чакалі мяне там, бо дакладныя весткі атрымалі яшчэ ў Відыні, што я проста з Відыня да Рушчука наняла карабель, і як я толькі ў Рушчуку да берага прыплыла, адразу ж варта турэцкая з сопамі, бо тут варта не з флінтамі,

а з вялікімі кіямі ходзіць, калі каго пад арышт бяруць, і так цяпер мяне яны прывіталі: «Так гэта, пані лекарка, ты ў нашым краі жывеш, і добра табе жывецца, ад нас і слова кепскага не чула, маеш пашану і рэпутацыю ў нашых паноў, а на самой справе ты наш вораг, шпег, і праз цябе так шмат крыві пралілося». Хоць я і тлумачыла, але нічога не дапамагло, і мяне завялі пад вартаю да арышту. А тут, у Турцыі, звычай такі: каго пад арышт возьмуць, дык яго адразу ж назаўтра пакараюць смерцю. Разлучылі мяне з дачушкай маёй, Канстанцыяю Гальпіроўнаю, і з нявольнікам маім, яго мосцю Юзафам Фартунатам дэ Пільштын, з лёкаямі маімі, з набыткам маім, з аптэкаю, кнігамі ды іншым.

Значыць, пад арыштам я была ў аднаго жанатага чалавека, турка, у хаце, дык яны мяне цэлую ноч намаўлялі і плакалі нада мною, каб жыццё сваё ратавала ў маладым веку і каб стала турчанкаю, але Бог мой і Пан мой падмацавалі сэрца, і душу, і розум мой, што мне лягчэй было памерці нявіннаю, чым стаць турчанкаю. Адказала: «Згаджаюся з воляю Божаю. Пан Бог бачыць, што я нявінная».

Тут зазнала дапамогу і цуд Бога, Творцы неба і зямлі, бо ў гэтым горадзе быў адзін турак са Стамбула, вялікі пан. Ён быў дзяржаўны падскарбій. І ў тую ноч, калі я была арыштавана, ягоны сын, малады чалавек 22 гадоў, лёг спаць здаровы, а ў поўнач прачнуўся, аж галава, і вочы ягоныя, і твар увесь так паапухлі, і язык на пяць пальцаў з рота вывернула, і нічога ён не бачыць, не чуе, не кажа і прытомнасць страціў. Былі ў гэтым горадзе тры добрыя лекары, і паклікалі іх да гэтага пацыента, але ніхто не ўзяўся лячыць. І вось нехта пра мяне бацьку гэтага пацыента, якога звалі Мехмет-ага эстэрэдзы-паша (дзяржаўны падскарбій), так сказаў: «Ёсць адна доб-




Выгляд горада Відзіна.

рая лекарка, яна прыехала з Відыня ў Рушчук, але на яе, небараку, нападаюць, узята яна пад арышт, і заўтра пакараюць яе смерцю. Калі б гэта можна было, калі б яе на нейкі час вызвалілі, калі б пабачыла сына яснавяльможнага пана». Стары эстэрэдзы-паша сказаў: «Каб хутчэй Пан Бог дзень даў, каб хутчэй убачыць мне тую арыштантку-лекарку!» І вось Пан Бог дзень даў, аж тут параконная каляска прыехала да таго дома, дзе я сядзела пад арыштам, пастукалі ў браму і запыталіся пра мяне. О, мой Божа, як жа я ў той час спалохалася! Не было моцы на ногі стаць, бо я думала, што мяне, адразу вывеўшы, пакараюць. Але хочаш не хочаш, а мусіла выйсці за браму. Аж бачу параконную каляску і двух чалавек. Адразу ж з пакораю пытаюся ў іх: «Сябры мае мілыя, а куды вы мяне павезяце?» Кажуць: «Да эстэрэдзы-пашы». Пытаю: «Навошта?» Адказваюць: «Не ведаем».

Прывезлі мяне да таго палаца яшчэ да ўзыходу сонца, спынілася я на сходах, аж мяне два чухадары

пад рукі наверх вядуць. Вельмі мне гэта не падабаецца. Я ў страху, няшчасці, а навошта мне гэтая пыха? Прыйшлі ў вялікую залу. Я бачу: сядзіць адзін стары турак у сабаліным футры, на адно вока сляпы, вітае мяне ўсё-такі па-чалавечы і адразу пытаецца, як гэта здарылася, што я ў такую вялікую бяду і небяспеку трапіла. І імем Бога прасіў, каб я яму казала праўду, а яшчэ мовіў гэты турак: «Калі за доўг, дык бір бін эдэрым (гэта значыць за кожны злоты тысячу злотых дам), а не дапушчу, каб і волас з галавы твае ўпаў. Буду апекавацца над тваім сіроцтвам у чужым краі, але што датычыць шпегаўства, не дапамагу, бо гэта тычыцца самога султана і ўсёй Турцыі». Плачучы, я так адказваю: «Міласцівы пане, не вер таму, што я магу быць шпегам у такім маладым веку ды яшчэ ў белагаловым стане. Наша ж Карона Польская мае вечны мір з туркамі[112]. Адкуль жа на мяне гэты паклёп?» І працягвала: «Пане ласкавы, выслухай мяне, распавяду я, адкуль гэта злосць князя Ракацы на мяне, я не хацела Пана Бога абразіць, сваё сумленне зганьбіць і быць паслухмянай яго бязбожнай пажадлівасці»,— і далей падрабязна распавядала пра светлага князя яго мосць Ракацы да мяне несправядлівыя дамаганні.

Ён адразу з ласкі Пана Бога паверыў мне, што тое, аб чым я казала, шчырая праўда, і адразу абяцаў узяць пад сваю апеку, і каб я нікога не баялася. Пасля загадаў паказаць мне свайго хворага сына. І як я таго сына ўбачыла, дык страшэнна спалохалася яго, бо колькі жыла, не бачыла яшчэ такога пацыента і не ведаю, чым і як яго лячыць. Думаю сабе: скажу, што вылечу, а ён памрэ, дык нажыву сабе за вялікага ворага бацьку; а калі скажу, што не, дык ён мяне пад сваю апеку не возьме і зноў пад арышт адправіць. Эх, з ласкі Божае з ахвотаю бяруся лячыць, а



Дарогі ў Альпах.
Па такіх шляхах Саламея Русецкая
кіравалася з Любляны ў Вену.

тут думаю, як бы гэта тут уцячы і жыццё выратаваць. Ужо адмаўляюся ад дачкі маёй, ад нявольніка майго, набытку майго і лёкаяў і ўсяго, што маю, пасля кажу пану майму, яго мосці пану эстэрэдзы-пашы: «Міласцівы пан, як лячыць? Няма ні аптэкі, ні кніг, усё ў мяне забрана».

Адказвае мне эстэрэдзы-паша: «Зараз загадаю ўсё тваё сюды ў палац прывезці».

Ён адразу паслаў да суддзі, просячы мае рэчы, і вось па загадзе яго мосці Мехмет-агі эстэрэдзы-пашы аддалі мне дачушку маю Канстанцыю Галь-

піроўну, і нявольніка майго, яго мосць пана Юзафа Фартуната дэ Пільштын, і лёкаяў маіх, і набытак мой, усё цэлае, што мела з ласкі Пана Бога. І вось я, узяўшы на дапамогу Пана Бога, пачала лячыць таго пацыента. Зрабіла яму катаплазмы[113] на галаву і на твар, бо дзеля ўнутранага ўжывання нельга нічога было даць: язык быў высунуты ў яго з рота.

Тым часам паслаў пан мой і апякун па тых двух туркаў, што з Відыня за мною ў пагоню ехалі, і прасіў іх, каб яны, вярнуўшыся назад, яснавяльможнаму яго мосці пану Гайваз-пашы распавядалі лагодна і ў нявіннасці маёй пераканалі, і тыя два туркі з вялікаю ахвотаю гэта выканаць абяцалі, бо мяне моцна шкадавалі. Дык яго мосць пан эстэрэдзы-паша даў кожнаму на пяцьдзесят леваў падарункаў і выправіў іх Дунаем у Відынь, і яны таго ж дня паплылі.

У гэты ж час з намаўлення Духа Святога апамятаўся мой князь Ракацы, што кепска зрабіў, што загадаў лавіць мяне, як шпега, і разважыўшы, што туркі мяне за такую пагалоску і ягонае сведчанне могуць пакараць смерцю, двух кур'ераў з ардынансамі — аднаго Дунаем, а другога сушаю выслаў, каб як найхутчэй спяшалі ў Рушчук мне на дапамогу, сцвярджаючы, што гэта памылка, што я не шпег, а высакародная белагаловая і добрая лекарка і сто іншых пахвал, толькі што ўгорскага князя Ракацы падданая, і таму каб мяне жывую разам з набыткам і з усім іншым назад у Відынь адправілі да князя Ракацы. Так з ласкі Божае была я пацешана і засталася сумленнай, без усялякае віны, і была ў пашане ў свайго пана эстэрэдзы, як і ў цэлага горада і ваяводства рушчуцкага сапраўднаю лекаркаю, і сярод усіх людзей добрую рэпутацыю мела.

Дык тады мой пацыент, эстэрэдзы-пашы сын, на

трэці дзень лекаў прыйшоў у свядомасць і стаў бачыць, і вось мяне за руку ўзяў, бачачы перад сабою, і, як нямы, на мігі паказаў, каб села. Бацьку спавясцілі, што хворы сын ужо крыху бачыць і чалавечыя пачуцці мае. І той засмучаны бацька прыйшоў і ўсцешыўся, пачаў плакаць над сынам сваім, сын даў знаць пра сябе, каб не плакаў і спадзяваўся на Бога.

Дык адразу ж стары бацька даў мне бакшыш, жменю чырвоных злотых (бакшыш — гэта падарунак). Так мне Пан Езус дапамог, што таго пацыента свайго добра вылечыла за дзён 40. Ягонае лячэнне будзе, дасць Бог, адлюстравана ў маёй лекарскай кніжцы, якую ўжо напісала ўласнаю сваёю рукою і падам у друк. Як таго пацыента свайго вылечыла ад апухласці галавы, твару, языка і горла (без прытомнасці ляжаў сын эстэрэдзы-пашы), дык праславілася сярод людзей так, што мяне за найлепшую лекарку лічылі паўсюль у ваколіцы. Больш чым за дзесяць міль ад Рушчука прыязджалі да мяне на лекі, з чаго мела вялікі барыш і ад свайго эстэрэдзы-пашы атрымала за лячэнне 500 леваў, гэта значыць 2000 тынфаў і каляску, пунсовым сукном зверху пакрытую паводле звычаю турэцкага, і пару коней з шорамі, за якія даў пан эстэрэдзы 40 чырвоных злотых, і іншыя падарункі, і даў мне жытло недалёка ад сябе, ля Дуная, вельмі прыгожае, і прасторнае, і вясёлае, прытым усялякія стравы з кухні ягонае і коням — сена і фураж.





СМЕШНЫ ВЫПАДАК ЗДАРЫЎСЯ Ў РУШЧУКУ

Мела я людзей, даўніх лёкаяў, якія ведалі мужа майго яго мосць пана Якуба Гальпіра. Пасля ягонае смерці яны заўсёды са мною былі і ў Рушчук прыехалі. Быў адзін хлопец, Юзаф, лёгкага сумлення чалавек, але ж яго мусіла трымаць з-за ягонае душы, каб у Турцыі не загінуў альбо ў няволю не трапіў. Ужо яго хацела ў Польшчу вывезці да хрысціян. І вось у Рушчуку мелі мы ля Дуная прыстойнае жытло *ad instar* кляштара. Знадворку мае пакоі, а ўнутры — кадыні, гэта значыць мужа з жонкаю і дзецьмі.

Той непаважны хлопец, Юзаф, дадумаўся і сярод ночы ўлез у пакой, дзе муж з жонкаю спалі, дык яго муж схапіў, і страшэнна збіў, і ў вязніцу пасадзіў, і быў ён ужо на смерць асуджаны, бо калі хто красці маёмасць улез у спальню ці дзеля кепскага ўчынку з чужою белагаловаю, а да таго ж з турчанкаю, дык быў варты ён смерці. У гэты час моліць мяне хлопец Юзаф, каб дзеля пяці ран Хрыста Пана ў судзе ўпрасіла, каб яго выслухалі, і ён дакажа сваю нявіннасць, бо ён зусім нявінны. Смяяліся ўсе з гэтага, але на та-



Любляна. З гравюры XVI ст.

кія просьбы мусіла гэта ўчыніць і пайшла да суддзі, просячы яго, каб ён сам Юзафа выслухаў. І вось Юзаф стаў перад судом. І так пачаў Юзаф урачыстую прамову да мяне: «А ці памятаеш, пані, пры жыцці святое памяці пана майго і мужа вашае мосці пані дабрадзейкі часта гаворку вы мелі, што да́мы польскія валасы сабе на галаве стрыгуць, і таму, што штодзённа чэшуць грэбнем, галава пасля не смярдзіць, і таму пан хваліў польскіх дам. А ваша мосць пані дабрадзейка інакш мовіла: папраўдзе не смярдзяць галовы турчанак, а такія прыгожыя, прыстойна аздабляюць белагаловых, хто валасы доўгія мае і


колькі кос заплеценых. Я ж хацеў праўды дабіцца, хто праўду мовіць: ці пан мой, ці пані мая, то, стоячы з талеркаю ля стала, каля крэсла альбо табурэткі, за паняю маёй, нюхаў галаву, а тае начы пайшоў да гэтае турчанкі не красці багацце, набытак, не дзеля чаго кепскага, а толькі, прынамсі, хадзіў у чужую спальню, каб панюхаць галаву турчанкі, абы добра ведаць, чыя галава смярдзіць, а чыя пахне». Суддзя і ўсе прысутныя, паслухаўшы ягонае дурное тлумачэнне, вельмі смяяліся, і так суддзя сказаў: «Гэта вар'ят. Я гэтага вар'ята судзіць і асуджаць на смерць не магу, толькі пастанаўляю даць яму 300 кіёў па нагах, каб больш галовы белагаловых перастаў нюхаць». І далі яму па нагах 300 кіёў моцных і вызвалілі той жа гадзінаю.

У той час вялікія войны былі з персамі, з немцамі і з маскалямі. І як была крывавая вайна ў Азове[114], тады мае добрыя прыяцелі, турэцкія паны, на вайну паехалі супраць маскалёў. А калі Пан Бог паслаў туркаў на маскоўскую моц і магутнасць, дык колькі дзесяткаў тысяч туркаў загінула і колькі дзесяткаў тысяч у няволю маскоўскую трапіла, як таксама жонкі і дзеці турэцкія без ліку трапілі ў няволю. Вось і мае добрыя прыяцелі без вестак прапалі, невядома, ці забітыя на вайне, ці ў палоне. Вялікі смутак, плач і лямант падняўся ў дамах маіх добрых прыяцеляў. А я мела натуру, ад Бога дадзеную, што за дробязь, калі ад каго слова добрае чула альбо кавалак хлеба ў хаце іх ела, дык ужо да смерці за гэта доўг мела. І так мовіла жонкам маіх прыяцеляў і братам альбо сваякам, да каго гэтыя словы належала мовіць: «Панове мае ласкавыя, калі я ў ваш край і горад прыехала і была ў той час у бядзе, вяльможнае панства мяне прыняло, пад апеку сваю ўзяло і з ласкі Божае і вашае добра мне ў вас жылося,

а прытым мой любімы пацыент, сын эстэрэдзы-пашы, што меў пухліну галавы, і ён на вайне загінуў, а засмучаны бацька ледзь не памёр з жалю, я вось вырашыла ехаць з Рушчука праз Польшчу ў Пецярбург да найяснейшай яе мосці імператрыцы, маючы надзеі на Бога і на ласкавую манархію, што мне тых туркаў, дзеля якіх еду, на просьбы мае не адмовіць і выпусціць іх з няволі».

Дык узяўшы Пана Бога на дапамогу, я развіталася з усімі туркамі, і пацыентамі маімі, і са знаёмымі. Далі мне яны 40 туркаў канвою, і я паехала з Рушчука ў Польшчу, узяўшы сваю дачушку і нявольніка пана Юзафа Пільштына, і лёкаяў, і ўсё тое, што мела з ласкі Божае, і, праехаўшы праз Магілёў[115], спынілася проста ў Бары[116].





Раздзел другі

Я ДРУГІ РАЗ ІДУ ЗАМУЖ ЗА ЯГО МОСЦЬ ПАНА ПІЛЬШТЫНА

Прыехаўшы ў Бар, я мела намер пакінуць свайго нявольніка тут у езуітаў з тым, каб ён пісаў сваім бацькам у Карніёлію ў Лайбах, абы за яго прыслалі 300 чырвоных злотых; і няхай сядзіць у Бары ў езуітаў, пакуль за яго не аддадуць грошы, толькі тады будзе вольны яго мосць пан Юзаф Пільштын. Як даведаўся яго мосць дэ Пільштын, што я яго хачу пакінуць у езуітаў, дык пачаў вельмі горка плакаць. Я пыталася пра прычыну слёз, але ён не хацеў мне казаць. Тады мовіла: «Калі не хочаш, яго мосць пане Юзаф дэ Пільштын, мне самой распавесці, дык скажы езуітам». Ён абяцаў, і вось якім быў аповяд яго мосці пана Юзафа дэ Пільштына, майго нявольніка, афіцэра ў званні харунжага ў рэгіменце яснавяльможнага яго мосці пана Дамніца, генерала імператарскага войска, які быў раней у турэцкі палон узяты пад Краёвай у 1737 годзе. Ён езуітам сказаў: «Калі мая пані, яе мосць пані Гальпірова, медыцыны лекарка, выкупіла мяне з турэцкае няволі і служыў я ёй два гады, а яна па волі Бога ўдава, і я чалавек вольны, дык

рады быў стаць ёй на ўсё жыццё сябрам. Абяцаю такую самую пашану, рэпутацыю і паслугі пасля шлюбу, як і цяпер, калі я — куплены яе нявольнік».

Распавялі мне пра гэты намер іх мосці ксяндзы езуіты і хвалілі, што ён чалавек добры, вялікай адукацыі (пра гэта я раней казала). Карацей, узважыўшы ўсе акалічнасці, што я ўдава, у розных краях бываю, але мяне аніводзін пан, ні стараста не возьме; о! няхай, думаю, будзе воля Божая са мною. Карацей, праз колькі тыдняў я бяру шлюб з яго мосцю Юзафам дэ Пільштынам у Дубне[1].

Прыехаўшы ў Дубна з Бару, мы стараліся знайсці службу майму мужу ў светлага князя яго мосці Сангушкі[2], ардыната, але не маглі дабіцца, каб мог быць афіцэрам у ардынацыі. У гэты час у самыя Запусты прыязджае ў Дубна з Алыкі[3] светлы князь яго мосць Радзівіл[4], гетман польны літоўскі, і ён з вялікай ахвотаю прымае нас; майму мужу адразу дае патэнт на харунжаства, мяне за лекарку бярэ з сабою ў Нясвіж[5] у Літву.

Як кажуць: як ажаніўся, дык і перамяніўся. Ужо муж мой новы не так мяне шануе, як раней, ужо кажа: «Вашая мосць пані толькі лекарка, а я імператарскі, а цяпер літоўскі афіцэр». Пасля такога шчасця заракаўся, што будзе паручнікам, капітанам, штабсафіцэрам, і ўжо мяне не вартаю сябе лічыў. Але я, аднак, памятаючы прысягу маю і прыпісваючы ўсё гэта волі Пана Бога, экіпіравала яго: вопратку, коней, збрую, пісталеты, каснікі, рынкраг[6], насоўкі, пасцель ды іншым і што патрэбна. Адным словам, выдаткавала на яго 5000, бо гэта і гадзіннікі, і табакеркі, і залатыя сыгнеты. А пасля задумала я з Нясвіжа, горада ў Літве, у ваяводстве навагрудскім, выехаць у Маскву[7] ў Пецярбург вызваляць тых маіх туркаў. Дык пакідаю маю дачку ад першага шлюбу Канстан-

цыю Гальпірову ў Нясвіжы ў кляштары ў вялебных паненак бенедыктанак на вучобу, бо яна не ведала і слова па-польску, а толькі па-турэцку, і пакінула свой набытак і ўсю рухомасць у кляштары, а што належала мужу майму, тое ўсё яму пакінула. У дадатак да гатовае платы за службу.





ВЫЕЗД З НЯСВІЖА Ў ПЕЦЯРБУРГ

Укленчыла я перад светлым князем яго мосцю Радзівілам, гетманам літоўскім, просячы пашпарт і ліст інстанцыяльны[8] ў тую дарогу для мяне да найяснейшай расійскай яе мосці царыцы Анны Іванаўны[9], але князь яго мосць адмовіў мне, кажучы: «Чаго ты паедзеш у такі далёкі і небяспечны край? Вызваляць тваіх знаёмых туркаў? Ці разумна гэта, ці не фамільярна польцы без усялякіх заслуг у расійскага двара ў найяснейшай яе мосці царыцы прасіць за туркаў, непрыяцеляў Масквы? Не дам табе ні пашпарта, ні інстанцыяльнага ліста, бо як на мой ліст яе мосць царыца нічога не ўчыніць, дык гэта мяне зняважыць». Так мне казаў князь Міхал Радзівіл, гетман літоўскі. А я, укленчыўшы перад ім, мовіла яму: «Ваша мосць князюдабрадзею, хоць ты мне і не дасі пашпарта і ліста, аднак я паеду і маю спадзяванне на Бога майго на найяснейшую манархіню Анну Іванаўну, імператрыцу расійскую, што аддасць яна мне тых туркаў, і я з выгодаю і ў радасці, дасць Пан Бог, вярнуся з Масквы і буду служыць вашай княжацкай мосці». Я раз-

віталася з мужам маім, і з дачкою маёю, і з добрымі прыяцелямі, выспавядалася і ўзяла прычасце ў яго мосці ксяндза Празора, бенедыктына, прыдворнага капелана самой яе мосці княгіні-дабрадзейкі, і выехала з горада Карэлічы ў тую дарогу.

На другі начлег спынілася я пад Наваградкам у карчме, у маёнтку вяльможнага яго мосці пана Лопата[10], бабруйскага старасты, а ў той час наваградскага пісара, які цяжка хварэў на галаву і зубы. Даведаўшыся, што я лекарка, вяльможны яго мосць пан Лопат прыслаў па мяне, каб прыехала з каляскаю і сваімі людзьмі, гэта значыць з Бенядыктам Скалубовічам, пачцівым і годным шляхціцам з Літвы, а другі чалавек да коней Юзаф Бяліцкі. І вось толькі я ў двор вяльможнага яго мосці пана Лопата прыехала і лекі ад зубоў дала, як праз дзве гадзіны прыязджаюць госці, двое годных маскалёў, родных братоў Лівенаў. Адзін генерал, а малодшы — палкоўнік. Была там таксама і светлая княгіня яе мосць Радзівілава[11], наваградская ваяводзіха. Дапамаглі вяльможнаму яго мосці пану Лопату мае лекі, таму прасілі гэтыя паны за мной, каб мне гэты вяльможны яго мосць генерал Лівен даў пашпарт у Пецярбург, што гэты генерал з вялікаю ахвотаю ўчыніў. Даў мне пашпарт і рэкамендацыі да многіх паноў і генералаў лістоўна, а вяльможны яго мосць Лопат шчодра забяспечыў мяне на дарогу, і я шчасліва выехала ў Вільню.

У Вільні я спынілася ў езуіцкай карчме і хутка пазнаёмілася з годнымі панамі, і дамамі, і з манашкамі; было гэта ў час Трыбунала, і я забавілася тут 4 тыдні.

Тым часам светлы князь Міхал Радзівіл, гетман літоўскі, з дабрадзейства свайго і літасці нада мною прыслаў мне вельмі хвалебны і карысны *ad instar* інструмент, ці пашпарт, які я і цяпер маю пры сабе, і ён за-

сведчвае маю асобу. Пазнаёмілася я і з яснавяльможнай яе мосцю паняю Дунінай[12], народжанай княжною Трубяцкою, маскоўкаю; гэтая пані мела бацькоў у Пецярбурзе, бацьку і маці, а таксама дзядзькоў, родную цётку, таксама княгіню Трубяцкую, што была замужам за царэвічам[13], які быў у ганаровым почту нашага найяснейшага яго мосці караля[14] ў час яго каранацыі. А гэтая княгіня Трубяцкая, якая была за літоўскім сенатарам, яснавяльможная яе мосць пані Дуніна, дала мне лісты бацькам сваім і да годнай саёй фаміліі і вельмі добра мяне ў лістах сваіх рэкамендавала.

Я шчасліва выехала з Вільні, выдаткаваўшы некалькі дзесяткаў чырвоных злотых, і ехала праз Жмудзь праз Біржы[15] ў Рыгу. У Біржах заехала ў карчму, а там удава-гаспадыня, немка, здзіўлялася маёй адвазе, што маладая белагаловая толькі з двума людзьмі адважылася ехаць у такую далёкую дарогу. А горад гэты памежны, тут розныя рабаўнікі збіраюцца, бо Біржы — Польшча, маёмасць светлых Радзівілаў, а Рыга — ужо Масковія, і вось тут заўсёды ліхадзеі знаходзяцца, уласна, як і каля Кіева, і каля Белай Царквы[16], бо я і там усё добра ведаю. І вось як я ад тутэйшых людзей пачула пра небяспеку, дык прасіла іх, каб пра гэта нічога перад людзьмі маімі не ўспаміналі, і гэта таму, каб яны са страху ад мяне не ўцяклі. Напасвіўшы коней, я загадала запрагаць, а гаспадыня таго дому з сынам сваім селі са мною побач у маю каляску, бо меліся ісці да зяцёў сваіх, і паехалі мы на вальны гасцінец. Яны добра растлумачылі мне дарогу: «Тут да вёскі дзве мілі. Едзьце ж гэтым вальным гасцінцам, не патураючы коням, каб да вечара даехалі. Не бярыцеся ні ўправа, ні ўлева».

Я развіталася са сваёю гаспадыняю і загадала дзеля Бога ехаць, аднак не ведаю, якім чынам збіліся


Die Wilde Fluvius



мы з вальнага гасцінца на малую дарогу, а тым часам вечар надыходзіць. Ах, вельмі мяне гэта засмуціла. Тут чую гоман вялікі ад мітусні, і іншага выйсця няма, як спыніцца ціха на месцы, аднак двое вершнікаў да нас едуць і шмат людзей пешшу з косамі і каламі, наракаючы, на нас ідуць. Як падышлі да нас, кажуць: «Адкуль такая смеласць, адна белагаловая з двума людзьмі наважылася па гэтых небяспечных дарогах ездзіць?» Адзін вершнік кажа: «Я гаспадар гэтай вёскі, а гэтыя людзі — мае падданыя, на лямант купцовых людзей на вялікім гасцінцы мы ўзрушыліся і ездзілі на дапамогу і вось тых купцоў вызвалілі ад ліхадзеяў, аднак адзін з тых купцоў забіты, а ліхадзеяў было 24, мы чатырох звязалі, а астатнія ўцяклі». І яшчэ распавёў мне гэты шляхціц, што колькі дзён назад адна годная шляхцянка ехала з пяццю людзьмі па гэтай дарозе, і вось яе з людзьмі забілі ліхадзеі, толькі адзін лёкай уцёк. А гэтую забітую шляхцянку пахавалі ў Біржах.

І пытаўся ён у мяне, адкуль я еду гэтай дарогаю. Адказваю: «З Біржаў». Мовіць мне той шляхціц: «Колькі жыву, гэтай дарогаю толькі сена альбо снапы возяць». Кажу, што заблудзілася. «Ах,— мовіць,— дзякуй Пану Богу, што васпані заблудзіла, бо каб ехала вальным гасцінцам, дык пэўна б тым ліхадзеям у рукі трапіла». А простыя людзі казалі: «Нават калі б біты талер праваднiку дала, не змог бы ён лепш правесці сцежкамі да нашае вёскі, як яна і адна вальным гасцінцам прыехала».

Гэты пан шляхціц аказаўся нягжэчным, не ўзяў нас у двор, толькі загадаў у вёску да карчмы паказаць

← Вільня на пачатку XVIII ст., тагачасны палітычны, эканамічны і культурны цэнтр Беларусі. Старадаўняя гравюра.

нам дарогу ў змроку, а там габрай неахайны. Надзвычай я знудзілася, спыніўшыся на колькі дзён, бо небяспечна было адной ехаць праз лес і гэтай дарогаю ў Рыгу. І тут воля Божая ўчыніла, што нейкі шляхціц, яго мосць пан Пшэмскі, з-пад Вільні ехаў конна з двума людзьмі, са зброяю ў руках, і меў 14 вазоў, ці падвод, запрэжаных чацверыкамі, льну, які вёз у Рыгу на карабель, а карабель гэты, ці віціна, стаяў на рэчцы Дзвіна. Дык я таго шляхціца моцна прасіла, каб мяне ў кампанію з сабою ўзяў у Рыгу, што ён з ахвотаю паабяцаў, пачакаў, пакуль мы сабраліся, узяў мой экіпаж, ці каляску, у сярэдзіну сваіх вазоў і так вось шчасліва давёз мяне.





ДА РЫГІ

Вельмі спадабаўся мне гэты пышны горад, і я адразу ж вырашыла пажыць у Рызе колькі тыдняў, каб пазнаёміцца з гэтым прыгожым горадам і яго людзьмі. Заехала ў адну аўстэрыю, дзе гаспадыняю была полька, яе мосць пані Фравіцкая, і жыло там у яе шмат годных польскіх паноў; яго мосць пан Міхал Кроер, яго мосць пан Пшэмскі і шмат іншай шляхты. Кожны з нас меў асобны пакой, вялікія выгоды ў ежы, у пітве, у абслугоўванні, нават музыкаў, і былі мы ў бяспецы. Я пазнаёмілася з годнымі купцамі, а менавіта з яго мосцю панам Бекерам, а таксама з вяльможным яго мосцю панам генералам Бісмаркам[17] і з яе мосцю ягонай, і лячыла таксама людзей рознага стану, і мела сякую-такую карысць, адным словам, з гатовага нічога не страціла і прасіла вяльможнага яго мосць пана генерала Бісмарка дазволіць агледзець туркаў, якія былі тут у рускай фартэцыі ў няволі. І вось мне яго мосць пан Бісмарк з ахвотаю дазволіў пайсці ў кашары, дзе знаходзіліся турэцкія нявольнікі. Дык я з тымі туркамі размаўляла, пытаючыся ў іх па-турэцку пра маіх рушчуцкіх туркаў, і атрымала добрыя і добра-

сумленныя весткі, дзе і ў якой маскоўскай фартэцыі засталіся, і хто памёр, і хто жывы.

Пазнаёмілася я ў Рызе з адным афіцэрам, харунжым, які зваўся Бурман, быў ён чалавек годны, добры і выдатнай адукацыі кавалер. Ён меў у Рызе адну даму, роўную сабе, удаву, якая жыла ў дастатку і ўсялякія цноты і дасканалыя чалавечыя якасці мела. Гэты яго мосць пан Бурман хацеў мець гэтую даму за сяброўку жыцця, і гэтая дама моцна хацела быць жонкаю таго ж яго мосці пана Бурмана, бо адзін аднаму ўзаемна лепшае зычылі, толькі што перашкаджала адна пэўная рэч, а менавіта гэты яго мосць пан Бурман меў бацьку маёра. Гэты ж маёр, штабс-афіцэр, быў вялікай дасведчанасці, знаўся на хірамантыі, гэта значыць, як у каго руку ўбачыць, дык адгадваў, што таму чалавеку было і будзе. І вось калі ў яго нарадзіўся сын, яго мосць пан Юзаф Бурман, дык бацька прарочыў яму, што на 20-м годе свайго жыцця, і на 25-м годзе, і на 35-м годзе мусіць ганебнаю смерцю памерці. Так сталася, што на 20-м годзе свайго жыцця ўпаў ён у Няву[18] з канём, плывучы на пароме, і толькі адна нага ў стрэмені засталася, але як конь выплыў на бераг і тая выслізнула са стрэмені, і яго вадзяная плынь гадзін сем несла. На шчасце, схапіўся за вялікае дрэва, якое плыло, выхапленае імкліваю плынню, і так з дапамогаю Пана Бога прыплыў да берага.

Другая прыгода яго мосці пана Бурмана была на 25-м годзе ягонага жыцця, калі служыў у польскім войску, як ён казаў, пад булавою яснавяльможнага яго мосці пана гетмана Юзафа Патоцкага[19], гетмана вялікага кароннага, у якім рэгіменце і ў якой кампаніі, па праўдзе кажучы, я забылася, але яго мосць пан Бурман з нейкае прычыны адчуў агіду да службы ў Польшчы, дык дэзерціраваў, а калі ягамосця злаві-



Выгляд Рыгі.
Гравюра пачатку XVIII ст.

лі з трыма дэзерцірамі, якіх ён намаўляў да ўцёкаў, дык быў засуджаны да смяротнага пакарання, але напярэдадні сваёй смерці неяк удала з-пад варты зноў з двума жаўнерамі ўцёк і паспяхова вярнуўся ў Рыгу, на сваю бацькаўшчыну, і тут у Рызе ў гарнізоне даслужыўся чыну харунжага.

Гэтая дама ягоная, баючыся трэцяга параксізму, які на яго прыйдзе на трыццаць пятым годзе ягонага жыцця, а ў той час быў 35-ты год, хацела пачакаць, каб дажыў 36-га года, абы прайшла злая хвіліна прароцтваў ягонага бацькі.

А як той ягó мосць пан Бурман навучыўся па-

польску, будучы ў Польшчы, дык быў рады з палякамі весці знаёмства, і я з гэтае прычыны часта яго бачыла і добра пасябравала з гэтым кавалерам, які няраз вадзіў мяне да свае дамы ў ейны дом.

Аднойчы пайшла жалобная пагалоска, што яго мосць пан Бурман арыштаваны, бо забіў на смерць капітана са сваёй кампаніі. Прычына гэтага забойства была наступная: той нябожчык вельмі кепска гаварыў пра даму яго мосці пана Бурмана, а яго мосць пан Бурман яе абараняў і казаў: «Гэта ніколі праўдаю быць не можа. Я гэтую даму так даўно, так шчыра кахаю і шаную, і яна мяне таксама: яна прыстойная і дабрачынная, што мне і слова непаважнага не дае сказаць, толькі кажа чакаць часу і волі Пана Бога, а як бы яна з чужымі, не дай Божа, такое дазволіла?»

Капітан адказвае смела: «Мне не патрэбны сведкі: я сам актор тае дзеі». Мовіць яго мосць пан Бурман: «Іду на сто чырвоных злотых у заклад, што гэта няпраўда. І хоць я ніколі не меў такога шчасця з жонкаю вяльможнага яго мосці пана дабрадзея мець блізкія адносіны, але калі сёння першы раз пайду, то здолею выклікаць да сябе гарачыя пачуцці яе мосці дабрадзейкі, праз тры гадзіны прашу прыйсці і ўпэўніцца, што кажу праўду».

Так і сталася. Яго мосць пан Бурман з дазволу яго мосці пана капітана пайшоў у ягоны дом і пачаў яе мосці капітанісе прадбачліва і падрабязна распавядаць, што ейны муж на людзях казаў, што кахаецца з той-та і той-та ўдавою, а ці ж не шкода вяльможнай яе мосці пані дабрадзейцы маладосці, бо яго мосць пан капітан кавалер у гадах, а так распусна жыве.

Абзываецца яе мосць пані капітаніха: «Ах, я веру гэтаму. Мой муж такі няўдзячны чалавек, ня-

годнага жыцця, што аніводная кухарка, аніводная нянька без ганьбы і абразы Божае з дому майго не выйшла, а няхай яго Пан Бог пакарае, каб раптоўнаю смерцю памёр, а мяне Бог аслабаніў ад гэтага кепскага чалавека!»

Яго мосць пан Бурман мовіць: «Такому мужу на злосць трэба *vice versa*[20] злосцю адплачваць». І так і гэтак словамі ядвабнымі злавіў яе мосць пані капітаніху, абедаў там, піў віно, узяў з чыстага золата табакерку і сеў з ёю на ложку. У гэты час прыходзіць яго мосць пан капітан, узрушана пачынае лаяць сваю жонку. Яна яго ў пяць разоў больш дакарала, што хваліўся на людзях, што мае блізкія адносіны з той дамаю.

Пан капітан адмаўляўся, а яго мосць пан Бурман і іншыя, што разам з панам капітанам прыйшлі, сцвярджалі, што праўда, што так ён казаў. Яго мосць пана капітана тут лепш бы халера ўзяла, выхапіў ён шпагу і тройчы ледзь не закалоў на смерць яго мосць пана харунжага, жыццё якому, аднак, Пан Бог выратаваў. А яго мосць пан харунжы, забыўшыся пра бяду, схапіў шпагу і з першага разу забіў капітана на месцы. Прысутныя не мелі моцы затрымаць яго, і ён пайшоў да свае дамы і распавёў ёй усю гэтую гісторыю і сказаў: «Ведай добра, мая пані, што я за твой гонар рад жыццём рызыкнуць». У гэты час прыйшла варта і арыштавала яго мосць пана Бурмана; дык усе палякі, што тут жылі, шкадавалі яго і хадзілі адведваць; а я была ягонаю прыяцелькай, дык і я наведала ягамосця ў вязніцы, бо ўжо выязджала ў Пецярбург і зычыла хуткага вызвалення. Але ягамосць на гэта не спадзяваўся, бо той капітан быў лютэранін, а яго мосць пан генерал таксама лютэранін, і ўсе штабс-афіцэры мелі да яго даўнія крыўды, і пры гэтым яго мосць пан Бурман быў каталік; я яму

абяцала, калі б воля Пана Бога была такою і мела шчасце гаварыць з найяснейшаю яе мосцю імператрыцаю і просьба мая каб месца мела, дык яму пад прысягаю абяцала прасіць за яго і даказаць невіноўнасць яго мосці пана Бурмана ў справе смерці пана капітана.





ВЫЕЗД З РЫГІ Ў НАРВУ

Прыехаўшы ў Нарву[21] выдатную фартэцу і прыгожы горад, які яшчэ Пятро Аляксеевіч[22], імператар расійскі, адабраў у шведаў (бо раней ён шведскі быў), і пайшла я там да вяльможнага яго мосці пана генерала Тараса Абрамавіча Шацілава[23], які быў камендантам гарнізона, і пыталася пра маіх туркаў, і мела дазвол пайсці да турэцкіх нявольнікаў і пытацца, і атрымала добрыя весткі пра іх, а вяльможны яго мосць пан генерал быў такі ласкавы і гжэчны, што ўзяў да свайго палаца мяне, і людзей маіх, і каляску, і аддала я яму ад яго мосці пана генерала Лівена ліст, што мне яшчэ быў дадзены ў Літве пад Навааградкам. Лячыла я там пані генераліху Шацілаву, жылося мне добра, бо былі гэта людзі бескарыснае дабрыні і пабожнасці. Мела пашану і некалькі дзесяткаў рублёў на дарогу і ліст ад яе мосці пані генераліхі да яе роднага брата ў Пецярбург, да яснавяльможнага яго мосці пана Сямёна Юр'евіча, брыгадзіра, ад сястры ягонай Марыі Юр'еўны. І вось шчасліва прыехала я ў Пецярбург, проста да палаца князя Шарамецьева на Васільеўскім востраве на 25-й лініі, дзе жыў Сямён Юр'евіч Каравулаў[24], брыгадзір,



Выгляд Нарвы на пачатку XVIII ст.
Тагачасная гравюра.

які некалі быў камендантам у Кракаве ў час інкурсіі[25]. І тут была я па-чалавечы прынята гэтымі ягамосцямі, бо ягоная сястра Марыя Юр'еўна добрую мне рэкамендацыю дала. Яе мосць пані Каравулава, брыгадзірыха, цяжарная была і вельмі баялася, бо гэта ўжо сёмае дзіцё, а ранейшыя пры родах паміралі. Дык я яе запэўніла, што з дапамогаю Пана Бога і маёй дасведчанасці не памрэ тое дзіця, што цяпер народзіцца. Я некалі на вёсцы была пры родах аднае беднае

шляхцянкі, якую звалі Ганна Стрынкевічоўна (пайшла замуж за яго мосць пана Якубоўскага), а мела гэта панна гадоў сорак і зацяжарала і нарадзіла сына, але ён не крычаў, як звычайна плачуць нованароджаныя дзеці, дык узяла тая баба-прасцяча дзежку, у якой хлеб рашчыняюць, і накрыла ёю тое дзіця, і пакуль палову малітвы прачытала, дзіця заплакала і жыло. Я, ведаючы гэты сакрэт, учыніла тое ж самае з дзіцём яго мосці пана Сямёна Юр'евіча, і назвалі яго Іван Сямёнавіч, і цяпер, дзякуй Богу, жыве, і быў у Кіеве на пакланенні св. Барбары, бо яго ў гэты дзень ахрысцілі.

Пражыла тыдні тры ў спакоі, у пашане ў вяльможнага яго мосці пана Сямёна Юр'евіча з людзьмі, з коньмі, але мяне хвалявала, як бы дступіцца да найяснейшай яе мосці царыцы Анны Іванаўны. Аднак мне ўсе адно сцвярждалі, што цяжка заслужыць такі гонар, людзі па году сядзяць і не могуць падступіцца, каб пагаварыць з ёю, нават супліку даць цяжка, але ёсць тут адна княгіня, з дому Трубяцкіх, а замужам за князем Чаркаскім[26], які быў у той час першым міністрам, дык яе надзвычай шануе яе мосць царыца. Пытаюся, ці магу я знайсці доступ да княгіні Чаркаскае[27]. Кажа мне яго мосць пан Караулаў: «Можаш з маёю жонкаю; пачакай, няхай яна ўстане пасля родаў і паедзе з візітам, дык разам з маёю жонкаю і ты паедзеш». І вось я паехала з жонкаю яго мосці пана брыгадзіра да светлае княгіні яго мосці Чаркаскае, але мне казалі, што гэтая княгіня скрытая, суровая, хоць бы і якая панна-прыслужніца ці мужчына, а ўсё роўна біць загадае, але тут інакш нельга, трэба да яе на службу прасіцца, бо рада яна розных нацый людзей у двары сваім мець. Адважылася я на ўсё, што Пан Бог і на мяне пашле.

І вось першы раз прыехалі мы да княгіні ў самы



Варта каля заставы пры Анічкавым мосце ў Пецярбурзе. Старадаўняя гравюра.

Пецярбург, перабраўшыся праз Няву (бо між Васільеўскім Востравам і Пецярбургам цячэ рэчка Нява), княгіня мае палац на Мільённай вуліцы, непадалёку ад асударскага дварца (гэта значыць каля царскага палаца), і вось пра мяне яе мосць княгіня запытала. Адказваю: «Я бязродная шляхцянка, белагаловая, крыху разбіраюся ў лекарстве». Дык мне яе мосць княгіня дазволіла ёй служыць. Гэтая княгіня мела адзіную дачку Варвару Аляксееўну, вялікай годнасці і пабожнасці даму, багацця невыказнага, бо бачыла я сярод іх скарбаў срэбныя бочкі для перавозкі вады, срэбныя насілы, каб насіць тыя бочкі, срэбраныя цэбры, срэбраныя жароўні, адна жароўня, *alias* срэбраная печка, за 7000 рублеў, такія ж міскі,

вазы, кружкі, талеркі, балеі купаць дзяцей, срэбраныя ванны для купання дарослых дам і паноў, такія сервізы майстэрскай работы і калі іх на стол ставілі, дык верх даставаў да бэлькі. Там клалі садавіну, цукар, свечкі і інш. надзвычайнае прыгажосці, такога сервізу я нідзе не бачыла. І мела я ад яе вялікую ласку і ўсялякую павагу, бо мяне яна не выкарыстоўвала на чорнай рабоце, а куды еду — заўсёды ў калясцы. Дачка яе мела каля сябе ледзь не ўсіх дам каталічак, напрыклад, мадмазель францужанку дзеля навучання французскай мове і іншыя дамы для паслуг, і заўсёды нам у нядзелю і на святы была падрыхтавана каляска ехаць у касцёл да айцоў капуцынаў на святую імшу, і ўсялякая нам абслуга і чалавечнасць. Я сядала за стол заўсёды з яго мосцю князем, а княгіня мая Марыя Юр'еўна часта мела галавакружэнне і з гэтае прычыны не магла бываць часта ў яе мосці царыцы, але з дапамогаю Пана Бога, калі я дала ёй пэўныя дзейсныя лекі, галавакружэнні прайшлі, і яна на доказ нашае дружбы ці майго добрага імя паехала сама да яе мосці царыцы і хвалілася: «Маю такую лекарку, што мяне вылечыла ад мае хваробы».

Таго дня, калі княгіня яе мосць Чаркаская паехала да яе мосці царыцы ў палац, мяне прасіў адзін сляпы бандурыст у двор яе мосці царыца Лізаветы Пятроўны[28], каб што можна дапамагла адной дзяўчыне, прачцы, з 14 гадоў сляпой. На шчасце, гэтая дзяўчына мела нястрашную катаракту, дык я ў гэты ж дзень інструментам зняла тую катаракту, і дзяўчына пачала бачыць на абодва вокі. Прысутныя лёкаі і іншага стану людзі надзвычай дзівіліся, што дзяўчыну, якая была доўгі час сляпою, я так хутка вылечыла. Былі там лёкаі і з вялікага палаца найяснейшае царыцы Анны Іванаўны і князя Бірона[29], Анны спадкаеміцы[30], жонкі Ульрыха дэ Брунсвік, і гэтая слава

хутка па тых дварах разнеслася, і мне загадана было з'явіцца да найяснейшае манархіні Анны Іванаўны, расійскае імператрыцы. Мяне старанна шукалі, але не знайшлі ў палацы княгіні Чаркаскае, дзе я ў той час жыла. Пасля ўвечары я прыйшла ў палац, і вялікую мне радасць учыніла яе мосць княгіня, якая таксама ад яе мосці царыцы вярнулася ў свой палац і апавядала, што мяне яе мосць царыца загадала старанна шукаць, бо ведае ўжо, што я адной прачцы інструментам вочы адчыніла, дык тут жа, не бавячыся, загадала яе мосць княгіня Чаркаская, Марыя Юр'еўна, каляскаю сваёю завезці мяне да асударскага дварца; і было гэта ўжо змрокам.

І стала я перад яе мосцю царыцаю Аннай Іванаўнаю. І трэба было тры разы ўкленчыць, пакуль да яе падысці, яна ласкава дала мне пацалаваць руку і запыталася, адкуль я. Кажу: «Полька». Пытаецца яе мосць царыца: «А чаго ў Маскву прыехала?» Кажу: «Была ў Турцыі, у Стамбуле, служыла султанскім дочкам і шмат якім іншым людзям, бо крыху ведаю лекарства. Там пачула, што ў Маскве кіруе дама, і я зычыла сабе такога шчасця ад Пана Бога, каб учыніў мяне годнаю ўбачыць тое сваімі вачамі, пра што чула, і спадзяюся на Бога, што ён і тут, у Пецярбурзе, забяспечыць мае патрэбы. Найяснейшая імператрыца Анна Іванаўна так мне мовіла: «Дык ты ў такую далёкую дарогу выбралася і за свой уласны кошт, каб пабачыць мяне?» Я кажу: «Хоць бы і ў некалькі разоў далей было ехаць і яшчэ большыя выдаткі, нічога мяне не хвалюе, нічога я не шкадую, задаволена тым, што ад Бога атрымала такое шчасце: бачу найяснейшую расійскую імператрыцу». Яе мосць царыца прамовіла: «Калі ты хочаш мяне бачыць дык будзеш месяца ў мяне пры двары маім, нават у маіх ніжніх пакоях». Тут павярнулася яе мосць царыца да тых кава-

лераў і дам, што стаялі каля яе, і сказала: «Мой бацька пасылаў некалі ў Парыж па слаўнага акуліста і прывёз яго сюды ў Пецярбург за вялікі кошт лячыць нейкага добрага сляпога прыяцеля, але ж той акуліст цэлы год бавіўся тут у Пецярбурзе і лячыў таго сляпога і шмат іншых, аднак нікога не вылечыў, а гэтая новая лекарка вылечыла прачку царэўны Лізаветы Пятроўны, як мне казала Марыя Юр'еўна, княгіня Чаркаская». Яе мосць царыца пыталася, як мяне завуць. Кажу: «Саламея».— «А бацьку?» Кажу: «Яўхім». Тады яе мосць царыца назвала мяне: «Саламаніда Яфімаўна, ідзі з маім надворным маршалкам у свой пакой, які табе прызначаны». Яе мосць царыца зноў дала мне пацалаваць руку. А сам яснавяльможны пан надворны маршалак адвёў мяне ўніз, у першы пакой пад пакоем яе мосці царыцы, і загадаў імем яе мосці царыцы тым дамам, што ў гэтым пакоі жылі (сямёра, а я восьмая), каб мяне шанавалі, на што тыя дамы з вялікай ахвотаю згадзіліся быць ласкавымі да мяне. Мяне раптам паклікалі да яе мосці царыцы, дык я нічога з сабою не мела, ні пасцелі, ні лёкаяў, але мне ложак паказваюць, засланы пад кармазынавым аксамітным балдахонам, і коўдру, таксама чырвоную аксамітную, пешкамі падшытую, бо ў Пецярбурзе надзвычай холадна, а гэта перад Божым Нараджэннем было. Так я шчаслівa засталася ў двары найяснейшае расійскае імператрыцы.





ЗАЙЗДРАСЦЬ ЛЕКАРСКАЯ

Я белагаловая, а кожная дама з большым даверам раскажа пра свае хваробы белагаловай, дык тут, як і ў іншых краях, было ў мяне вельмі шмат годных пацыентаў абодвух полаў як з імператарскага двара, так і з горада, і з іншых мясцін, якія хацелі лячыцца ў мяне, а я такое вялікае аптэкі не мела, каб лекі знайсці можна было, дык дала рэцэпт у аптэку, але лекар яе мосці царыцы забараніў у аптэцы, каб па маіх рэцэптах медыкаментаў не давалі, гаворачы пра мяне тое, што я, белагаловая, не ўмею лячыць. Тады я сама пайшла ў аптэку, просячы, каб мне лекаў прадалі; але дарма, прадаваць яны не хацелі.

Дык падгаварыла я адну даму, яе мосць пані Вільдову, капітаніху, якая мела вельмі хворыя вочы, каб яе мосці царыцы сказала, што прыдворны лекар забараніў прадаваць мне лекі. Даведаўшыся пра гэта, яе мосць царыца загадала мне прыйсці да яе, і я пра свае скаргі і хваляванні падрабязна распавяла, што ўсё тое толькі ад шчырай нянавісці ідзе, што яго мосць пан лекар мяне шчасця пазбаўляе. Я таксама зазначыла тое, што іншыя хваробы ні ў кога лячыць не

хачу, толькі вочы. Дык пайшоў адзін камер-лёкай[31] яе мосці царыцы да яго мосці пана лекара з загадам, каб мне дазволіў лячыць кожнага хворага на вочы, бо маё лячэнне і ўмелае і выпрабаванае.

Яго мосць пан лекар дазволіў, але я напісала рэцэпт не толькі на хваробы вачэй, але агулам і ўсім іншым пацыентам, што толькі хто лячыў, і падала ў царскую аптэку, бо ў Пецярбурзе добрых аптэк дзве, праўда царская, а другая ў Акадэміі. Як аптэкар прачытаў мой рэцэпт, адразу паслаў да лекара, а пан лекар быў вельмі халерычны чалавек і хворы на падагру, ён скакаў ад злосці і наракаў на мяне: «Што гэта за акулістка і ці можна лячыць вочы такімі лекамі?»

Бо пан лекар добра ведаў, што ў тым рэцэпце не ўсё да вачэй, але і да іншых хвароб таксама. І дайшло тое да яе мосці царыцы, што я на адным рэцэпце на дваццаць чалавек медыкаментаў узяла з аптэкі, і пыталася царыца яснавяльможная ў мяне: *«Саламанида Ефимовна, да скажи правду, свет мой госпожа докторша, чы тебе надобны тыя леки да глаз?»* З пакораю адказваю: *«Усемилостивейшая ассударыня, твой свет величество*, скажу праўду. Калі мне пан лекар з зайздрасці забараняе лячыць і купляць лекі ў аптэцы, дык пад гэтаю адгаворкаю я і для іншых людзей твайго двара ў адным рэцэпце напісала». Гэтым яе мосць царыца ўцешылася, бо я ёй праўду сказала, і мовіла такія словы: *«Добраумна, мой дружок, Саламанида Ефимовна»*.

Потым я заўсёды што хацела ў аптэцы брала, і каго хацела лячыла, і з ласкі Пана Бога Найвышэйшага шчасліваю была ў лекарстве сваім.



АВАНТУРА Ў МАЮ БЫТНАСЦЬ З АДНЫМ КНЯЗЕМ. КНЯЗЬ ГАЛІЦЫН З АДНОЮ ДАМАЮ З ВЕНЫ

Князь Галіцын[32] быў пасланы яе мосцю царыцаю Аннай Іванаўнай з пасольствам у Вену, у Аўстрыю, да імператара Карла Шостага. Дык князь Галіцын у дарозе забараніў сваім лёкаям, каб яны гаварылі, што яго мосць князь жанаты (меў ён жонку і дзяцей, а адну дачку выдаў за генерала). І вось гэты князь-пасол, прыехаўшы ў Вену, казаў, што ён не мае жонкі, што ён кавалер. Сярод іншых годных дам закахалася ў яго адна ўдава, генеральская дачка, якая была раней замужам за генералам, я, аднак, цяпер іх імён і прозвішчаў не памятаю, толькі тое, што тая дама была маладая, станістая, цуд прыгажосці, ведала розныя мовы, на розных інструментах іграла, голас надзіва мілы мела, я за сваё жыццё ніколі прыстойнейшых людзей не бачыла.

Князь Галіцын гаварыў пра яе мосці імператрыцы, гэта значыць Лізавеце фон Вольфенбытэль[33], жонцы імператара Карла, але тая дама яго не хацела, бо ён быў праваслаўнае рэлігіі, а яна — прававерная каталічка. Дык князь Галіцын перахрысціўся з праваслаўнае ў каталіцкую веру. І вось узяла шлюб з ім тая

жаданая яму дама, і вяселле справілі ў імператарскіх пакоях у Вене з вялікаю пыхаю і належнымі цырымоніямі.

Пасля заканчэння пасольскай дзейнасці забірае князь Галіцын жонку сваю з Вены і прыязджае з ёю ў Рыгу, а ў Рызе ён мовіў новай сваёй жонцы, з якой меў сына: «Мая мілая жонка, я ўзяў цябе з Вены з-за пачуццяў да цябе, але ж я вялікае злачынства ўчыніў супраць свае манархіні, што без яе волі асмеліўся ажаніцца, дык ты застанься, васпані, тут, у Рызе, патаемна, не кажы нікому, што ты мая жонка. Пакідаю табе пару коней, трое людзей і трыста рублёў на выдаткі. Сам жа я паеду ў Пецярбург і пацiху ўпрашу яе мосць царыцу і сам пасля пышна прыеду па вяльможную паню-дабрадзейку і вазьму з сабою ў дом мой і ў маёнткі мае».

І вось гэтая добрая пані з сынам сваім маленькім і з трыма людзьмі засталася ў Рызе і чакае вяртання свайго мужа, князя Галіцына, а князь Галіцын едзе проста ў Пецярбург, складае свае абавязкі перад яе мосцю царыцаю, а пасля ў свой дом, да жонкі і да сваіх дзяцей. Тая дама з Вены, другая жонка князя Галіцына, ужо грошы выдаткавала, доўга чакаючы свайго мужа і на шматлікія лісты не маючы адказу, ідзе гэтая добрая пані да суддзі[34], аднаго генерала, каменданта, просячы яго пазычыць колькі соцень рублёў, адкрываючыся яму, што яна генераліха і жонка пасла князя Галіцына. Адказвае суддзя-генерал: «Ці быць гэта можа? Князь Галіцын мае жонку, і дзяцей, і зяця-генерала». Дык гэтая засмучаная дама плача, лямантуе, адкуль яе такое няшчасце спаткала. Параілі ёй разумныя людзі, каб пра гэты эксцэс у супліцы да яе мосці царыцы распавядала.

Так і сталася. Пра ўсё праўдзіва і падрабязна распавяла яна яе мосці царыцы. Яе мосць царыца мела



Вена.
Гравюра пачатку XVIII ст.

літасць над гэтаю дамаю, паслала з Пецярбурга ў Рыгу запрэжаную шасцерыком каляску, колькі дзесяткаў людзей, тысячу рублёў на выдаткі і на даўгі тае ашуканае венскае дамы. Прыехаўшы ў Пецярбург, яна стала перад яе мосцю імператарскаю, як таксама і князь Галіцын. Пабачыла сама яе мосць царыца нявіннасць той дамы і загадала, каб князь Галіцын даў 4000 рублёў той мадаме, і ён вымушаны быў закласці сваю маёмасць. Але князь Галіцын не перастаў кахаць мадаму і сваімі хлуслівымі абяцаннямі, прысягамі, крывадушным плачам, пацалункамі ашукаў гэтую мадаму, і яна аддала добраахвотна тыя 4000 рублёў, бачачы ягоныя патрэбы. Гэтая

мадама і князь Галіцын у пэўных месцах часта сустракаліся. Даведаўшыся, яе мосць царыца сурова забараніла князю, каб ён ніколі ў мадамы не бываў. Князь у лістах назначае мадаме пэўную карчму, на якой напісана чырвонаю охраю, і каб апранулася па-мужчынску, як жаўнер, як таксама і князь Галіцын апрануўся па-жаўнерску, як гемайны, зайшлі сабе абое ў тую карчму і бавіліся тры дні звычайным півам, быццам яны два гемайны былі. Даведалася пра гэта яе мосць царыца, бо ім старанна цікавілася і ведала, дзе яны абое. Загадана капралу і чатыром жаўнерам, каб мадаму і князя ў тых ганебных мундзірах арыштавалі. Але тыя двое добра бараніліся, і іх не ўдалося арыштаваць, бо яны шчасліва ўцяклі. Праз дзве гадзіны стала мадама ў рагоўцы[35], як прыдворнай даме належыць, а князь таксама ў пышным адзенні, пры ордэнах, і знайшлі добрыя апраўданні, хоць і хлуслівыя. Аднак яе мосць царыца сурова, пад страхам вялікае кары, загадала, каб князь ніколі з мадамаю не бачыўся. Тут ці то з волі Божае, ці з паслугі мужа, князя Галіцына, памірае няшчасная княгіня, першая ягоная жонка.

Яе мосць царыца чакае да года, пакуль жалоба закончыцца па першай жонцы. Пасля просяць яго да яе мосці царыцы, і пачала яе мосць царыца дакараць, што па ягонай віне памерла тая годная ягоная жонка і за ўсе ягоныя вераломствы і ветранасць, і нарэшце мовіла наконт мадамы: «Пашліце сабе па духоўнага і прасіце шлюб ваш ранейшы канфірмаваць, ці зацвердзіць, і бяры сабе мадаму і жыві з ёю ў міры». Адказаў на гэта князь Галіцын: «Найяснейшая царыца, хоць жыцця мяне пазбаў, але я мадаму за жонку мець не хачу». Як гэта мадама пачула, дык страшным голасам закрычала і ўпала на падлогу, заразілася яна хваробаю св. Валенты, і вось яе непрытомную ў пакой

занеслі, а мой ложак і мадамавы ложак побач стаялі. Яе мосць царыца пыталася князя Галіцына: «Чаму бязбожны ты нелюдзь, тыран, звёўшы такую годную асобу, якая заўсёды вартая была годнага кавалера, ты яе цяпер не хочаш?» Адказаў князь: «Бо як мне ваша царская мосць забараніла бачыцца з мадамаю, я тым часам закахаўся ў сваю ўласную прачку, кахаю яе і жадаю яе мець сабе за жонку». Дык яе мосць царыца разгневана загадала з яго ордэн зняць, генеральскага звання пазбавіць і ў лёкайскую сукню апрануць, каб да стала паўміскі з кухні насіў і з талеркаю стаяў за плячамі іншых, ніжэйшых за сябе. З ахвотаю князь гэтую кару прыняў.

Пасылае яе мосць царыца па тую прачку, пагражаючы ёй смерцю, калі пойдзе за князя, пераконваючы яе, што той бязбожны генерал такіх дам звёў, што яна нявартая ім чаравікі выціраць, дык якое яе няшчасце чакае. Адказала прачка яе мосці царыцы: хоць бы і пэўна ведала, што яе муж заб'е, але даволі ёй таго, што хоць адзін дзень княгіняю Галіцынай будзе і сям'я яе простая ганарыцца некалі будзе, што княгіню ў родзе мелі. А бедная мадама станавілася ўсё больш хвораю, са смутку і самоты вар'яцела, дык я ўсялякія невыгоды мела з-за бяссоння гэтае мадамы, бо яе ложак стаяў каля майго ложка, і вось дзень і ноч на розных мовах яна наракала, лямантавала на няшчасце сваё і легкадумства князя Галіцына. Князь хоць чуў і бачыў, але яшчэ гэты нелюдзь і здзекаваўся з мадамы.

Яе мосць царыца, бачачы неспакойнасць мадамы, загадала паклікаць да сябе князя ў лёкайскім уборы і мадаму, а князь быў нізкага росту, а мадама высокага, дык мадама ў прысутнасці яе мосці царыцы і ўсёй прыдворнае світы бярэ зэдлік і з усёй сілы князю ў лоб б'е. Некалькі разоў князь уцякаў; а тут яго за

дзверы не выпускаюць, дык гэтая пагоня працягвалася доўгі час. На гэтае відовішча глядзела я амаль кожны дзень, ужо я і з Пецярбурга выехала, а мадаму звар'яцелую пакідала. Яе мосць царыца шмат абяцала князю, калі ён такую пакуту вытрывае: яму загадае паставіць лядовы палац з пакоямі, са сталамі, з кухняю, з ложкам, а ён каб са сваёй прачкаю на тым ложку пераначаваў без пасцелі, без футра, ён у суконным мундзіры, а яна ў камлётавых, без падшыўкі, сукенках. Гэта ўсё ахвотна згадзіўся вытрываць князь. Так і сталася.

Пасля рускіх Каляд у 1743 годзе, калі ў Пецярбурзе нязносна холадна, быў зроблены той палац цалкам. Былі на тым вяселлі дзівы розныя, бо ў Пецярбурзе ёсць кадэцкая акадэмія, дык уся акадэмія гуляла на тым вяселлі ў размаітых масках, на нейкіх размаітых конях з саламянымі свечкамі. Была там вялікая сціжма люду годнага, есці і піць шчодра дадзена, капэла. А пан малады з паннаю-прачкаю ў сваім пакоі, варта пастаўлена, каб ні вопраткі, ні напояў, ні вуглёў распаленых не падалі гэтаму малжонству. І вось яны вялікую ноч пераначавалі на голым лёдзе, а назаўтра раніцаю іх перад яе мосцю царыцаю паставілі, і мелі яны вялікую ад яе ласку: загадала вярнуць яму ордэн і ў пышны княжы строй убраць, і каляска, шасцерыкам запрэжаная, па іх прыехала, і вось абое, пышна, багата апранутыя, у каляску селі і ў палац свой паехалі. Як яны цяпер маюцца, я пра тое не ведаю.

Вышэй на старонцы 64[36] быў успамін пра аднаго кавалера ў Рызе, што забіў свайго капітана. Дайшла гэтая вестка да яе мосці царыцы, толькі не рада была гэтая святой памяці манархіня дазваляць праліццё

крыві, а тут выпадак складаны, мусіў быць дэкрэт на расстрэл яго мосці пана Бурмана, але ж пры яе мосці царыцы шмат дам служыла, а дамы зазвычай літасцівыя, вось і пачалася між імі размова пра таго пана Бурмана, і зычылі яму, каб яго Пан Бог вызваліў. Пачула я пра тую гутарку. Прасіла тых дам, каб і мне таксама распавялі ўсё, і вось тыя дамы, як чулі, так мне і распавялі. Я ім кажу: «Мае мілыя пані, лепш я вяльможным паням распавяду тую гісторыю, бо я ў той час у Рызе была і ўсю праўду пра тую авантуру ведаю, і як бязвінна той годны кавалер, не дай Божа, загіне».

Як тыя дамы гэта ад мяне пачулі, а найбольш Аўдоцця Хведараўна (муж яе быў генералам, камендантам у Смаленску), адразу пабеглі да яе мосці царыцы, паведамляючы, што наша *госпожа докторша* добра ведае пра тую авантуру капітана і харунжага Бурмана. Дык мяне хутка паклікалі да яе мосці царыцы, і яна ўнікліва пыталася ў мяне, ці ведаю я. Кажу, што: «Міласцівая асударыня *твой свет величество,* ці магла б я ў прысутнасці найяснейшае манархіні слова якое па-іншаму сказаць, толькі праўду, як Бог ведае, так добрасумленна і перад вашай царскай мосцю, калі маю аўдыенцыю, мовіць тое буду. Яго мосць пан Бурман, харунжы, меўся ажаніцца з адной годнаю дамаю, і ягоныя намеры былі добрасумленнымі, але яго мосць пан капітан на людзях сказаў, што твая дама, яго мосць пан Бурман, распусная нявеста. Яго мосць пан харунжы Бурман шчыра заступіўся за сваю даму, мудра і слушна яе гонар абараняў. Яго мосць жа пан капітан кажа: «Навошта яе васпан яго мосць пан харунжы, абараняеш? Я сам жыў з тваёю дамаю». Яго мосць пан харунжы мовіў: «Гэта быць не можа і не было, але я на вялікі заклад іду, што з першага разу змог бы

ад жонкі васпана, яе мосці пані капітаніхі, дабіцца ўзаемнасці». Пайшлі на заклад, а яго мосць пан харунжы — проста да яе мосці пані капітаніхі і адразу сказаў: «О, пані мая, не дай Бог, якога легкадумнага мужа ты маеш, які на людзях прызнаўся, што з пэўнай дамай кахаецца, і гэта прысягаю пацвердзіў». Яе мосць пані капітаніха: «Лёгка веру, пане харунжы, бо я век свой малады пакутую з гэтым кепскім чалавекам лёгкіх паводзін, бо ні мамкі, ні кухаркі трымаць не магу, бо заўсёды прыстойную белагаловую вазьму, а блудніцаю з дому майго адпраўлю». Нарэшце ён палуднаваў там і выпіў шклянку віна і сеў на ложку. У гэты час прыбягае яго мосць пан капітан з крыкам у свой пакой, з выхапленай шпагаю і робіць яго мосці пану харунжаму тры смяротэльныя раны, але Пан Бог выратаваў яго мосць пана Бурмана. Яго мосць пан Бурман крычаў: аднак жа гэта жарты, і мы пайшлі на заклад, але яго мосць пан капітан прагнуў смерці яго мосці пана харунжага, і вось яго мосць пан Бурман, неяк няўдала абараняючыся, адным рухам забіў пана капітана, і яго адразу арыштавалі; усё, што сама чула і бачыла, паведаміла вашай імператарскае мосці».

Яе мосць царыца: «Хвала Табе, Божа, што я такое добрае тлумачэнне і, як бачу, спрыяльнае для таго беднага арыштанта пачула». І адразу выдала загад, каб у Рыгу паехалі і яго мосць пана Бурмана сюды ў Пецярбург прывезлі. Так і сталася. Прыехаў хутка яго мосць пан харунжы і стаў перад найяснейшай яе мосцю царыцаю Аннай Іванаўнай, і загадала яму шчырую праўду сказаць, за што асмеліўся забіць свайго ўласнага капітана; яго мосць пан Бурман усё падрабязна слова ў слова распавёў пра сваё няшчасце і прычыны прыгоды, усё папраўдзе і добрасумленна, уласна так, як і я распавяла, а супраць-

леглы бок сам даў паказанні, што так і было. І вось атрымаў ён памілаванне і вялікую ласку з волі Пана Бога ў яе мосці царыцы, пажалаваны ў паручнікі ў кірасійскім[37] палку, гэта значыць стаў паручнікам Лейб-кампаніі[38], і так яму мовіла яе мосць царыца: «Дзякуй Пану Богу і пані лекарцы, што мне пра цябе добра і сумленна распавяла». Дык вось і ў Пецярбурзе сябравала я з яго мосцю панам Бурманам, паручнікам, і сярод шматлікіх людзей добрую славу мела, што я яму добрым словам дапамагла. Нават супрацьлеглы бок, гэта значыць бок памерлага яго мосці пана капітана, былі са мною ў сяброўскіх адносінах, бо той яго мосць пан капітан, нябожчык, быў неспакойны чалавек.

Аднаго разу папрасіў ён адпачынак, каб паехаць у Рыгу з паважнымі намерамі да свае даўняе дамы, хоць тут у Пецярбурзе меў ён шмат дам, што яму сваталі: паненкі і ўдовы багатыя і годныя, але ніводнай не хацеў, дык яму яе мосць царыца такую ласку зрабіла, што па яе сама паслала экіпаж, 15 чалавек і тысячу рублёў выдаткавала на дарогу, і вось яна, дама тая, з гонарам прыехала ў Пецярбург і стала перад яе мосцю царыцай, і яе мосць царыца хваліла яе і абаіх тут блаславіла, а хутка, на гэтым самым тыдні атрымаў ён патэнт на капітана ў кірасірскім палку. І справілі ёй дванаццаць пар пышных суканак, будуар, срэбраныя пудэлкі, два з чыстага золата гадзіннікі, табакеркі, парцьеру за 1000 рублёў над ложкам і шмат рэчаў, і маёнтак, і каляску, і коні, і шматлюднае вяселле ў царскім палацы. З Богам, у згодзе, вясёлых і здаровых пакінула я іх у Пецярбурзе.



ВЯСЕЛЛЕ
ЯГО МОСЦІ ПАНА КІЗЕРЛІНГА

Яснавяльможны яго мосць пан Кізерлінг[39], шамбелян найяснейшае яе мосці імператрыцы, пад час маёй бытнасці спраўляў вяселле з адной дамаю верхняга фраўцымеру. У ягоным почце былі ўсе міністры: яснавяльможны яго мосць пан Остэрман, яснавяльможны яго мосць пан Валынскі[40], яснавяльможны князь Аляксей Міхайлавіч Чаркаскі і шмат іншых паноў, кавалераў ордэнаў і незлічоная колькасць дам. Дыяментавая карона, кулянт[41] і бранзалеткі коштам 10 000 рублёў, ложак за 20 000 рублёў з табакеркамі і з будуарам, са шпалерамі, *et mobilia*[42], дванаццаць калясак, запрэжаных шасцерыком, парадныя каляскі, срэбранымі шынамі колы кутыя, былі ядвабныя шторы з золатам, срэбраныя, з пазалотаю бляхі з царскімі гербамі, каля кожнае каляскі два ганцы, шчодра ўбраныя ківеры на галовах, дыяментамі аздобленыя, залатыя жэзлы ў руках, аздобленыя дыяментамі, і кожны ганец, ці скараход, меў запаленую паходню ў руках. Гэты пышны парад быў ужо раней гатовы, бо таго ж года выдала яе мосць царыца замуж сваю нябогу за Ульрыха,



Стары Зімовы палац у Пецярбурзе, пабудаваны пасля 1727 г.

князя Гальштынскага[43], якая пасля смерці святое памяці Анны Іванаўны была спадкаеміцаю і царавала сем гадоў.

Гэтая цырымонія пачалася ад царскага палаца і доўжылася аж да палаца яснавяльможнага яго мосці пана Кізерлінга, шамбеляна, актора гэтага вяселля. Калі яны прыехалі, паводле расійскага звычаю, праз якую хвіліну ўцякае яснавяльможны пан малады ў адной толькі кашулі, у шлафроку, у начным каптуры і ў гальштуку, а начныя чаравікі яму павінна даць яе мосць маладая. Гэтыя рэчы былі коштам дзве тысячы рублёў. І вось яго мосць пан малады, як можа, уцякае ў іншы пакой, а тут да ягонага пакоя колькі ёсць людзей, годных дам, кавалераў старых, і маладых, і чужых, нават фурманы і конюхі — штурхаюцца ў пакой, дзе ложак панны маладое, і вось яе ў адной

кашулі ставяць на ногі і даюць яе мосці панне маладой вялікую срэбраную тацу ў рукі, на якой колькі дзесяткаў кубачкаў з чыстага золата,поўных цукровае гарэлкі, і вось кожнаму прысутнаму яна з пакораю падае, просячы, каб пілі, і кожны бярэ і п'е, і шчыра Пана Бога хваліць, і бласлаўляе маладых на шчаслівае жыццё і добрае здароўе, і каб блаславенне Божае мелі, і дочкі гэтай панны маладое, каб такімі ж цнатлівымі паннамі замуж пайшлі, «як і маці іх цяпер у вачах нашых цнатлівая панна з дару Божага». Пасля прыйшлі адзін пачцівы і прыстойны кавалер з дамаю замест бацькі і маці яго мосці пана маладога і прынеслі сабалінае футра, зялёнае, аксамітнае з дыяментавымі пятліцамі, шырокае і вельмі доўгае, і акрылі панну маладую, і павіншавалі яе, і паклалі на ложку, і ўсе прысутныя выйшлі ў іншыя пакоі, дзе ім далі шчодра есці і піць, царскую капэлу, танцы, скокі, як звычайна бывае на вяселлі.

Толькі цяпер яго мосць пан малады ціха таемнымі пакоямі прыходзіць да панны маладое, і яны просяць даць ім піць і есці, і застаюцца самі двое толькі са сваімі хатнімі лёкаямі і пакаёўкамі на 24 гадзіны, а пасля абое выходзяць, вельмі пышна ўбраныя, да людзей, што ўдзельнічалі ў вяселлі, і просяць людзей, каб весяліліся, і садзяцца абое на аксамітных крэслах і сядзяць. Як час быў абеду альбо вячэры, дык елі разам з гасцямі. Пра срэбраныя крэдансы і знешні выгляд пакояў, пра мундзіры людзей цяжка пісаць, так багата і стройна гэтае вяселле 8 дзён працягвалася, але пан малады і панна маладая не скакалі, толькі глядзелі і цешыліся; я іх у добрым здароўі пакінула ў Пецярбурзе.



АВАНТУРА КНЯЗЁЎ ДАЎГАРУКІХ

Ёсць фамілія шляхетная ў Маскве, князі Даўгарукія[44]; пасля смерці Пятра Аляксеевіча Вялікага, імператара расійскага, застаўся ягоны ўнук ад таго сына, што кажуць, быццам яго Пётр Аляксеевіч загадаў пакараць смерцю. Гэты ўнук меў гадоў 15, а князі Даўгарукія мелі сястру, разумную, гжэчную, пышную князёўну, але яна не хацела ў маладосці ісці замуж, бо роўнага сабе не мела, дык ужо мела гадоў 35. У гэты час яе браты, князі Даўгарукія, якія ў той час былі найбольш прыбліжаныя да двара расійскага, падгаварылі таго маладога цара, каб узяў іх сястру за жонку сабе. Ён, цар, як малое дзіця, рады, што яго жэняць, згадзіўся на гэта, але князёўна Даўгарукая ні ў якім разе не хоча і кажа: «Дзед ягоны, Пятро Аляксеевіч, кінуў бабку ягоную, так і мяне гэты малады цар пакіне, як пастарэе». Але на гэтыя скаргі не зважалі, толькі выдалі браты сястру сваю за цара, і адразу ж пасля вяселля, паводле звычаю царскага, загадаў цар пышна каранаваць сваю жонку, княгіню Даўгарукую, з парады і навучання чатырох братоў, князёў Даўгарукіх, якія яшчэ пры жыцці Пятра Аляксеевіча раілі яму першую


царыцу пакінуць, а другую жонку ўзяць і каранаваць яе. Так сталася, што пасля смерці свайго мужа, вялікага імператара Пятра Аляксеевіча, другая жонка, маці цяперашняй яе мосці імператрыцы Лізаветы Пятроўны, была сапраўды каранаванаю царыцаю і кіравала расійскаю дзяржаваю, пакуль жыла на свеце.


Так князі Даўгарукія хацелі зрабіць і сваёй сястры, каб пасля смерці свайго мужа, калі яго пераражыве, *настаяшчаю* царыцаю была. Але Фартуна інакш павярнулася, бо гэты малады цар хутка захварэў на воспу і, як быў хворы, хацеў у халоднай вадзе купацца, хоць лекар не дазваляў. Князі Даўгарукія дазволілі, дык той малады, бязвінны цар Пану Богу душу аддаў на вечнае збаўленне.

Вынялі яго мёртвага з ванны, паклалі на ложак, убралі ў багатае пышнае сабалінае футра і пасадзілі. І залез за парцьеру, як кажуць, адзін князь Даўгарукі, узяў руку нябожчыка ў сваю руку і пяро ў прысутнасці аднаго архірэя, вялікага прэлата, годнага і сумленнага чалавека, і гэты жывы князь ціхенька гаварыў што хацеў. Быццам бы малады цар сам тастамант піша, а сведкі — шматлікія міністры і архірэй Божы — чулі голас хворага цара і рукою напісаны тастамант, хоць гэта здрада была, бо ў пакоі цёмна было, удзень, пры свечках, сенатары і духавенства здалёку пазіралі, не дакучаючы хвораму цару. І яны засведчылі, што чулі і бачылі, як цар прамаўляў і пісаў, і падпісаліся за сведкаў на тым тастаманце, і толькі пасля паведамілі, што памёр цар, *alias* малады расійскі імператар.

Адразу ж пасля смерці маладога імператара села на трон княгіня Даўгарукая, жонка маладога імператара, і кіравала расійскаю дзяржаваю разам са сваімі братамі, але пачаліся вялікія хваляванні сярод раз-

маітых саслоўяў, «аднак жа мы маем спадкаеміцу па крыві ад Пятра Аляксеевіча Вялікага, імператара расійскага, гэта значыць Лізавету Пятроўну, а чаму кіруе намі нам роўная?» І вось зразумелі, што той тастамант быў не царскаю рукою пісаны. Дайшлі гэтыя размовы да вушэй князёў Даўгарукіх, і вельмі іх усхвалявалі гэтыя навіны, і раіліся яны між сабою: калі мы абяром імператрыцаю Лізавету Пятроўну, дык яна будзе нам помсціць за недагляд маладога цара, які быў сынам роднага брата Лізаветы Пятроўны, што дазволілі ці раілі хвораму на воспу купацца ў халоднай вадзе, і ён ад гэтага купання памёр. Таксама за тое, што абралі сястру сваю імператрыцаю, мінуючы сапраўдную спадкаеміцу, і што выдумалі тастамант, а таксама іншыя законы парушылі. Дык, маючы яшчэ моц і ўладу, паехалі ў Курляндыю і выбралі Анну Іванаўну.





ГІСТОРЫЯ КІРАВАННЯ АННЫ ІВАНАЎНЫ

Анна Іванаўна была дачкою Івана, роднага брата Пятра Аляксеевіча. Калі гэтая Анна Іванаўна была яшчэ маладою прынцэсаю, у яе бацькі Івана Аляксеевіча быў князь курляндскі[45] прыдворным кавалерам. Гэты кавалер быў годны, прыгожы, меў усе добрыя чалавечыя якасці, і вось па волі Пана Бога гэты князь курляндскі закахаўся ў Анну Іванаўну так, што яму цяжка і жыць без яе было, як таксама і Анны Іванаўна гэтага князя курляндскага ўзаемна пакахала. Тут даведаўся яе бацька, Іван Аляксеевіч, і быў супраць таго, каб ягоная дачка пайшла замуж за курляндскага князя, і так моцна забараніў, каб ужо больш ніколі дачка ягоная не гаварыла і не бачылася з курляндскім князем, ад чаго яны, прысягаючы ў вернасці, нясцерпны смутак і неспакой перажывалі ў пакоры і ў цярплівасці.

Але быў у князя курляндскага хлопец, які зваўся Бірон. Гэты хлопец быў годны шляхціц, добрае адукацыі, ведаў розныя мовы, ціхі, пабожны, цвярозы, верны і старанны на панскіх паслугах. Анна Іванаўна, прынцэса, таксама мела дзяўчыну-пакаёўку, над-

звычай верную, вясёлую і добрасумленную, якая пані сваёй ад усяго сэрца спрыяла і любіла яе, рада была ёй зоркі з неба даставаць.

Гэты Бірон, лёкай князя курляндскага, і пакаёўка Анны Іванаўны па загадзе пана і паненкі часта бачыліся, і Бірон ад князя курляндскага лісты перадаваў ў рукі пакаёўцы Анны Іванаўны, а пакаёўка Анны Іванаўны таксама лісты аддавала Бірону, каб перадаваў князю курляндскаму. Такое ліставанне доўгі час патрывала дзякуючы гэтым дваім верным лёкаям. Пасля, на гора, злавілі іх няшчасных з лістамі і моцна збілі абаіх па загадзе бацькі прынцэсы Анны, ды так сурова пакаралі, каб больш ніколі не наважыліся лісты насіць. Аднак пасля пакарання яны былі больш асцярожныя і ў вялікай таямніцы лісты насілі. Гатовыя былі не тое што пакаранне, а нават вечнае зняволенне альбо смерць вытрываць, толькі б паноў сваіх волі паслухмянымі быць.

Аднаго разу заспела Анна Іванаўна свайго бацьку ў добрым гуморы, кінулася яму ў ногі і сказала: «Тату мой і пане міласцівы, дазвольце мне, ваша царская мосць, быць клятваю злучанаю сяброўкаю князя курляндскага, за што і Бог сам і неба ласкавыя да цябе будуць, бо яшчэ ніколі кепскага прыкладу ў доме нашым расійскім не было. Крый Божа, каб я сама пачаткам чаго непрыстойнага была. Стаю перад табою, тату мой, маеш моц за мае смелыя словы ўладаю вашае царскае мосці загадаць зліта-вацца з мяне альбо пакараць».

Разважлівы бацька, убачыўшы звар'яцелую сваю дачку і значную перамену яе здароўя, дазволіў, але сказаў так: «Калі хочаш ісці замуж за каго сама хочаш, нічога ў пасаг не возьмеш з дому майго». Згодная Анна Іванаўна і без пасагу пакінуць дом бацькі свайго. Яна адразу пасылае князю з пакаёўкаю



Расійская імператрыца Анна Іванаўна.
Гравюра XVIII ст.

сваёю ліст, які атрымлівае Бірон і перадае стомленаму чаканнем свайму пану, князю курляндскаму. Як прачытаў князь такі чаканы ліст, дык адразу ж загадаў вызваліць усіх нявольнікаў у сваім княстве і 3000 рублёў раздаў у той дзень убогім. Пасля смела пайшоў у палац, кінуўся ў ногі Івану Аляксеевічу з годнымі панамі міністрамі, і прасіў рукі ягонае дачкі Анны Іванаўны, і запісаў ёй перад шлюбам сваё княства Курляндскае на вечнае карыстанне і ўсё, што мае і мець будзе. Такія пачуцці меў князь да жонкі свае.

Бірона таксама, хлопца свайго, з той гадзіны прызначыў маршалкам свайго двара, а Анна, жонка ягоная, прызначыла сваю пакаёўку першаю дамаю верхняга фраўцымеру. І вось праз столькі гадоў у царскіх палацах і пакоях, кожны зразумець можа, калі царская дачка замуж ідзе, якое пышнае вяселле было. Пасля забірае князь курляндскі жонку сваю Анну Іванаўну з Пецярбурга ў свой край у княства Курляндскае і там, шчасліва размясціўшыся, спраўляе надзвычай шчодрае вяселле Бірона з тою старэйшаю дамаю верхняга фраўцымеру.

Але ж князь яго мосць доўгі час не мог ажыццявіць свой намер ажаніцца з Аннай Іванаўнаю, дык ад цяжкага смутку і празмерных пачуццяў ён захварэў і так прасіў жонку сваю: «Усё, што я толькі маю, падараваў вашае царскае мосці, аб адным толькі прашу, памятай пра нашага вернага лёкая Бірона, бо што толькі яму добрага ўчыніш, тое Богу будзе і, уласна, быццам мне самому, бо тое, што нас Пан Бог злучыў на гэты кароткі час, што мы пацешыліся, ад Бога быў нам на дапамогу Бірон наш каханы, а я,— кажа князь курляндскі,— памерці мушу хутка, бо не чую сэрца ў сабе». Так і сталася. Пасля пераезду з Пецярбурга ў княства сваё ўдзельнае Курляндскае ра-

зам з жонкаю сваёю, жаданаю Аннаю Іванаўнай, імператрыцаю расійскаю, праз шэсць тыдняў са светам развітаўся і Пану Богу душу сваю аддаў.

Пасля смерці князя была ягоная жонка ў смутку і жалобе і загадала мужа свайго, князя, экзентэраваць[46], і знайшлі сэрца ягонае высахлае, толькі як галубінае яйка.

Пасля пышнага пахавання князя паклікала Анна Іванаўна свайго лёкая Бірона разам з жонкаю ягонаю і так мовіла: «Забяспечвайце мае невялікія патрэбы, абы толькі па-чалавечы жыць і госця прыстойнага прыняць магла. Я ўжо замуж, крый Божа, не пайду, а цябе, Бірон, прызначаю камісарам і намеснікам маім. Уладар і кіруй княствам мужа майго, толькі з хвалою Божаю і без крыўды людское. Я хачу задаволіць волю нябожчыка мужа майго і пана твайго, хачу прызначыць цябе спадкаемцам пана твайго і гэтага княства курляндскага». І вось з плачам, са смуткам і з вялікаю пакораю абое, ён з жонкаю сваёю, кінуліся ў ногі пані сваёй Анны Іванаўны і абяцалі ёй верна і старанна служыць да скону жыцця свайго, да апошняе кроплі крыві сваёй, калі б гэта патрабавалася, і таксама павагу і пашану абяцалі. Так і сталася. Пражыла Анна Іванаўна ўдавою ў княстве Курляндскім у спакоі, пабожна, колькі гадоў, а кіраваў Бірон.

Тут прыехалі з Пецярбурга чатыры браты, князі Даўгарукія, і кажуць ёй, што маюцца абраць яе сваёю манархіняй, імператрыцаю расійскаю. Адказала Анна Іванаўна: «Як жа гэта быць можа, калі жывая сапраўдная спадкаеміца Лізавета Пятроўна, родная дачка імператара Пятра? А як жа я магу панаваць, будучы далёка ад трона, бо я ж дачка царскага брата, Івана Аляксеевіча?»

Адказалі князі: «Прысягні толькі нам у тым і тым, што, уступіўшы на трон, стрымаеш, і не хвалюйся.

Лёгка цябе мы імператрыцаю расійскаю ўкарануем». Пасля доўгіх размоў згадзілася Анна Іванаўна і прысягнула таму, чаго хочуць і жадаюць князі Даўгарукія, і адразу выбіраецца ў дарогу да сталіцы Масквы, дзе па традыцыі імператараў карануюць. Блізка быў дзень каранацыі, дык, паводле звычаю, трэба было падрыхтавацца да сакраментальнай споведзі, і мусіла Анна Іванаўна спавядацца перад архірэем Божым, што абяцала князям Даўгарукім, а тое абяцанне супярэчыла старому праву і артыкулам царскіх продкаў. І вось ёй духоўны архірэй дазволіў: лепш прысягу парушыць, што давала Даўгарукім, якая супярэчыць Пану Богу і сапраўднаму праву, і лепей цяпер пры каранацыі прысягнуць таму, што належыць да справядлівасці і да айчыны. Каранаваная была Анна Іванаўна, імператрыца маскоўская, у 1730 годзе.

А князёў Даўгарукіх, чатырох родных братоў, загадана па ўказе найяснейшае імператарскае яе мосці Анны Іванаўны ўзяць пад арышт, і Анна Іванаўна пасля свае каранацыі паехала ў Пецярбург. Аднак князі Даўгарукія не думалі адмовіцца ад свайго намеру і, пад арыштам будучы, шукалі магчымасці выступіць супраць найяснейшае манархіні. І вось у бытнасць маю ў Пецярбурзе ў 1739 годзе па ўказе Анны Іванаўны загадана ўсіх братоў Даўгарукіх пакараць смерцю, і ўсе чатыры пад катаў меч пайшлі.

Тым часам я, узяўшы на дапамогу Пана Бога, дбала пра тое, каб сабе ў людзей рознага стану ласку мець, а найперш у яе мосці царыцы, хоць я заўсёды за гэта мела розныя непамыслоты, зайздрасць, што яе мосць царыца да мяне вельмі ласкавая была, але я гэта з ласкі Пана Бога цярплівасцю перамагла, нічога кепскага ні пра кога ў адказ не кажучы, і такім чынам зразумела, што маю надзвычай ласкавую найяснейшую імператрыцу.

У маю бытнасць быў там у няволі Ях'я-паша, турак паважны і выдатнага розуму, цудоўны мужчына, і Калчак-паша, таксама вялікае павагі чалавек, з гэтымі панамі мела я магчымасць хоць штодзённа размаўляць, што не кожнаму дазволена, але мае Ях'я-паша і Калчак-паша вельмі мяне шанавалі, паважалі справядлівасць маю, што я абодвум бакам усяго добрага зычыла, як маскалям, так і туркам, бо некалі такая спрэчка адбылася ў прысутнасці яе мосці царыцы.

Была там старая белагаловая Аўдоцця Міхайлаўна, што жыла ў Стамбуле ў няволі гадоў 40; адзін пасол Аляксандр Віснякоў выкупіў яе ў Стамбуле з няволі і прывёз у Пецярбург, і засталася з літасці ў яе мосці царыцы тая Міхайлаўна ў царскім двары. І пыталіся ў гэтае белагаловае пра звычаі турэцкія. Яна моцна хлусіла, выдумляла пра туркаў, што жалезнымі распаленымі абцугамі цела яе палілі і шмат разоў, купіўшы ёй абутак, насыпалі ў яго распаленых вуглёў і загадвалі ёй абувацца. Дык яе мосць царыца кажа мне: *«Саламанида Ефимовна, какая ты противница, ты гаварыш, как бы твои турки люди срадные, а посмотри, какие враги, как бедную Михайловну попортили»*. Адказваю: *«Смилостивиша асудариня, Михайловна врет,* няхай пакажа тыя знакі на целе сваім, дзе яе палілі». У мяне ў дзяцінстве быў парэзаны нажом палец, я паказваю: «Гэтаму парэзу ўжо больш дзесяці гадоў, аднак знак застаўся, дык і ў цябе, Міхайлаўна, павінны быць знакі, ці ты мусіла быць, даруй мне, зладзейкаю альбо якою распутніцаю і маглі б цябе і хрысціяне мучыць, не тое што туркі. Я, дзякуючы Богу майму, паехала ў Турцыю ў маладыя гады мае, у чатырнаццаць гадоў, з мужам маім, але ў мяне ніводзін турак нічога не ўзяў, не біў, не лаяў, бо я заўсёды кепскае кампаніі асцерагалася.



Пецярбург.
Неўскі праспект у XVIII ст.

Прытым калі турак купіць каня альбо карову ці нешта падобнае, ён іх корміць, гадуе, а за нявольніцу трэба даць колькі соцень леваў і паліць ёй ногі, калечыць? Гэта ніколі быць не можа». Так яе мосць царыца пагадзілася з мае праўдаю і сумленнасцю.

Даведаліся пра гэта мае два пашы, якія ў той час у няволі былі ў Пецярбурзе, Ях'я-паша і Калчак-паша і іншыя годныя туркі, што я адстойваю праўду пра туркаў і не даю беспадстаўна зняслаўляць іх гонар, надзвычай былі задаволеныя і абяцалі мне шмат добрага засведчыць, калі Пан Бог вызваліць іх шчасліва з маскоўскае няволі.

Аднойчы ўбачыла я найяснейшую імператарскую

яе мосць ласкаваю да сябе, дык прыніжана прасіла яе, каб яна паслухала мае нягоднае просьбы і падарыла мне двух туркаў, нявольнікаў з горада Рушчук, на гэта яна мне ласкава адказала: «Толькі двух туркаў? Я табе і чатырох туркаў падарую». Я разумела, што сказаць лёгка, а пасля гэта забудзецца. Ёсць іншыя патрэбы, хто пра мае інтарэсы помніць будзе, але дакучаць пра гэтую рэч баялася, каб не апрыкраць. Аддалася цалкам на волю Пана Езуса і пайшла тае начы спаць.

Назаўтра падымаюся і знаходжу ў сябе ля падушкі загад з царскаю пячаткаю на вызваленне чатырох туркаў: з фартэцыі рэвельскае двух і двух з фартэцыі нарвскае. Я супакоілася, бо мяне Бог мой пацешыў у намерах маіх, дык з гэтага дня пачала я старацца пра дазвол, каб магла выбрацца з маімі туркамі ў дарогу, у Польшчу.

Быў там адзін міністр Арцём Пятровіч Валынскі. Мяне аддалі яму ў апеку, каб забяспечыў мяне і мае патрэбы на дарогу. Запрасіў мяне той міністр з сабою ў міністэрскі палац. Аднаго дня пачаў са мною той міністр Валынскі размаўляць, колькі будзе каштаваць дарога з Пецярбурга да Польшчы мне, людзям маім і туркам маім. Даволі, кажа, рублёў пяцьдзесят. Вельмі мне не даспадобы быў гэты кепскі план скнары міністра, бо то не з яго ласкі, а з ласкі Пана Бога і найяснейшае яе мосці царыцы. Дык я, паціху забраўшы свае рэчы, перабралася ў палац Аляксея Міхайлавіча, князя Чаркаскага, майго вялікага дабрадзея, што меў жонку Марыю Юр'еўну, княгіню Трубяцкую, якой я з Польшчы, з Вільні лісты прывезла ад аднае сенатаркі, што была за Дуніным, княгіні Трубяцкое. Паскардзілася я князю яго мосці Чаркаскаму, які таксама быў міністр, што мне яснавяльможны яго мосць пан Валынскі толькі 50 рублёў на да-

рогу дае, а ён яе мосці царыцы паскардзіўся, і загадала яна мне яшчэ раз да яе прыйсці.

Стала назаўтра я перад яе мосцю царыцаю, якая мне вельмі лёгка аўдыенцыю дала, і руку пацалаваць, і смяялся: «Дык гэта табе так міністр Валынскі дапамог?» Адказваю: «Найяснейшая манархіня, усё ж гэта не доўг. Я і за гэтую дробязь прысягáю Пана Бога прасіць заўсёды за вашае царскае мосці здароўе і шчаслівае панаванне». Дык мне яе мосць царыца загадала са скарбцу свайго адлічыць 1000 рублёў, тканіны, кубкаў вялікіх 12 і кубкаў малых срэбраных 12, нават сурвэтак тузін з царскімі гербамі ды іншае, за што я, укленчыўшы перад Богам і гэтаю манархіняю, паводле звычаю, падзякавала Пану Богу і гэтай манархіні, дабрадзейцы маёй, і развіталася з ёю, і ўзяла бласлаўленне з вуснаў яе, і развіталася ў двары з усімі знаёмымі і прыяцелямі маімі, і вярнулася зноў у палац князя Чаркаскага.

Але пані мая з ласкі Бога дабрадзейка, яе мосць царыца падумала сабе, што цяпер дала мне 1000 рублёў і галантарэі ўсякае і вызваліла мне чатырох туркаў-нявольнікаў і, баючыся, каб мяне праз тыя грошы туркі ў дарозе, крый Божа, не забілі, загадала яшчэ адзін указ даць, абы мне ў Нарве пасля выдання першых двух туркаў далі канвой, гэта значыць капрала, і шэсць жаўнераў, якія б мяне суправаджалі аж да Польшчы, да маёнткаў светлых князёў Радзівілаў, да Біржаў.

І вось я развіталася з князем Чаркаскім, панам маім, і княгіняю Марыяй Юр'еўнаю (з дому князёў Трубяцкіх, жонкаю гэтага князя), і дачкою іх Варвараю Аляксееўнаю, і з усім дваром іх пабожным, усялякае пахвалы ад Бога і ад людзей вартага. Гэта княжна Варвара Аляксееўна пайшла хутка замуж за князя Шарамецьева, вялікага князя, сведчу

Богам і не таму хвалю, што мне шмат у чым спрыялі, бо калі спытацца ў таго, хто быў у гэтым краі і ведаў тых дам, той мяне падтрымае. Ах, Пане Божа, калі хто з іх жывы, дай ім, Божа, шчасця, аман.

Я выехала з Пецярбурга ў Нарву, заехала да яснавяльможнага яго мосці пана Тараса Абрамавіча Шацілава, генерала і каменданта тае фартэцыі, і пакажала свой ардынанс. Мне ён выдаў са свае фартэцыі двух сіпахаў[47], гэта значыць вайскоўцаў, і ў Нарве ўзяла сем жаўнераў канвою, двух туркаў і паехала ў Нарву[48] і там, прыехаўшы, спынілася ў адной аўстэрыі, бо не адважылася да пана генерала, таму што не была знаёмая з ім, як у Нарве.

Але як даведаўся яго мосць пан Бісмарк, генерал і камендант фартэцыі рэвельскае, пра мой прыезд, дык адразу ж паслаў па мяне экіпаж, і я пераехала ў ягоны палац. Прачытаўшы ардынанс найяснейшае царыцы, з вялікаю ахвотаю аддаў мне той годны кавалер двух туркаў-янычараў, таксама з Рушчука, бо я сама, прынамсі, з Рушчука хацела, і не дазваляў мне тры дні ў дарогу выязджаць, таму што лютая зіма была. Бог яму заплаціць за дабрадзейства і спагаду, якія мне гэты цудоўны кавалер засведчыў, бо я штодзённа з яго мосцю і з ягонаю паняю генераліхаю па некалькі візітаў рабілі да найвыдатнейшых асоб у горадзе Рэвелі разам з самім панам генералам Бісмаркам і ягонай жонкаю ў адным экіпажы, запрэжаным шасцерыком, і вельмі нам усюды радыя былі, і гэта ўсё ішло з ласкавага сэрца абаіх ягамосцей, хвалілі мяне за маю адвагу і добрасумленнасць, што такога дабіцца ў яе мосці царыцы змагла белагаловая, чаго і мужчыне цяжка.

Развітаўшыся з генеральскаю сям'ёю і ўсімі добрымі прыяцелямі і знаёмымі, паехала я з Імем Бога ў Рыгу з двума людзьмі маімі, гэта значыць з пачці-

вым пабожным чалавекам Бенядыктам Скалубовічам і з другім сякім-такім Юзафам Бяліцкім, з чатырма туркамі, сем жаўнераў-маскалёў канвою, адною маскоўскаю кібіткаю, ці будкаю, запрэжаную шасцерыком, якую мне падаравала яе мосць царыца, вазком, запрэжаным чацвёркаю коней, і двума коньмі і санямі для туркаў. Так мы шчасліва паехалі з Рэвеля ў Рыгу.





АВАНТУРА Ў ДАРОЗЕ НА НАЧЛЕЗЕ

Мы выехалі з Рэвеля і праз больш чым дзесяць міль спыніліся на начлег у добрай, чыстай аўстэрыі. Але ж мы і слова іх мовы не ведалі, а яны нашае (гэтыя людзі завуцца цухны[49]), і засталі мы там колькі чалавек п'яных, што лаяліся. Дык мы ім без цырымоній загадалі выйсці, у плечы і ў карак выштурхалі, зачынілі таксама добра карчму, толькі адзін чалавек надта п'яны за печчу ў куце спаў, пра якога мы ніякага *dubium*[50] не мелі. Але ў гэтай карчме з ласкі Пана Бога была адна старая белагаловая, якая была полькаю з горада Вільні, з Літвы, і пад час нейкае руіны[51] маскоўскае трапіла ў маскоўскую няволю, і нейкім чынам стала служыць у гэтай карчме, і яна зразумела, што я полька, бо чула, як я са сваімі людзьмі па-польску размаўляла, дык як толькі я спаць уклалася і свечкі патушылі, прыходзіць тая старая белагаловая да майго ложка і ціхенька мне на вуха кажа: «Пані мая, шкада мне цябе, што ты тут, у гэтай карчме, памерці мусіш. Дарма твой ардынанс, туркі і жаўнерскі канвой, бо гэты гаспадар і ўся вёска заўсёды адно ведаюць,

каму няшчасце выпадзе: ці купцу, ці пану, дык ужо з гэтае карчмы ніколі не выберуцца. А той п'яны чалавек на тое за печчу, каб адчыніць і даць знак колькім людзям, і вас уначы перарэжуць».

Як я гэта пачула, дык шчыра паверыла і падаравала той белагаловай рубель, а сама пайшла да сваіх сямі жаўнераў, якія мелі флінты і патранташы, даволі пораху і куль, распавяла таксама і маім чатыром туркам пра гэтую навіну і так замаркоцілася і пачала каяцца, як перад смерцю, і прасіла шчыра Пана Бога заступіцца.

Я параіла сваім людзям, каб адразу запалілі свечкі і гаспадару соннаму дзве флінты да грудзей прыставілі, а пасля звязалі, як і таго за печчу чалавека, і загадалі ім маўчаць, бо з багнетам стаяў над кожным жаўнер, і мы на мігі паказвалі гаспадару, што як толькі з вёскі людзі на нас нападуць, дык вы з жонкаю, з дзецьмі, з лёкаямі раней загінеце. Значыцца, мы чакалі літасці Пана Бога, а мужыкі ў вёсцы чакалі свайго шпега, які павінен быў з карчмы прыйсці і ім паведаміць, ці мы добра спім. Так нямала часу прайшло.

Ужо пасля паўночы пачалі мужыкі самі збірацца і паціху клікаць гаспадара, шпега, лёкаяў, а мы адусюль вокны фіранкамі і каберцамі завесілі, каб тыя мужыкі не бачылі, што ў хаце дзеецца. Але ж тым дурным гіцлям вытрымкі не хапіла, і пачалі яны гучна крычаць і ў дзверы ламіцца. Я прасіла тых маіх раз'юшаных жаўнераў, каб, як могуць, дысымулявалі[52], першае, у гэтай справе не рада я страціць аніводнага вайсковага чалавека найяснейшае манархіні і дабрадзейкі маёй, другое, не варта на вецер без патрэбы ўначы порах і кулі траціць. Тут мае чацвёра туркаў узялі па вялікай палцы ў рукі і крычалі пасвойму: «Аллах!»,— разоў сто паўтараючы. Тым

дурным людзям здалося, што гэта ўначы яшчэ сотня туркаў прыехала, бо што гэта за крык і стуканне палкамі. Але тыя шэльмы толькі ямчэй узяліся за дзверы і ўжо выламалі адну дошку. Праз гэтую дзірку застрэлілі жаўнеры нашы насмерць трох чалавек. Звязаны гаспадар вішчаў, як казёл, прасіў іх, каб адступіліся ад свайго намеру, бо ён мусіць раней памерці з усім домам сваім, бо ляжыць збіты, звязаны і шпег побач з ім. Аднак тыя бязбожнікі не перасталі, дык мой чалавек, Бенядыкт Скалубовіч, малады, здаровы, сумленны, прававерны католік, вынайшаў такое. Кароткаю палкаю знянацку, як хто толькі сунуўся да дзвярэй, так біў у грудзі, што ўжо больш той не падымецца. Так некалькіх тых злачынцаў ледзь не на смерць пазабіваў. У такім страху і, баронячыся, заставаліся мы ад поўначы аж да самага дня, а тых хворых і параненых і забітых дахаты заносілі, а замест іх здаровыя, свежыя і раз'юшаныя людзі прыходзілі.

Аднак з ласкі свае Пан Бог паслаў аднаго вялікага пана, маскаля, які праязджаў непадалёку ад карчмы, дык мае маскалі колькі змогі клікалі на паратунак.

Ён спыніўся, выслухаў нас, пецярых ліхадзеяў злавіў і загадаў звязаць. Сам, той пан маскоўскі, паслаў у двор, але там быў мізэрны падстараста, дык гэты пан сам распараджаўся, абяцаў тую вёску выклікаць у суд і пакараць — усіх павесіць. Як той маскаль зваўся, я запісала, але згубіла, і цяпер не ведаю ягонага імя. Але даволі, Бог яму заплаціць, і станецца ён анёлам.

Пасля шчасліва прыехала я ў Рыгу, а з Рыгі ў Біржы, ва ўладанні светлых князёў Радзівілаў, і адтуль назад адаслала свой канвой, сем маскалёў, дала ім ад сябе пасведчанне, што мяне пільна і старан-

на ахоўвалі, і дала ім кожнаму па чырвоным злотым, і вярнуліся яны ў свае межы.

Але мне тут у Польшчы цяжэй стала з капейкі жыць, і куды прыеду, у малое мястэчка альбо вёску, адразу пытае кожны шляхціц: хто я, дзе ўзяла гэтых туркаў, цэлы дзень на адказы пойдзе, і ніхто мне і жмені сена не дае. Толькі з ласкі Пана Бога з Біржаў у Вількамір[53], у Вільню, і гэтак далей прыехала ў Карэлічы, пад Наваградак, і тут застала светлага князя яго мосць Міхала Радзівіла, вялікага літоўскага гетмана, з яе мосцю княгіняю, і мне адразу ўначы загадалі з туркамі ў замак прыехаць. Значыцца, князь яго мосць і княгіня яе мосць аглядалі мяне і туркаў маіх, і дзівіўся князь яго мосць, што блаславіў мяне Пан Бог у намерах маіх, бо як сабе зычыла, так мне мой Бог даў, што прывезла тых туркаў, па якіх ездзіла.

А мужа майго, яго мосць пана Юзафа дэ Пільштына, не застала ў той сітуацыі, у якой яго пакінула. Ён патраціў маю маёмасць, якую яму пакінула, ад'язджаючы ў Маскву, а князь яго мосць загадаў мужу майму з Карэліч ехаць у Нясвіж, а з Нясвіжа ў Лахву[54] на Палессе, і тыя туркі са мною, дык мела выдаткі. Пасля я хацела з тымі туркамі ехаць зноў у Турцыю, у іхні край, але ж мне князь яго мосць Міхал Радзівіл забараніў гэтае падарожжа і так мне мовіў: «Мы маем даўні пакт з туркамі, і не варта нам туркаў у Польшчы ў няволі мець». І адабраў ад мяне маіх чатырох туркаў, справіў ім вопратку, даў ім канвой і адаслаў да пашы бендэрскага, а з Бендэр[55] яны шчасліва даехалі да Рушчука над Дунаем, у Турцыю, да дому свайго.

Дык я засталася вельмі маркотная з усіх бакоў, толькі на Бога ў Тройцы Святой Адзінага надзею і веру маю.

Я цяпер усё пра маскоўскі край і ягоныя звычаі пісала, дык тое, што пэўнае чула, дзеля пацехі чытача распавяду. Трэба ведаць, што з даўніх часоў звычай маскоўскіх цароў такі быў, калі хацеў жаніцца які царэвіч, спадкаемца трона, дык мусіць мець поўных дваццаць пяць гадоў, і калі набліжаўся час ягонае жаніцьбы, тады пісаліся лісты па цэлым краі ягоным: кожны пан, альбо князь, альбо бязродны дваранін, які меў адно пекную дачку, мог прыехаць на царскі баль разам з дачкою. Так збіралася некалькі тысяч паненак, і штодзённа баль давалі ў царскіх палатах, елі, пілі, таньчылі, а пасля выбіралі з усіх, што былі на балі, колькі з найпекнейшых, а астатніх з бацькамі з пашанаю дахаты ці ў маёнткі іхнія праводзілі, кожнай даме сукенку новую справіўшы і значны падарунак даўшы: пярсцёнак, альбо гадзіннік, альбо таксама бранзалеткі, ці іншае. І вось пасля тых баляў і праводзінаў заставаліся найпрыгажэйшыя, найпякнейшыя дамы, а на апошнім балі ўжо з гэтых найпрыгажэйшых адну сабе царэвіч паненку выбірае па гусце сваім, з ёю шлюб бярэ і з ёю аднмою ўжо жыве, але не з удавою, толькі з паненкаю.

Але як быў Пятро Аляксеевіч малады прынц, ягоная маці пагрэбавала тым звычаем збіраць паненак, толькі сама, выбраўшы адну годную даму на свой густ, дала ў малжонкі свайму сыну Пятру Аляксеевічу. Узяў ён з ёю шлюб: раскошнае было вяселле, і жыў з ёй добра, пабожна шмат гадоў, і меў з ёю сыноў, дачок. Аднаго сына[56], вывучыўшы добра, ажанілі з дамаю з роду Вольфенбытэль, роднаю сястрою той Лізаветы, што была жонкаю рымскага імператара Карла Шостага і што родная маці Марыі-Тэрэзы[57], імператрыцы цяперашняе рымскае, якая жыве ў Вене, у Аўстрыі, у Немцах. Гэты сын Пятра Аляксеевіча,

расійскага імператара, меў са сваёй жонкаю фон Вольфенбытэль сыноў і дачок.

У гэты час пачалася вайна маскоўскага цара са шведамі[58]. Заўсёды шчаслівы, шведаў ён перамагаў, нязменна ў палон па некалькі тысяч браў, як і пад Палтаваю, такую славутую і векапомную вікторыю атрымаў над шведскім каралём, што безліч войска шведскага паклаў, а кароль шведскі мусіў у Бэндэры да туркаў уцякаць.

На гэтай вайне, будучы ў ростані са сваёю царыцаю, Пятро Аляксеевіч заўважыў сярод нявольніц адну прыгожую даму, шведку, якую звалі Кацярына[59]. Закахаўся ён у яе і вырашыў за жонку сабе ўзяць, а першую[60] ад сябе аддаліць. Так сталася, што, закончыўшы тую шведскую вайну і прыехаўшы ў сваю сталіцу да жонкі і дзяцей, сабраў ён духавенства і сенат свой, жонку сваю першую, царыцу, і так мовіў да епіскапаў, сенатараў і міністраў: «Ведаеце добра звычай наш маскоўскі, калі цар жэніцца, дык яму жонку на выбар, якая спадабаецца, даюць (так, як я ўжо гэты звычай апісала вышэй з царскім вяселлем), а мяне маці прымусіла, каб жонку маю ўзяў. Жыў я з ёю шмат гадоў, а цяпер не хачу з ёй больш жыць, бо прымушаны быў, а калі хоча мая жонка замуж ісці, развядуся з ёю і няхай мне скажа, каго хоча, той мусіць яе ўзяць і з ёю добра жыць. Калі хоча з дзецьмі сядзець, будзе ўсялякі гонар і павагу мець, як маці царскіх дзяцей». Тут царыца, першая жонка Пятра Аляксеевіча, абазвалася: «О, цар, мужу мой, а ці можаш ты мяне, жонку сваю, замуж аддаваць? А ці магу я цябе пакінуць? Туга і журба сэрца майго не дазваляюць мне зрабіць гэта». Пятро Аляксеевіч кажа: «Гэты свой намер перамяніць не магу, бо цябе ўжо не хачу». Тады царыца кінулася яму ў ногі і прасіла, каб яе разам з усім фраўцымерам у кляштар

адправіў, хоча яна скасаваць шлюб і стаць манашкаю да канца дзён сваіх. Гэта цар лёгка дазволіў, загадаў з вялікаю пашанаю ў манастыр яе з усім фраўцымерам адвезці і ў той самы манастыр прызначыў епіскапа і больш за дзесяць базыльянцаў, якія б імшу, ці службу Божую, адпраўлялі б, спаведнікамі былі і дзеля пацехі яе мосці царыцы.

Так і сталася. Апранула яе мосць царыца мнішаскі строй і ўвесь фраўцымер яе таксама, хутка скасавалі шлюб, і сталі сапраўднымі манашкамі з вялікім дастаткам і выгодамі, якія надаў Пятро Аляксеевіч таму кляштару, дзе царыца ягоная стала мнішкаю.

А цар Пятро Аляксеевіч мусіў прысягаць у кансісторыі, што яго жонка Кацярына-шведка была паненкаю, бо яго духавенства папярэдзіла, што маскоўскі цар ніяк жаніцца не можа з удавою. І вось ён сабе вельмі пышнае вяселле справіў з тою Кацярынаю-шведкаю, другою жонкаю, і меў з ёю сыноў і дачок, адна з дачок, як мне вядома,— цяперашняя яе мосць імператрыца Лізавета Пятроўна.

Тут той сын выданы, ці жанаты, Пятра Аляксеевіча, што быў жанаты з фон Вольфенбютэль, вельмі ўгневаўшыся на мачыху сваю Кацярыну-шведку, так мовіў ёй: «О, прасі Пана Бога, каб доўга жыў яго мосць цар, муж твой, бо калі бацька мой памрэ, а ты застанешся, дык цябе лютай смерцю забіць загадаю». Гэтая другая жонка царская вельмі перапалохалася тае пагрозы, кінулася цару ў ногі, каб развёўся з ёю і каб лепш жыў добра з першай жонкаю, царыцаю сваёю, і распавяла пра тую пагрозу, што сын абяцае пасля смерці ягонае ўчыніць. Разгневаны Пятро тут жа хацеў павесіць свайго сына гакам за рабрыну, але другая жонка з плачам, з лямантам прасіла цара, каб сына свайго не караў, і ўсё духавенства, і ўсе міністры, паны прасілі, каб сыну свайму жыццё

даравaў. Ды цяжка раз'юшаны бацька не хацеў яму даравaць ні ў якім разе. Тады міністры, баючыся і саромеючыся іншых парадаў, абы не мовілі, што бацька-тыран сына свайго замардаваў, і, баючыся, каб яго ў шаленстве не мучыў доўга, параіліся з дасведчаным лекарам, як бы яго забіць. Параіў той, каб маладому царэвічу не давалі спаць восем дзён і начэй, а пасля дазволілі спаць колькі хоча, дык ён захварэе на летаргію і памрэ. Так і сталася. Не давалі яму спаць восем дзён, а пасля дазволілі спаць колькі хоча, дык ён захварэў на летаргію і памёр. Застаўся пасля яго сын, што, як я вышэй распавяла, ажаніўся з княжною Даўгарукаю і праз воспу памёр.

Тым часам узбунтавалася маці таго маладога царэвіча, што з летаргіі памёр, і не хацела больш сядзець у манастыры; яна скінула строй мнішаскі, апранула свецкі строй і пачала на злосць цару пахваляцца, як раней была царыцаю, і ўсё гэта з цэлым фраўцымерам сваім, а ў кампанію брала дадзенага ёй епіскапа. Даведаўшыся, што першая жонка выйшла з манастыра, Пятро Аляксеевіч баяўся бунту, бо яна была ўкаранаваная разам з ім і, па звычаю тутэйшым, магла войскам кіраваць, дык угневаны цар кінуўся туды і, дзе яе знайшоў, сам, сваёю рукою, абухом сякеры перабіў абедзве рукі і ногі, што ніколі ўжо больш хадзіць не магла і рукамі валодаць, а епіскапа яе жыўцом у агонь укінуў, а як той памёр, дык цела цалкам не паліў, дам усіх загадаў бізуном біць і зноў у манастыры пад суроваю вартаю трымаць. Епіскапа, якога спаліў, шкадаваў, плакаў, сам з ім у той момант памерці хацеў, вельмі пышнае пахаванне наладзіў і сам за трунoю нябожчыка епіскапа ішоў і крычаў: «Ойча мой, даруй мне, бо не ведаў, што ў шаленстве чыніў». Адна дама, калі яе бізуном па голых плячах і ніжэй біў чалавек, якому гэта было загадана, і ненаў-

мысна стукнуў ёй па грудзях, дык яна ў прысутнасці цара моцна яму ў пысу дала, што той паваліўся. Угневаны цар кажа: «Як можаш ты ў маёй прысутнасці чалавеку майму поўху даць, які цябе па маім загадзе білавеку майму поўху даць, які цябе па маім загадзе білізуном б'е?» А тая дама адказала: «Найяснейшы цар, загад твой па плячах біць быў, а не па грудзях. За тое яго стукнула, што не выконваў загад царскі». Дык цар засмяяўся і ласку праявіў: аддаў яе ў верхні фраўцымер другое свае жонкі, Кацярыны-шведкі.

Гэты цар, Пятро Аляксеевіч, за сваё жыццё край свой вельмі добра і пахвальна сфармаваў. Першае, разбойнікаў і ліхіх людзей так панішчыў, што не толькі старых і маладых на адной шыбеніцы па некалькі соцень загадваў вешаць, але і жонак і дзяцей павырэзваў, абы благога зародку ў ягонай краіне не было, бо нельга было ні купцу, ні пану, аніякаму чалавеку праехаць. Другое: даў мундзіры свайму войску і маршыраваць загадаў вучыцца, размаітых настаўнікаў, а менавіта: французаў, немцаў, італьянцаў і латынян дзеля моваў размаітых і дзеля аздобы свайго краю наняў, як я сама бачыла ў Пецярбурзе, амаль у кожнага афіцэра альбо купца ёсць розныя настаўнікі і танцмайстра, амаль у кожным доме, а асабліва ў штабс-афіцэраў і міністраў. Розныя фабрыкі: сама я купляла аксаміт, градэтур[61], залатыя галуны, залатыя кампанкі[62] з пецярбургскае фабрыкі; і там, дзе былі балоты, дрыгва, там цяпер масты каменныя і драўляныя і пяском роўна высыпаныя, на кожнай мілі пяць слупоў з надпісамі па-маскоўску, па-нямецку і па-лаціне, куды ехаць і як далёка.

Па дарозе частыя аўстэрыі з вялікімі выгодамі, і ўсё танна, нельга дарага прадаваць, бо кошт на дзвярах напісаны, а мера праверана, а бедным падарожным і дарма есці і піць даюць. Пецярбург такі прыгожы, такі велічны пабудаваў над Нявою, што

лепшы і мілейшы за Стамбул і Вену ў Аўстрыі, бо Стамбул хоць і вялікі, шыкоўны бязмерна, але стары горад: тут палац за тысячу кес, а тут кузня, дзе коней куюць, а тут бакал, што агуркі і гарбузы прадае. І Вена, дзе імператар хрысціянскі рэзідэнцыю мае, тое самае: тут шыкоўны кляштар, а тут халупка якога мясніка альбо бакалара, адным словам: тут стары дом, тут новы палац. Але Пецярбург ах які прыгожы і дыхтоўны, такія доўгія вуліцы, што некалькі соцень камяніц альбо палацаў усе аднолькавыя па вышыні і адзін ля аднаго роўна стаяць, і здаецца — адна сцяна. Асобныя палацы меднай бляхаю крытыя, каля кожнай камяніцы размаітыя дрэвы, ліпы, нават у залеву чалавек не змочыцца, ідучы пад стрэхамі. Вуліцы такія шырокія, што шэсць калясак размінуцца могуць. Нідзе драбніцы смецця альбо бруду не відаць, бо як просты мужык з горада выязджае, дык мусіць даць дзве капейкі, а калі смецце альбо гной возьме, хоць адну жменю, ужо дзвюх капеек не дае; а як у горад мужык заязджае, дык мусіць дрэва альбо камень прывезці, а не прывязе, мусіць даць дзве капейкі. Гэта дрэва і камень — на рэпарацыю мастоў па малых вуліцах. Хлеб, мяса, рыба, сыр, масла вельмі танныя, з садавінаю крыху скупей. Вялікая вольнасць і спакой добрым людзям хадзіць, ездзіць, фарсіць паводле свайго багацця. Людзі прыемныя, ветлівыя. Наш каталіцкі касцёл велічны, у ім — францысканы. Пятро Аляксеевіч у жыцці сваім быў у Ерусаліме і паўсюль, дзе толькі ёсць святыя месцы, як Аінорас[63] і інш., дзе толькі быў, даў наказ ці права, каб заўсёды штомесячна на кожны кляштар, дзе ён быў, на пяцьсот леваў з ягонага скарбу давалі, пакуль маскоўскай кароны стане, так і цяпер, да сёння ездзяць мніхі ў Пецярбург з тым правам і атрымліваюць тыя грошы, хоць за дзесяць гадоў разам, нават

з ліхвою. Сама я там размаўляла з тымі мніхамі, што былі з турэцкіх краёў у Пецярбурзе і атрымалі за дзесяць гадоў грошы з ліхвою. Быў гэты цар і ў Польшчы, Францыі, нават і ў Рыме. Пражыўшы гадоў 60, ён памёр. Я бачыла цела яго ў Пецярбурзе ў царкве святых Пятра і Паўла на самы фэст.

Пасля смерці ягонае царом быў унук, сын ягонага сына, што ад летаргіі памёр, і гэты ўнук ад воспы памёр. Пасля гэтага ўнука абралі князі Даўгарукія, як я вышэй пісала, Анну Іванаўну, дачку роднага брата Пятра Аляксеевіча Івана. Гэтая Анна Іванаўна панавала некалькі гадоў і ваявала з туркамі і заўсёды слаўных вікторый дабівалася, а менавіта, узяла ў туркаў Азоў, Ачакаў, Хоцін[64], і на полі бітвы паклалі маскалі туркаў без ліку, а ў няволю некалькі дзесяткаў тысяч мужоў, жонак, дзяцей забралі; таксама яна і з татарамі ваявала. Знішчалі дашчэнту татарскае ханства маскалі, а найбольш бахчысарайскага[65] татарскага хана. Я была ў гэтае Анны, якая шмат мне дапамагла і ў маю бытнасць вяселле справіла сваёй нябозе, што звалася таксама Анна[66]. Выдала яе за Ульрыха, князя гальштынскага, і як Анна Іванаўна, расійская імператрыца, не мела ні мужа, ні дзяцей, дык зрабіла спадкаемцам трона сына[67] маладое Анны, княгіні гальштынскае, сына, якога тая праз год пасля вяселля нарадзіла. Спадкаемца кароны расійскае яна публічна зацвердзіла пры жыцці сваім, а маці таго княжыча, княгіню гальштынскую,— рэгенткаю да ягонага пасталення, да 25 гадоў. І вось яшчэ кажуць, у маладым веку, у 48 гадоў, развіталася са светам мая мілая пані — пашлі, Пане Божа, у рай яе, дабрадзейку маю — Анну Іванаўну, расійскую імператрыцу.

Пасля смерці Анны Іванаўны трон заняла рэгентка Анна, княгіня гальштынская, да пасталення сына

свайго, але, вядома, карона павінна была належаць не з міласці, а папраўдзе і доўгу Лізавеце Пятроўне, малодшай дачцэ Пятра Аляксеевіча, але ж яшчэ волі Пана Бога на тое не было, дык Лізавета Пятроўна сядзела ў сваім палацы на Мойцы[68] (так называлася месца). Там я сотні разоў была, а сядзела яна асірацелая, не даходзіла да яе пенсія, як ёй гэта бацька ў тастаманце завяшчаў, і праз нястачу сваю мусіла двор распусціць і абыходзіцца невялікай колькасцю людзей.

Былі імяніны малодшае дачкі рэгенткі Анны, і спраўлялі ўрачысты баль. На гэтым балі былі і забаўляліся ўсе міністры: Остэрман, Бірон і ім падобныя годныя паны. Была там і законная спадкаеміца, Лізавета Пятроўна; прыехала яна павіншаваць гераіню сённяшняе ўрачыстасці, але прынялі яе, небараку, вельмі кепска, не пасадзілі яе на ганаровым месцы, дзе ёй належала, а на благім месцы за сталом сядзела і зняважлівымі словамі была гэтая манархіня абазваная як рэгенткаю Аннаю і мужам ейным Ульрыхам, князем гальштынскім, так і ўсімі міністрамі абражана, якія казалі: «Што табе трэба ў палатах царскіх і на балях?» Адзін мовіў: «Чакай, браце, заўтра я разбяруся, развітаецца яна са светам». Другі казаў: «У ссылку адправіць!» Іншыя: «У манастыр, у вязніцу кінуць». Вельмі п'яныя былі на імянінах тыя міністры, што наважыліся на царскую дачку і законную спадкаеміцу расійскае кароны так смела наракаць. Заплаканая і прыгнечаная смуткам Лізавета Пятроўна, пакінуўшы тую незычлівую кампанію ў царскіх палацах расійскіх, вярнулася маркотная ў свой палац на Мойцы і там з вялікай тугою распавяла сваму фраўцымеру пра сваю няўдачу і таксама сваім прыдворным. І кожнаму свайму прыдворнаму царэўна падзякавала і казала ім кожнаму, няхай дзе

хочуць шчасця шукаюць, бо яе вялікае няшчасце чакае. Але воля Найвялікшага Бога ў Святой Тройцы Адзінага інакш яе лёсам распарадзілася.

Быў пры гэтай манархіні адзін чалавек, зваўся ён Кірыла[69], прафесія ж — бандурыст. Ён супакойваў сваю пані, мовячы: «Пані мая, я, мізэрны чалавек, нявартыы парады даваць царскай крыві, але ж маю вялікую веру і надзею на Бога і Маці Прачыстую Казанскую, што калі б мяне паслухала і адразу паднялася і з нашымі вернымі лёкаямі пайшла, якія падрыхтаваныя і да апошняй крыві будуць стаяць за сваю пані, і Бог нам дапаможа, дык мы князя гальштынскага заб'ём разам з Аннаю, малжонкаю ягонаю, рэгенткай кароны расійскае, і эрц-герцага Курляндскага Бірона з жонкаю, і сем сыноў ягоных, і міністра Остэрмана, і іншых» і г. д. І воля Божая падмацавала сэрца Лізаветы Пятроўны, і яна стала мужнай, а не палахліваю, і даверылася Пану Богу, і паслухала бандурыста Кірылу. І параіў ён, каб яна апранула ягонае адзенне, а Кірыла — дамскае, і вось з Імем Божым пайшлі яны ўпяцёх, а менавіта: сама Лізавета Пятроўна, бандурыст Кірыла і яшчэ трое верных лёкаяў.

Пайшлі апоўначы проста да палаца, а люд бяспечны, ніадкуль не чакаючы аніякае бяды, напіўшыся на імянінах, і старыя, і маладыя, і малыя, і вялікія — усе афіцэры і штабс-афіцэры, нават жаўнеры спалі. Падходзіць Лізавета Пятроўна з бандурыстам Кірылам і іншымі да першае варты. Але ўсё-такі пяць жаўнераў не спалі і закрычалі: *«Кто идет?»* Адказалі: *«Свои»*. Аднак пускаць не хацелі. Хацеў тамбур у барабан стукнуць, каб падняць трывогу, бо нехта гвалтам у палац лезе, а Лізавета Пятроўна выхапіла нож і парэзала рэмень і скуру барабана, а бандурыст Кірыла выхапіў кінжал і забіў на месцы тамбура, гэта значыць барабаншчыка. Лізавета Пятроўна мо-



Рэвель (сучасны Талін) на пачатку XVIII ст.

віла: «Ці я не дачка.цара Пятра, ці вы не падданыя мае і не павінны за мяне стаяць?» Дык тыя чатыры жаўнеры ўкленчылі і прысягнулі, што гатовыя і кроў праліць за сваю манархіню. Пайшлі далей удзевяцярых у палац, проста ў пакоі, дзе спіць князь гальштынскі разам з малжонкаю сваёю Аннаю, рэгенткаю кароны расійскае, і са сваімі дзецьмі, а ўсе спалі, ніхто не чуў. Бандурыст Кірыла паздымаў зброю над ложкам, меў напагатове і кляпы ў рот запіхваць,

і вяроўкі. Ён кінуўся на князя гальштынскага, заткнуў яму рот і звязаў яго. Анна, малжонка ягоная, прачнулася, убачыла гэта няшчасце, кінулася ў ногі Лізавеце Пятроўне, прасіла дараваць і не забіваць мужа ейнага, яе самую і дзяцей ейных. А Лізавета Пятроўна лёгка на гэта згадзілася, абяцала жыццё дараваць і цалавала яе і дзяцей ейных і, плачучы, казала: «Калі б вы не пагражалі майму жыццю, не дайшло б да гэтага». І дзе іх бандурыст Кірыла падзеў, гэта толькі Пан Бог ведае і Страшны Суд назаве, а я тое добра ведаю, што іх ён не забіваў. Ён пакінуў Лізавету Пятроўну ў палацы, у царскіх яе пакоях, а сам з тымі людзьмі пайшоў да Бірона, эрц-герцага Курляндскага, і яму, і жонцы ягонай, і сямі сынам ягоным кляпамі раты пазакрываў, звязаў, а дзе падзеў, Пан Бог ведае, але жывыя яны. Учыніўшы там сваё, ён пайшоў са сваімі людзьмі да палаца міністра Остэрмана і яму кляпам рот закрыў, звязаў і схаваў таксама гэтай жа ноччу.

Некалькі дзесяткаў найвышэйшых паноў, якія толькі маглі б быць супраць атрымання Лізаветаю Пятроўнаю расійскае кароны, ён звязаў і пад арышт пасадзіў, куды і што, ніхто не ведае, але нікога не забіў, бо яму Лізавета Пятроўна моцна забараніла рабіць гэта, каб яна шчасліва ўступіла на трон без праліцця крыві. Так і сталася, бо толькі адзін першы барабаншчык і загінуў.

Назаўтра такі нечуваны гвалт стаяў у Пецярбурзе, як некалі ў Егіпце, калі ад кары Пана Бога (у часы прарока Майсея) у кожным доме егіпцяніна труп знайшлі, альбо гаспадар памёр, альбо сын першародны, і паўсюль быў плач і нараканні, таксама тое і ў Пецярбурзе, калі ўбачылі, што Анны, рэгенткі расійскае кароны, няма з мужам ейным, князем гальштынскім, і з ейнымі нашчадкамі, дык пабеглі да

Бірона, эрц-герцага курляндскага,— і ў ягоным палацы тое ж самае дзеецца, лёкаі і пакаёўкі не ведаюць, дзе пан з паняю і сем сыноў падзеліся гэтае начы.

Тады да міністра Остэрмана — і яго няма. Пытаюцца ў генерала, што на варце палаца з тысячай людзей быў — і яны нічога не ведаюць, хоць павінны былі ведаць, а гэта гарэлка і бесклапотны сон справілі. І вось так удала, і лёгка, і спакойна з ласкі Пана Бога атрымалі карону і спадчыну свайго бацькі Лізавета Пятроўна ў 1747 годзе і кіруе аж да 1760 года, а я зычу, каб як даўжэй яшчэ жыла і шчасліва панавала.





ПРА БІРОНА

Бірон, эрц-герцаг Курляндскі,— гэта лёкай князя Курляндскага, мужа Анны Іванаўны, які перад смерцю вельмі прасіў Анну Іванаўну, малжонку сваю, каб Бірону наколькі зможа дапамагала, як я вышэй распавяла. Дык пасля смерці мужа свайго, князя Курляндскага, яна прызначыла яго маршалкам свайго двара, а як Анне Іванаўне Бог спрыяў праз князёў Даўгарукіх, што атрымала расійскую карону, тады падаравала Бірону Курляндыю, таму ён і зваўся герцаг Курляндскі, а пасля жыў ён, аднак у палацы, дзе і сама яе мосць царыца жыла, Анна Іванаўна, і ён меў з жонкаю сваёю сем сыноў, і заўсёды, калі Біронава жонка сына нараджала, дык яе мосць царыца Анна Іванаўна тое дзіцё з мамкаю, з калыскаю, у свой пакой брала, а як другое нараджалася, першае маці аддавалі, а другое з мамкаю, з каляскаю ў пакой яе мосці царыцы бралі, бо я сама малодшага сына Бірона, Іванушку, бачыла маленькага ў калысцы ў пакоі, дзе спіць яе мосць царыца, але ж ужо тое дзіцё магло само хадзіць. Такую вось вялікую пашану і ўзнагароду атрымліваюць верныя лёкаі.



АВАНТУРА МАЗЕПЫ

Я ўсё тут пра Маскву пісала, дык успомніла і пра Мазепу[70], што быў фельдмаршалам яшчэ ў Пятра Аляксеевіча, і быў ён у манарха гэтага ў вялікай пашане, бо заўсёды Пятро Аляксеевіч бацькам называў яго, таго Мазепу, фельдмаршала свайго, як я чула ад годнага шляхціца, вяльможнага яго мосці пана Якубоўскага ў ваяводстве Кіеўскім. У ягоным дзяцінстве, калі Украіна была даведзена да галечы і ўсе вёскі і гарады стаялі спустошаныя, Мазепава маці са сваёю сястрою ў Кіеве, у Пячорску[71], мнішкамі былі ў кляштары і гэтага вяльможнага яго мосці пана Якубоўскага трымалі на стале, распавяла Мазепава маці, і дзе ейнага сына вёскі і землі былі.

І гэты вяльможны яго мосць пан Якубоўскі, як я лячыла ў Навасёлцы, сам сумленна распавёў мне, што той Мазепа кахаў адну замужнюю шляхцянку, якая жыла непадалёку, паўмілі ад яго, а быў той Мазепа чалавек малады, зграбны, мужны і ўмелы, бо ў школу хадзіў, і каля яго чыста, акуратна, і каня заўсёды меў добрага, і ўсё што трэба да каня, і часта там у той пані бываў. Даведаўся пра гэта муж той


шляхцянкі і падпільноўваў, калі ён распранецца і зброю пакладзе. Пасля муж на яго напаў са сваімі лёкаямі і распрануў дагала таго беднага Мазепу і люта збіў бізунамі, пасля памазаў мёдам, у гусіным пер'і выкачаў і на каня задам наперад пасадзіў, рукі назад звязаў, а ногі — пад канём, ды каня загадаў на дарогу завесці, вось так ён сярод белага дня ў сваю вёску прыехаў да маці свае на двор. Збеглася ўся вёска на дзіва. Знялі яго з каня, развязалі, абмылі, маці бедная з сястрою змазалі, перавязалі тыя раны, і ён адляжаўся.

Ачуняў ён, але саромеўся суседзяў і знаёмых, а таксама маці свае, і мусіў небарака пакінуць каханку сваю, і развітаўшыся з маці і сястрою сваёю, атрымаў ад іх блаславенне і паехаў за Дняпро да Масквы. Адным словам, нейкім дзівам трапіў да самога імператара Пятра Аляксеевіча. І быў той Мазепа з погляду чалавек прыгожы, разумны, умелы, пры гэтым навучыўся асобным мовам, як кажуць: калі захочаш, дык зможаш, таксама і расійскую мову вусную і пісьмо вывучыў, і так яму пашанцавала, што стаў фельдмаршалам расійскім. Але, я думаю, пры ягоным шчасці баязлівасці Божай не меў, дык падняў бунт супраць цара Пятра Аляксеевіча і хацеў яго туркам выдаць пад Брагіловам[72], ля Дуная.

Таму вельмі цяжка давялося, бо так туркі слаўнае памяці імператара Пятра Аляксеевіча атакавалі, што Пятро Аляксеевіч загадаў сабе магілу выкапаць і пасцель ягоную там у магіле паслаць, як і Кацярыны-шведкі, другое жонкі свае, і загадаў войску свайму: калі будуць бачыць, што ўжо іншага выйсця няма, толькі як трапіць жывымі ў няволю турэцкую разам са сваёю жонкаю, тады лепей, каб яго з ёю зямлёй прысыпалі і каб разам з ёю памёр. Але ж воля Пана Бога наканавала так, што ўдала ён гэтае бяды

ўнікнуў і з жонкаю сваёю, з войскам сваім вярнуўся ў свае маскоўскія межы. А князя Бранкавана Канстанціна[73], які таксама ў той час бунт падняў, *alias* абмануў турэцкага імператара (бо той князь Бранкаван быў у той час гаспадаром мультанскім у Бухарэсце), яго ўзялі ў няволю ў Стамбул і пасадзілі ў Еды Куле[74] і галаву яму адсеклі.

Якою смерцю памёр Мазепа, я не магла даведацца, але ведаю, што не сваёй. А ў Батурыне[75], горадзе гетманскім, загадана з *funditu*[76] палац перакуліць і зямлю, дзе ступалі Мазепавы ногі, на сажань углыбіню ва ўсім Батурыне выкапаць, з горада вывезці і *de novo* пасвянціць, жонку і дзяцей знішчылі ўсіх да аднаго і радных паноў, прыяцеляў ягоных; а маці з сястрою-мнішкаю, што ў Кіеве ў Пячорску ў манастыры былі, кажуць, ад страху, але сваёй смерцю памерлі, аднак манастыр зруйнаваны. Цяпер ужо на тым месцы стайня. Калі часам была ў Кіеве альбо ў Пецярбурзе ў царкве, дык чула, як яго праз некалькі дзесяткаў гадоў пасля смерці праклiналі: *«Да нехай буде проклятьі»*. Такія вось благія ўзнагароды атрымліваюць кепскія лёкаі, і кожнага здрадніка няхай Бог так узнагародзіць.





АВАНТУРА КІРЫЛА РАЗУМОЎСКАГА

Я, будучы ў Казельцах, мястэчку за Дняпром, што за дзесяць міль ад Кіева, не тое што ад дзесяці, але чула ад некалькі дзесяткаў чалавек, якія ведалі і Кірылу Разумоўскага, і бацьку, і маці, і братоў, і сясцёр ягоных: бацька ягоны быў просты мужык, і загадвалі Кірылу заўсёды пасвіць валы, а ён не мог іх дапільнавацца, бо яны ў шкоду ўкідваліся, у жыта ці ў пшаніцу, і заўсёды беднага хлопца білі. Гэты Кірыла меў надзвычай добры голас і рады быў на кобзе альбо на скрыпцы як мог іграць. Аднаго дня плакаў ён крывавымі слязьмі і прасіў Пана Бога, каб яму добрага пана даў, каб мог навучыць чытаць і пісаць, і на бандуры добра граць, і на разнаітых інструментах. І вось аднаго дня, пакінуўшы валы ў полі, пабег ён дарогаю, босы, без шапкі і плачучы, Бога просіць: *«Ісусе, Сыну Божы, памілуй нас!»* Бо больш нічога не ўмеў. Тры дні пасля таго, як уцёк ад валоў, не еў нічога, нікуды не заходзіў, бо баяўся, каб яго зноў дахаты не вярнулі. Тут едзе нейкі маскоўскі палкоўнік, бачыць: малое дзесяцігадовае дзіця плача ў лесе. Загадаў спытацца

ў яго, куды ідзе і чаго плача. Адказвае: «Я пана шукаю і вельмі галодны».

Загадаў той палкоўнік есці яму даць і кажа: «Хлопча, калі б я ведаў, што ў мяне будзеш верна служыць, што нічога не ўкрадзеш, узяў бы цябе». Кірыла прысягае Панам Богам, што будзе яму верна і старанна служыць і платы ніякай не хоча, толькі каб яго на бандуры загадаў вучыць і на скрыпцы і на іншых інструментах, бо вялікую ахвоту да музыкі мае.

Гэты палкоўнік, узяўшы Кірылу да свайго двара, загадаў яму вопратку справіць і знайшоў у ім хлопца паслухмянага, вернага, разважлівага. Стаў ласкавым да яго і выканаў жаданне Кірылы: загадаў вучыць яго чытаць, пісаць і на разнастайных інструментах граць. Прытым ёсць такі звычай у Маскве, што ні арганаў, ні іншай якой музыкі ў царкве няма, толькі ў час службы Божае пеўчыя спяваюць. З гэтымі пеўчымі Кірыла яшчэ лепш развіў свой голас, спяваючы па нотах, і вось пабожна жыў мой Кірыла сем гадоў у таго палкоўніка сярод самавітых людзей, верна і старанна пану свайму служыў, таму меў ад свайго пана вялікую ласку, і ўсе дамовыя любілі яго і дзівіліся, што простае вясковае дзіця такому майстэрству і такім манерам навучылася.

Пашчасціла таму пану палкоўніку, у якога Кірыла служыў, па важнай справе ехаць у Пецярбург, а як Кірыла верна і старанна служыў, дык не мог вяльможны яго мосць пан палкоўнік абысціся без ягоных паслуг, дык бярэ яго з сабою ў Пецярбург. І здарылася таму яго мосці пану палкоўніку ў той царкве быць, дзе царская дачка была, Лізавета Пятроўна, а ў Маскве ў час службы Божае спяваюць надзвычай добрыя пеўчыя, там заспяваў і Кірыла. Як пачула Лізавета ягоны голас, адразу пажадала мець сабе за спевака

ў сваёй капэле, бо вельмі, як мне вядома, любіла яна музыку і, што я бачыла, мела дванаццаць дзяўчат, якія на бандурах гралі. Пасля гэтага царэўна, гэта значыць Лізавета Пятроўна, прасіла вяльможнага яго мосць палкоўніка, каб ёй свайго хлопца, спевака Кірылу, уступіў, і вяльможны яго мосць пан палкоўнік — воляй-няволяй — свайго Кірылу падараваў прынцэсе Лізавеце Пятроўне.

Пры двары Лізаветы Пятроўны ён яшчэ лепей навучыўся спяваць, граць на размаітых інструментах, а найбольш на бандуры, і атрымаў гэты тытул: Кірыла-бандурыст, і служыў у гэтае пані гадоў трынаццаць. Быў ён чалавек добрых поглядаў і сярэдняга росту, разумны, дасціпны, ціхі, разважлівы і пабожны, ніколі кепска не паказаў сябе і гэтым заслужыў сабе ў пані сваёй вялікую ласку, і яна яму ва ўсім спрыяла.

Як прыйшоў час тых імянін дачкі Анны, рэгенткі кароны расійскае (пра гэта я вышэй распавяла), дык Кірыла-бандурыст даў тую раду і сам мужна зрабіў, што смела пайшоў у палац з манархіняй сваёй Лізаветай Пятроўнай і звязаў Ульрыха, князя гальштынскага, і малжонку ягоную Анну, рэгентку кароны расійскай, Бірона, і Остэрмана, і іншых міністраў. Гэта ён, а не які іншы Кірыла-бандурыст. Пасля атрымання вікторыі, ужо як Лізавета Пятроўна стала з ласкі Божае расійскай імператрыцаю, нікога супраць сябе не маючы і, як усе каралі і цары, маючы ад Пана Бога ўладу і моц мужыкоў набілітаваць, дык адразу Кірыла-бандурыст быў набілітаваны разам з усёю сваёю сям'ёю, і цяпер яго завуць граф Кірыла Разумоўскі, і ён першы міністр і дарадца яе мосці царыцы. Хутка паслалі па ягонага малодшага брата і прывезлі яго ў Пецярбург. Таксама набілітавалі і аддалі ў школу, і ён у хуткім часе чаму мог,

таму навучыўся, і паслалі яго ў Прусію, і навучыўся мове нямецкай, толькі за год. Пасля ён вярнуўся ў Пецярбург, яе мосць царыца Лізавета Пятроўна аддала за яго сваю саячку і зрабіла яго расійскім гетманам.

Меў гэты яснавяльможны яго мосць пан граф Кірыла, першы міністр расійскага двара, старую маці ў той жа вёсцы ля мястэчка Казельцы, што за дзесяць міляў ад Кіева, вельмі бедную і простую. І вось быў загад яе мосці царыцы, каб адзін генерал з цэлым рэгіментам і шмат дам верхняга фраўцымеру па яе паехалі, шэсць карэт, запрэжаных шасцерыкамі, і загадала яе мосць царыца ўганараваць маці яснавяльможнага яго мосці пана графа Разумоўскага. І вось, выехаўшы з Пецярбурга, гэты эскорт шчасліва спыніўся ў той вёсцы, дзе жыла маці графа Разумоўскага. Як сталі ля халупкі, дык і на двор заехаць нельга было, такі ён быў маленькі, увайшоў у халупку сам генерал, і штабс-афіцэр, і дамы. Яна, бедная старая, з нагамі забралася на печ з кудзеляю, але ж яе прасілі мужыкі-суседзі, каб злезла з печы, бо ў яе госці ад сына. Генерал нізка схіліўся перад ёю, як перад годнаю дамаю, і руку пацалаваў, і дамы ёй вялікую пашану выказалі, бо былі дзве француажанкі, дзве немкі, а рэшта — паненкі розных станаў.

Як толькі маці графа Разумоўскага стала босая пасярод халупкі, дык адразу на яе чорную зрэбную кашулю накінулі сабалінае футра коштам тры тысячы рублёў, пакрытае зялёным аксамітам. Пасля яе ў ванне выкупалі, валасы прыгожа пастрыглі па модзе, мелі яны прыгатаваныя сукенкі, рагоўкі і іншае, што належыць да строю годнае дамы, і яе надзвычай багата ўбралі, і ў карэту, запрэжаную шасцёркаю коней, пасадзілі, і сказалі ёй: «Ты вартая гэтага,

мілая пані, бо такога сына нарадзіла, што так верна сваёй манархіні служыць». І завезлі яе ў мястэчка Казельцы, у замак, там яе далікатнымі стравамі пачалі карміць, аднак жа, я чула, што яна капусты з салам прасіла.

Нарэшце яна лёгка навучылася добрым манерам, прыгожа есці, піць, людскай галантнасці, і вось яе прывезлі ў Пецярбург ды адразу паставілі перад Лізаветай Пятроўнаю, расійскай імператрыцаю, яе мосцю царыцаю. Загадала яна крэсла каля сябе ёй паставіць, садзіцца прасіла, і так яе мосць царыца Разумоўскай мовіла: «Пазнай свайго сына сярод гэтых кавалераў». Адказала старая: «Няма ў мяне пана сына, загінуў сын мой Кірыла-пастушок, і заўсёды я плакала па ім». Тут усе прысутныя плакаць пачалі. Яе мосць царыца мовіць: «Ваша мосць пане граф Разумоўскі, калі цябе маці твая не пазнае — гэта і не дзіўна (бо ў дзяцінстве ты згінуў), дык пазнай жа сам маці сваю». І вось яснавяльможны пан граф Разумоўскі кінуўся ў ногі сваёй маці, і старая плакала і Богу дзякавала за Ягоныя шчодрыя дары, што яе вартаю ўчыніў мецы сына графа і першага міністра ў двары расійскім. О, вось як Пан Бог узнагароджвае добрых і верных людзей і лёкаяў, не толькі калі ў манархаў, але хоць бы роўны ў роўнага служыў, але верна і старанна, без нараканняў, трэба спадзявацца на ласку Пана Бога і волю Ягоную, і ад пана альбо пані сваёй узнагароду добрую атрымаеш.

Яе мосць царыца Лізавета Пятроўна, шчасліва пануючы ў кароне расійскае, узяла да сябе Пятра Фёдаравіча[77], свае роднае сястры сына, бо гэтая Лізавета Пятроўна паннаю была, і гэтага Пятра Фёдаравіча з дзяцінства пры сябе маючы, адукавала і зрабіла спадкаемцам, гэта значыць прэтэндэнтам расійскае кароны, альбо *наследнікам*, а як будзе яму

дваццаць пяць гадоў, абяцала карону ўступіць, а сама пайсці ў манастыр. Нечакана ён вельмі цяжка захварэў, і ўжо ад яго ўсе лекары адступіліся, а сама яе мосць царыца вялікі смутак і маркоту праз ягоную слабасць мела і шмат убогім і мніхам у цэрквах і манастырах раздала, сама Пана Бога шчыра за ягонае здароўе прасіла. Аднойчы прысніла шаноўную асобу, і тая так ёй сказала: «Лізавета, вер і спадзявайся, што не памрэ Пятро Фёдаравіч. Я — апостал Андрэй, пры жыцці хадзіў па гэтым маскоўскім краі, каб хрысціць гэты люд, але нічога не дабіўся ў той час, толькі, прыйшоўшы ў Кіеў, на пясчанай гары ўчыніў Пану Богу ў Святой Тройцы Адзінаму малітвы, каб калі не цяпер, дык хоць калі-небудзь слава Божая і вера хрысціянская распаўсюдзілася ў тым маскоўскім краі, дзе толькі паганцы былі». І меў ён з сабою крыж алавяны вышынёю ў сярэдні локаць, і закапаў святы Андрэй пры жыцці сваім у той пясчанай гары крыж з такім надпісам: «Я Андрэй-апостал, алавяны крыж закапаў, будзе з дапамогаю Пана Бога здаровы Пятро Фёдаравіч».

Тут прачнулася яе мосць царыца і адразу ж з вялікаю ахвотаю дала зарок паехаць самой з Пецярбурга ў Кіеў і сама задумала рукамі сваімі закласці падмурак царквы. Так і сталася. З той гадзіны пачаў Пятро Фёдаравіч ачуньваць і ачуняў. Яе мосць царыца Лізавета Пятроўна разам з графам Разумоўскім і з вялікім дваром з вялікімі выдаткамі паехала ў Кіеў, і пехатою хадзіла па Кіеве, і, як тая Алена, крыжа і месца таго на пясчанай гары шукала, якое ў сне бачыла. І знайшла, і там, на тым месцы, на ўсю прастору, царкву мець хацела, чатыры камяні сваімі рукамі паклала.

Але ўсе мэтры, якія ў гэтым разбіраліся, пярэчылі, што тут ні ў якім разе царква, такі гмах, быць не можа,

бо пясок. Аднак жа яе мосць царыца мовіла: «Я тут хачу мець царкву, а не ў іншым месцы» — дык мусілі капаць і падмурак глыбока закладваць, і знайшлі той алавяны крыж, і яе мосць царыца мае яго і цяпер у скарбніцы сваёй ці ў пакоі. А тут да такой крыніцы дакапаліся, што вада так гвалтоўна выбухнула, быццам з бяздоння, і там шмат вады вылілася адтуль, што ніжні Падол у Кіеве ледзь не затапіла. Размаітыя мудрыя людзі рознае раілі, як бы гэтую новую крыніцу спыніць, бо дрэвы, гной, сена, галлё, каменні кідалі, але не дапамагло.

А яе мосць царыца, нічога не ведаючы пра гэтыя штукі, толькі як быццам праз натхненне Святога Духа вымавіла: воўнаю, воўнаю тую крыніцу заткнуць. Так і зрабілі, і з ласкі Пана Бога прыкрылася тая прорва, і пабудавана на тым месцы цяпер велічная царква. Я чула, што граф Разумоўскі хоча стаць першым манахам у той царкве, бо адначасова загадала яе мосць царыца багаты манастыр і палац непадалёку дзеля сябе паставіць у Кіеве, каля Пячорска, і сад надзвычай цудоўны дзеля сябе, бо абяцала Пану Богу, як Пятру Фёдаравічу споўніцца поўных дваццаць пяць гадоў, дык сама Лізавета Пятроўна манаскі строй апране і ў кляштары жыццё сваё доўжыць будзе. Так і сталася.

Ажаніўшы Пятра Фёдаравіча з Кацярынаю Аляксееўнай і бачачы іх нашчадкаў, калі споўнілася Пятру Фёдаравічу дваццаць пяць гадоў, яе мосць царыца, узяўшы Пятра Фёдаравіча, жонку ягоную Кацярыну Аляксееўну і ўвесь пышны двор свой, выехала з Пецярбурга ў Кіеў, але як праехала палову дарогі па Масковіі, дзе знаходзіцца сталіца Наваград, Кітай-горад[78], Масква, і там крыху забавілася, а цэлы край яе ведаў тое, што яна хоча скласці карону. Ад маладога да старога ўсе паны, абывацелі з розных гарадоў

і весяў, купцы, епіскапы, люд паспаліты, ад малога да вялікага спяшаліся ў сталіцу і перад ёю крыжам падалі з плачам: «О, маці наша! О, пані наша, не рабі нас сіротамі, кіруй намі сама, а мы Пана Бога прасіць будзем, каб ты доўга жыла і шчасліва кіравала намі».

Духавенства таксама да сумлення яе звярнуліся, каб ад кароны не адмаўлялася з-за пэўных спраў і інтарэсаў, войска таксама горка плакала, афіцэры і штабс-афіцэры прысягалі на вернасць і абяцалі да апошняй кроплі крыві стаяць за яе і спаўняць яе ўказы.

І мусіла адмовіцца Лізавета Пятроўна ад свайго намеру і дзеля Бога вярнулася ў Пецярбург з такою, я лічу, думкаю: панаваць у кароне расійскай, пакуль будзе жыць. У той час, як яе мосць царыца была ў Маскве, учыніла яна новы парадак. Калі раней там быў звычай такі, што купец-маскаль сабалямі гандлюе на колькі дзесяткаў тысяч рублёў, а сам, і жонка, і дзеці ў кітаі[79] ходзяць, у простым кажуху з аўчыны пашытым, і ў мізэрных халупках жывуць, дык загадала яе мосць царыца гэтых купцоў і багатых мяшчан склікаць да сябе і загадала ім сваім указам паведаміць, што кожны мае колькі тысяч рублёў. Кожны з гэтых падданых праўду сказаў, і вось падалі яе мосці царыцы рэестр, хто колькі мае. Тады яе мосць царыца ўказ, гэта значыць ардынанс, выдала, каб адпаведна багаццю сабе шыкоўныя камяніцы ставілі, каб сабе, і жонкам сваім, і сынам, і дочкам багатыя сукні, і рагоўкі, і шапкі спраўлялі, адным словам, каб локаць дарагое матэрыі па шэсць чырвоных злотых бралі, брабанскія карункі на шапкі па тры чырвоныя злотыя, дыяменты, каштоўнасці, пярсцёнкі, гадзіннікі, і загадвала нават старым белагаловым валасы стрыгчы, завіваць і пудрыць, у багатых

саках, султанах[80] і інш. хадзіць стройна, у кунтушах з дарагой матэрыі, сабалямі падшытымі, у такім выглядзе дазволена ў царскія палаты прыходзіць і з годнымі дамамі і кавалерамі размаўляць, глянцу набірацца і добрых манераў.

Загадала дзеля гэтага новага дваранства штодзённа абеды даваць, прыгожымі нажамі, відэльцамі, сурвэтамі карыстацца і за здароўе кілішкамі піць, а пасля ім сурова загадалі, каб так і дома елі і пілі, а калі хто б наважыўся зноў па-ранейшаму жыць, каб ягонае багацце канфіскавана было на карысць царскага скарбу. Загадана гэтым белагаловым таньчыць, тут царская капэла грае, а яны, бедныя, і ступіць не хочуць, бо не ўмеюць; аднак тут іх танцмайстары і розныя кавалеры вучаць, а тыя простыя белагаловыя, што алей прадавалі, альбо рыбу, альбо што іншае, вельмі багатыя, а цяпер у саку, у рагоўцы, у гафтаваных чаравічках, у ядвабных панчохах, гадзіннікі пры боку, а яны, небаракі, і не разумеюць па гадзінніку. Адным словам, яе мосць царыца з цэлым дваром сваім і з гасцямі нацешылася з тых баляў, асамблей[81], як з мужчын, так і з белагаловых. Надалі ім імёны разнастайныя, гербы, чым кожны дом альбо сям'я пячаткі ставіць будзе, загадалі гэтаму новаму дваранству, ці мяшчанам, каб у дамах сваіх настаўнікаў мелі: французаў, немцаў і танцмайстараў, каб сыны іх у школу хадзілі, і розным мовам, і на кані сядзець, добра страляць, танцаваць і музыцы каб навучыліся, нават каб дочкі таксама; гэта падданыя паслухмяна і з ахвотаю выканалі. І праз тры месяцы стала Масква амаль як Варшава, можа, крыху і святочнейшая, і якія просьбы мела яе мосць царыца ад купцоў, бо нельга было знайсці матэрыі, карункаў і чаравікаў у чужаземцаў, мужчын і белагаловых. Яе мосць царыца загадала, каб тыя годныя дамы,

княгіні і жонкі міністраў, штабс-афіцэраў і дваранкі цэлы год не хадзілі ў багатых сукнях, толькі ў кітайках і градэтурах, і гэта таму, каб простаму люду дарагое матэрыі ставала. Гэта, пра што я тут пісала, чула ад генерала Івана Іванавіча Касцюрына[82], што ў той час быў за каменданта ў Кіеве, і ад генерала Глебава[83], што цяпер у Новае Сербіі[84], у Цыбулёве, і ад генерала Харвата[85].

Пра кіеўскія Пячоры што ведаю, тое, далібог, і кажу.

Ад аднаго добрага прыяцеля, што мяне незаслужана пакрыўдзіў на некалькі тысяч, я вельмі плакала, а тут зімою з Кіева ездзіла да Беластока да яснавяльможнага яго мосці пана гетмана кароннага Каятана Браніцкага[86], а тут на Вялікі пост з салёнай рыбай і хлебам, у маркоце, не ў час захварэла, і мая галава так высахла, што ніякая вадкасць ні ў нос, ні ў рот не праходзіла. Так у мяне ў роце і ў носе засыхала, што калі ўдзень, дык міндалавым альбо язьмінавым алеем намазвала, *aqua plantaginis*[87] на паласканне, бо гэта вільгаці і холаду дадае, і размаітыя сродкі прымала, але без дапамогі і надзеі. Калі ў сне тая сухасць прыступала, дык так храпла і шукала вады, што ў той момант сканаць хацела; сорамна мне было між людзей сядзець альбо спаць з-за таго частага мазання, паласкання, храпу, бо мовілі: сама лекарка, іншых лечыш, а сябе не можаш?

І таму заўсёды ў дарозе ў возе ці ў калясцы спала. Калі вярнулася праз год зноў у Кіеў, дык пайшла да пячорскага манастыра, дала на імшу і купіла свечкі сабе і двум маім лёкаям і прасіла Пана Бога, калі гэта святыя ўгоднікі, дык каб я таксама праз іх заслугі ачуняла ад мае прыкрае хваробы. І вось калі

з Імем Божым пачала я тых святых у Пячорах абхо-дзіць і чхнула, дык такая вільгаць носам і ротам пайшла, што з таго моманту стала я з ласкі Пана Бога здаровая.

Другі цуд быў у той час, але праз год пасля гэтага. Выпала мне быць зноў у Кіеве, была я ў царкве і бачыла белагаловую ў дзівосным строі; на галаве — як мітра біскупава, але ўвышыню на два локці; футра такое — шырокія рукавы, што чалавек змясціўся б; а як кланялася, дык тая мітра так смешна ківалася, як ветразь на караблі, бо яна была жомчугам і дыяментамі гафтаваная і з шырокаю аблямоўкаю. Я з цікаўнасцю пра яе пыталася, бо бачыла багата лёкаяў і пакаёвак вакол яе і каляску, запрэжаную шасцерыком, ля манастыра. І мне казалі, што гэта палкоўнічыха. Таксама і палкоўнічыха прыглядалася да мяне, што я ўкленчыла, інакш жагнаюся і строй мой інакшы. Загадала пытацца пра мяне.

Паведамілі ёй, што я лекарка, полька. Пасля набажэнства падышла тая пані да мяне і запрасіла ў свой экіпаж, на што я ад цікавасці лёгка згадзілася, села з ёю ў экіпаж, паехалі мы на яе двор; прасіла яна мяне на абед, я таксама згадзілася, бо мне хацелася есці. Была яна белагаловая разумная, чалавечная, шляхотная, у натуры пабожная і багатая, але непрыгожая. Асмелілася я спытаць яе: «Я тут у Кіеве часта бывала, але вяльможную паню-дабрадзейку першы раз бачу».

Паказвае яна пальцам на адзін слічны, надзвычай прыгожы партрэт, які з усіх бакоў пахвалы варты, і кажа: «Ці падобна, каб чалавек з таго партрэта быў маім мужам? Бачыш мяне не маладую, не прыгажуню і з дзіцячых гадоў калеку». І паказала мне свае

ногі, Пан Бог пасведчыць, што такіх тоўстых я ніколі не бачыла — як таўшчэзныя збаны, а чырвоныя, сінія, са схільнасцю да чарнаты, а цвёрдыя, як камень, а халодныя, як лёд, а скура на іх, як на дубе кара; і мовіла мне: «Мой муж жыў са мною трыццаць тры гады і па сваёй дабрыні і годнасці мусіў сядзець у Пецярбурзе ў яе мосці царыцы, аднак да мяне, хворай, нягоднай, за сябе старэйшай на пятнаццаць гадоў, штогод з Пецярбурга прыязджаў з такімі вялікімі клопатамі і выдаткамі, каб пабачыць мяне, а я ніводнага дзіцяці яму не нарадзіла, аднак ён верна па-хрысціянску са мною жыў, за ўсе гады нічога ніколі не заўважала, бо мела брата, які заўсёды з ім быў *contra*, і ён таксама жыў у Пецярбурзе, каб мог, дык нешта б ведаў, калі што кепскае казалі пра майго мужа, але ён без заган жыў, добры хрысціянін». І мовіла мне: «Зірні на гэты партрэт, што, падобная я на гэтага кавалера?» Пасля прасіла мяне тая пані палкоўнічыха палячыць яе ногі. Адказала я ёй: «З дапамогаю Пана Бога, лекаў, пластыраў, мулефікацыі[88], парання, пускання крыві, а найперш з дапамогаю цяпла магло б за тры месяцы крыху дапамагчы». Адказала палкоўнічыха: «Я і аднаго дня не хачу ў гэтым годзе ў хаце сядзець, бо штодзённа два разы ў царкву езджу, дзе пахавала мужа майго вернага і мілага, бо я яго цела з Дона дзвесце міль везла сюды ў Кіеў і тое, што мела, каштоўнасцей, жомчугу — усё тое на карону і на сукенку Прачыстае Маці аддала і сама гафтую арнаты, *alias* рызы з маімі пакаёўкамі; ягоную булаву, сцяг, як тут зазвычаена, царкве аддала, коней ягоных, каб ваду і гліну вазілі ў кляштар, рэшту маёмасці — на залатыя лямпы і іншыя патрэбы кляштарныя і царкоўныя. Сабе толькі пакінула на пражыццё, бо хачу памерці і разам у адной магіле ляжаць з мужам маім, бо так цяпер

учыніла, што ёсць месца гатовае для мяне». Тады я адказала: «Вяльможная пані, на холадзе нічога не дапамогуць пластыры». Дык развіталася з паняю палкоўнічыхай, сяды-тады бачылася з ёю, а пасля я выехала з Кіева.

Праз год па сваім інтарэсе зноў прыехала я ў Кіеў і ўспомніла пра тую паню палкоўнічыху з Дона, што мела пакалечаныя ногі, і ўжо год даўно мінуў пабожнасці ейнае, бо штодзённа абавязкова два разы бывала на набажэнстве ў той царкве ў Пячорску, дзе ейны муж пахаваны. Ужо, можа, цяпер і ў цяпле сядзіць, і лечыць свае ногі, бо мне трыста рублёў абяцала, каб я яе лячыла, але каб яна магла штодзённа два разы ў царкве быць. Дык аднаго дня, як мы ўжо былі знаёмыя, паехала я да яе з візітам. Пасля прывітання звяртаю ўвагу, што ногі палкоўнічыхі маёй былі ў панчохах, у чаравіках, яна, як быццам дзяўчына, зграбна ступала. Здзіўляюся: дзе тая таўсматасць, футравыя панчохі ды два чалавекі, што яе заўсёды вадзілі? Асмелілася я запытаць і павіншаваць з выздараўленнем, пыталася, хто той лекар, што яе вылечыў ад такое цяжкае хваробы, ён варты ўсялякае пахвалы. Адказала мне палкоўнічыха, што сам Пан Бог яе лекарам быў і ўсе святыя пячорскія. Распавяла палкоўнічыха, што, калі закончыўся год ейнага зароку за спачын мужавае душы, пачала яна таксама бываць у Пячорах праз пяць пятніц, просячы Бога і пячорскіх святых вылечыць ейныя ногі, і вось за гэтыя пяць тыдняў цудоўным чынам пачалі ногі худзець, вось так шчасліваю, і здароваю, і зграбнаю стала; так закончыла: «Калі мне дваццаць гадоў было, дык і ў той час з цяжкасцю хадзіла, а цяпер з ласкі Пана Бога зусім здаровая». І дала дзве вельмі тоўстыя срэбраныя нагі царкве пячорскай.

Трэці цуд такі: на Валыні, непадалёку ад Роўна, узяў мяне з Дубна нейкі годны шляхціц, вяльможны яго мосць пан Вільнер, дзеля лячэння свае жонкі ад гектыкі[89]. Я тае пані не бачыла, дык і абставін яе хваробы не ведала, але ведала, што асобных я вылечвала ад гектыкі, тых, хто не так даўно захварэў; таму ўзялася лячыць і, прыехаўшы ў маёнтак таго пана Вільнера, пачала лячыць еймосць ягоную і як магла і ўмела лячыла тую пані. Але дарэмна, хвароба была даўняя. Бацька, маці і сёстры памерлі ад гэтае хваробы, і я бачыла яе сваімі вачамі на Божае пасцелі, без пульсу, без мовы, без духу. Уклянчыла я, просячы ў Пана Бога здароўя гэтай пані за заслугі ўсіх пячорскіх святых, хоць бы мне адсюль выехаць і смерці яе не бачыць, трэба было яе жывою пакінуць, а цяпер пакіну яе мёртвую, ад чаго вялікі смутак і сорам мець буду. Ужо яе муж, годны кавалер вяльможны яго мосць пан Вільнер, з дзецьмі, з сястрою, з лёкаямі аплакаў, крык, плач да неба, аднак гэтая пані ўсхапілася, як пасля сну, і села на ложку, і лагодна, разумна з мужам, і з сястрою, і з іншымі размаўляла, ела, піла, спала. Я і падзякавала Пану Богу, што яе цудоўным чынам здаровую бачу, але хваробе невылечнай не веру, каб гэтая пані ачуняла. І прасіла вяльможнага яго мосці пана Вільнера, каб мяне зноў у Дубна на мой двор адвёз, і ён гэта з ласкі свае ўчыніў, і мяне з пашанаю, узнагародзіўшы мае выдаткі і клопаты, адвёз экіпажам у Дубна. Тая мілая пані жыла пасля колькі тыдняў з ласкі Божае і ад хваробы памерла, але не тады, калі я была.

Што ведаю дакладна, тое і пішу пра пячорскіх святых. Чула, але не бачыла наступнае. Хадзілі два студэнты ў школу разам і вельмі сардэчна з дзяцін-

ства любілі адзін аднаго. Паўперамі[90] былі, не мелі бацькоў, ні сваякоў, ні знаёмых. Калі які што выжабраваў, выпрасіў, а другі не меў нічога ў той дзень, дык яму таварыш сваё даваў, і калі які з іх хварэў, другі яго даглядаў. Вельмі пабожныя і дабрачынныя былі яны, і людзі іх моцна любілі, яны добра вучыліся абодва. Як падраслі, казалі адзін аднаму: «Што з нас будзе? Каб ісці ў двор ці каб ажаніцца, патрэбна вопратка, грошы, коні, куды ні сунься, усюды грошы трэба, дык навошта нам гэты крывадушны свет? Пойдзем у манастыр. Гатовая вопратка і стол, будзем разам Пану Богу служыць і душы нашыя ўратуем». Так і сталася. Абодва разам мніхамі сталі, і мелі келлі адна ля другой, і вельмі пабожнае і Богу мілае ў манастве жыццё вялі, і тое яшчэ адзін аднаму ў свецкім жыцці казалі, што калі якога з іх нешта будзе хваляваць, незадавальняць, альбо будзе мець згрызоты сумлення, альбо сон які ўбачыць, каб адзін аднаму паведамляў, нават і думкі свае, а гэта для таго, каб адзін другому дапамагаў выратавацца і згрызот сумлення пазбавіцца.

Праз колькі гадоў такога шчаслівага жыцця з Богам што ж робіць з імі зайздросны д'ябал? Прыходзіць аднае начы наяве да аднаго, маладзейшага з гэтых двух мніхаў, што так любяць адзін аднаго, і мовіць: «О, як Богу мілае тваё жыццё, твая пабожнасць, твая чысціня, але мяне Пан Бог да цябе прыслаў, ужо даволі тваіх пакут і цярпення, дазваляе табе Пан Бог ажаніцца, і мусіш ты такіх сем сыноў нарадзіць ці напладзіць, як ты сам, добрых, пабожных, і з гэтага большая слава Пану Богу будзе, чым ад цябе аднаго». Адказаў мніх: «Як такое Пан Бог ад мяне, грэшніка, хацець можа? Я ўчыніў шлюб перад Богам, я манах і пасвяціў чысціню маю Пану Богу і не магу табе, Анёл Божы, даць адказу. Пабачу, што мне на гэта

таварыш мой, манах, скажа, а гэта таму, што я бедны чалавек, якой распуснае белагаловае не хацеў бы, а годная за бедняка не пойдзе». Шатан кажа: «Паказаў мне Бог вялікі скарб для цябе, які я табе пакажу, возьмеш сабе». Тут у вялікім святле знік той пекны анёл.

Назаўтра распавёў гэты маладзейшы мніх старэйшаму, што гэтаю ноччу ўласнымі вачыма бачыў. Той старэйшы мовіў: «Брат, не вер яму, не анёл, а шатан гэта. Маліся Пану Богу, каб даў табе веру і дапамог, а калі і ў гэтую ноч прыйдзе, скажы яму: «А дай жа мне тыя грошы».

У другую ноч прыходзіць той самы, што і ўчора, праз зачыненыя дзверы і вокны, стаў перад мніхам у вялікім святле і ў постаці чалавечай і кажа: «Чалавек Божы, дай мне адказ, што я мушу Богу сказаць». Адказвае гэты мніх: «Дай мне тыя грошы, што абяцаў, дык дам табе пасля адказ». Шатан мовіць: «Добра, ідзём са мною». Гэты мніх смела ідзе з ім уначы, і прыйшлі яны ў адно месца, стукнуў той нагою і рукамі нешта дапамог, а там скрыня. Бяруць шатан з мніхам яе і прыносяць у келлю. Ідзе маладзейшы мніх да старэйшага перад світаннем і кажа: «Ужо ёсць поўная золата скрыня». Ідуць абодва ў келлю са свянцонаю вадою, каб выпрабаваць тыя грошы, ці не знікнуць. Не, і золата надзвычай добрае. Бярэ гэты старэйшы мніх тры чырвоныя злотыя, ходзіць з келлі ў келлю, пытаючыся, ці гэта золата, пасля ідзе да пазалотнікаў, кожны бачыць, якое добрае, але старое золата. У трэцюю ноч мовіць старэйшы маладзейшаму мніху: «Браце, парада мая такая: як прыйдзе той д'ябал, кажы яму: не хачу я твайго золата, бяры сабе. Я ўжо з Богам і так буду жыць на свеце». І вось на трэцюю ноч прыйшоў шатан да маладзейшага мніха і пытаецца пра адказ. Мніх кажа: «Бяры

сабе гэтыя грошы». Мовіць шатан: «Удвух прынеслі, удвух аднясём». Аднеслі на тое самае месца, і мніх вярнуўся ў келлю. Зайздросны шатан што робіць? У постаці старэйшага мніха з гэтых двух прыяцеляў ідзе да кіеўскага ваяводы і кажа: «Таварыш мой, мніх, знайшоў скарб, а навошта яму грошы. Пакліч яго, няхай аддасць іх у скарбніцу яснавяльможнага васпана дабрадзея». Паслалі да маладзейшага мніха, пытаючыся пра скарб. Ён кажа: «Таварыш мой параіў мне, каб я тую скрыню з чырвонымі злотымі, што мне даў д'ябал, зноў назад аднёс — і я аднёс». Кажуць: «А пакажы тыя грошы». Пайшоў маладзейшы мніх: «Зараз пакажу». Але на тым месцы ані знаку, дзе скрыня была. Маё падазрэнне, што старэйшы мніх, таварыш, схаваў. Клічуць у двор старэйшага мніха. Той жагнаецца: «Я тут ніколі ў вас не быў, нікому не мовіў пра гэты скарб, пра грошы».

Разгневаны свецкі пан: «А ці можаш ты, поп, ілгаць? Ты ж учора быў у мяне, бачылі і чулі цябе мая жонка, дзеці, лёкаі, госці і прысутныя, а кажаш, што не быў, што не казаў?» Маладзейшы мніх кажа: «Шатан гэта робіць, каб я свайго бацьку і таварыша зненавідзеў за тое, што быццам ён мяне ў бяду ўцягвае. Ведаю, што мой таварыш, мніх, тут у вас не быў, не гаварыў нічога на мяне. Я свайго таварыша люблю, бо ён мяне ад пекла выратаваў». Пан не верыць таму, што гэта справа д'ябла. А ў Маскве ёсць звычай, што духавенства належыць уладзе свецкай.

Дык за той скарб абодва мніхі былі пакараны, а тыя тры чырвоныя злотыя, што старэйшы мніх узяў са скрыні, а тры іншыя ў скрыню паклаў, дык я чула, што і цяпер яны ў Пячорах у схованках.

А гэтае чула і бачыла: аднаго святога па пояс закапанага ў зямлю. Ён, гэты святы, быў мніх, ці схімнік, альбо пустэльнік. Ён ніколі ні з кім не размаўляў, у голадзе, у холадзе, голы, босы жыў, увесь час у пастах, у малітвах, зарослы барадою і валасамі. Але адна паганая, нецнатлівая белагаловая закахалася ў яго, дзень і ноч па лесе хадзіла і таго святога пустэльніка шукала і намаўляла на кепскія справы, хоць ёй небарака сказаў: «А ці мала на свеце людзей прыгожых, багатых? Пакінь мяне». Але яго шатан моцна зводзіў. Той бедны пустэльнік, не верачы сабе, каб яго д'ябал не спакусіў, сам выкапаў дол, залез, ды так закапаўся зямлёй, што толькі рукі для малітваў мог падняць і жагнацца. Тая паганая белагаловая шукала яго ўначы па лесе і знайшла, расклала вогнішча, каб яго сагрэць і выцягнуць з той ямы, але ён крычаў і рукамі жагнаўся ад яе. Разгневаная белагаловая выхапіла галавешку з вогнішча і асмаліла яму бараду і галаву, а пасля забіла, дык цяпер ён ужо колькі соцень гадоў стаіць, укапаны ў зямлю, як жывы.

Тут пішацца пра Маскву, прыпамінаю, што ў Пецярбурзе ёсць адна царква і манастыр св. Антонія. Гэта гісторыя такая: быў вялікі купец на Маскве, далёка ад Пецярбурга, і меў вельмі прыгожага на пагляд сына, разумнага, пабожнага і чалавечнага, якога звалі Антоні. Гэты Антоні не хацеў жаніцца, ні ў свецкім жыцці быць, а хацеў быць мніхам, але бацька ягоны, бачачы яго лепшым сярод дзяцей сваіх, мужнага, разважлівага і пабожнага, абавязкова хацеў, каб ён ажаніўся і быў купцом, дык даў сыну карабель, тавары, грошы і людзей.

І вось мусіў мой каханы Антоні плыць караблём па моры, куды яму бацька загадаў. У дарозе прызна-

чыў на сваё месца вернага лёкая і аддаў яму рэестрам кіраўніцтва, але сам, аднак, за кожнаю рэччу назіраў. Прыехаўшы на тое месца, куды быў бацькам пасланы, ён усё добра справіў і сабе, што трэба на пабудову манастыра і царквы, і тканіны на рызы, і тры келіхі загадаў там зрабіць, адзін з чыстага золата, адзін срэбраны, а трэці крыштальны ў залатой аправе. І ўзяў тры дзежачкі, у адну паклаў золата, залаты келіх і залатую тканіну; у другую дзежачку — срэбраны келіх, срэбраную тканіну і грошы; у трэцяю дзежачку — крыштальны келіх і срэбранай дробнай манеты на выдаткі і што трэба было і ўначы з дапамогаю Пана Бога скінуў гэтыя тры дзежачкі там, дзе глыбей, у мора, а падрыхтаваныя лісты да сваіх бацькоў аддаў аднаму са сваіх лёкаяў.

Ноччу сам ад іх уцёк, прайшоў міль дзвесце пехатою да Пецярбурга. Меў ён з сабою колькі соцень чырвоных злотых, даў супліку Пятру Аляксеевічу ў 1730 годзе, каб дазволілі непадалёку ад горада царкву і манастыр пабудаваць, каб памёрлых там хавалі. І даў яму Пятро Аляксеевіч на гэта права, і пачаў ён дзеля Бога мураваць той манастыр і царкву. Калі ў яго грошай не стала, пачаў ён у багатых купцоў пазычаць, бо яго ведалі, і таму яго крэдытавалі, што меў багатага бацьку, і бралі яны ад гэтага Антонія распіскі, ці карткі, колькі яму пазычалі. Гэтыя купцы не зважалі на тэрмін, але ж ён па дзесяць і па дваццаць тысяч рублёў асобным купцам быў вінен, дык ужо больш чакаць не хацелі. А Антоні мовіў: «Маю я грошы, у моры закапаныя». Ды ніхто не верыў, каб тыя тры дзежачкі з келіхамі, з грашыма сюды прыплылі. Значыцца, далі чалабітную на гэтага Антоні, што ён, махляр, мантыка[91], ашукаў шмат добрых людзей, яны мусяць быць банкрутамі праз той абман.

Дык загадаў Пятро Аляксеевіч, цар маскоўскі, арыштаваць гэтага добрага Антонія і марыць голадам, толькі ў нядзелю хлеб і ваду даваць: першае, што купцоў ашукваў, а другое, што лухту меле, быццам з мора, з дна за колькі соцень міль яму грошы і келіхі прыплывуць. І прыставілі да яго моцную варту і капітана, каб не ўцёк, бо мелі падазрэнне, што ён тыя грошы выдаткаваў не на манастырскія муры, а схаваў іх сабе. А мой каханы Антоні даверыўся Богу, беспрастанку, дзень і ноч Бога просіць, не перастае маліцца.

І вось аднаго дня ракою Нявою, якая непадалёк зліваецца з морам, тры дзежачкі плывуць да манастыра, дзе Антоні сядзеў пад арыштам. Заўважыў іх першы капітан і падумаў: можа, рассохліся і нейкі гаспадар кінуў у ваду, але жартам кажа: «Ойча Антоні, ці не твае гэта дзежачкі з грашыма, на якія ты спадзяваешся?» Антоні: «Яны, акурат яны. Ведаю, што прыплылі». Дык афіцэр рапартаваў вяльможнаму яго мосці пану генералу, і так дайшло да самога Пятра Аляксеевіча. А той, не разумеючы нічога, сам паехаў да таго манастыра, што вымураваў Антоні і сядзіць там пад арыштам, загадаў зняць з яго кайданы, прывезці да яго і запытаўся: «Ойча Антоні, чым ты даўгі купцам заплоціш?» Антоні адказаў імператару: «Заплачу з дапамогаю Пана Бога, бо ўжо мае тры дзежачкі з грашыма прыплылі».

Загадаў імператар людзям сваім на чаўне ехаць і забраць тыя дзежачкі ды пагледзець, што там ёсць, але ж не маглі яны ніякім чынам іх з месца зрушыць. Загадаў імператар Антоні самому ў човен сесці і выцягнуць свае дзежачкі. Антоні мовіць: «Ён, Пан Бог, што іх сюды да мяне за колькі соцень міль прыслаў, гэты Бог іх сам і на бераг прышле».

Узняў Антоні рукі свае да Пана Бога, і ў прысут-

насці імператара, колькі тысяч людзей і тых купцоў, якім Антоні быў вінны, прыплылі яны да берага. Як адчынілі тыя дзежачкі, дык усё знайшлі, што Антоні казаў: тры келіхі, адзін з чыстага золата, другі срэбраны, а трэці крыштальны, і шмат чырвоных злотых, і рублёў, і манет даволі. Ні на шэлег не памыліўся. Дык сам імператар кінуўся Антонію ў ногі, перапрашаў за свой учынак, ойча Антоні з усмешкаю на твары дараваў свае крыўды; і купцы яго перапрашалі, сёй-той яму з вялікай ахвотаю доўг дараваў, а распіскі парвалі; якія бяднейшыя былі, дык ім ойча Антоні з ліхвою заплаціў. І цяпер стаіць той велічны манастыр; той ойча Антоні там пахаваны і цуды чыніць, і ў тым манастыры шмат набожных мніхаў, і незлічоныя скарбы ёсць у тым манастыры, як мне казалі самі тыя мніхі, калі я жыла ў Пецярбурзе.





АВАНТУРА АДНАГО ГАБРАЯ

Нябожчыца Анна Іванаўна загадала выгнаць габраяў з Масквы, але двух габраяў, мільённых багатыроў і, між іншым, родных братоў, не выганяла. Аднаго звалі Зэльман, другога — Моўша. Гэтыя габраі былі з Вены, вялікія купцы, але ім не дазвалялі жаніцца. А ўжо сталыя былі, Зэльман быў старэйшы, жыў у Лафейным палацы, быў нябрыдкі чалавек, па-французску хадзіў, галіўся як хрысціянін.

Адным словам, як казалі, так фарсіў, што ніколі найдастойнейшы афіцэр лепей не мог, а быў ён генеральны камісар. Нечакана папрасіў яе мосць царыцу, каб яму дазволіла выехаць з Пецярбурга і ажаніцца, а брат ягоны, Моўша, каб тут застаўся. Лёгка гэта выпрасіў у Анны Іванаўны, каб выехаць з Пецярбурга і, дзе хоча, ажаніцца. Габраі вялікі розум маюць. Ён узяў большую частку багацця і даў Моўшу, брату свайму малодшаму, і паслаў яго ў свет шукаць яму жонку: у Амстэрдам, у Франкфурт, у Берлін, у Вену і г. д., дзе толькі пекную габрайку ўбачыць, ці ўдаву, ці дзяўчыну, каб яе малявацъ загадваў і тыя ўсе партрэты яму ў Пецярбург адсылаў. Якая


з партрэта Зэльману спадабаецца, тую ён сабе за жонку возьме.

Паехаў Моўша шукаць яму жонку; адным словам, дзесяць партрэтаў прыслаў, якія я сама бачыла і ўвесь двор яе мосці царыцы, бо дамы казалі Зэльману, каб партрэты ўсе ў палац прынёс.

І вось дурнаваты Зэльман найпрыгажэйшую сабе ўпадабаў і вялікія падарункі ёй паслаў, з жомчугу, з дарагое тканіны і з іншых каштоўных рэчаў праз Моўшу. Моўша, шэльма, брат малодшы Зэльманаў, думае сабе: аддам я яе за жонку Зэльману, а сам мушу ў Маскве без жонкі век свой дажываць? Адважваецца і сам шлюб бярэ з тою пекнаю дзяўчынаю, і дасталося яму вялікае багацце; так ашукаў ён Зэльмана.

Зэльман, паводле звычаю свайго габрайскага, меў дзесяць лёкаяў-габраяў, а гэта таму, што ў габраяў ёсць такі звычай: калі яны моляцца, дык абавязкова трэба, каб дзесяць габраяў у гурце было. Меў ён свайго мясніка, бо габраі не ядуць ні ялавічыны, ні курэй, што наш хрысціянскі мяснік зарэжа. Той мяснік быў з Літвы, з горада Ляхавічы, вотчыны яснавяльможных іх мосцяў паноў Сапегаў. Гэты габрай-мяснік стаў часта хадзіць да аднаго суседа, маскаля, маёра, *alias* афіцэра. Той афіцэр рады быў пра Святое пісьмо размаўляць і хацеў габрая пераканаць перайсці ў праваслаўную веру, але габрай, як чорт упарты, дык не вельмі адукаваны маскаль хутчэй угаварыўся, што іудзеем стаў. Дазволіў габраю-мясніку тое ўчыніць, што габраі сваім хлопцам на восьмы дзень пасля нараджэння робяць, не дазвалялася яму іншых страў есці, а толькі тое, што сам габрай зарэжа і яму прыгатуе, гэта афіцэр еў. Не хацеў ён са сваёю жонкаю жыць, як раней, загадаў ёй у халодную ваду ў рэчку залезці і з галавой акунуцца, толькі

тады да яе рукою дакранецца. Жонка гэтага маёра бацьку, маці, і ўсю сям'ю мела, паведаміла яна бацьку пра прыхамаці свайго мужа. З аповяда свае дачкі зразумеў бацька, што ягоны зяць стаў іудзеем, бо гэты бацька ў Польшчы бываў і габраяў ведаў, бо ёсць такія людзі ў Маскве, што габраяў цалкам не ведаюць і думаюць, што гэта звяры. Дык загадаў бацька сваёй дачцэ, маёршы, каб агледзела вопратку ягоную, ці няма на чатырох канцах нітак ваўняных, якія кожны габрай носіць, і цыцамі гэта завецца. Агледзела дачка мужавую вопратку: так, ёсць цыцы. Таемна ўзяліся адмаўляць ад ягонага благога намеру. Ён прызнаўся, што стаў іудзеем і гатовы за гэта памерці. Доўгі час мучыліся над ім манахі, добрыя сваякі, прыяцелі, жонка і дзеці — не маглі яго прымусіць адмовіцца. Дайшло гэта да самое яе мосці царыцы, і загадала яна афіцэру прабачыць і жыццё дараваць, а габрая-мясніка на вогнішча і жыўцом спаліць. Але асеплены афіцэр так многа супраць Бога і веры хрысціянскае блюзнерыў, што іх свецкі суд загадаў абодвух на вогнішчы спаліць.





СЕКТА РАСКОЛЬНІКАЎ

Секта раскольнікаў[92] ёсць і ў глыбінях Масковіі і ў самім Пецярбурзе. Усюды можна бачыць гэтую секту, іх ледзь не больш, чым людзей праваслаўнае веры. І гэтыя раскольнікі маюць такую секту: сярод іх мусіць быць дванаццаць апосталаў, і Пан Езус, і Прачыстая Панна,— Божа, даруй мне грахі мае, што так кажу,— і белагаловая, што чытаць умее, завецца кніжніца, і спавядаць можа і абедню правіць. Як хто сябе ведае, што яшчэ чысты мужчына, і ажэніцца з дзяўчынаю, і калі першае дзіця будзе хлопцам, дык даюць яму імя Ісус Хрыстос, на восьмы дзень яго абразаюць, пасля яго так лупцуюць і распінаюць, і плачуць, і спачуваюць, як Пана Езуса; кроў асабліва пралітую, усю хаваюць, а цела сушаць, труць на пыл, і з ім прасвіркі пякуць і ім прычашчаюцца. Пасля смерці не кажуць інакш хаваць, а толькі ў труне апускаюць у ваду. Кажуць, што гэта ў гонар св. Юзафа, які ў Егіпце быў прададзены, і ён пасля свае смерці прасіў братоў сваіх апусціць яго ў труне ў рэчку Ніл, а праз чатырыста гадоў, як выйшлі ізраільцяне з Егіпта, дык тую труну

дасталі з рэчкі Ніл і ў Ерусалім занеслі; таму раскольнікі просяць, каб іх у ваду апускалі. Вялікіх пастоў трымаюцца больш, чым грэкі[93], ніколі не дазволяць пусціць сабе кроў, хоць бы сёння паміраў, а ведаў. што калі кроў пусціць, дык яшчэ сто гадоў жыць будзе, усё роўна не дазволіць. Ніякіх алкагольных трункаў не п'юць, тытуню не паляць і табакі не ўжываюць. Надзвычай справядліва гандлююць, чужаложства ніколі ў іх не бывае, ніколі ні з кім не ядуць, не п'юць, не сядзяць, хіба што самі з сабою, са свае секты, а як калі-небудзь выпадзе, што да іх хто ў госці прыйдзе, дык дадуць яму есці і піць, але ўжо з таго посуду есць не будуць, і месца тое вымыюць, і агнём выпаляць, дзе сядзеў і хадзіў той госць.

Гэтую секту заснаваў адзін праваслаўны чарнец[94]. Быў ён неслухам, і меліся яго пакараць смерцю. Ён жа ўцёк у Сібір, дзе і цяпер сям-там паганцы жывуць і іх свае веры навучыў. Даведалася пра гэта Анна Іванаўна, нябожчыца, і загадала іх у Пецярбург звозіць, бо хацела яна тую веру выкараніць, рознымі смярцямі караць. Нарэшце загадала па колькі дзесяткаў у адно вогнішча класці і жыўцом паліць, і гэта раскольнікі добраахвотна ўчынілі і даліся іх спаліць. Аднак яе мосць царыцу адгаварылі знішчаць і далей гэтую секту. Паведамілі паны-радцы, што іх ужо так многа, што палову сваіх падданых пакарала б. Дык быў указ асударскі, каб іх больш не каралі, толькі раскольнікі павінны хадзіць у такой вопратцы, напрыклад: адно крысо чырвонае, а другое крысо сукні сіняе, альбо адно крысо чорнае, другое белае, і вось за тыдзень раскольнікаў, як блазанаў, апранулі. Пра якіх не ведалі, тыя гэтым сваім строем адкрыліся — багацейшыя купцы і шмат іншых людзей розных станаў.

Вярнуся, аднак да свае тэмы. Калі я прыехала з Масквы з чатырма туркамі, маімі нявольнікамі, дык яго мосць князь мне з маім мужам загадаў у Лахву на Палессе ехаць, чым я вельмі незадаволена была. Тут у мяне туркаў маіх адабралі.

Муж мой парушыў шлюбную веру. Тут, на Палессі, нідзе ні пацехі, ні забавы, ні авантажу[95] не маю, тут я хворая з волі Пана Бога, зацяжарала. Звыкла ў Пецярбурзе глядзець на шляхетныя справы і жыць добра, а тут свет мне закрыўся. Але прыйшоў ардынанс яго мосці князя Міхала Радзівіла, каб муж мой з жаўнерамі сваімі рыхтаваўся выступіць з Лахвы ў Жолкву[96], бо быў ён харунжым. Дык я вырашыла прасіць свайго мужа, каб мне дазволіў паехаць у імператарскую дзяржаву[97], да ягоных бацькоў, бо часта ён так казаў: «Ну што тут такога, што тваіх некалькі тысяч страціў, паехалі да бацькоў маіх, яны дадуць пяць тысяч чырвоных злотых». Я думала сама сабе, каб хоць тысячу чырвоных злотых далі, бо я ж мужа свайго, яго мосць пана Пільштына, выкупіла з турэцкае няволі, як вышэй апісана, і што ён быў харунжым яшчэ ў імператарскім войску, дык яму належала за ўвесь гэты час харунжая гажа[98], якую плаціць са скарбу імператара Карла, дык я думала, ці не вырву чаго, апрача ўсяго гэтага я была б рада вырвацца адсюль, як з няволі, бо не задаволеная была сядзеннем на гатовых грашах на Палессі, у Лахве.

Дык узяла ў майго мужа лісты да ягоных бацькоў, братоў, сваякоў і да генерала Дамніца, з рэгіменту якога ён пад Краёваю трапіў туркам у няволю.

Тым часам наблізіўся прызначаны ардынансам час, і мой муж, узяўшы коні, сукні і што яму трэба ў дарогу і на патрэбы, выступіў у Жолкву, а я, пакінуўшы дачушку маю маленькую Канстанцыю

Гальпіроўну і набытак мой у яснавяльможнай яе мосці пані Шчытавае[99], кашталяніхі, здаецца, смаленскае, сама хутка выбралася да імператарскае дзяржавы з двума людзьмі і кабетаю на калясцы, запрэжанаю чатырма коньмі, і на параконным вазку і паехала праз Вроцлаў, Алаву, Нысу, Брын, Нікалсбург[100] да Вены, а з Вены да Штаймарка, Грацу, Ніжняй Карніёліі, Верхняй Карніёліі[101], да Лайбаха, і дапыталася годных бацькоў майго мужа, якія жывуць у чатырох мілях ад Лайбаха ў гарах, у мястэчку Пільштын. А з гэтага мястэчка маюць шляхецтва продкі майго мужа ад імператара Леапольда[102], і я там узяла рада-вод дзеля сына майго, а найперш дзеля мужа. Прынялі мяне там добра, па-чалавечы, рады мне былі, і пражыла я там тыдняў шэсць, але чула я з вуснаў бацькі мужа майго, што ён люта гневаўся на майго мужа, бо той з маладых гадоў не слухаў бацькоў, шмат іхняга набытку прагуляў, нарэшце па сваёй волі ў жаўнеры пайшоў і ў няволю турэцкую трапіў, і за тое, што я мужа свайго за трыста чырвоных злотых выкупіла, выйшла за яго замуж,— мала я мець буду альбо ніякай узнагароды. Але мне ўсё ж такі далі сто чырвоных злотых, і я паехала нараджаць назад у Вену. Першае, бачыла, што ў Карніёліі цяжарныя дамы толькі супы ядуць, а я, полька, звыкла каплуны есці ды яшчэ часу не хацела траціць, бо вырашыла, ці не вазьму я чаго са скарбу за выкуп свайго мужа альбо за ягоныя заслугі, бо ён за імператарскія справы ў няволю трапіў.

У Лайбаху, у Карніёліі, ёсць кляштар, які фундаваў дзед майго мужа дзеля дачкі свае Урсулы.

А было гэта так. Той паненцы Урсуле было дванаццаць гадоў, але бацькам здавалася, што яна смелая,

адважная і быццам бы распусная, за што яе дакаралі і білі, кажучы: «Яшчэ малая замуж ісці і ў кляштар паступаць. Адкуль у такое малое дзяўчынкі такая вялікая смеласць?» Адказала: «Замуж, напэўна, малая, а хоць бы і дарослая была, ніколі не буду мець жаданне замуж пайсці, толькі фундуй дзеля мяне тут кляштар, бацька мілы, з імем святое Урсулы, а я хутка мнішкаю стану». Бацька кажа: «Дзе, на якім месцы хочаш?» Пайшла з бацькам і паказала месца ля рэчкі Лайбах, і вось бацька Урсулы, а дзед майго мужа, яго мосці пана Юзафа Пільштына, даў зарок пабудаваць велічны кляштар і касцёл і шмат грошай адпісаў на гэты кляштар. І пачалі дзеля Бога мураваць ды за два гады шчырае і старанные працы і выдаткаў закончылі, і сталі вакол келлі і муры, а мая каханая Урсула, малая паненка, пераменіла жыццё. Зрабіўшы келлю ў адным пакоі дома свайго бацькі, так зачынілася, што ўжо не хацела на нікога глядзець, ні размаўляць, уся з Богам, у малітвах, у пастах. У чатырнаццаць гадоў свайго жыцця пайшла ў свой кляштар, і з ёю сем паненак, кроўныя ейныя, а пасля шмат там у касцёле святой Урсулы сабралася.

Здарылася так, што ігумення выйшла на ганак паглядзець на ваду, бо там рэчка, як мора, і вялікія караблі плывуць. Раптам бачыць гэтая ігумення разам з іншымі законніцамі, што абраз прыгожы і вялікі плыве рэчкаю да кляштара і спыняецца. Загадала яна кляштарным лёкаям у чоўны сесці і той абраз з вады дастаць, але не маглі лёкаі і з месца абраз зрушыць. Бачаць гэтыя законніцы, што то справа Пана Бога, дык даюць знаць свайму спавядальніку. Ксёндз-спавядальнік таксама і з месца абраз не зрушыў. Так далёка вестка пайшла, што біскуп, які ў той час быў у горадзе, з усім духавенствам

хрэсным ходам прыйшлі, але не маглі, ужываючы размаітыя спосабы, абраз з месца зрушыць. Усе старэйшыя мнішкі спрабавалі шчасця і не маглі. А тая маладая законніца Урсула, якую за нягодную мелі, збоку ў куце, укленчыўшы, прасіла Пана Бога, каб гэты абраз Прачыстае Панны мог тут, у фундацыі яе бацькі, быць. Толькі па волі Пана Бога яснавяльможнага яго мосць ксёндз-біскуп і духавенства, і старэйшыя законніцы загадалі Урсуле Пільштыновай, маладой законніцы, каб яна пайшла паспрабавала, ці не будзе вартаю ласкі Пана Бога, абы гэты абраз даўся ўзяць яго. Дык яна пакорліва паслухала мяне, пайшла, села ў човен, але той абраз сам да яе плыве, і ўзяла яго рукамі сваімі, і прынесла да касцёла, і не магла далей несці, бо вялікі абраз, дык насупраць касцельных дзвярэй паставіла ля сцяны. На гэтым месцы ейны бацька, вяльможны яго мосць пан Анджэй Пільштын, загадаў новы, пышны алтар пабудаваць, і я гэты надзвычай прыгожы і цудоўны абраз бачыла на алтары, і мела больш чым дзесяць гравіраваных такіх абразкоў.

Калі выязджала з Лайбаха, мае швагры і бацькі майго мужа казалі тры мае партрэты намаляваць і пакінулі сабе, а мне і бацька, і маці, і швагер, вяльможны яго мосць пан Антоні Пільштын, суддзя таго горада, партрэты свае далі, і вось, развітаўшыся з бацькам і маці, сёстрамі і братамі, вярнулася я ў Лайбах, у Вену, і спынілася ў карчме горада Леапольдштад *«bain rotyn resyl»*[103].

Калі выязджала з Польшчы, мела дзвесце чырвоных злотых і думала, што мне бацькі майго мужа дадуць пяць тысяч чырвоных злотых, паводле абяцанняў майго мужа, дык грошай не шкадавала. Аднак

мне мала далі, а тут выдаткі і тое і другое купляла, едучы ў Лайбах, дык мне цяжка давялося, бо толькі пяць неістотных чырвоных злотых мела.

Была я ў імператара Карла і супліку, якую мне патэр Колер, езуіт, спавядальнік імператарскі пісаў, з рук у рукі перадавала, выказваючы крыўды пакінутае ў гэтым чужым краі. Заўсёды мне святое памяці імператар Карл Шосты адказваў: «*Auf ale Weise Madam Fahnrichin*[104], будзеш мець належную сатысфакцыю. Я ўжо загадаў графу, каб вяльможнай пані ўсялякая выгода і належная гажа была, і выкупныя грошы за свайго мужа атрымаеш». Значыць, мяне абнадзеілі, дык кожны дзень то да графа NN, то ў двор ездзіла, а гэта выдаткі на коней і на лёкаяў, і штодзённа чатыры польскія злотыя за пакой. Была колькі дзесяткаў разоў у палацы ў самое яе мосці імператрыцы[105] і падала ёй супліку; нічога яна мне большага не дала, як пяць чырвоных злотых. А тут роды набліжаюцца, няма ні грошай, ні сена, ні фуражу, ні таксама надзеі, што нешта атрымаю, толькі ў размовах час ідзе.

О, не так, як у Маскве! Ніхто мяне на абед не просіць. Немцы не маюць такой манеры, як палякі альбо маскалі, калі да каго кубкам п'юць за здароўе, дык пасля таксама і таму даюць, да каго п'юць. А ў Нямеччыне не так: будзе мяне старанна шукаць, дзе я сяджу, знайшоўшы, п'е той кавалер за маё здароўе: «*Inre Gesundheit Engelsche Madam*»[106], сам немец вып'е, а мне не дасць. Мяне як варам абліе. Напрыклад, у нядзелю альбо ў якое свята ходзяць кавалеры з дамамі, кавалер мае ўбор, залатымі альбо срэбранымі галунамі аблямаваны, пры срэбранай шпазе, дама таксама ў рагоўцы. Я думала, што гэта ягамосці прыезджыя, аж гэта рамеснікі, ды і асобныя юрысты, пісары, афіцэры, купцы, такія вядомыя людзі і ходзяць у

аўстэрыю і пытаюцца, дзе добрая ежа, і абедаюць у корчмах, нават ходзяць годныя людзі да імператарскага палаца, і што сходзіць з кавалертафель[107], тое пан маршалак з панам кухмайстрам прадаюць, і ёсць на гэта асаблівы пакой, дзе прадаюць ежу, што з імператарскага стала сходзіць. Нікому нічога не дадуць без грошай. Ёсць на гэта лёкаі, што на паўмісках выносяць кавалкі пячонкі і паштэту і доўга таргуюцца з наведнікам, пакуль да згоды не прыйдуць. І там кавалеры са сваімі дамамі абедаюць. Гэтак робяць і езуіты. Маюць маршалка, жанатага, і што застаецца на стале, наведнікам прадаюць. У корчмах, калі бедны чалавек на ноч прыйдзе, дык мусіць сабе з апошняга есці купіць, а саломы на пасцель не дадуць дарма, трэба даць два грошы за салому. Тую салому зноў у куль звяжуць, а на другую ноч другому прададуць. Напрыклад, сённяшні падарожны чысты, а ўчарашні, што на саломе спаў, вашывы быў, дык учарашнія вошы да беднага чыстага чалавека напаўзуць; адным словам, адзін куль саломы і трыццаць разоў прадасць. Мне не дазволілі ў вялікай гасцёўні спаць, а мусіла каморку ці пакоік браць. З дарогі, холадна, на маіх вачах кажа гаспадар-немец дроў у печ накідаць. Я, небарака, радая, што мне цёпла будзе, але ж гаспадар, мярзотнік, закрывае мяне на замок у пакоі, а дровы з печы кажа затушыць, дык я ад дыму, холаду пакутую, а два марыяшы[108] за пакой і за дровы даць мушу.

Мне гэта яшчэ нічога, але калі якія падарожныя людзі здадуцца яму падазронымі, ён баіцца, каб чаго не ўкралі, дык шэсць мужчын у адзін халодны пакой пасяліў. Тыя людзі адзін аднаго не ведаюць — адзін італьянец, другі немец, трэці паляк з французам, а аднаго не ведаю; і паставілі ім партрэцік, гэта

значыць начную пасудзіну, а сукні і кашулі гаспадар пазабіраў. Былі яны бедныя, пасцелі ім не даў, толькі па кулю вашывае саломы, а іх пакой бліз майго быў. У той аўстэрыі ў Вене ўначы гэтыя людзі памёрзлі, дык са злосці і ад холаду на розных мовах крычалі, праклінал, стукалі. Я спачатку звечара смяялася, потым за цэлую ноч яны мне страшэнна дакучалі крыкам.

Але мне Пан Бог цудоўна дапамог, бо ў такі патрыбны час прыехаў са Стамбула турэцкі пасол Джаны Алі-бей эфендзі, які быў з вялікаю пашанаю прыняты, каля трохсот туркаў меў ён з сабою, далі яму палац у горадзе Леапольдштад, непадалёку ад мяне. І вось разважаю сабе, што мне, самотнай белагаловай, рабіць, грошай няма, надзеі няма, каб мне найяснейшы імператар Карл Шосты што-небудзь даў за заслугі майго мужа альбо хоць тыя трыста чырвоных злотых даў, што я выдаткавала на выкуп майго мужа, тут роды хутка, тут чацвёра людзей і чатыры коні, дровы, за пакой штодзённа 4 злотыя. Адным словам, галава ў мяне баліць, як мне, самотнай белагаловай, цяпер быць у гэтым чужым краі.

Узяўшы Пана Бога на дапамогу, загадваю запрэгчы сваіх коней у каляску, і еду да турэцкага пасла.

Я ўмела крыху размаўляць па-турэцку і прывітала яго. Ён пытаўся ў мяне, якой я нацыі. Кажу: «Полька»,— і на ўсё шчыра адказвала, што была ў бацькоў свайго мужа, і тое сказала, што я лекарка і акулістка, дык мяне гэты шаноўны турак добра прыняў і сказаў: «Бог так прызначыў, каб я вяльможную васпані застаў, бо ў мяне па дарозе колькі дзесяткаў чалавек памерла і цяпер у мяне колькі дзесяткаў людзей хварэе, лекар-немец не разумее ні нашае натуры, ні мовы, усё праз тлумача». І прасіў мяне, каб узялася я лячыць ягоных людзей, і так мовіў: «Мы

маем дружбу з Польшчаю, і таму люблю людзей гэтае нацыі». Я гэтаму паслу за ягонае добрае сэрца падзякавала, а тыя паслугі, што магу маім лекарствам рабіць, з вялікаю ахвотаю ўзяла на сябе, і, значыцца, пасля гаворкі, кавы і тытуню загадаў ён упісаць мяне ў рэестр: раніцай і ўвечары па восем талерак з кухні ягонае мосці есці мне давалі, на чатыры кані порцыю сена і фуражу, пакой таксама запісаны за польскаю лекаркаю, і далі мне тры вокі кавы, галаву цукру і дванаццаць чырвоных злотых. О, як я Пану Богу дзякавала за Ягоную ласку. Пачала я лячыць пасольскіх людзей і ад кожнага пацыента асобны мела падарунак альбо грошы.

Заўважылі мяне немцы, што я так часта ў яснавяльможнага пасла бываю, пачалі мяне паціху запрашаць, лекі размаітыя браць, нават з палаца імператарскага дамы, напрыклад, фрайляйн княжна Парцыя, фрайляйн Марыяна дэ Берхтульт і іншыя дамы і мужчыны. Бачыў мяне вялікі імператарскі тлумач, які часта бываў у янавяльможнага пасла і пытаўся ў самаго пасла: «А ці ўмела тая яе мосць пані лекарка?» Мяне пан пасол вельмі рэкамендаваў, што я добрая лекарка, а яшчэ лепшая акулістка. Дык мяне той вяльможны яго мосць тлумач рэкамендаваў, аднаму графу Канвенцыту, які быў больш за дзесяць гадоў сляпы. І вось ад гэтага графа ў той жа дзень прыслалі каляску па мяне; я аглядзела ягоныя вочы і ўзялася, не таргуючыся, лячыць. І так мне Бог мой дапамог, што я яго цалкам вылечыла, і далі мне за лячэнне яснавяльможнога графа Канвенцыта дзвесце чырвоных злотых; так я атрымала падтрымку.

Тут прыйшоў час, што Пан Езус даў мне сына, Францішка Ксаверыя. Кумам быў князь Фернер, а кумою — фрайляйн фон Берхтульт, дама верхняга фраўцымеру яе мосці імператрыцы. У форы *in die*

Leopoldstadt[109] быў ён ахрышчаны, і я ўзяла ягонную метрыку.

Лежачы пасля родаў, мела я ласку Божую, мела я грошы, і коням корм, і з пасольскае кухні па восем місак раніцай і ўвечары ежы. Пачалі да мяне немцы і немкі часта наведвацца, а я, полька, не магу, каб з некім піць за яго здароўе, а яму не даць, таму казала штоф[110] за штофам у майго гаспадара гатэля браць віно і частавала гасцей.

Тым часам пры гасцях здарылася, што мне мае людзі ад пасла ежу прынеслі, дык я засаромелася, бо турэцкія стравы іншакшыя за нямецкія. Але панове немцы і немкі крычалі мне: "*Niksz gilelin fru Rolin gybynsy nor her die Tirksz raiz*", гэта значыць: «Гэта нічога, пані полька, дай сюды толькі нам турэцкую кашу». Я смяялася і з вялікаю ахвотаю давала сваю ежу гасцям, а мне і людзям маім, дзякуй Пану Богу, усяго хапала.

Была я ад Вены — гадзіну ехаць, а там ёсць звярынец імператарскі, і глядзела я на тое, як найяснейшы імператар Карл Шосты паляваў разам з малжонкаю своёю Лізль фон Вольтен-бютэль, старэйшаю дачкою сваёю Марыяй-Тэрэзаю, малжонкаю Францішка, князя Лютрынскага[111], якая цяпер рымска-хрысціянская імператрыца, і сястрою ейнаю паннаю[112], якую выдалі за баварскага князя, як мне казалі, і Марыю-Магдаленаю эрцгерцагіняю[113] фон Естрайх, роднаю сястрою Карла. Гэтую імператараву сястру выдалі некалі замуж за яснавяльможнага яго мосць пана Сапегу[114], канюшага літоўскага, якога засекла Рэч Паспалітая Польская. Некалі была я ў Вільні і чула, што біскуп[115] быў прычынаю гэтага і дазволіў засекчы такога годнага, велічнага, пабож-

нага, кавалера. У імператарскім двары дамы і кавалеры вельмі мала яго ўспаміналі. На гэтым павяванні няшчасце здарылася; найяснейшы імператар быў бадзёры, а калі далі абед, ён не хацеў ісці есці, толькі найяснейшая фамілія села за стол.

Пасля ўбачыў імператар, што адзін лоўчы еў сальцісон, і так яму мовіў: «Дай жа і мне гэтага сальцісону»,— што лоўчы ахвотна зрабіў і даў імператару. Імператар Карл з'еў той сальцісон, ад яго захварэў і памёр.

І вось пасля бацькавае смерці стала яна энцгерцагіняю аўстрыйскаю, загадала ў сакеце аднесці яе ў адно месца, якое завецца ў Вене Уфін Кахінмарк, і там усклалі на яе мітру, здаецца, на правае плячо. Сама не бачыла, бо ў той час нараджала. Маці Марыі-Тэрэзы, а імператара Карла малжонка, пакуль яшчэ імператар быў хворы, упала крыжам у касцёле святога Стафана перад алтаром і цэлую гадзіну так ляжала, а была яна дама вельмі поўная, станістая, адным словам, ад плачу кроў у яе з носа і рота ішла.

Так мовіў імператар Карл сваёй жонцы: «Ах, мая пекная Лізль (бо па-нямецку пакуль яшчэ яна паннаю была і людзі яе так і звалі: *die szeie Lizl*), якая шчаслівая была гадзіна, калі мы шлюб узялі і каранаваліся разам, калі я цябе першы раз назваў: «*O mejne romesze Kejzerin*». Гэта значыць: «О, мая рымская імператрыца, а цяпер я цябе пакінуць мушу». І як толькі імператар памёр, дык імператрыца ў чорную аксамітную мантыю ўбралася, села ў закрытую каляску і да кляштара паехала, дзе жыла імператрыца Амалія, малжонка нябожчыка імператара Іосіфа[116], брата роднага імператара Карла.

Гэтая імператрыца, Карлава жонка, была некалі бязвінна перад імператарам абвінавачана, што быц-

цам бы з нейкім кавалерам кахаецца, а гэта таму, каб выклікаць агіду да яе імператара і каб ён развёўся і жонку ўзяў, якая б магла сына нарадзіць, спадкаемца кароны. Паверыў у гэта імператар Карл і задумаў сабе падарожжа, а таго кавалера шамбелянам прызначыў, каб лягчэйшы доступ да яе мосці імператрыцы меў, а сам, развітаўшыся са сваёю пекнаю Лізль, ад'ехаў. Прасіла яго імператрыца, каб яе з сабою ўзяў, але адмовіў ёй у гэтым. Уначы апранаецца імператар у лёкайскую сукню, бо лёкаю можна, калі хоча ў пакой зойдзе і выйдзе, ды ідзе ў пакой шамбеляна. Шамбелян мала зважае на лёкая, бо думае: можа, падмесці прыйшоў альбо каго шукае, а сам нейкую кніжку чытае, лежачы на ложку. Ідзе ў пакой імператрыцы. Імператрыца, укленчыўшы, Пану Богу моліцца і не зважае на лёкая. Імператар у вопратцы лёкая падыходзіць да імператрыцы, малжонкі сваёй, і так мовіць: «*Ir gilibtin Lizl* (гэта значыць: мая мілая Лізль), што ты робіш «у поўнач молішся, чаму не спіш?» Імператрыца задуменна мовіць: «О, імператар, ці цень твой бачу, ці ваша імператарская мосць сам тут?» Ён кажа: «Не хвалюйся, гэта я сам». Пасля ў размове прызнаўся ёй імператар, як было, што на яе з тым кавалерам нагаварылі, што ён гэтае падарожжа наўмысна задумаў і абяцаў імператрыцы больш ужо не верыць, а лгуноў жорстка караць.

Была я ў садзе князя Генюша[117], нябожчыка. Вельмі ён прыгожы і каштоўны. Была больш за дзесяць разоў у касцёле святога Стафана. Там каля дзвярэй ёсць камяні, якімі габраі забілі святога Стафана, і ў тых камянях ужо вялікія ямкі, што людзі, цалуючы, выгладзілі, дакранаючыся да тых камянёў. Тут пахаваны той прынц Генюш. З левага боку ад дзвярэй у глыбіні касцёла ёсць капліца, удзень і

ўночы там залатую лямпу наліваюць, і свеціць яна дзень і ноч, і штодзень там ля ягонае магілы святая імша бывае. Камень, што дзверы ў магілу прываліў, мае два з чыстага золата кольцы, за якія бяруцца, калі ксёндз на імшу туды заходзіць.

Чула я, што імператрыца Лізль мела сына, якога карміла грудзямі адна пані графіня. Мовілі, што малако гэтае графіні не з'яўляецца карысным, дык, добра ўзнагародзіўшы, тую паню графіню адправілі дадому, а другую мамку ўзялі, яна імператарскае дзіця карміла. Гэтая белагаловая была шаўчыха, але малако яе вельмі карыснае было дзіцяці. Аднойчы прыйшоў імператар Карл, бацька дзіцяці, у той пакой, дзе мамка з імператаравым дзіцём, і ўбачыў сваё дзіця здаровае і бадзёрае. Мамцы даў вялікага кошту дыяментавы канак і яе ўвесь род набілітаваў. Але тая графіня, першая мамка, сяды-тады наведвала дзіця, якому ўжо было амаль два гады. Узяла звар'яцелая кабета вялікую іголку, як шыла, і ў мозг дзіцяці ўбіла, а звонку і канца не пакінула. Дзіцё яшчэ не гаварыла, толькі плакала, крычала, не ведалі, што з ім чыніць. Лекары давалі ад розных хвароб лекі, а не маглі зразумець, што за хваробу дзіця мае. За дваццаць чатыры гадзіны яно Пану Богу душу аддало. Загадалі дзіця ўскрываць. Убачылі сэрца, вантробы такія здаровыя, што лекары казалі: у дзіцяці такі арганізм, з якім можна і сто гадоў жыць. Імператар мовіць: «Якая ж усё-такі прычына смерці майго сына?» Узялі і галаву яму ўскрылі і ўбачылі тую іголку і тут жа паслалі па мамку-графіню. Тая прыйшла і прызналася, што ад вялікае зайздрасці ўчыніла гэта і павінілася. Імператар Карл Шосты з малжонкаю сваёю Лізль фон Вольфенбютэль толькі сардэчна заплакалі, смуткуючы ад страты свайго сына. Даравалі ёй жыццё, толькі выехаць

загадалі з нямецкага краю і каб ніколі на зямлі гэтай не паказалася.

У той час, калі я была ў Вене, ювелір Марыі-Тэрэзы, дачкі імператаравае, меў чалядніка, таксама ювеліра. Малады, разумны і добры майстар, меў ён бацькоў у Вене і меў усе каштоўнасці імператаравае дачкі пад сваёй уладаю. Гэты чаляднік закахаўся ў адну белагаловую, жонку аднаго касцельнага слу-жкі, і шмат ёй каштоўнасцяў імператаравае дачкі падараваў.

Пыталіся таго вучня пра каштоўнасці — ён, не ведаючы, што рабіць, уцёк. Даведаліся, што ён у касцельнае бываў, паслалі па яе. Яна мусіла каштоў-насці аддаць, а за вучнем пагоня пайшла, імператар-скія стральцы, і загадана было, каб абавязкова знай-шлі яго і закутага прывезлі, але не таму, каб пакараць смерцю, а таму што ён добры майстра быў.


Даведалася пра гэта тая белагаловая, жонка кас-цельнага, што стральцы за яе каханкам пагналіся і ён за зладзейства пакараны смерцю будзе. Дык тая белагаловая так зажурылася, пайшла ў касцёл, пры-гожа ўбраўшыся, спавядалася, прычасцілася і адразу тастамант напісала, што з яе невялікім набыткам чыніць, бо траіх дзяцей мела, і як убраная была, лягла на ложку, два ксяндзы прычашчалі яе перад смерцю, і хутка яна памерла. З майго пакоя быў бачны яе пакой.

Тым часам імператарскія стральцы дагналі таго лёкая-ювеліра, каханка тае кабеты. Як яго дагналі, дык ён з радасцю вярнуўся: «Ведаю, за той учынак, што адважыўся імператаравае дачкі каштоўнасці раздаваць, ведаю, што мяне смерць не міне, але даволі мне будзе таго суцяшэння, што, пакуль

памру, пабачу сваю каханку». І вось яго ў жалезныя кайданы закавалі і ў Вену прывезлі здаровага і вясёлага. А як толькі атрымаў вестку, што памерла касцельная, дык закрычаў: «О, сэрца ўва мне разарвалася ад тугі». І ледзь толькі паспавядаўся, памёр. Пышнае пахаванне Марыя-Тэрэза ім справіла, і ў адным яны касцёле ляжаць.

Пасля, праз колькі месяцаў, пачала я збірацца ў дарогу, ехаць у Польшчу. Пайшла і развіталася са сваім дабрадзеем, паслом турэцкім, і ён яшчэ мне за мае заслугі даў тры тысячы польскія, сукна і інш. У дарогу купіла сабе чацвёра коней за дзвесце бітых талераў, каляску за сто бітых талераў і срэбра і інш., што мне патрэбна было, і апрача гэтага вывезла з Вены з ласкі Пана Бога пяцьсот чырвоных злотых. Развітаўшыся з усімі добрымі прыяцелямі, кумамі і кумою сваімі, выехала я на Каляды ў Олміц[118] і пражыла там колькі дзён.





ГІСТОРЫЯ ПРА АДНАГО НІБЫТА ЧАРНАКНІЖНІКА, МАЛАДОГА І ВЕЛЬМІ ВУЧОНАГА ЧАЛАВЕКА Ў ГОРАДЗЕ ОЛМІЦ

Гэтая авантура была такая. Габраі з Літвы, з горада Пінска, прывезлі з сабою на продаж срэбраны буфет аднаго пана больш чым на дзесяць тысяч. Не маглі тыя габраі тое срэбра прадаць, як пан хацеў, дык склалі ў вялікую скрыню ў прысутнасці шматлікіх годных купцоў, пералічыўшы колькі штук, пераважыўшы колькі грыўняў, і зачынілі гэтую скрыню, і запячаталі і паставілі гэтую скрыню ў лаўцы ў аднаго купца, і заплацілі за месца купцу, а самі паехалі ў Пінск і пра ўсё распавялі таму пану. Гаспадар сказаў: «Так танна я не прадам. Як зноў паедзеце ў Вроцлаў, дык прывязіце мне маё срэбра». Габраі сказалі: «Добра». Праз колькі месяцаў тыя габраі-купцы па справах гандлю паехалі зноў у Вроцлаў і просяць у купца свой дэпазіт[119]. Здымаюць пячатку і адчыняюць скрыню, а там і самага маленькага кавалачка таго срэбра няма. Габраі ад купца срэбра патрабуюць, купец і іншыя прысягаюць, што не бралі, а гэты купец сумленны быў, суд

яму паверыў, што тут нейкае няшчасце здарылася. Так гэтая справа незакончанаю доўга цягнулася.

Адзін кавалер ехаў дарогаю, маючы з сабой некалькі людзей, і шляхетных, і здольных яго абараніць. З лесу выходзіць чалавек і просіць таго падарожнага, каб яму пазычыў сто чырвоных злотых і пару пісталетаў. Гэты кавалер кажа: «Я не ведаю цябе, чалавека, і грошай не маю, і загадаю цябе за тваю смеласць, за тое, што ў лесе ты так са мною размаўляеш, люта пабіць, і звязанага ў Вену завязу». Той чалавек мовіць кавалеру: «Гэтага ты не зможаш зрабіць». Кавалер — за пісталеты, і лёкаі таксама страляюць; хапаюць, а не могуць да яго дакрануцца. Ужо ім і пораху, і сіл не стае, а той чалавек мовіў: «А калі я ў вас страляць буду, дык і разу не схіблю і вас усіх пазабіваю і ўсё забяру». Дык мусіў падарожны кавалер даць яму сто чырвоных злотых і пару пісталетаў.

Прыязджае той кавалер у Олміц, ідзе да генерала-каменданта і скардзіцца на разбойніка, што ў яго гвалтам сто чырвоных злотых і пару пісталетаў забраў і ўсё пра авантуру гэтую распавёў. Генерал адказвае кавалеру: «Мая жонка мела з чыстага золата туалетны столік, і на вачах нашых столік стаяў, ды тут нехта ўсё цалкам украў, я лёкаяў сваіх ледзь не замучыў, ды бачу, што нявінна пакутуюць мае людзі». І распавёў тую гісторыю пра срэбра, што ў Вроцлаве з лаўкі з-пад пячаткі ўкралі. Але малады чалавек, што тое срэбра ўкраў, і ў кавалера сто чырвоных злотых забраў, і туалетны столік за калькі дзесяткаў тысяч, інакш гэта ўчыніць не мог, а толькі мусіў раней бачыць тыя рэчы, бо чаго не бачыў, таго ўзяць не мог.

У гэта час меўся быць фэст недалёка ад Олміца.



План горада Брэслаў (Вроцлава).
Гравюра XVIII ст.

На высокай гары ёсць там вялікі кляштар і касцёл, а ў тым касцёле вельмі цудоўная Прачыстая Маці. І ўбралі на той фэст у вельмі дарагія каштоўнасці і ў жомчуг гэтую Прачыстую Маці. Меліся ўбраць таксама і алтар. Той чарнакніжнік, малады чалавек, раней пайшоў на тую гару, дзе кляштар, бо там і аўстэрыя ёсць, і вёска, і вось гэты нягоднік бавіўся там з адною белагаловай, апранутаю па-мужчынску,

быццам гэта ягоны таварыш, і чакаў фэсту; каб ён толькі тыя скарбы вачамі ўбачыў на алтары, дык ужо з рук бы ягоных нідзе не дзеліся. І вось гэты чарнакніжнік піў (з усіх кепскіх учынкаў п'янства — найгоршы) і, напіўшыся, пачаў свае сакрэты адкрываць люду, што ў той карчме быў, ён дастаў адну шклянку, якая ўся была крывёю спісана нейкімі характа́рамі[120], і калі гэтую шклянку трымаў як належыць для піцця, дык быў бачны, а як павярнуў яе ўверх дном, дык яго не бачылі, і ён з людзей шапкі знімаў, і яны не маглі ад яго абараніцца, бо яго не бачылі.

І вось адзін жаўнер, што піў з ім, тут і гаворыць яму: «Мілы браце, дай мне гэтую шклянку; пагляджу, ці магу і я гэта ўчыніць». Той жлукта даў яму ў рукі шклянку, а жаўнер яе на зямлю кінуў і разбіў. Асобныя людзі пачалі крычаць: «Новых вяровак на гэтага злачынцу, трэба яго звязаць, бо чараўнік». Адказаў чараўнік: «І старымі ўжо можаце вязаць, бо без той шклянкі нічога не ўмею». Значыць, яго злавілі, звязалі і да генерала ў Олміц завезлі. Запытаны ён быў пра той з чыстага золата туалетны столік, і пра тое срэбра з Вроцлава, і пра іншыя без ліку страчаныя рэчы, што ад чараў згінулі. Ва ўсім прызнаўся і сказаў, дзе закапаў, іх выкапалі, і зноў гэтыя рэчы трапілі гаспадарам. І я гэтага чалавека пакінула ў Олміцы ў вязніцы, як і тую белагаловую, што была па-мужчынску апранутая. Выпіўка і Прачыстая Маці не дапусцілі больш злое чыніць.

З Олміца я зноў вярнулася ў Найзу, у Алаву, і ўбачыла бязмерную моц прускага войска, якое цягнулася з Вроцлава ў Алаву. У дарозе спаткалася

са штабс-афіцэрамі, у якіх пыталася, адкуль едуць і куды. Паказала я ім свае пашпарты, і яны мне далі двух жаўнераў, каб мяне ніхто нічым не пакрыўдзіў, дык я шчасліва даехала ў Вроцлаў.

Калі я спынілася перад вроцлаўскаю брамаю, мяне не хацелі пускаць у горад, бо ў той час толькі на тры гадзіны быў адкрыты ўваход у горад, і то з дазволу каменданта. А ўсё гэта таму, што прускі кароль у гэты дзень сам прыехаў у Вроцлаў.

Мае людзі па-нямецку добра не ўмелі, а я сама баялася пайсці, бо, можа, тыя тры гадзіны закончацца і брама зачыніцца, дык я ў горадзе застануся, а людзі і каляска з коньмі — у прадмесці, і я баялася рабунку: у той час там шмат войска стаяла. Дык я свайго чалавека, Бенядыкта Скалубовіча, паслала ў горад да таго гаспадара, у якога мы стаялі два гады таму, калі ехалі ў Карніёлію, а той гаспадар жыве недалёка ад касцёла езуітаў, пад знакам «Чырвоны паляк». Той гаспадар даў мне лісты ў Вену да свае роднае сястры, а я цяпер ад яе зноў лісты ўзяла да таго гаспадара, дык мовіла: «Бенядыкт, ты ідзі да нашае карчмы «Пад чырвоным палякам» і кажы: «Пане гаспадар, твая сястра з Вены прыехала,і не пускаюць яе ў горад. Схадзі, васпан, да вяльможнага яго мосці пана каменданта і вазьмі дазвол, каб магла трапіць у горад». Стары гаспадар за галаву схапіўся: «Мы, вроцлаўскія абывацелі, рады былі б выехаць з Вроцлава, а чаго мая сястра з Вены, з бяспечнага горада, сюды прыехала ў такі час! І што ж мне, небараку, чыніць?» Холадам пабег ён да каменданта, выстараўся прапустку і жаўнера, каб ягоную сястру пусцілі ў горад, і вось прыбег да мяне, і я заехала ў браму. Зазірнуў ён у каляску — аж не сястра, а толькі я. Немец кідаецца да майго Бенядыкта, але я мовіла: «Даруй мне, пане мілы,

бо мой чалавек не шмат умее па-нямецку, а мусіў ён казаць: «Мая пані прыехала, што ліст узяла ад сястры вяльможнага пана, а ён, прасцяк, мовіў, што сястра прыехала». Гэтым астудзіла немца і шчасліва даехала да ягонае аўстэрыі ў Вроцлаве.

Заставалася ў той карчме дзён 15. Бачыла, што мне на коней і на людзей выходзіць удзень больш як чырвоны злоты, а тут аніводнае душы не выпускаюць з горада па загадзе найяснейшага Фрыдэрыка, прускага караля[121] ў 1739 годзе.

Я палічыла тыя злотыя, што мушу тут выдаткаваць у такі дарагі час, і вырашыла: паеду сама да яго мосці караля, калі чаго добрага даб'юся, дык слава Богу, а калі не — ніхто не будзе ведаць майго намеру.

І вось я паехала. Пад'ехала да палаца і пайшла на верхнія пакоі, бо мяне першая варта лёгка пусціла. А калі ўжо ў пакой самога яго мосці караля ўвайсці хацела дык не хацела мяне варта пускаць. Я прасіла шамбеляна, каб дазволілі мне мець аўдыенцыю ў яго мосці караля.

Шамбелян паведаміў, што «стаіць ля пакоя нейкая белагаловая і хоча мець аўдыенцыю ў вашай каралеўскай мосці». Гэты манарх, поўны цікавасці, якую патрэбу мае тая белагаловая, выслаў да мяне гіхаймерота[122] Айхіта, свайго сакратара, які ў мяне зацікаўлена пытаўся, адкуль я. Кажу: «З Польшчы, харунжыха».— «Адкуль едзеш».— «З Вены».—«Чаго хочаш?» Мовіла: «Не скажу васпану, толькі самому яго мосці каралю». Пайшоў да караля. Кароль зацікавіўся, што гэта за сакрэт маецца распавесці белагаловая, прысылае да мяне другога сакратара, гіхаймерота Шумахера. Ён мне так мовіў: «Мадам, самы найвялікшы сакрэт можаш мне распавесці, бо я найбліжэйшы сакратар

яго мосці караля». Аднак я сказала: «Даруй мне, вяльможны пане, але я не распавяду. Калі самому яго мосці каралю, дык распавяду, а калі аўдыенцыі мець не буду — паеду да свае карчмы». Яго мосць кароль цікавы ведаць, што я хачу яму распавесці, дазволіў мне прыйсці ў ягоны пакой. І вось, прыйшоўшы, я ўкленчыла і пацалавала ягонае крысо і так мовіла: «*Ir Kinigliche maister, fercainsy mir die umgileginhaitin das ich far ursaht hab Zycht got in Hymel das ich Pinginet derzuvenig main mut*», гэта значыць: «Найяснейшы кароль, прабач мне, ваша каралеўская мосць, за маю фамільярнасць, бо вымушана ад майго цяжкага становішча чыніць гэта, а просьба мая такая: дазволь мне выехаць з Вроцлава ў Польшчу, калі гэта магчыма, альбо загадай даць на мае патрэбы, гэта значыць суфіцыенцыю мне, людзям і коням маім, бо я, бязродная шляхцянка, мала маю на дарогу». На што мне кароль яго мосць адказаў: «*Auf aler weis Madam wil sy farin ich las ir hajte ain pasport gieben, wilsi hir blaiben ich wil ir farfiegung las in untgebyn*, гэта значыць: «Мадам, калі хочаш ехаць, загадаю васпані пашпарт даць», а хочаш тут забавіцца, загадаю ўсялякую суфцыенцыю даць». Я кінулася яму ў ногі і прасіла пашпарт, і ён на маіх вачах загадаў адразу напісаць і даць мне ў рукі. Пасля шмат у мяне распытваў, адкуль еду і чаго ездзіла.

Адказвала на ўсё добрасумленна, нават, што ў Стамбуле і ў Пецярбурзе і інш. была. Пасля гэтае гутаркі, засведчыўшы маю павагу, я выйшла з пакоя яго мосці караля і ў вітальні прасіла яго мосць пана сакратара свой пашпарт, каб хутчэй даў мне яго, але пан сакратар мовіў: «Мадам, едзь зараз у сваю карчму. Праз тры гадзіны прыедзеш, і будзе гатовы пашпарт». Аднак я пабаялася: ужо цяпер ягамосць ведае мой сакрэт, што я распавяла яго мосці кара-

лю; як я ў карчму паеду і зноў прыеду, дык можа мяне варта не пусціць, таму кажу: «*Irginadun*, я жыву ў аўстэрыі, у вельмі нявыгаднам доме. Тыя тры гадзіны, што маю там правесці, лепш я тут забаўлюся і ўслужу пану дабрадзею». Бачыць пан сакратар, што мяне не збудзе, загадаў адразу пісару напісаць, пячатку прыкласці і аддаў мне пашпарт у рукі. Я з радасцю ў карчму прыехала і паказала купцам свой выязны пашпарт, і ўсе вельмі дзівіліся, што магла яго дастаць, чаго аніводзін не змог, бо іншыя па шэсць месяцаў стаялі, а пашпарта не маглі атрымаць.

З Вроцлава я паехала ў Пётркаў, дзе ўзяла лёкая. З Пётркава ў Люблін, з Любліна ў Львоў паехала. У Львове даведалася, што мой муж, яго мосць пан Пільштын, адабраў мой дэпазіт у яснавяльможнай яе мосці Шчытавае, кашталяніхі смаленскае, і дачку маю Канстанцыю Гальпірову, і ўсё патраціў, і сам пад арыштам сядзіць за нейкі ўчынак афіцэрскі, што яму не дазваляецца з пакоя выйсці, але, аднак, пры сабе дзвюх белагаловых трымае, адну прачку, другую гаспадыню, пачуўшы гэта, я вельмі замаркоцілася.

Я думала, што тут у мужа застануся і мы будзем цешыцца з нашчадка нашага, што нарадзіўся ў Вене, сына Францішка, і я крыху набытку прывезла, бо ў Вроцлаве пару ўбораў, залатымі галунамі абшытых, свайму мужу справіла, на якія выдаткавала шэсцьсот польскіх злотых, кавалак палатна за дванаццаць чырвоных злотых і іншых рэчаў патрэбных, а тут бачу з боку мужа майго нянавісць і марнатраўства. Задумала паслаць свайго чалавека Стафана па маю дачушку ў Алыку, каб ён выкраў маю дачку ў майго мужа і каб мне яе сюды ў Львоў прывёз.

Але гэты кепскі чалавек, Стафан, не рабіў так, як яму загадала, а, прыехаўшы ў Алыку, заехаў да майго мужа і ўсё яму распавёў, чаму я яго навучыла. Дык мой муж не прыслаў мне дачку, а прыгатаваў атруты і даў Стафану. Стафан прыехаў з Алыкі ў Львоў і шукаў хвіліну, каб мне падсыпаць тую атруту. І падсыпаў, і я з'ела яе з макаронамі, і хутка так цяжка захварэла, што ледзь не звар'яцела, адным словам, разоў чатырыста ванітавала. Наведалі мяне законніцы з ласкі сваёй, панны бенедыктынкі армянскае нацыі, яе мосць панна Аўгусцінава Алаіза, іх мосці ксяндзы-езуіты, напрыклад, яго мосць ксёндз Пакаслаўскі і яго мосць ксёндз Кіянкоўскі, і армянскай нацыі яго мосць ксёндз Колчан, і яго мосць ксёндз Міхалевіч. Ніхто не спадзяваўся, што я выжыву, я таксама нічога не ведала пра сябе, дык мамка, кухарка, той жа Стафан і іншыя парасцягвалі мой набытак. Пасля цудоўна Пан Езус мяне вылечыў, але ў мяне зубы выпалі, валасы вылезлі, кіпці пазлазілі, нават уся скура з мяне злупілася. Праз дванаццаць тыдняў ужо магла ў касцёл хадзіць, есці, піць. Аднаго разу ўбачыла князя яго мосць Міхала Радзівіла, гетмана літоўскага, у касцёле і прасіла за свайго мужа, каб яго ўжо з-пад арышту вызваліў, што той мне лёгка абяцаў учыніць.

У гэты час прыехаў вяльможны яго мосць пан Бранёўскі[123], падчашы брэсцка-куяўскі з Баліч[124] і прасіў мяне, каб з ім паехала і лячыла еймосць ягоную, якая такую мела хваробу, што як зацяжарыць, дык на пятым альбо сёмым месяцы дзіцё скіне і ўжо шасцёра скінула. Будучы цяжарнаю сёмым, ужо ўсе знакі былі, што зноў скіне. Дык даў мне гэты яго мосць Бранёўскі дваццаць чырвоных злотых, і мы паехалі ў калясцы разам з ягамосцем дабрадзеем у Балічы, дзе, прыехаўшы, наколькі мне Бог даў

умельства, клапацілася я пра здароўе тае пані, і Пан Езус дапамог мне, што гэта дзіцятка моцаю Пана Бога было даношана і шчасліва нарадзіла вяльможная еймосць Базыля Бранёўскага, падчашніковіча брэсцка-куяўскага.

У час гэтага лекавання прыехаў туды мой муж, яго мосць Юзаф Пільштын, з-пад арышту з Алыкі, але вельмі кепскае было ў яго становішча, усё страціў: і што меў, і што ў мяне забраў. Але я ўжо зусім не хацела жыць са сваім мужам, не вельмі настойвала разводзіцца, а хацела жыццё сваё ў сепарацыі праводзіць і хацела проста з Баліч ехаць у Камянец і ў Хоцін, а там у Рушчук над Дунаем, дзе мае чатыры нявольнікі-туркі, што мне яе мосць царыца дала, а светлы князь Міхал Радзівіл, гетман літоўскі, адабраў і ў Турцыю адаслаў. Я з ласкі Божае спадзявалася, што ад гэтых туркаў, аднак, колькі тысяч вазьму, бо яны туркі сумленныя былі, ну а я ў Львове яшчэ дамовілася, каб мяне вяльможны яго мосць пан Бранёўскі ўжо не ў Львоў адвёз, а ў Камянец. Але ж гэта ўсё перамянілася, як мой муж прыехаў. Мяне ён у тую дарогу не пусціў і ўпёрся, каб абавязкова жыла з ім і назад ехала ў Львоў. Так і сталася, зацяжарала я зноў сынам маім другім, Станіславам дэ Пільштынам, але я сабе думала: «Як толькі ў Львоў прыеду, дык адразу ад мужа свайго ўцяку ў кляштар». Так і сталася. Уцякла я адразу з каляскі, пайшла ў касцёл, а з касцёла ў кляштар вяльможных матак бернардзінак, а муж мой каханы цапнуў з каляскі мой куфар з сукнямі, з грашыма і іншым, што там было, потым фурыі і спрэчкі чыніў з паннамі бернардзінкамі, што я ўжо таго шуму выцерпець не магла і сама выйшла да яго да брамкі і мовіла: «Відаць, гэта воля Пана Бога. На, вазьмі мяне і з'еш». Ён мяне схапіў, пацягнуў на адзін рускі магіль-

нік, дзе меў нанятую сваю халупку, і там з маім мужам мы колькі тыдняў пражылі, і тое, што я здаўна ў іх мосцей паненак бернардзінак мела, таксама ад іх выцягнуў, патраціў, так што я зноў нічога не мела. Аднойчы з вялікім плачам і нараканнем сказала мужу майму: «Бачыш мяне, цяжарную белагаловую, да такой нястачы давёў ты мяне, памятай, што я цябе з турэцкае няволі выкупіла за трыста чырвоных злотых, чын харунжага вяльможнаму пану выпрасіла і сукні, коні, вупраж, сёдлы, гадзіннікі, сыгнеты, табакеркі, пасцель, бялізну ды іншыя выдаткі на яснавяльможнага пана мела, не такой я ад вяльможнага пана ўзнагароды і пашаны чакала, а яшчэ і цяпер дзе што маё схопіш, дык забярэш і змарнатравіш, і яшчэ мне забараняеш ехаць шчасця шукаць! Давядзецца мне, маркотнай белагаловай, з голаду памерці пры вяльможным пане, бо цяпер ты і службы не маеш». Ходзіць мой муж па хаце і думае, што б мне на гэта адказаць, і так мовіў: «Параю табе, мая жонка, як ад усіх бед і нястач пазбавіцца. Купі сабе за тры грошы аршэніку[125] і атруціся, дык ні родаў, ні мамкі не трэба». Калі я гэтыя словы пачула, цяжка ўздыхнула, плакаць і гаварыць перастала, пераканала сябе і на Пана Бога паклалася, ды з таго часу шукала спосабу, як бы пакінуць свайго мужа.

Тут прыехаў вяльможны яго мосць пан Тамашэўскі, які некалі ў мяне лячыўся ў Любліне ад ішыясу і раматусу, тады вылечыла я гэтага ягамосця, і ён таксама ў адказ дабрадзейства ўчыніў: майго мужа намовіў, каб мне дазволіў паехаць у Турцыю забраць мой доўг у маіх туркаў-нявольнікаў, дык мой муж мне дазволіў, а вяльможны яго мосць пан Тамашэўскі пазычыў каляску, коней і лёкаяў і адаслаў мяне ў Жванец[126]. Калі я спынілася ў Жванцы, дык мяне не хацелі прапусціць на той бок ягамосці-намеснікі,

хоць мела пашпарт з трыбунала ад яснавяльможнага яго мосці пана маршалка Вадзіцкага[127], хоць выхрыстаў, папоў, блудных кабет і даўжнікоў лёгка прапускалі, а мяне не хацелі нават і назад адпусціць.

У гэты час, Пану Богу дзякуй, адна годная мяшчанка, купчыха, яе мосць пані Сеферава два гады хварэла, і гэтая хвароба пагражала смерцю, бо я шмат такіх ведала, што ад гэтай хваробы памерлі, і вось прыехаў яго мосць Сефер з жонкаю сваёю і яго мосць пан Стафан Мількановіч з жонкаю сваёю, і пераканалі яго мосць пана-намесніка, што несправядліва закрыў мне тую дарогу, і ўзялі мяне з сабою ў Камянец, і лячыла я яе мосць паню Сефераву, якая ачуняла.

Даведалася яснавяльможная яе мосць пані Патоцкая[128], кашталяніха брацлаўская, што я ў Камянцы-Падольскім, дык прыслала па мяне каляску і забрала мяне ў староства сваё, у Смотрыч[129], дык я лячыла ногі гэтае яснавяльможнае пані, бо яна зусім не магла хадзіць. Калі дзе якую патрэбу мела, дык яснавяльможную яе мосць паню кашталяніху насілі, а я так удала вылечыла, што і цяпер з ласкі Пана Бога яна здаровая. Таксама лячыла я ў той час яснавяльможную яе мосць паню ламжынскую, старасціху Думаноўскую, таксама вяльможнага яго мосць ксяндза Малахоўскага, піяра, дык мне Пан Езус дапамог на пяцьдзесят чырвоных злотых, і я аддала іх у дэпазіт яснавяльможнай яе мосці пані кашталянісе брацлаўскай, а гэта з той рацыі, што мела сына Францішка толькі з мамкаю, а тут цяжарная еду ў Турцыю, Бог ведае, ці прыеду жывая, ды і дачка мая Канстанцыя, бедная дзяўчынка, дык я верыла, што гэтая пабожная пані яшчэ і свайго даложыць, і маім дзецям дапамагаць будзе, бо ўзяла ж у сваю апеку майго

сына Францішка з ласкі свае панскае — малое дзіця ледзь два гады мела — і загадала майму дзіцяці стварыць усе выгоды, нагляд, і яшчэ пісала тая яснавяльможная яе мосць дабрадзейка да яснавяльможнага яго мосці пана Патоцкага, ваяводы кіеўскага, каб ад сябе загадаў даць мне пашпарт і ліст напісаў да яго мосці пана Мандзялёўскага, у той час рэгіментара[130] памяжовага. У лісце выказала, чаму мне не варта дарогу закрываць, бо я — белагаловая веры годнае і па сваіх справах еду за мяжу. Праз дзён дзесяць атрымалі мы спрыяльны адказ ад яснавяльможнага Патоцкага, ваяводы кіеўскага (бо я і сама ад сябе ліст пісала ў форме супплікі). Атрымаўшы гэты спрыяльны інструмент, а таксама пашпарт, узяла я дазвол у вяльможнага яго мосці пана Бякерскага[131], генерала і каменданта камянецкага, на вольны праезд да турэцкае зямлі. Прыйшоў таксама ў той час і ліст ад майго мужа, яго мосці пана Юзафа Пільштына, каб не хвалявалася, каб нішто здароўю майму і дзіцяці нашаму не шкодзіла; а раней мовіў: «атруціся», а ўсё таму, бачу, што думаў, мо я яму грошай прышлю.

Развітаўшыся з паняй маёй, яснавяльможнай яе мосцю паняю Патоцкаю, кашталяніхаю брацлаўскаю, старасціхаю сматрыцкаю, паехала я з Імем Божым у Хоцін толькі з адным хлопцам, Бенядыктам Скалубовічам. У той час, як я прыехала ў Жванец, і добрага слова не сказала іх мосцям панам намеснікам, бо мне яны несправядліва дарогу закрылі былі, хутка я прыехала ў Хоцін. Суправаджаў мяне адзін годны таварыш, вяльможны яго мосць пан Ніцэцкі, падчашы, з той кампаніі, што і ў Жванцы была, дай Божа таму годнаму кавалеру здароўя. У той час як я прыехала ў Хоцін, вялікі бунт узнялі туркі супраць самога янычар-агі, што мусіў сабе

галаву і твар пераміткаю[132] завязаць, як белагаловая апрануцца, і так з палаца свайго ўцякаць, а я ў той час была ў пакоі пашы з ягонаю жонкаю і дзецьмі. На пачатку яшчэ гэтага паўстання пісаў быў хоцінскі паша ў Стамбул да турэцкага султана, паведамляючы яму, што янычары пачалі бунтаваць. Дык адзін турак прыехаў з некалькімі сотнямі вершнікаў і ў Хоціне тых паўстанцаў перадушыў, асобных на выгнанне паслаў, а ранейшаму янычар-агу Алі-азе даў вялікае падмацаванне і канвою колькі соцень людзей, а сам выехаў з гонарам, з набыткам, з жонкаю, з дзецьмі з Хоціна ў Стамбул. І гэтаму ж янычар-агу, што з Хоціна ехаў у Стамбул, рэкамендаваў мяне яго мосці хоцінскі паша, каб мяне ў дарозе не пакінуў і ў Бухарэст завёз, і дадаў, што я — добрая лекарка; гэта ўсё той янычар-ага з ахвотаю ўчыніў і абяцаў мне ў дарозе ўсялякую апеку.

Толькі ў дарозе загадаў запрасіць мяне да сябе і размаўляў са мною, але я бачу, што ён стары чалавек, гадоў восемдзесят мае, надзвычай перапалоханы і хворы на цяжкую крывавую дызентэрыю. Я ж аптэкі не мела, толькі ў дарозе зёлкамі і карэньчыкамі ратавала яго, напрыклад, *rad. tormentilla, rad. caramphilat, rad. bisztorta*[133] і іншымі, якімі разумела, зёлкамі, так мы прыехалі шчасліва ў Ясы[134] на Валахіі, і там я застала вяльможнага яго мосць ксяндза Рыгарскага, *Societatis Iesu*[135], і паспавядалася ў яго, і ўзяла святое прычасце, і паехалі мы далей на Мультаны[136] ў Бухарэст; у дарозе мела я вялікія выгоды, бо мне даў ён свайго чалавека, венгра Уладзіслава Тапліцу, годнага шляхціца, які трапіў быў у палон і таго ж Алі-агі нявольнікам стаў.

Есці, піць, што толькі душа мая хацела, магла я прасіць са спіжарні ягонае, і абяцаў ён мне падараваць, прыехаўшы ў Стамбул, таго нявольніка, Ула-

дзіслава Тапліцу, і вось мы шчасліва прыехалі ў Бухарэст.

Я цяжарнаю была і штодзень чакала родаў, дык хацела як найхутчэй да Рушчука даехаць, бо спадзявалася там даўніх прыяцеляў знайсці. Але мяне мой пацыент Алі-ага на колькі дзён затрымаў, пасля сам выбраўся ў дарогу да Стамбула, а я назаўтра мелася з Бухарэста выехаць на паштовых у Сілістру[137], бо ведала, што там трыбунальскі паша, зяць імператаваў, які завецца Якуб-паша, і мелася прасіць у яго *ferman*, гэта значыць ардынанс у Рушчук, каб мае нявольнікі, якіх я з Пецярбурга прывезла ў Літву і якіх у мяне яснавяльможны князь адабраў і адаслаў у Бэндэры, цяпер мне аддзячылі, што я іх з маскоўскае няволі вызваліла. Пераначавала я адну ноч у Бухарэсце, а назаўтра па палудні выбралася з пакоя і села ў вазок з маім верным і пачцівым лёкаем Бенядыктам Скалубовічам, і толькі з месца рушылі, як сустракае нас годны турак і пытаецца, ці не ў гэтым доме лекарка з Польшчы. Дык гаспадар адказаў: «Вунь яна, што з брамы выехала». Гэты турак кланяецца мне і ад імя Алі-агі просіць дзеля Бога, каб сёння не ехала, толькі гэтую ноч пераначавала і выратавала яго ад вялікага болю ног, а я беднаю шляхцянкаю ў той час была, бо толькі пяць бітых шустакоў[138] мела, ні сукняў, ні пасцелі, бо ўсё муж мой, яго мосць пан Пільштын, прагуляў, а пацыент мой, яго мосць пан Алі-ага, нічога не даў, адно мне таго нявольніка-венгра падараваў і абяцаў яго са Стамбула ў Рушчук прыслаць, дык я мусіла з вазка вылезці і рэчы свае ў пакой аднесці, бо мне той хворы турак даў тры чырвоныя злотыя на аптэку, каб лячыла ягоныя хворыя ногі. Дык пайшла я ў аптэку і купіла, што мне трэба, зрабіла пластыры і аддала майму пацыенту, а сама вярнулася ў свой

пакой. Пасля вячэры пайшла з Імем Божым спаць, і гэтай жа ноччу даў мне Пан Бог сына Станіслава Костку Пільштына.

Назаўтра прысылае да мяне турак мой, каб не ад'язджала, толькі каб з ім раней пабачылася, бо хоча ў мяне дасканала вылечыцца, бо мае пластыры добра дапамаглі. І вось яму мая гаспадыня адказала: «Пэўна, не паедзе, бо ёй Пан Езус даў сына». Тады ў вялікай радасці прыходзіць да мяне мой турак з віншаваннем і дзякуе за добрыя лекі; убачыў ён мяне, бедную белагаловую, што мала ці, папраўдзе, нічога не мела, і, узрушаны маёй вялікай галечаю, так мне мовіў: «Нічога табе дарма, мая пані лекарка, не дам, толькі за тваё лячэнне, колькі яно варта, столькі заплачу. Цяпер мусіш пасля родаў сорак дзён тут ляжаць, дык мяне можаш дасканала вылечыць». І пайшоў у лаўку і купіў мне шэсць кавалкаў ядвабнае тканіны ў паскі, таксама ядвабную коўдру, матрац, аксамітнае ўзгалоўе, адным словам, чаго ў мяне не было праз маю галечу, тым мяне Пан Бог забяспечыў праз таго добрага пацыента, бо ён мне пакоік мой увесь і ложак абабіў новым атласам у паскі. Магла ўжо без сораму ляжаць, хоць бы мяне і годныя людзі наведалі.

Казала я прасіць да мяне ксяндза Мікалая, закону святога Францішка, каб мне пашукаў куму і дзіця маё ахрысціў, бо ў Бухарэсце мала католікаў.

Гэта набожны *pater* з ахвотаю ўчыніў, сабраў мне кумоў пар тры, сярод якіх быў граф, і залацільшчык, і купец, бо тут сярод простых вельмі мала католікаў. І вось шчасліва дзеля Бога ахрысцілі мне сына майго трыццаць першага ліпеня тысяча семсот сорак другога года і далі яму імя Станіслаў Костка, а кум з прычыны пабожнасці свае прасіў даць яму імя Георгі,

бо колькі дзяцей хрысціў, толькі ім гэтае імя даваў. І вось я шчасліва адляжалася пасля родаў сорак дзён і ўзяла тысячу дзвесце злотых барышу ад таго турка, бо сталі здаровымі ягоныя ногі, і адтуль і адсюль. Ды і разныя пацыенты трапіліся мне ў Бухарэсце, дык вывезла 3000 польскіх злотых і выехала на паштовых з Бухарэста ў горад Сылістра, які ля Дуная, а там быў вялікі трыбунальскі паша, імператараў зяць Якуб-паша. У гэтага пашы прасіла я ферман у Рушчук, каб туркі мае, якіх я з Масквы, з Пецярбурга прывезла і якіх у мяне яснавяльможны яго мосць князь Радзівіл адабраў і ў Бэндэры адаслаў — гэтыя мае нявольнікі, туркі, жылі ў Рушчуку — дык я хацела ад іх, каб далі мне за сябе па пяць тысяч польскіх. І вось мне яснавяльможны Якуб-паша ахвотна даў ардынанс, мубашыра, гэта значыць свайго шляхціца, які са мною разам Дунаем паехаў з Сылістры ў Рушчук — таксама ля Дуная горад — да рушчуцкага суддзі, каб ён тых маіх туркаў выклікаў у суд і мае дваццаць тысяч ад іх па законе забраў.

І вось я шчасліва з Сылістры выехала ў Рушчук з тым шляхціцам пашы і з ардынансам. Прыехаўшы ў Рушчук, мы аддалі лісты нашы і ардынанс. І былі да нас ласкавыя рушчуцкія паны, напрыклад, ваявода Хаджы-Ахмет-паша, яснавяльможны пан дэ Магілабей, і іншыя, і сам суддзя. І двое туркаў, маіх нявольнікаў, хутка без суда і клопату з радасцю да мяне прыехалі, бо ў вёсках жылі, і так мне мовілі: «Ты матуля наша і пані, а мы сапраўдныя нявольнікі твае, але не можам так шмат даць, колькі ад нас патрабуеш, злітуйся і вазьмі ад нас, што даць можам». Дык з прычыны сяброўства з іншымі панамі, што за іх прасілі, я па іх просьбе згадзілася з імі, узяла пяць тысяч польскіх і праз суд распіскі ім дала, а

таго шляхціца, аддзячыўшы за ягоныя клопаты і адпісаўшы ліст Якубу-пашу, адаслала назад.

А два туркі, нягоднікі, вельмі мне супраціўляліся, не хацелі нічога даць. Спачатку казалі, што князь яго мосць Радзівіл ім загадаў, каб яны мне нічога не давалі, іншы раз мовілі, што яны самі ўцяклі з няволі, а я іх толькі на дарозе знайшла і з Масквы ў Літву прывезла, дык мне толькі за фатыгу можна даць, а не дзесяць кес, як я ад іх патрабую. І не хацелі яны падпарадкоўвацца закону, а падалі на апеляцыю ў Стамбул і самі паехалі ў Стамбул. Тым часам прыехаў да мяне на лячэнне адзін турак, якога звалі Хасан-паша, з Біліграда, сляпы на абодва вокі. Старгаваўся ён са мною за дзевяноста чырвоных злотых і адразу даў пяць ды абяцаў праз тры дні даць 85 чырвоных злотых. Значыцца, пачала я яго лячыць і лячыла дзён пятнаццаць, і стаў ён бачыць. Мовіла яму: «Пане Хасан, ужо не пяць дзён, а пятнаццаць, ды бачу, што мне абяцаных 85 чырвоных злотых не даеш». Тады мой добры Хасан-паша ўзяўся мяне з Імем Божым прасіць, каб я яго дасканала вылечыла, а што да грошай, дык ужо і шэлега не мае, але абяцаў, што мне будзе пяць гадоў за гэта служыць. І вось з ласкі Божае задаволена я была гэтым і лячыла яго далей так дасканала, што бачыў, як і раней.

Гэтаму Хасан-пашы купіла я каня, забяспечыла на дарогу і паслала ў Стамбул з лістом да Ях'і-пашы, што быў у няволі ў Пецярбурзе, калі мне Анна Іванаўна загадала выдаць чатырох туркаў, і гэта Ях'я-паша добра ведаў.

Тыя два туркі, нягоднікі Ібрагім-ага і Хусейн-ага, што раней паехалі ў Стамбул і пайшлі на Дыван, дабіваліся свайго інтарэсу, даказваючы сваю праўду, што мне нічога не павінны даваць, і згодна іх тлумачэнням атрымалі дэкрэт, каб мне крыху толькі далі за

тое, што я іх везла і карміла ў дарозе. Але ж мой лёкай Хасан-паша, якому я вылечыла вочы і паслала з лістом у Стамбул да Ях'і-пашы, быў чалавек спрытны, разумны і верны. Аддаўшы ліст Ях'і-пашу, ён больш вусна пра інтарэс распавёў, чым я пяром накрэсліла, і вось мой добры паша, не зважаючы на клопаты, сам паехаў да візіра і засведчыў, што праўда на маім баку, што я іх выслужыла і выпрасіла ў найяснейшай яе мосці імператрыцы, і яны мае ўласныя нявольнікі. І атрымаў мне такі ардынанс, каб пасля прачытання яго тых двух туркаў тут жа закавалі і аддалі ў мае рукі, і вольна мне іх да жорнаў прыкаваць, каб малолі, і вольна мне іх у Польшчу браць, калі б зноў здарылася, каб туркі ў палон трапілі, дык іх не варта і за злоты выкупіць, бо мяне за маю стараннасць, вернасць і выдаткі не захацелі шчодра аддзячыць. І вось мой паслухмяны Хасан-паша, атрымаўшы ардынанс і ліст, *alias* адказ ад Ях'і-пашы мне, выехаў са Стамбула, і шчасліва прыехаў да мяне ў Рушчук. Як мой лёкай Хасан-паша да мяне прыехаў, я забараніла яму, каб нічога нікому не гаварыў, што я маю такі спрыяльны ардынанс са Стамбула.

І вось праз колькі тыдняў прыехалі і мае два туркі-нявольнікі са Стамбула, бо яны там па сваіх справах бавіліся, і прыйшлі да мяне і кажуць: «Мілая пані, мусім з васпаняю ў суд ісці. Мы маем ферман нічога васпані не даваць». Я таксама кажу: «Згаджаюся з воляю Божай і з урадам стамбульскім». Значыцца, пайшлі мы ў суд, і паказалі суддзю мае нявольнікі свой ардынанс, дзе напісана, каб яны мне нічога не давалі. І так мовіў да мяне яго мосць пан суддзя: «А што мне тут чыніць, мілая пані? Ужо дэкрэт маецца, я яго парушаць не магу».

Я ж таксама адказваю: «Ваша мосць пане суддзя,

у мяне таксама ёсць моцны стамбульскі дэкрэт, дык і яго парушыць не можаш». Дастала свой ардынанс і дала на чытанне суддзі. Як суддзя на людзях ардынанс прачытаў, перапалохаліся мае нявольнікі, а іншыя прысутныя надзвычай былі здзіўлены. Дык суддзя мовіў тым двум туркам: «Хочаце яе мосць паню лекарку супакоіць ці вас загадаю закуць і ў яе рукі аддаць, і будзеце яе нявольнікамі?» Адзін, Ібрагім-ага, мовіў: «Я пайду пашукаю за сябе паручыцеля, а сам пайду дадому і аддам грошы». І мы выйшлі з дому суддзі, а Хусейн-ага ў шаленстве кідаецца на мяне і клянецца, што заб'е мяне. А я са смехам кажу яму: «Пане Хусейн, ты думаеш, што нашы полькі заечыя сэрцы маюць, як вашыя балгаркі альбо валашкі?» І дастала пару набітых круціц[139] з кішэні і працягваю: «У мне хопіць пораху на лёкаяў васпана. Аддай, васпан, што мне належыць, а пасля няхай тое будзе, што Бог дасць». Прысутныя пацяшаліся са смеласці маёй. Карацей, за чатыры тыдні атрымала я ад гэтых двух туркаў-нявольнікаў польскіх васемнаццаць тысяч, і мы пагадзіліся, і гэтыя туркі такое мне зычылі: «Калі б такая патрэба была, казалі, пайшлі б мы зноў у няволю, а ты, каб заўсёды вольная была, матуля нашая».

Я ў гэтым Рушчуку шчасліва жыла і з усіх бакоў пацыентаў і значныя барышы з ласкі Божае мела.

У гэты час прыязджае той венгр Махмет, а пахрысціянску Уладзіслаў, нявольнік Алі-агі, з якім я з Хоціна ў Бухарэст прыехала, бо той Алі-ага недалёка ад Стамбула памёр у дарозе, аднак не забываў пра сваё абяцанне гэтага венгра мне падараваць. І ўсіх сваіх нявольнікаў перад смерцю вызваліў, даў ім

вольныя лісты і кожнаму па сто леваў і сукні, што мелі. Той Алі-ага меў сто дваццаць нявольнікаў і нявольніц у дарозе і ў Стамбуле, а венгру Уладзіславу Тапліцы загадаў: едзь ты назад з адным байрактарам, гэта значыць харунжым, з Разграда[140] ў Рушчук да пані лекаркі. І даў яму сукні, і сто леваў, і ліст вольны. Але гэты Уладзіслаў быў чалавек малады, не practычны, ён аддаў свой вольны ліст і сто леваў на захаванне свайму таварышу, харунжаму. Так яны ў Рушчук прыехалі, і венгр да мяне прыйшоў і кажа: «З'явіўся па загадзе майго пана Алі-агі і хачу служыць васпані». А харунжы мовіў: «Ты ж дурань, пане венгр. Ці ж можаш ты пані лекарцы служыць, калі ты мой нявольнік? Пан твой перад смерцю сваёй мне падарыў цябе». І вось з гэтага шум зрабіўся. Пайшлі мы ў суд. Я мовіла: «Гэты вявольнік — мой». Харунжы таксама сказаў, што ягоны, сведкаў жа мы не мелі. І так таго венгра ацанілі: шэсцьсот леваў варты, і каб яго прадалі, дык і мне, і харунжаму па трыста леваў далі б, альбо калі яго хоча харунжы, няхай мне трыста леваў дасць, а калі я хачу гэтага венгра, дык каб я харунжаму дала трыста леваў, але на мой выбар. Дык я, на Пана Бога спадзеючыся, што ў свой час зноў можа быць хрысціянінам, бо не па добрай волі стаў туркам, а таму, што ў палон трапіў, я дала трыста леваў харунжаму і ўзяла сабе венгра, які мне верна, і пільна, і пабожна служыў.

У той час у Рушчуку захварэў сын мой, Станіслаў Костка, на хваробу святога Валента, і так доўга, на цэлы тыдзень, і штодзень па колькі разоў, і так цяжка, што без надзей на жыццё, ад гэтай хваробы я такую вялікую тугу мела, што ледзь жывая засталася. Але мне людзі тутэйшыя параілі, што тут ёсць непадалёку ад Рушчука адзін святы Дзмітры, вельмі добры, ён з дапамогаю Пана Бога ад усіх хва-

роб і недамаганняў лечыць. Дык я туды паехала са сваім дзіцем і, паводле тутэйшага звычаю, купіла барана і казала прынесці яго ў ахвяру. Мяса і скуру ўбогім раздалі; у час службы Божае дзіця таму святому Дзмітрыю ў труну паклалі, яно ні плакала, ні грудзей не брала, толькі калацілася ў курчах і муках, аж пачарнела. Як толькі імша закончылася, дзіця заплакала. Яны, тыя папы, дзіця з труны вынялі і мне, маці, здаровае і вясёлае далі. Бачыла я, што там у труне яно так упацела, нібыта ў вадзе ляжала, і хутка грудзі ўзяло і здаровае было, дзякуй Богу на вякі.

Калі я жыла ў Рушчуку, была там адна нявольніца-немка ў аднаго турка. Тая нявольніца вельмі мяне прасіла, каб я яе выкупіла, што я з задавальненнем хацела зрабіць і давала за яе і трыста, і чатырыста леваў, аднак яе пан, той турак, не захацеў нявольніцу прадаваць. Тады я ёй трыццаць леваў падаравала і такую параду дала: «Уцякай ад свайго пана, але нічога не бяры, апраніся ў жаночае, як сялянкі ў вёсцы ходзяць, і ўцякай за Дунай у Гіяргеву[141], у Бухарэст». І дапамагла той немцы, што паказала, дзе святую імшу адпраўляюць, і яна паспавядалася, і прычасце ўзяла, бо ў Рушчук толькі таемна каталіцкі ксёндз прыязджае дзеля набажэнства некалькіх католікаў, рушчуцкіх жыхароў. Але тая дурная, бязбожная немка набрала колькі магла сукняў, хустак ды іншых рэчаў, і ў турэцкім строі, наняўшы фуру, пераехала з Рушчука праз Дунай у Гіяргеву, і паехала ў Бухарэст, заехала ў карчму, дзе музыкі граюць, адразу скінула з сябе ферэдзу і яшмак[142] і скакаць пачала са жлуктамі.

Яе пан адразу ж да мяне прыслаў, пытаючыся пра сваю нявольніцу. Я адказала, што не ведаю. Той турак шмат выдаткаваў, за ёю пагоню пасылаючы.

Потым атрымаў вестку, што яна ў Бухарэст уцякла. Паехаў за ёю і знайшоў у карчме, ужо пераапранутую, ужо сукні турэцкія загадала на нямецкія перашыць, памарнатравіла, папрапівала беднага турка рэчы.

Пытаецца ў яе турак, чаму ўцякла. Яна адказвае адразу ж: «Пані лекарка мяне намовіла, каб уцякала і адраклася ад добрае турэцкае веры, а кепскую хрысціянскую прыняла, і загадала мне паспавядацца і прычасціцца». Тут нападкі на мяне пачаліся. Той турак з нявольніцаю з Бухарэста вярнуліся ў Рушчук, і выклікаў ён мяне да суддзі, а тая так мне ў вочы сыпала: «Ты ж мяне ў кепскую веру намовіла, ты ж мне трыццаць леваў дала!» І ўсё больш мяне абвінавачвала і ўсіх рушчуцкіх католікаў і ксяндза. Я ж толькі паклалася на волю Божую і дапамогу Ягоную, бо гэтая справа крымінальнаю была. Раптам суддзя так мовіў: «Ты ж старэйшая за паню лекарку, дык чаго ты яе паслухала? Было табе лепей пані лекарку намовіць, каб яна турчанкаю стала! Але, відаць, здаўна ты, блудніца, лёгкаветранка, жлукта, нападаеш на чужых людзей!» І загадаў даць ёй сто чыбукоў па пля-чах, прывязаўшы рукі да слупа. Вішчала яна, як казёл. А турку мовіў: «Ведаеш, браце, што кожная птушка ў клетцы, хоць бы цукар ела, радая вылецець адтуль, так і нявольнікі з няволі радыя ўцячы; трэба добра пільнаваць сваю нявольніцу».

А мне, аднак, прысудзіў выдаткі вярнуць, якія той турак меў, яе шукаючы, і мусіла даць дзвесце пяцьдзесят леваў і дзякавала Пану Богу за вызваленне. Пасля, пражыўшы ў Рушчуку каля двух гадоў — ужо мела ледзь не сорак тысяч сваіх,— захацелася мне на бяду сваю зноў у Польшчу. І вось выбралася я ў дарогу Дунаем з Хасан-пашою, туркам маім, з венграм Уладзіславам, нявольнікам маім, і з

Бенядыктам, палякам, верным маім лёкаем, і з сынам маім Станіславам, і паехалі мы вазамі ў Галач[143], а з Галача ў Ясы на Валахіі.

Прыехалі мы ў Ясы ў бытнасць князя яго мосці Канстанціна Маўрыкардайскага[144], і наняла я там сабе жытло. Сустрэла я там пачцівых, годных людзей у двары таго князя, напрыклад, вяльможнага яго мосць пана Яна Дэйму, сакратара, яго мосць пана Эпіса, яго мосць пана Сталя. Яны рэкамендавалі мяне яго мосці князю, і вось мела я значную пенсію, прадукты і пакой, дык у Ясах пражыла колькі месяцаў, а Хасан-паша, мой турак, такі быў мне верны і ўдзячны, што не толькі мне ўсялякага дабра зычыў, а нават рады быў, пэўна, і рай мне даць, думаючы, што ягоная турэцкая вера вельмі добрая, і заўсёды намаўляў мяне да турэцкае веры, жадаючы майго збаўлення. Бачачы ягоную палкасць да збаўлення, пачала я мовіць: «Мой каханы Хасане, бачу, што ты добра ведаеш сваю веру. Калі ласка, распавядзі мне сумленна з пачатку аж да канца, я таксама табе, мілы браце, сваю хрысціянскую з пачатку раскажу аж да канца, і я пагляджу, ці будзеш мне зычыць, каб я ад свае адраклася (крый Божа), а турэцкую прыняла». І так мы сабе вольнымі гадзінамі гаманілі, ён мне аднаго дня пра турэцкую, а я другога пра Хрыстуса і пра догмы веры. Так Дух Святы ўчыніў, што ён запалаў да хрышчэння, што не захацеў мяне чакаць у Ясах, а раней паехаў у Жванец, а са Жванца ў Чорнаказінец[145] да яснавяльможнага яго мосці ксяндза біскупа Дамбоўскага і так распавёў пра мяне, што я яго святое веры навучыла, і ён прагне хрышчэння. І быў дзеля Бога ахрышчаны. Яго сам яснавяльможны ксёндз біскуп Мікалай Дамбоўскі[146] ахрысціў, і цяпер

ён вельмі добры і пабожны хрысціянін, і завецца зараз Мікалай Надольскі. Ажаніўся ў Чорнаказінцы і жыве ў Навасёлцы, там ягоная жонка і дзеці, і яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп дапамагае яму, адным словам, добры хрысціянін.


Венгр Уладзіслаў, каханы чалавек, служыў мне верна, ды я падумала: хоць я за яго і дала трыста леваў, але калі буду доўга трымаць, тады мала буду мець заслуг, ведаючы, што ён у сваім краі багаты і добры шляхціц, дык я яго сабрала і дала колькі леваў на дарогу, каб ехаў у Венгрыю на сваю бацькаўшчыну, і пакінула яго ў езуітаў у Ясах.

З Ясаў, развітаўшыся з добрымі прыяцелямі, я выехала з Бенядыктам Скалубовічам і прыняла жаўнера, імператарскага дэзерціра Юзафа, фурмана, і дзяўчыну, і белагаловую Соф'ю Бераздэцкую, і мы шчасліва праз Хоцін у Камянец-Падольскі прыехалі, і была я па-чалавечы прынятая яснавяльможным яго мосцю панам генералам Дамінікам Бякерскім, камендантам камянецкім ды іншымі годнымі яснавяльможнымі, а таксама і рознага стану людзьмі, і адразу забрала сына свайго Францішка Пільштына ў яснавяльможнай яе мосці пані Патоцкае, кашталяніхі брацлаўскае, якога пакідала з мамкаю на ейную панскую ласку, а дачка мая ад першага шлюбу Канстанцыя Гальпірова заставалася ў Алыцы з маім мужам яго мосцю панам Юзафам Пільштынам, а муж мой з Алыкі прывёз яе ў Львоў і аддаў яе ў кляштар вялебным законніцам бенедыктынкам армянскае нацыі. Я пра яе з ласкі Божае клапацілася яшчэ з Турцыі, пасылала грошы, а цяпер, спыніўшыся ў Камянцы, паслала па яе, і яна прыехала да мяне ў Камянец, жыла колькі месяцаў у пакоі з дзеткамі маімі.

Мужа зусім не хацела, ні з ім жыць, ні таксама старацца пра развод, бо я хацела ў набажэнстве жыць,

таму што мне замужжа косткаю ў горле стаяла, такі мне свет стаў агідны. Я ў Камянцы шмат выдаткавала, бо мела чатыры коні, колькі людзей, дзетак і заўсёды гасцей, дык хацела ў душы, каб дзяцей у добрым месцы пакінуць, а самой зноў назад вярнуцца ў Ясы дзеля заробку.





Раздзел трэці

АВАНТУРА З ЯГО МОСЦЮ ПАНАМ БЯКЕРСКІМ

Вяльможны яго мосць пан Бякерскі, генерал і камендант камянецкі, пазычыў быў у мяне тры тысячы, у заклад мне сваё срэбра даўшы, я ж, маючы намер назад у Ясы вярнуцца, напомніла пра доўг, але ж мне яснавяльможны яго мосць пан генерал так мовіў: «Грошай цяпер я не маю, але заклад мне сёння аддай, а як назад з Ясаў вернешся, я табе адразу ж грошы аддам». Так я не хацела, толькі патрабавала грошы, дык вяльможны яго мосць пан генерал Бякерскі стаў маім вялікім непрыяцелем. Я, на гэта не зважаючы, аднак, паволі збіралася ў дарогу.

Пры тым яшчэ і такое няшчасце здарылася, што далі мне на пастой двух жаўнераў. Адзін Ян Перс, а другі Ян Лазар. Бо такі ёсць звычай у Камянцы, што па дамах, і камяніцах, і па маёнтках нават яснавяльможных паноў жаўнеры стаяць, бо казармаў не маюць. Я была далікатная з тымі жаўнерамі, казала ім есці даваць, а часам што і са старызны дарыла, дык

гэтыя жаўнеры да мяне прыхільныя былі, і як даведаліся пра мой выезд на Валахію, надзвычай гэтым засмучаныя былі, бо тое добра ведалі, што ў іншага гаспадара не змогуць сваю пенсію зберагчы і гатовы стол мець.

Адзін з тых двух жаўнераў, Ян Лазар, паходжаннем немец і малады чалавек, думаў, што яго ніхто не можа гвалтам трымаць у рэгіменце, калі ён добраахвотна ўступіў, дык цяпер пайшоў да свайго капітана, каб даў яму абшыт[1], і што ён маецца вярнуцца назад да свайго пана, яснавяльможнага яго мосці пана Патоцкага[2], ваяводы бельскага, бо ён там служыў пажом, ці камердынерам. Але замест абшыту ўзялі гэтага пана Лазера пад арышт на гаўптвахту, і сядзеў ён там колькі тыдняў. Я, маючы літасць да гэтага чужынца, бо ён мяне нічым не пакрыўдзіў, а, наадварот, чым мог мне дапамагаў, дык я яму заўсёды есці пасылала, а часам і колькі шустакоў на выдаткі.

Таму пану кадэту апрыкрала няволя. Ужо абяцаў прысягнуць палкоўніку, што будзе служыць далей, дык яго з-пад арышту вызвалілі. Ён нібыта меўся пайсці да прысягі, а сам уцёк да францысканаў за манастырскую сцяну. Так мне той яго мосць пан Лазар яшчэ горш зрабіў, бо пан генерал сказаў, што я яго намовіла, каб уцёк да кляштара.

За колькі тыдняў знайшлі айцы францысканы спосаб і вывезлі яго з Камянца. І меліся яго адаслаць з габраем-фурманам у Броды[3]. Але францысканы не ведалі, што той габрай быў фактарам пана генерала і быў намоўлены ім: як толькі Лазара на воз возьмеш, каб яго з галавою накрыў і не ў Броды, а ў Акопы[4] завёз к Днястру, пад турэцкую мяжу. А сам тут жа пагоню за ім паслаў і загадаў злавіць і закаванага пана Лазара назад вярнуць у Камянец; усё так удалося і

сталася, што яго гарбай Ёха ўзяў на вазок і, замест таго каб у Броды да яснавяльможнага яго мосці пана Патоцкага ехаць, завёз яго ў Акопы, і тут адразу пан генерал Бякерскі па яго паручніка паслаў з некалькімі гэмайнамі, і прывезлі назад пана Лазара, і зноў пасадзілі на гаўптвахту пад арышт на ланцуг.

І вось на мяне пачаў яго мосць пан генерал нападаць, што я таго пана Лазара мелася прадаць туркам, а габрай няверны, пракляты іуда, хлусліва сведчыў, што я яму дала дзесяць чырвоных злотых, каб ён прадаў Лазара. Яго мосць пан генерал, сам пан, сам суддзя, сам гаспадар, а сведка — габрай, дык на аснове гэтага ён паставіў варту ля майго дому і не дазволіў мне нікуды і за парог выйсці і нікому да мяне прыйсці. Прыняла я гэта як ад Бога. Пасля загадаў ён варце ля ложка стаяць, і кожныя дзве гадзіны змяняліся жаўнеры, як гэта бывае ля Магілы Панскае, і стаялі каля мяне з флінтамі.

Аднак я, у той час як яшчэ варта ў сенцах стаяла, са спіжарні праз акно куфэрак свой адзін перадала, і шчасліва занеслі яго да майго добрага прыяцеля, яго мосці ксяндза Мелькановіча, каштоўнасцей на васемнаццаць тысяч было ў ім, у тым куфэрку. Мяне яго мосць пан генерал прыгнятаў тою вартаю, бо я звыклася спакойна жыць, хоць у падарожжах, хоць у чужых краінах, а тут не магла ні есці, ні піць, ні спаць праз гэтыя нязручнасці і ўжо ад гвалту крычала, няхай сабе возьме пан генерал што хоча, а няхай вольную стану з ягонае ласкі. І вось прыслаў да мяне яго мосць пан генерал нейкага ягамосця, пана паручніка, каб мяне з ім замірыў. Узяў у мяне яго мосць пан генерал свой заклад на тры тысячы, якія мне быў вінен: шкатулку з волава, персідскія шпалеры, чатыры коні за шэсцьдзесят чырвоных злотых, каляску за во-

семсот злотых і шматлікія іншыя рэчы галантарэі і з медзі, але мне ўжо абяцаў пад прысягаю і на мужчынскае слова гонару, што пусціць мяне паехаць у Ясы, і падводы дасць, і каляску пазычыць, і канвой дасць. І варта адразу адступіла, як я яму гэтыя рэчы аддала.

Але ж той яго мосць пан паручнік, пасрэднік між мною і яго мосцю панам генералам, так мне мовіў: «Цяпер кепскія людзі, кепскія часы, навошта куфэрак з дому адаслала? Я паверыла гэтаму і забрала назад ад яго мосці ксяндза Мелькановіча мой куфэрак, у якім было каштоўнасцей на васемнаццаць тысяч. Як ужо быў той куфэрак у доме, прасіў мяне яго мосць пан генерал да сябе.

Я да яго пайшла, а яго мосць схаваўся. Я вярнулася да дому, да хаты сваёй, ажно варту паставіў яго мосць пан генерал, і замкнулі, і запячаталі дзверы, і вось я, засмучаная белагаловая, засталася на вуліцы. Хадзіла ад хаты да хаты, просячыся ў каго перанагачаваць, але не знайшла прыяцеля ў сваім смутку, а дзіцё маё ходзіць за мною, як авечка. Ледзь-ледзь адзін мешчанін яго мосць пан Маркевіч папрасіў даць яму чырвоны злоты і пусціў мяне пераначаваць у адной каморцы. Сына майго старэйшага і дачку маю ўзяла да сябе яснавяльможная яе мосць пані Патоцкая, кашталяніха брацлаўская. Я ж безупынку пішу яго мосці пану паручніку, наракаючы, навошта ён мне казаў куфэрак забіраць у яго мосці ксяндза Мелькановіча, навошта ён так мяне абмануў. І вось як мне яго мосць пан паручнік адказаў: «Ужо табе інакш не паможаш, дай мне даўгавую распіску на колькі чырвоных злотых, дык я пайду з ёю да яго мосці пана генерала і скажу, што мне васпані вінна здаўна чатыры чырвоныя злотыя, дазволь мне васпан дабрадзей з-пад арышту ўзяць яе куфэрак з бялізнаю». І мяне

таксама намовіў, каб напісала ліст яго мосці пану генералу, каб з-пад арышту загадаў выдаць мой куфэрак. Я радая была, думаючы, што ён мне аддасць, але ж яго мосць сабе забраў мой куфэрак, у якім было 18 000. І ўжо да мяне больш яго мосць пан паручнік не прыйшоў, і калі я пісала, дык мне адказу не даў.

А тут мне і ў таго мешчаніна, у яго мосці пана Марцевіча, дзе я жыла, варту паставілі, кажучы: «Дзе ты ўзяла грошы, так шмат каштоўнасцей, сукняў, дзвеляскі ды іншае? Не магла ты гэта лекарствам зарабіць, а толькі як была ў Турцыі, хрысціян прадавала туркам. Адкуль у цябе грошы?»

Я не магла нічым абараніцца, толькі Богам у Святое Тройцы Адзіным, бо і ўсе тастаманты, ардынансы і паперы, а менавіта: лекарскія кнігі і аптэка, пасцель і іншае, адным словам, на чатыры тысячы ў мяне забралі. Але быў там адзін афіцэр з лановых[5], яго мосць пан Людвік Корбан. Ён быў у вялікай пашане ў яго мосці генерала. Быў ён чалавек разумны і адмысловы, выдатнай адукацыі, па-французску, па-нямецку, па-лаціне, па-італьянску і іншаму гаварыў і пісаць умеў. Ён часам меў ключ ад майго дома, дык я таго пана Корбана прасіла, каб мне маленькі куфэрачак выдаў, у якім былі ніткі і швейныя іголкі. І гэты добры хрысціянін аддаў мне той куфэрак. Але ж у тым куфэрку былі мне патрэбныя паперы, а менавіта той пашпарт, які ад яснавяльможнага яго мосці пана Патоцкага, ваяводы кіеўскага, атрымала,— што едзе яе мосць пані Саламея Пільштынова за мяжу з адным чалавекам, Бенядыктам Скалубовічам, і таксама пашпарт ад самога яго мосці пана генерала Бякерскага, што едзе за мяжу Саламея Пільштынова з адным чалавекам (вышэй названым), і гэта мне падпораю і жывым сведкаю было, бо мяне тут дакарае

яго мосць пан Бякерскі, што я ў Турцыі людзей прадавала, а тут ягоны пашпарт сведчыць, што толькі аднаго чалавека мела. Таму мела вялікую надзею на Бога, што вызваляць мяне, і сядзела я ў таго пана Маркевіча, камянецкага абываценя.

Тым часам паведамілі майму мужу, яго мосці пану Пільштыну, які адразу ж з радасцю прыехаў у Камянец не на дапамогу мне, а каб мяне зганіць і пашкодзіць мне, што было найбольш балюча. Яго мосць пан генерал прагнуў мае мазольнае працы, а яго мосць пан муж жыццё рад быў бы забраць; і мусіла я ад пана Маркевіча перабрацца ў дом вяльможных іх мосцяў паноў Красноўскіх разам з мужам. А мела я яшчэ на руках залатыя бранзалеты і залаты ланцужок на шыі і сорак тры чырвоныя злотыя. Усё гэта варта было сто трох чырвоных злотых. У той час была ў мяне наймічка Соф'я Бераздэцкая.

Служыла яна раней прачкаю і спявачкаю ў яснавяльможнай яе мосці пані Каліноўскае[6], старасціхі вінніцкае, і з той сям'і ўцякла, накраўшы, колькі змагла, з адным пахолкам Казімірам. Гэты пахолак быў яснавяльможнага пана старасты Пяткоўскага[7]. І ўцяклі яны ў Ясы на Валахію, і там у Ясах я гэтую нягодніцу Соф'ю прыняла. Росту яна была высокага, бледнаватая, валасы чорныя, вочы шэрыя. Яна ў мяне на сто тры чырвоныя злотыя ўкрала з кішэні і гэтае ночы 1743 года ўцякла з Камянца. Калі хто гэтую зладзейку злавіў альбо зловіць, я дарую палову на касцёл, а палову таму, хто яе злавіў альбо зловіць.

І вось я засталася ў такім сіроцтве без дапамогі, без шэлега, так мне спрыяла мая Айчына, залатая вольнасць польская, што не мела за што паесці. Толькі цяпер зразумела сяброўства людское, бо тыя, што ў мяне елі і прыяцелямі былі, часта з мяне здзека-

валіся ў маім няшчасці. Толькі на аднаго Бога надзею мела.


Тут развітаўся са мною мой муж і паехаў ад мяне, а я засталася адна з малым дзіцем у доме вяльможных іх мосцяў паноў Красноўскіх. Тым часам зразумеў яго мосць пан Бякерскі, генерал і камендант камянецкі, што ўсё, аднак, трэба калі-небудзь будзе аддаць мне, дык загадаў яго мосці пану Людвіку Корбану, харунжаму ляновых, ардынанс напісаць белацаркоўскаму каменданту, каб той мяне пад арыштам да канца жыцця трымаў у Белай Царкве[8], і загадаў наняць падводу, і знянацку хацеў мяне ўзяць, і ў Белую Царкву адаслаць. Аднак воля і наканаванасць Пана Бога Найвышэйшага інакшая нада мною была, бо гэты ж яго мосць пан Корбан, напісаўшы ардынанс, аддаў на подпіс яго мосці пану генералу, а сам, да мяне ў пакой прыбегшы, закрычаў: «Бяры дзіця і ўцякай у кляштар да паненак дамініканак». Я не хацела, але мяне гэты пабожны кавалер, дай яму, Пане Божа, шчасця ў жыцці, яго мосць пан Корбан, ледзь не гвалтам у кляштар адвёў і так мне мовіў: «Я гэта раблю насуперак майму статуту, павінен быць паслухмяны, як жаўнер яго мосці пана генерала, але баюся Пана Бога і ведаю, што загінеш у Белай Царкве пад арыштам, таму папярэджваю і прашу гэты злы час перасядзець у кляштары».

Але ж і тут праз кару Божую мяне мнішкі не хацелі прыняць у кляштар, дык мусіў той пабожны Корбан бегчы ў фару (бо быў у той час яснавяльможны ксёндз-біскуп камянецкі Дамбоўскі ў Камянцы). Прыйшлі два ксяндзы з фары ад імя яго мосці ксяндза-біскупа, каб мяне паненкі-дамініканкі прынялі, дык яны ўсё-такі адчынілі брамку і прынялі мяне ў кляштар, і там я ў нястачы, у беднасці жыла.

Яго мосць пан Корбан, дабрадзей мой, мала што маючы, шмат мне дапамагаў, бо цяжка шмат выдаткаваць, калі не стае самому.

Будычы праз колькі месяцаў у кляштары на самыя Каляды, я моцна плакала, прыпомніўшы, як на леташнія святы была ў спакоі, у багатых сукнях, футрах, каштоўных камянях, жомчугу і інш.,а цяпер дрыжу з холаду, футэрка нават не маючы. Адным словам, я не мела куды галаву прытуліць, а мая праца гніе ў пана генерала пад ягонай пячаткаю. Злітавалася нада мною адна паненка свецкая і пазычыла мне кунтуш свой з футрам, каб я на імшу пайшла ў касцёл. Дык я, падзякаваўшы і апрануўшыся, пайшла ў касцёл. Тут паненка, адумаўшыся, прыслала да мяне ў касцёл маё старое футра са сваёю пакаёўкаю, а свой кунтуш назад просіць. Я воляй-няволяю, выйшаўшы з касцёла, аддала і з вялікага смутку моцна заплакала.

Ад таго плачу, тугі і нястачы так цяжка захварэла, што звар'яцела, і не ведаю, што са мною чынілася. Як з ложка раз упала, дык тры дні і тры ночы на зямлі голай ляжала, крычучы немаведама што. Гэта ўсё пацвярджае, што ад мяне ў гэтым няшчасці ўсе ў кляштары адступіліся. Быў там адзін муляр, якога звалі Гжэгаш, кляштарны чалавек, які з міласці да бліжняга падняў мяне з зямлі, на ложак паклаў і пайшоў да яе мосці пані Тарэзы Праўдзінскае, удавы, вельмі годнае і пабожнае пані, і распавёў пра маю хваробу і нястачу. Тая мілая пані прыехала санямі са сваёю пасцеллю, мяне ахуталі, на сані паклалі і ў дом яе мосці пані Праўдзінскае ў Камянцы адвезлі, і гэтая пані вельмі клапацілася пра маё здароўе, і таго Гжэгаша, муляра, паклікала, каб мне, хворай, служыў, на што гэты пабожны чалавек ахвотна згадзіўся і вельмі верна і пільна мне служыў.



Камянец-Падольскі.
Фрагмент гравюры пачатку XVIII ст.

У гэты час ад Духа Святога зразумела, што хутка мову страчу, дык прасіла паклікаць ксяндза, што тая яе мосць пані Праўдзінская з вялікай руплівасцю зрабіла, і ў поўнач ксяндза мне знайшлі. Я паспавядалася, прычасцілася і святы алей узяла, і тут мне

мову адняло. Таксама ахвяравала на мяне мая дабрадзейка дзеля Найяснейшае Панны Армянскае ў Камянцы, і ахвяравала на алтар, даўшы свечкі і на імшу святую. І вось я дзівам на пяты дзень загаварыла. А там дзень у дзень пачала ачуньваць, але ж мой добры прыяцель, яго мосць пан Людвік Корбан, харунжы лановых, застаўся ў Акопах, дзе з яго рэгіменту заўсёды камандзіры жывуць, і не мог часта ў мяне бываць, але ў той цяжкай хваробе, калі мне мову адняло было, наведаў мяне і вось думаў, што я ўжо больш жыць не буду, таксама і ўсе камянецкія лекары на гэта спадзяваліся, дык мой добры прыяцель, напісаўшы мне вельмі спачувальны ліст, аддаў яе мосці пані Праўдзінскай, і тое зазначыў, што не можа ад смутку на маю смерць глядзець, і, падзякаваўшы за службу, ад'ехаў з Камянца.

А названы вышэй Ян Лазар, кадэт рэгіменту найяснейшае яе мосці каралевы, сядзеў пад вартаю на ланцугу і мусіў пад бізуны пайсці, але атрымаў паміламанне. Але ж яго вяльможны яго мосць пан генерал прымушаў, каб абавязкова на мяне намаўляў, што я яго прадаць хацела; я гэтага вельмі баялася, каб ад бяды і нястачы малады чалавек не паддаўся намаўленню.

У гэты час прыехаў у Камянец светлы князь Любамірскі[9], казімерскі староста, і я гэтаму пану супліку напісала, просячы дапамагчы, каб таго Лазара вызвалілі, бо як даўжэй будзе сядзець, пачне яшчэ лухту малоць ад няволі і недастачы. І вось Пан Езус даў, што яго мосць князь быў ласкавы і сам прыехаў на гаўптвахту і ўзяў Лазара з-пад арышту з сабою ў Палонну[10] і зрабіў яго харунжым. І вось маё няшчасце шчасцем пану Лазару стала, бо каб ён і сто год служыў у Камянцы, ніколі б ніякага чыну не даслужыўся, бо шляхціцы польскія, якіх я добра ведаю з

маладосці, хоць ужо іх галовы пасівелі, а не прадстаўлены да павышэння. Аднак мне той пан Лазар, хоць і мог у яснавяльможнага гетмана словам дапамагчы, але ці не хацеў, ці таксама не мог, адным словам, ён — вялікі няўдзячнік.

Калі мяне Пан Бог крыху падлячыў, дык я думала, што мне рабіць, не маючы нічога. Імем Пана Бога прасіла яго мосць пана генерала хоць аднаго чырвонага злотага. Не даў мне і шэлега. Прасіла жменьку кавы і кавалак цукру, бо ў мяне ён забраў дзесяць галоў цукру, кандысброд[11] і дзесяць ок турэцкае кавы, а ён загадаў мне адказаць, каб ужо адмовілася каву піць. Ах, мой Божа, як мяне гэты свет прыгнятаў і залатая вольнасць польская!

І вось выпрасіла я ў добрага прыяцеля мужчынскіх убораў і выехала, пераапрануўшыся, з Камянца ў Чорнаказінец да яснавяльможнага яго мосці ксяндза-біскупа камянецкага, бо мне нельга было з Камянца выязджаць: суровы быў загад брамнікам. Стаўшы перад яснавяльможным панам ксяндзом-біскупам, прасіла рады і дапамогі, што рабіць з тым хцівым да чужое працы яго мосцю панам генералам, каб мне маё аддаў. Яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп, як бацька ўдоў і сірот, узяў мяне пад сваю апеку, і атрымала я спрыяльны дэкрэт у кансісторыі на вяльможнага яго мосць пана генерала, што я нічога нікому не вінна, нікога не прадала, і прысягала за мяне дванаццаць годных шляхцінаў. Але ж яго мосць пан генерал мала на той кансісторскі дэкрэт зважаў і мне нічога не хацеў аддаваць.

У гэты час была камісія ў Радаме, дык яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп паехаў у Радам і

ўзяў мяне з сабою да Залошац[12] да яснавяльможнага яго мосці пана Патоцкага, вялікага кароннага гетмана. Прасіў яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп яснавяльможнага яго мосць пана гетмана, каб быў ласкавы да мяне, сіраты, і пераканаў вяльможнага яго мосць пана генерала аддаць мой набытак. Але ж я была агаворана хлуслівымі лістамі пана генерала, дык мяне ён не хацеў выслухаць і веры даць. І вось яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп з Залошац выехаў, а мяне, смутную і адзінокую белагаловую з малым дзіцем, пакінуў, а я ніколі ў Залошыцах не была і яснавяльможнага яго мосць пана гетмана не ведала, толькі яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп так мне мовіў: «Аддаю цябе волі Божай». І падаваў мне дванаццаць чырвоных злотых. Вось так я ў пакоях засталася, не ведаю, куды ісці і што каму казаць.

У гэты час яснавяльможны яго мосць пан Мнішак[13], кашталян кракаўскі, бацька яснавяльможнай яе мосці пані гетманіхі, дабрадзейкі, быў у Залошыцах, а быў ён калісьці сляпы, я ж, едучы з аўстрыйскае Вены ў Львоў, праязджала праз Варшаву, і яснавяльможны яго мосць пан кашталян кракаўскі даведаўся, што я ў Варшаве, загадаў свайму прыдворнаму прасіць мяне палячыць ягоныя вочы, але я праз гонар, думаючы, што ў Кароне Польскай не знойдзецца ніводнага акуліста, які б змог вылечыць вочы яснавяльможнаму пану Мнішку, не захацела пешшу ісці, бо ён па мяне каляску не прыслаў. Дык вось выехала з Варшавы, а яснавяльможны яго мосць пан Мнішак, кашталян, лячыўся ў яго мосці пана Страшэра, і вылечыў свае вочы, і даў тысячу чырвоных злотых. А цяпер, як пачаліся на мяне тыя нападкі пана генерала, дык я баялася, што і яснавяльможны Мнішак на мяне наракаць будзе, бо быў свёк-

рам яснавяльможнага яго мосці пана Патоцкага, вялікага кароннага гетмана.

Але ж інакш сталася. Гэты пабожны пан, дай яму, Пане Божа, шчасця, у гэтым маім адзіноцтве ў цэлым свеце не памятаў учынку майго, толькі мяне мой пан загадаў прасіць да сябе і так мовіў: «Здаецца, ты тая пані лекарка і акулістка, што, едучы з Вены, не захацела мяне наведаць, як я быў сляпы». Адказала: «Так, пане міласцівы, тая».

І вось як яснавяльможны яго мосць пан Мнішак сказаў: «Не мела шчасця, небарака, у мяне грошы ўзяць». І сваю пабожную дачку загадаў да сябе прасіць, яснавяльможную яе мосць паню гетманіху, каб яна не дапусціла нада мною крыўды чыніць.

Толькі я гэтую палёгку атрымала ў смутку маім, аж тут шчасце да мяне павярнулася, бо прыехаў яснавяльможны яго мосць пан Пятро Пастэмпскі, суддзя вайсковы. Ён не ведаў пра маё няшчасце, але калісьці ў Любліне хацеў у мяне купіць чатырох коней за дзвесце бітых талераў, але я іх прадаваць не хацела. І была я ў кампаніі з гэтым панам у дэпутатаў, і ў самога яснавяльможнага яго мосці пана маршалка трыбунальскага, і ў годных людзей, і сенатары мяне пазналі, і былі ласкавыя да мяне. Цяпер, бачачы мяне ў галечы, ён закрычаў: «Што з табою, пані Пільштынова?» Я распавяла пра нападкі яго мосці пана генерала. Кажа: «Не бойся, Бог з табою». Узяў мяне за руку і завёў у пакой яснавяльможнага гетмана. І пачаў пра мяне вельмі хараша гаварыць і дзівіўся, адкуль гэта ў яго мосці генерала ўзялася тая хцівасць загубіць нявінную кабету. Дык яснавяльможны яго мосць пан гетман памякчэў, бо мяне пан генерал агаварыў, што я блудніца, а як яснавяльможны яго мосць пан Мнішак, кашталян кракаўскі, і яснавяльможны

пан Пастэмпскі, суддзя вайсковы і падкаморы, засведчылі, што я заўсёды была годнай сімпатый белагаловая, дык з ласкі Пана Бога перамяніў яснавяльможны гетман суровасць сваю на ласкавасць і сказаў мне: «Не бойся, ты будзеш пад маёй апекаю, ніхто цябе пакрыўдзіць не зможа. Пашлю я цябе да яе мосці пані аканоміхі, будзеш ты з дзіцем мець там усялякія выгоды». І даў мне колькі чырвоных злотых. Вось так суцешаная з ласкі Божае паехала я да яе мосці пані аканоміхі і там была па-чалавечы прынятая. Але ж я вельмі маркотная заставалася, бо, будучы незнаёмаю і незаслужанаю, як мне кавалак хлеба ў рот браць; баюся, каб ім не абрыдзець.

Але ж яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп камянецкі памятаў пра мяне. Лічыў, што мяне ў слязах, адзінокую і маркотную, пакінуў у Залошыцах без надзеі на лепшае, але ж Залошыцы ад Алеява[14] толькі, здаецца, за дзве мілі, а там жыў вяльможны яго мосць пан Стафан Бляндоўскі, палкоўнік. І быў той пан Бляндоўскі вялікі прыяцель яснавяльможнага яго мосці ксяндза-біскупа. Як толькі там у Алеяве спыніўся яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп, дык адразу ж мяне рэкамендаваў яго мосці пану Бляндоўскаму, які з дваццаці пяці гадоў не хадзіў, а цяпер пачуваўся горш, ад вялікага болю ні есці, ні спаць не мог, і вось вяльможны яго мосць ксёндз-біскуп хацеў, каб я, аднак, нейкі прытулак мела; і вось адразу пасля абеду выехаў яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп з Алеява ў Радам на камісію. А вяльможны яго мосць пан Бляндоўскі адразу па мяне каляску, шасцерыком запрэжаную, прыслаў і маршалка свайго з лістом. Як толькі гэтая каляска спынілася ля вокнаў майго пакоя і пыталіся пра мяне, я не верыла, бо хацела на чым-небудзь з'ехаць, каб вырвацца з апекі пана генерала. Ажно мне той пры-

дворны, пекна прывітаўшыся, ліст аддаў і прасіў мяне ехаць лячыць ягонага пана ў Алеяў. Дык я адышла ўбок, укленчыла перад абразамі і дзякавала Богу за Ягоную ласку. І вось з Залошыц паехалі мы ў Алеяў да вяльможнага яго мосці пана Стафана Бляндоўскага, палкоўніка, і прыняў ён мяне па-чалавечы, і распавёў ён мне падрабязна пра сваю хваробу, што ўжо колькі разоў яго ратавалі і дваццаць пяць гадоў лячыўся. Я ж, спадзеючыся на ласку Божую, пачала яго лячыць, і вось мне мой Бог дапамог, што шчасліва вылечыла і ягоныя ногі, і сухоты, што хадзіў як і належыць, і пашана вялікая мне была ў ягоным доме, і заплаціў семдзесят чырвоных залатых, і справіў мне пару сукняў, і даў мне каляску і пару коней, пахолка, дзяўчыну і хлопца ў новых мундзірах, і загадаў ім сурова, каб мне верна і старанна служылі цэлы год.

Пасля, добра ачуняўшы, узяў мяне вяльможны яго мосць пан Бляндоўскі ў сваю каляску, і паехалі мы ў Залошыцы да яснавяльможнага яго мосці пана гетмана кароннага, і ўзяў ён мяне за руку, і завёў у пакоі, і так мяне моцна хваліў за лячэнне маё, і пахваліўся сваім здароўем, і шчыра прасіў яснавяльможнага гетмана, каб быў да мяне ласкавы ў справе маёй з яснавяльможным панам генералам, што яснавяльможны пан гетман лёгка ўчыніў і абяцаў даць позву яго мосці пану генералу і яго мосці пану паручніку, што забраў мой куфэрак, дзе было 18 000.

Так і сталася: выдаў ім позвы яснавяльможны гетман каронны, каб з'явіліся на гетманскі суд, і мусілі ягамосці з'явіцца, і выйграла я справу з яснавяльможным панам Дамінікам Бякерскім, генералам і камендантам камянецкім. Мусіў мне ўсё аддаць, што забраў, а што патраціў, грашамі заплаціў у канцэлярыі камянецкай.

І яго мосць пан паручнік таксама мусіў вярнуць, што забраў, а што патраціў, атрымала дэкрэт на сем тысяч, і мусіў мне заплаціць. А за свой учынак мусіў шэсць месяцаў на гаўптвахце сядзець і, здаецца, на ланцугу.





ПРА МАЙГО КАВАЛЕРА

Пасля тых пакутаў трэба было дзякаваць Богу і ў спакоі жыць, але, ці то воля Божая, ці нядоля мая, зноў мне сустрэўся кавалер пэўны, годнага роду і шляхетнае адукацыі, адным словам, з годнае сям'і, і хацеў ён мець мяне за спадарожніцу жыцця. Я, памятаючы, што было з яго мосцю панам Пільштынам, адважылася ў душы: «Яшчэ раз паспрабую і пайду замуж, але не цяпер, пагляджу, зразумею, што гэта за чалавек, ці змагу я з ім жыць». І вось я таму кавалеру адказ дала: «Пагляджу, якою воля Пана Бога будзе». А ён так мне мовіў: «Колькі жыву, так ніводнай дамы, ні ўдавы не кахаў». Я ў яго першая, якую ён пачаў шчыра кахаць. Я ў гэтую казку паверыла. Праз колькі дзён быў баль у іх мосцяў паноў адвакатаў, і прыйшоў гэты ягамосць, мой кавалер, прасіць мяне на той баль. Я яму адказала, што я на тым балі быць не магу, што гэта мне не да твару, але ж мой кавалер, падпіўшы, узяў сваю даўнюю амаратку на рукі, прынёс у мой пакой і мовіў: «Калі не дзеля мяне, дык дзеля гэтае дамы прыйдзі на наш баль». О, якою злою была я на таго кавалера і дурноту ягоную. Пасля супакоілася, ажно аднойчы скардзіц-

ца мой кавалер мне па паддымак і просіць у мяне лекаў. Я яму адказала: «Мілы браце, ты малады кавалер, адкуль у цябе той паддымак?» Адказвае мне: «Выпіўшы быў на вяселлі і там меў дзве прыяцелькі, а гразка было, дык я іх абедзвюх узяў на рукі і праз дзядзінец нёс, дык падарваўся». Ужо мне той мужчына абрыдзеў так, што мовіла: «Не чапай мяне, браце».

Аднаго разу паехаў той мой кавалер да нейкага пана з клопатам, а ў тым двары блудная дзеўка служыла і, *salvo honore*, цяжарная была, дык атрымала бізуноў, і прагналі яе са двара. Кавалер мой, маючы літасць да яе, абяцаў яе ўзяць у сваю каляску і ў Камянец адвезці. Калега ягоны, нейкі камянецкі адвакат, які там быў, прасіў кавалера майго, каб узяў яго таксама ў сваю каляску і ў кампанію сваю да Камянца. Не мог і яму адмовіць, узяў і калегу свайго, і тую блудніцу. У дарозе той калега пазайздросціў шчасцю ягонаму і пачынае з маім кавалерам сварыцца. Гэты кавалер, будучы падпіты, скочыў з каляскі на зямлю і — за шаблю, выклікае свайго калегу на двубой. Той, цвярозы, схапіўшы лейцы, а бізуном сцебануўшы каня, раптоўна паехаў, пакінуўшы майго кавалера. Фурман спыняе коні і мовіць: «Васпане, аднак жа, гэта коні майго пана». А ён фурману па карку. Мусіў коні гнаць на ўсю моц, паехаў іншаю дарогаю, заехаў у вёску і пераначаваў з той дзеўкаю. А мой кавалер думаў, што яны проста паехалі ў Камянец, дык бяжыць на ўсю моц, ды цяжка дагнаць пешшу было. Ажно едзе селянін з дрывамі. Мой кавалер кажа: «Мілы мужычок, скінь гэтыя дровы, я табе за іх заплачу»,— і даў яму шэсць тынфаў, і, сеўшы на вазок, паехаў у Камянец. Думаючы, што дагоніць, узяўся моцна гнаць сялянскую кабылу. Селянін мовіць: «Мосці пане, не хачу вашых грошай! Кабылу мне скалечыце!» А той яму: «Мусіш ехаць».

Селянін не хоча. Той жа ў шаленстве давай селяніна сячы. Скрываўлены селянін прыехаў у Камянец, пайшоў да ўпаўнаважанага свайго пана і падаў маніфест на кавалера майго. Гэта справа каштавала яму больш за дзесяць чырвоных злотых, а ягоны калега перапрасіў яго, і яны памірыліся.

Я, даведаўшыся пра гэта, вельмі гневалася, цуралася і зусім глядзець не хацела ў той бок, дзе ён бываў, вось жа да мяне бяда прычапілася, ні пазбыцца, ні аджагнацца! Абяцае і сто разоў клянецца, што выправіцца. І тое выпраўленне было такое: была адна белагаловая, Малуцка, вялікая нягодніца, і ён яе завабіў, каб да яго на вячэру прыйшла, і загадаў куранят насмажыць, віна і мёду *multum*[15], і селі яны ўдваіх за стол. Даведаліся пра гэта ягоныя старыя калегі, распуснікі, і таксама заселі за той стол, елі і пілі. У майго кавалера нейкая патрэба з'явілася ў віталыню выйсці, а тыя калегі пакой замкнулі, свечкі патушылі. Мой кавалер бегае ля дзвярэй і акон, крычыць, наракае на лёкая: «Дай мне шаблю, дай мне пісталеты!» А лёкая з пакоя выпхнулі, і вось майго кавалера цэлую ноч у пакой уласны ў доме ягоным не пусцілі. Досвіткам тую Малуцку з пакоя выпхалі, дык іх мосці абое ў кустах ляжалі, а пасля калегі перапрасілі, мовячы: «Браце, жарты гэта былі».

Зноў плакаў, стаяў на каленях, перапрошваў мяне і абяцаў выправіцца, але я ні ягонае папраўкі, ні яго самога ўжо не хацела. Але ж ён абавязкова жадаў мяне, і куды толькі паеду, дык і ён туды прыязджаў, ад чаго вялікі смутак мела, бо і так малога багацця быў. Мяне ён ніколі не слухаў і заўсёды, што казаў, усё хлусіў. Толькі той талент меў, што вялікую цярплівасць меў. Як бы яго ні лаяла, усё цярпліва зносіў. Дык я таму заўсёды пра яго клапацілася і заўсёды кунтушы, жупаны і добрыя паясы, шаблі, піста-

леты і коні купляла колькі гадоў, але пайсці за яго ніколі не хацела, бачачы ягоную легкадумнасць, і што маладзейшы за мяне на гадоў сем. Заўсёды калі што давала, дык мовіла: «Ужо гэта васпану падарую, але пакінь ужо мяне ў спакоі са сваім ілжывым каханнем».

Нарэшце, падрыхтаваўшы яго, аддала аднаму біскупу на службу, і быў ён канюшым. Аднаго разу трое лёкаяў біскупа, дамовіўшыся, абакралі свайго гаспадара на тысячу чырвоных злотых. Дык той біскуп паслаў пагоню за тымі лёкаямі і абяцаў прыдворным сваім добрую ўзнагароду, калі б гэтых зладзеяў дагналі. І вось кавалер мой прыйшоў да мяне, просячы мяне пазычыць бекешу (бо ў той час зіма была), і дала я яму сваю бекешу, дык шчаслівы быў кавалер мой, што тых зладзеяў дагнаў і шчасліва да пана свайго прывёз ужо ноччу. Яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп не мог іх так хутка аддаць пад суд, тым часам загадаў іх у тым пакоі трымаць пад арыштам, дзе мой кавалер жыў, а рэчы каб перанёс у пакой пана маршалка. Але кавалер мой рэчы ад ляноты і нядбальства не загадаў перанесці, а яшчэ, маючы літасць над тымі зладзеямі, даў кожнаму па пары ўбораў, маю бекешу і сваю апанчу. І вось тыя зладзеі ўначы акно выламалі і, украўшы ўсе рэчы, уцяклі. Station назаўтра без узнагароды яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп майму кавалеру за службу падзякаваў, кажучы: «Такія непаслухмяныя лёкаі не маюць месца ў маім двары».

Намовіў мяне раз, каб я дала колькі тысяч на кавалак зямлі і гэтым яго выпрабавала, бо мае выправіцца і ўжо пабожна жыць і гаспадарыць. Згадзілася на гэта і купіла дзесяць валоў, чатыры каровы, сорак коней да статка, кацёл вялікі, каб варыць піва і іншае начынне, і рознага збожжа на насенне,

адным словам, колькі тысяч выдаткавала на гэта і ўсё аддала ў рукі майго кавалера. Засеяўшы сяк-так, пасля кажа: «Гэтыя валы старыя, паеду на кірмаш, прадам гэтых валоў, а маладых куплю». Так і ўчыніў. Старыя валы прадаў, і грошы — сорак пяць чырвоных злотых — узяў, толькі купіў сабе мітук[16] за тры бітыя талеры і мне чаравікі з конскае скуры, цвёрдыя, як з кары, што на дрэве, бо дрэнны быў з яго купец.

Статак прадаў так: спачатку жарабя некаму за колькі злотых, а мне мовіў, што яго ваўкі з'елі, а пасля сказаў: кабылы ўжо не трэба, дык і кабылы прадаў, вось так збыў і статак. Пасевы ў свой час загадаў пажаць, і скірды паставілі, але не агарадзілі, і наняў гаспадара з гаспадыняю і пяцёра дзяцей. Адно з'елі гаспадары, другое — свінні, вось так і пазбавіўся пасеваў. Бачачы такое кепства, пакінула я ўсё і паехала ў Пшэмысл, маючы там інтарэс, і наняла сабе камяніцу. Хутка прыехаў і кавалер мой да мяне, але я таго дня выехала да пацыента і пакінула яго. А ён баяўся адзін начаваць і пусціў да сябе падарожнага гультая ў пакой, поўны рэчаў. І вось той гультай украў у яго жупан, кунтуш, пас і іншае, дык ён застаўся без убораў.

Мовіў мне раз, што баіцца грымотаў. Я яму дала сваю грамніцу. Ажно яго мосць, падпіўшы з адною адвакаціхаю, спаліў усю грамніцу на размовах уначы.

Бачачы кепства, ад'ехала я з Пшэмысла ў Львоў і пакінула кавалера майго ў Пшэмысле з дзяўчынаю-пакаёўкаю і двума дзеткамі маімі, Францішкам і Станіславам, віна колькі анталаў[17] і размаітыя рэчы. Кавалер мой рады быў выпіць і з дзяўчынаю пажартаваць. Я таму сына свайго Францішка, якому было дзесяць гадоў, пакінула, каб ён у школу хадзіў, а ка-

валер мой баяўся, каб дзіцё не расказала мне тое, што бачыла, дык ён дзіцё гэта замкнуў у цёмны склеп на тры месяцы і забываў пра яго, ды так, што ледзь яму раз на тры дні хлеба даваў, і вось гэтае дзіця на голай зямлі ляжала, перапалохалася, азызла і праз гэта памерла.

Я напісала яму са Львова ў Пшэмысл, каб мне дзяцей прывёз, віно і рэчы. Ён сам прыехаў, але заехаў не да мяне, а на прадмесце, наняў піўніцу і склаў віно, кульбакі і іншае ў габрая. Пытаюся, чаму ён у карчме, чаму не ў маёй камяніцы, а пасля пайшла паглядзець віно, адкаркоўваю абцугамі, загадваю несці, аж тут толькі крышку віна на сподзе. Накідваюся на яго: «Мілы каханак, а навошта было за падводы плаціць і пустыя анталы прывозіць?» Сказаў, што габрай украў віно, і ўчыніў мне з габраем спрэчку, выклікі ў суд і выдаткі.

Пытаюся, дзе шпалеры, хусткі і іншае. Кажа: «Не ведаю». А лёкай мовіць, што Марыанцы аддаў.

Пытаюся, дзе каровы мае, кажа, што ў вёсцы. Я прашу: «Едзь ці ідзі ад мяне з Богам, бо мой сын памёр у Львове, таму што ты яго замыкаў», а кавалер мовіць: «Дай мне, васпані, вазок, пару коней, чалавека, паеду па каровы». Я паверыла, дала коней; паехаў кавалер па каровы і прадаў іх разам з цялятамі, а грошы прагуляў, а чалавека, дзякуй Богу, з коньмі і з вазком назад прыслаў..

О, як я цешылася, што ад гэтага амарата пазбавілася. Я ўжо думала, што ён будзе саромецца да мяне прыехаць пасля столькіх выдаткаў, але ж мой каханы амарат, абарваўшыся, на чужым кані, адзін, без лёкая прыехаў на самы Вялікдзень, і той конь здох у маёй камяніцы, і мела я вялікі клопат ад гаспадара і суседзяў, і мусіла гіцлям[18] заплаціць, каб таго каня выцягнулі з камяніцы.

Бачыў мой амарат, што зноў я маю колькі тысяч, дык пачаў мяне намаўляць і слушныя парады даваць, што тыя грошы без карысці ляжаць, лепей было б гандляваць, скажам, паехаць у Хоцін і накупляць ласункаў, напрыклад, фінікаў, разынак, рысу ды іншага і разам прадаць, на камені[19] важачы. Спадабалася мне гэтая парада. Магу я з тых ласункаў колькі фунтаў пакінуць дома і гэта добра прадаць, бо кірмашы недалёка былі; дык дала слова яго мосці пану маршалку светлага князя Радзівіла, гетмана літоўскага, і ўзяла задатак, і гэты ягамосць меўся ў мяне ўсе ласункі забраць на кухню светлага князя Радзівіла. І вось дала кавалеру майму шэсцьдзесят чырвоных злотых на ласункі і дзесяць чырвоных злотых, на дарожныя выдаткі, пару коней за дваццаць пяць чырвоных злотых, лёкая ў новым мундзіры, кармавыя грошы яму і яго мосці пану амарату новыя ўборы, паясы ды іншае. І паехаў ён у Хоцін, і купіў на колькі злотых тых ласункаў, а сам паехаў пажывіцца да братоў сваіх і да знаёмых, і прагуляў тыя колькі дзесяткаў чырвоных злотых, і коней страціў, нават пляцёнку і збрую. І вось тым часам кірмашы ў Львове закончыліся, а я колькі дзесяткаў злотых страціла, бо мусіла яго мосці пану маршалку ласункі ў габраяў купляць дарага і яму, паводле ўмовы, аддаць. Тым часам мой лёкай пешшу да мяне вярнуўся і распавёў мне пра «добрае» гаспадаранне майго кавалера.

Вялікі смутак мела я праз мае страты, але і вялікую радасць, што ўжо я пазбылася яго, што мяне больш ашукваць не будзе. Але памылілася я ў разважаннях сваіх. Праз колькі тыдняў прыязджае да мяне мой амарат на нанятай падводзе, зноў абадраны. Ён купіў за колькі злотых смярдзючага лою здохлых жывёл і прывёз той лой у камяніцу маю. Тут аптэка, разнастайныя пахучыя алеі, бальзамы, не маю дзе той лой

падзець. Ледзь упрасіла шынкарку, што жыла на ніжнім паверсе гэтай самай камяніцы, каб узяла лой у склеп свой, і вось тая бедная белагаловая паслухала мяне і дазволіла пакласці той заражаны лой у сваім склепе. Дык тае начы здохлі дзве каровы той беднай шынкаркі, і вакол у суседзяў захварэла жывёла, і мела я вялікі клопат і шум, адным словам, я паціху заплаціла за тыя дзве шынкарчыны каровы, а шынкарка прамаўчала пра той лой, быццам яго ніколі не было. Уначы мой бедны фурман і лёкай забралі лой у мяшкі і насілі па Львове, шукаючы зручнага месца, каб ніхто не ведаў, дзе той смярдзючы лой падзелі.

Аднаго разу я купіла была колькі багатых паясоў і хацела выгадна прадаць, але ў той час зноў прыехаў мой кавалер у Львоў і так мне мовіў: «Ёсць у мяне ў Львове калегі, якія мне за іх добра заплацяць». Я паверыла і дала дзесяць паясоў, і два гадзіннікі з чыстага золата, і васемнаццаць чырвоных злотых гатоўкаю, і пару коней, а мне трапілася шляхетная пацыентка вяльможная яе мосць пані Бранёўская, і паехала я ў Баліч. А той яго мосць пан Бранёўскі, высакародны пан, мае чатырох сыноў, як таксама і годных суседзяў, шляхту, з добрымі дастаткамі, якім я распавяла, што маю багатыя літыя паясы, пару коней і два залатыя гадзіннікі на продаж. Яны вельмі хацелі тыя паясы купіць, дык я поштаю пісала з Баліч у Львоў амарату майму, каб мне пры зручным выпадку паясы, гадзіннікі і коней прыслаў, але адказу не атрымала. Я ўжо і пасланца адправіла даведацца, што там дзеецца з маімі паясамі, але пасланец атрымаў вестку, што мой кавалер узяў сабе на службу чалавека, нейкага Себасцьяна Завадскага, вялікага жлукту і ўсялякіх подласцей мэтра, і паехалі абодва ў Пшэмысл. Я, ведаючы таго Завадскага, вельмі хвалявалася, аднак мне шкада было душы майго кавале-

ра, бо думала, што той жлукта заб'е яго ў дарозе.

Але ж праз колькі тыдняў прыязджае мой кавалер туды, дзе я лячыла. Ужо ён паясы прадаў, гадзіннікі заклаў, і каня на кабылу памяняў, і срэбную збрую на яе купіў, і прыехаў без грошай, без паясоў. О, як я радавалася такому госцю!

Але ж мой кавалер ніякім чынам не можа адсюль выехаць, сядзіць у мяне на шыі ў чужым доме, брыдка мне, адным словам, інакш яго збыць не магла, тольькі купіўшы ў Стрыі[20] ў габрая-купца тры бочкі венгерскага віна, і дала яму, абы ехаў у Камянец-Падольскі, а гэта таму, каб пазбыцца гэтага каханага, паслухмянага прыяцеля.

Мая дачка Канстанцыя Гальпірова жыла ў двары яснавяльможнай яе мосці пані Патоцкае, кашталяніхі брацлаўскае, шэсць гадоў у пабожным жыцці, я вырашыла: мушу я, відаць, ад таго кавалера ў свет уцякаць, але перш-наперш хацела я ведаць намеры мае дачкі.

І паехала ў Смотрыч, і забрала сваю дачку, і завезла ў Львоў, і хацела яе замуж выдаць альбо з сабою ў Маскву ўзяць да найяснейшае яе мосці царыцы ў Пецярбург разам з сынам маім Станіславам, бо я мела заслугі ў тым двары і мела пэўныя надзеі, што дачка мая будзе прынята ў двор найяснейшай яе мосці імператрыцы, а сын мой будзе прыняты ў Пецярбургскую Акадэмію. Але дачка мая ні ў якім разе не хацела ні замуж ісці, ні ў Пецярбург ехаць са мною, толькі хацела ў кляштар, ад чаго я вялікі смутак мела: першае, што яна адна ў мяне толькі была, а другое — у маладым веку; Бог ведае, ці намер гэты шчыры. Але па-іншаму нельга, і я сваю дачку мусіла пакінуць у Львове ў паненак брыгітак у кляштары, але прасіла яе, каб тры гады жыла па-свецку, і калі за тры гады намер не зменіцца, дык ужо можаш і законніцаю

стаць, а калі воля Божая — дазваляю за каго-небудзь замуж ісці, а на выдаткі пакінула ў айцоў кармелітаў босых куфар са срэбрам і размаітымі рэчамі на колькі тысяч, а грошы мелася прысылаць, адкуль буду мець магчымасць.

І вось шчасліва паехала ў Кіеў. Але, едучы ў Кіеў, трэба сорак дзён каранціну выседзець і мець пашпарт яснавяльможнага яго мосці пана гетмана, а я хоць і была ў Залошыцах у яснавяльможнага гетмана і прасіла пашпарта ў Масковію, але мне яго ён не хацеў даць, мовіў, што тут, у Польшчы, так шмат лекараў і размаітага стану людзей жыве ў дастатку, чаго ж мне за мяжу ехаць і сваё шчасце выпрабоўваць. Але не ведае яснавяльможны пан Патоцкі бяды мае, што цярплю ад свайго кавалера, бо я ўжо была і ў яснавяльможнага яго мосці ксяндза-біскупа камянецкага і скардзілася на таго амарата, які ўсё за мною ездзіць, і набытак нішчыць, і дурную славу на мяне сярод людзей і царкоўную кару пасылае, дык мне мовіў яснавяльможны ксёндз Дамбоўскі, біскуп камянецкі, каб яму і слова добрага не сказала, а ўпікала яго. Я мовіла: «Інакш яго не заву, толькі інклюзам[21], і не люблю там быць, дзе ён, але, аднак, не хоча даць мне спакою».

Мовіў мне яснавяльможны яго мосць ксёндз-біскуп: «Я яго за гэта караць не магу, бо ён шляхціц роўны мне». І таму я і без пашпарта ўцякала ад амарата.

Прыехала я да маскоўскае мяжы і бачу: сорак дзён трэба ў каранціне быць, а ў мяне пашпарта гетманскага няма, дык польская варта не пускае праз мяжу праехаць, а да таго белагаловая сама, без мужа, толькі двое лёкаяў, а рухомасці шмат. Тады што я чыню: з'язджаю ўбок з гасцінца, які вядзе да мястэчка Брусілава[22], а там быў кірмаш. Заехала я ў

добрую карчму, пакінула людзей маіх і рухомасць у бяспечным месцы і загадала ім чакаць мяне хоць цэлы год. Гаспадару казала я лёкаяў маіх карміць, а сама для сябе ўзяла грошы, і дзве пары добрых сукняў, і плашч, які каштаваў колькі соцень злотых. Усё гэта я ў стары кілім скруціла, а сама ўбралася ў серак[23], у боты і намітку на галаву завязала, як сялянка, пайшла на кірмаш і наняла мужыка з параю коней у санях. Кажу яму: «Маю пільны інтарэс у Кіеве, бо там сястра-чарніца[24]; адвязі мяне, якою ведаеш, патаемнаю дарогаю, а пераначаваўшы, назад мяне сюды прывязеш». Гэты бедны селянін, узрадаваўшыся рублю, які ён за адзін дзень заробіць, узяў мяне на сані. Як мага гонячы коней зімою на санях, мы мінулі шчасліва польскую варту і прыехалі да маскоўскіх рагатак. Пытаецца капітан: *«Кто идет?»* Адказвае чалавек: *«Свои»*. Пытаецца капітан: *«Какая-то хозяйка?»* Адказвае, што тут за паўмілі пападдзя едзе да свае сястры-чарніцы, суседка. Кажа: «Прапусці мяне без каранціну, я сёння назад вярнуся нанач». Той капітан паверыў, узяў ад яго колькі капеек і пусціў нас у Кіеў. І вось мы шчасліва спыніліся ў Кіеве на досвітку, і так я мовіла: «Чалавеча, ты ідзі спаць, а я пайду да сястры. Выспаўшыся, едзь адразу ж назад, бо я з табой не паеду, ужо тут застануся». І дала яму рубля за яго працу. А сама так думаю, што, калі хутка заўважаць мяне ў Кіеве, будуць пра білет пытацца, якую рагатку праязджала і дзе сорак дзён каранціну адбывала. Я на гэта ніякага дакумента не маю, ведаю, што без цырымоніі мяне возьмуць пад арышт і будуць рапартаваць яснавяльможнаму яго мосці пану Лявонцьеву, генералу і губернатару кіеўскаму.

Дык я, не чакаючы рапартаў, адразу свае сялянскія строі скінуўшы, у багатыя сукні ўбіраюся, і ў

каштоўныя камяні, і ў іншае, у што мне Пан Бог даў. Бедны фурман пазірае, а я ўзяла звозчыка[25], бо ў Маскве звычай такі: на нанятых санях ездзіць, і села на пекныя сані, і мовіла: «Як можаш гані коней, хоць хто лопне, крычучы, не спыняйся, замест пяці капеек дам табе дваццаць». Як я села на сані, узяўся звозчык коней гнаць і свістаць. Тут з брамаў крычаць: *«Кто идет?»* Мы на гэта не звяртаем увагі, а імчым далей у Пячорскія да яснавяльможнага яго мосці пана Міхала Іванавіча Лявонцьева, генерала. Падляцеўшы да палаца, я — проста ў пакой і кінулася ў ногі яснавяльможнаму генералу і павінілася, што адважылася варту мінаваць, прыехала без білета, і дала праўдзівыя тлумачэнні, што польскае варты баялася, бо не маю гетманскага пашпарта, і паказала даўнія паперы і пасведчанні, што маю з Пецярбурга з двара расійскага, што маю заслугі, што маю права бяспечна жыць у Маскве. У гэты дзень былі іманіны найяснейшае яе мосці імператрыцы Лізаветы Пятроўны. Хоць бачыла я ласкавага да сябе генерала, але ж мусіў ён паказаць сябе суровым згодна законам і ўказам маскоўскім.

І так мне мовіў: «Вяльможная пані, як даме і госцю ў нашым краі гэты ўчынак дарую, бо не ведаеш законаў нашых, але ж той пагранічны фурман ведае, якія тут звычаі, і той капітан на той жа варце, дзе праехала, на тое пастаўлены, каб нікога не прапускаў. Гэтыя два чалавекі вінаватыя і мусяць быць павешанымі на шыбеніцы, што парушылі асударскі ўказ». Я была вельмі засмучаная гэтымі словамі, бо праз мяне двух чалавек ганебнаю смерцю пакараюць. Тым часам далі абед. Прасіў мяне яснавяльможны генерал за стол.

Пасля абеду далі мне двух жаўнераў-маскалёў каб са мною ехалі да маёй карчмы на Падол і арыш-

тавалі майго фурмана, а фурман пакажа капітана, які яго праз рагаткі прапусціў.

Паехала. Пад'ехаўшы да мае брамы, спынілася і кажу аднаму жаўнеру: «Браце, бяры пяць капеек на гарэлку, а капейку на гарэлку сабе. Ідзі купі мне добрае гарэлкі, вып'ем з табою, бо я змерзла». Пайшоў адзін жаўнер па гарэлку, другому дала дзесяць капеек на віно, каб мне сюды віна прынёс. А сама, прыйшоўшы ў пакой, крычу фурману: «Уцякай, уцякай, бо цябе павесяць!»

Дык бедны чалавек кінуўся на свае сані і, дзякуй Богу, уцёк. Жаўнеры прыйшлі, пытаюцца пра чалавека, а я кажу: «Яшчэ раніцаю паехаў, як я была ў яго мосці пана генерала». Зноў мяне просяць да яснавяльможнага генерала, каб сказала, на якой варце пераехала. Мовіла, што не ведаю, бо ўначы ехалі. Аднак меркавалі, што з Брусілава на вахту Васільскую трэба ехаць, дык быў бы той афіцэр пакараны, але ён не прызнаўся, і я казала, што яго не ведаю, і так пазбег ён смерці.

Дык другі раз кінулася я ў ногі яснавяльможнаму генералу, і ён даў на дапамогу людзей і пашпарт, уначы паехалі ў Брусілаў і забралі мае рэчы, каляску, вазы, коні, людзей і ціха праехалі праз польскую вахту, а на маскоўскай прапусцілі па пашпарце, і вось шчасліва мае рэчы апынуліся ў Кіеве каля добрага Мікалая ў Шулькавым палацы.

Жыла я сабе шчасліва ў Кіеве ў спакоі больш года, бо прасіла яснавяльможнага генерала Лявонцьева, каб маю супліку адаслаў да найяснейшай яе мосці царыцы, паведамляючы, што я — тая асоба, што некалі служыла ў расійскім двары з ласкі Бога акулісткаю і лекаркаю. І вось, хоць і не хутка, дачакалася адказу, каб бяспечна прыехала, і буду мець месца пры двары. Атрымаўшы гэты прыхільны адказ, я па-

ставіла сабе чатырох коней на стайні, падрыхтавалася сама, і сына Станіслава, і лёкаяў падрыхтавала. І мелася адразу ж пасля рускіх Калядаў з Кіева выехаць у Пецярбург; трапілася кампанія на колькі дзесяткаў вазоў, і мы ў гурце ехалі б.

Але ж паспяшаўся мой каханы і жаданы кавалер да мяне ў Кіеў развітацца, узяў з сабою даўняга соцюша[26] Себасцьяна Завадскага і пакінуў яго ў іншай карчме, а сам да мяне прыехаў з фальшывымі паклонамі і плачам, што моцна смуткуе з прычыны майго ад'езду ў такую далёкую дарогу. Я, верачы яму, бо ён годны шляхціц і парэнтэлят[27] пэўнага ваяводства, даверыла яму свой пакой. Але ж гэты бязбожны ашуканец, дабраўшыся да майго куфра, забраў у мяне колькі тысяч майго набытку і яшчэ пазычыў, нібыта трэба яму паехаць да нейкага законніка ў Пячорск, у мяне пару коней і сані. Я яму гэта даверыла, а ён, бязбожнік, са сваім Себасцьянам Завадскім знік. Так сталася на Куццю перад рускімі Калядамі, уцёк ён з Кіева за мяжу ў Польшчу.

Я ў гэтым смутку сваім бягу да яснавяльможнага генерала Лявонцьева, просячы парады і дапамогі, дык мне гэты гжэчны генерал у тую ж гадзіну загадаў даць дваццаць рэйтараў з такім указам: калі таго злачынца зловяць, дык на першым суку — павесіць. І вось паехалі мы ў пагоню за ім, але так спешна і старанна той ашуканец разам з Завадскім па снезе на пузах перліся праз лес цэлую мілю і дабраліся да поўначы за мяжу ў Польшчу. А мы баяліся далей за імі гнацца, хоць і мелі лёкая запарожскага кашавога, хлопца мужнага і адважнага. Ён не зважаў, што там Польшча, дзе б таго дагнаў, там бы і забіў, але я зважала на тое і баялася па дзвюх прычынах: першае, я ведаю, што ў нас у Польшчы найбольш за зладзеяў і злачынцаў заступаюцца, у іх жа саміх

лёкаі і фурманы ўцякаюць у мундзірах да іншага шляхціца. Той рады, што да яго фурман у новым мундзіры прыйшоў, і думае, што ён яму служыць будзе, але ж пан фурман ці лёкай бачыць, што яму за першы ўчынак нічога не зрабілі, дык ён у свайго новага пана кунтуш, жупан, пояс, нават і шаравары ўкрадзе і далей памаршыруе, дык тыя зладзеі без пакарання намножыліся ў нашай Польшчы. Бо каб было так, як у іншых краях, што кепскі чалавек сярод добрых месца не мае, і за крадзеж вешаюць, і без рэкамендацыі не прымаюць ніводнага чалавека, тое ж самае чынілася б і з маім кавалерам, таму і баялася за ім гнацца ў Польшчу, каб за яго не заступіліся асобныя іх мосці панове палякі. Мусіла павярнуць зноў у Кіеў, а рэйтары мае, маскалі, і лёкай запарожскага кашавога зубамі скрыгаталі: *«Ах растакана мацъ, ушол лях, хахол, вор, блядюн»*.

І вось, прыехаўшы ў Кіеў, пайшла я да яснавяльможнага генерала Лявонцьева, які вельмі спачуваў майму няшчасцю і абнадзеіў мяне, што лёгка забярэ ўкрадзенае ў мяне, і даў мне інстанцыяльны ліст да яснавяльможнага Браніцкага, вялікага кароннага гетмана, пана і дабрадзея, другі ліст даў мне да яснавяльможнага пана Вароніча[28], кашталяна кіеўскага, трэці ліст да яснавяльможнага Патоцкага[29], старасты кіеўскага, таксама ўзяла я інстанцыяльныя лісты ад яснавяльможнае графіні Разумоўскае, маці графа міністра і гетмана Малое Расіі. І вось выбралася ў гэтую дарогу, у Польшчу, у судовы горад Жытомір[30].

Прыехаўшы, я падала маніфест на таго шэльму і ўзяла інстанцыяльныя лісты да яснавяльможнага гетмана ледзь не ад усяго кіеўскага ваяводства, бо трапіла ў час судовае сесіі. І вось, паехаўшы ў Беласток, я атрымала ад яснавяльможнага гетмана тры

ардынансы: адзін да вяльможнага яго мосці пана камendанта камянецкага, другі да вяльможнага яго мосці пана рэгіментара памяжовага, трэці да яснавяльможнага пана Патоцкага[31], старасты львоўскага і генерала-камendанта фартэцый памежных. Дык я, аддаўшы свой ардынанс таму яснавяльможнаму Патоцкаму, які мне абяцаў даць дваццаць почтаў[32] і аднаго камандзіра, вяльможнага яго мосць Ваяводскага, каб адразу ж паехалі па яго і, злавіўшы, закутага завезлі пад арыштам у Львоў. Але ж нехта бязбожны папярэдзіў майго кавалера, паведаміўшы ў тую вёску, дзе ён жыў у сваіх братоў, якіх я не называю, бо маю літасць над гэтым прозвішчам, бо браты не вінаватыя, што іх брат жлукта і марнатраўца і мяне абакраў. А я, таго не ведаючы, што ўжо ён быў папярэджаны і ўжо ў Камянец збег у кляштар айцоў францішканаў, выбралася ў дарогу з тымі дваццаццю почтамі і адным камандзірам, яго мосцю панам Ваяводскім, за тым мілым кавалерам. І думала сабе, што там без сваркі не абыдзецца, і пайшла ў касцёл, да тых самых айцоў францішканаў, і спавядалася, святое прычасце ўзяла на гэтую небяспечную дарогу. Пасля святога прычасця хачу ўстаць, але ж мяне нехта пад рукі падымае. Адварочваюся: хто такі, каму я мушу падзякаваць, ажно бачу свайго амарата. Так я перапалохалася і збянтэжылася, што ледзь жывая засталася. Ён падвёў мяне да лаўкі ў касцёле і пачаў казаць мне і прасіць, каб адмовілася ад свайго намеру і лепей з ім пагадзілася і сумленна абяцала, што за яго замуж пайду, дык аддасць мне ўсё цалкам, што толькі ў мяне забраў у Кіеве.

І вось я задумалася, што мне тут чыніць, хлусіць, што я пайду за яго, але ж не падманваць адразу пасля святога прычасця, а ў сэрцы не хачу яго, як злога духа, за ягоную хлусню, непаважнасць і марнатраўст-

ва, за іншыя ўчынкі і бесчалавечнасць супраць мае асобы, але ж, як скажу, што не пайду, дык цяжка будзе што-небудзь у яго адабраць з майго набытку, бо ён ужо схаваўся ў кляштары. Таму мусіла сказаць: «Добра, пайду за васпана, толькі наперад аддай мне мой набытак». Дык ён мне ў касцёле аддаў два з чыстага золата гадзіннікі і дыяментавыя завушніцы, залаты ланцужок і сто чырвоных злотых і іншую галантарэю. Я гэта з Імем Божым забраўшы ў рукі, дамовілася пра рэшту. Ён мовіў: «Абяцай мне, што ўжо мяне не схопяць і не арыштуюць, дык я паеду да братоў сваіх і рэшту прывязу».

Так і сталася. Вызваліла яго і падзякавала яго мосці Ваяводскаму, камандзіру, за клопат, адаслала почтаў, а той яго мосць пан кавалер паехаў у сваю вёску і прывёз рэшту рэчаў, бо не толькі тое, што ў мяне ў Кіеве забраў і ў маёй дачкі гадзіннік і іншае, але і тое, што забраў у кляштары ў Львове ў айцоў кармелітаў дэпазіт, які я пакінула дзеля мае дачкі Канстанцыі Гальпіровай, але і тое, што забраў у сына майго паясы, патранташы і сем тысяч польскіх, што я адабрала ў яснавяльможнага яго мосці пана Бярнадскага, капітана рэгіменту найяснейшай яе мосці каралевы. Калі я ўбачыла, што ён грошы майго сына палатраціў і шматлікіх маіх рэчаў бракуе, ды яшчэ зазлаваўшы на яго і аблаяўшы, стала пагарджаць ім.

Аднаго разу (пасля майго прымусу) рыхтаваўся мой кавалер да галоўнае споведзі і напісаў сабе два спісы, быццам рахунак сумлення, і ў адным, поўным дзіцячых дробязяў, напісаў, што за сваё жыццё толькі адну ўдаву кахаў, але без парушэння сумлення, і гэты спісачак меўся падкінуць мне, нібыта згубіў, а я, знайшоўшы і прачытаўшы, каб суцешылася, што такога пабожнага маю амарата. Але ж Пан Бог інакш распарадзіўся, бо ён замест таго аднаго —

абодва спісы згубіў, а я іх знайшла і прачытала шмат бязбожных рэчаў, як ён у мяне выдурваў, клянучыся ў лістах, а ўсё тое распусным белагаловым аддаваў, жлуктам і кепскім кампаніям.

Раз узімку ехала з ім дарогаю, і вось заехалі на такое паганае месца, што ніяк з'ехаць не маглі, можна было і самім, і коням каркі зламаць, дык ён нас пакінуў, а сам да блізкае карчмы пайшоў у вёску і там піў, а я з фурманам гіну ад страху, не маючы надзеі з'ехаць з тае скалы. Але ж Пан Езус паслаў людзей падарожных з цапамі, што ішлі дзесьці на заробкі, і я гэтых людзей абяцала ўзнагародзіць (а тых людзей была грамада), дык яны коней з дапамогаю Божаю з той скалы спусцілі, а сані са мною на руках перанеслі і паставілі на гасцінцы. Дык я загадала, каб фурман коней каля карчмы добра бізуном сцебануў і карчму мінулі,— ягамосць за намі цэлую мілю бег.

Аднойчы зімою мы ехалі дарогаю, я на сваіх цяжкіх санях, а мой кавалер сваімі санкамі і сам кіраваў, дык я яму мовіла: «Ягамосцю, вазьмі, васпан, маю Магду-пакаёўку на свае сані, бо ў мяне цяжка». А меў ён замучанага каня і паволі ехаў, а як толькі Магду на свае сані ўзяў, дык пачаў коней сваіх гнаць і ўцёк з Магдаю, і не маглі мы яго ніяк дагнаць, аж на папасе, і там толькі тым суцешылася, што яго лаяла і жартавала з яго.

Аднаго разу справіла яму вельмі прыгожы кунтуш з залатым галуном. Убраўшыся, ён узяў лёкая і пайшоў у мясную лаўку ястраба купляць, ці крагульца, і там сеў на калодцы, дзе мяса сякуць, у сала і кроў, і так запэцкаў кунтуш, што ў ім ніяк нельга было хадзіць і трэба было ззаду кавалак сукна ўстаўляць.

Раз намовіў быў мне, каб я купіла пчальнік, а ён будзе гаспадарыць; купіла яму дзвесце калод пчол,

і намовіў мяне, каб купіла сто бычкоў і коз: гэтыя бычкі праз тры гады будуць вартыя шасці чырвоных злотых. Пасля мовіў: купіць трэба яшчэ і цялушак, і індыкоў, і курэй. Я ж, прастадушная белагаловая, паверыла ягоным словам і на ўсё гэта грошы дала, і вось залажыў той ягамосць пчальнік пад адкрытым небам непадалёку ад горада і распусціў па полі тых бычкоў, і цялушак, і індыкоў, а гэта было не вельмі далёка ад Жванца, дзе віно валашскае таннае, а таксама сок цытрынавы, разынкі, фігі, фінікі; дык цэлы год балявваў: індыкоў штодзённа смажыў і еў. З часам знішчыўшы пчальнік, мёд прадаваў, бычкоў, цялушак памяняў, папрадаваў і памарнатравіў, і так мне мой Бог дапамог, што я нават са свайго пчальніка мёду не пакаштавала.

Меў гэты мой кавалер лёкая, якога звалі Куц. Той Куц прыехаў да мяне ў Броды па справе свайго пана і намовіў там у Бродах дзве дзеўкі, што былі пакаёўкамі ў габраяў, каб уцяклі ад гаспадынь сваіх у Камянец. Тыя дзеўкі паслухаліся і ўцяклі. Праязджаючы праз Падкамень, намовіў мой Куц дзяўчат, каб зайшлі ў касцёл, пакланіліся Прачыстай Маці Падкамянецкай. І вось гэтыя дзве небаракі пайшлі ў касцёл, а пан Куц з возам кінуўся ўцякаць ад іх у Камянец, і забраўшы тых дзяўчат клункі, усе рэчы і іншае, што тыя небаракі за колькі гадоў выслужылі. Але тыя дзяўчаты ведалі і памяталі Камянец і пана Куца, і дапыталіся да двара ягамосця, і прасілі свае рэчы, дык тыя, што не прададзены былі яшчэ, аддалі дзяўчатам, але ў кампенсацыю нарадзіла адна хлопчыка, а другая — дзяўчынку, і так вярнуліся з плачам голыя ў Броды.

З малых гадоў любіла я страляць і заўсёды мела пісталеты, фузіі ў дарозе ў калясцы, і вось у адной карчме страляла па дзікіх галубах, а той лёкай Куц

суправаджаў мяне ў той дарозе і набіваў мне *de novo* пісталеты і фузіі, але з такім разлікам, каб мяне скалечыць, і вось як толькі стрэліла, дык столькі насыпаў пораху, што фузію разарвала і руку пашкодзіла моцна, але з ласкі Пана Бога без шкоды здароўю. А гэта, відаць, было з намовы майго кавалера *I. M. C. Z.*[33] Божа, пазбаў мяне ад такога няшчырага чалавека.

Пэўнага разу я выбралася з Камянца зноў у Кіеў па свае рэчы, якія пакінула там пасля таго, як мяне мой кавалер абакраў, а я за ім ганялася. Прыехаўшы ў Кіеў, забрала свае рэчы і па загадзе і просьбе яснавяльможнага яго мосці ксяндза Солтыка[34], на той час біскупа кіеўскага, пана і дабрадзея майго, зноў вярнулася ў Польшчу і ўжо супраць волі адмовілася ад мілага Пецярбурга і надзеі на шчасце маіх дзетак, якія б напэўна добрае месца мелі ў двары найяснейшае яе мосці імператрыцы, бо і сын мой быў бы прыняты ў Акадэмію ў Пецярбурзе. Але той кепскі чалавек перашкодзіў.

Калі з Кіева вярнулася ў Жытомір, а з Жытоміра паехала ў Дубна на Валынь, дык там купіла сабе фальварак у айцоў бернардынаў, які ім дастаўся па тастаманце пасля смерці вяльможнай яе мосці пані Якубоўскае, і жыла я ў ім каля двух гадоў, і была пад час тое дубенскае камісіі, калі прысутнічалі на вялікім кангрэсе і з'ездзе тры гетманы, а менавіта: яснавяльможны яго мосць пан Каятан Браніцкі, гетман вялікі каронны, светлы князь Міхал Радзівіл, гетман літоўскі, яснавяльможны Жавускі[35], гетман польны каронны і шматлікія іншыя сенатары, якіх прасіла і суплікавала, каб дзе-небудзь у старасці сваёй магла мець месца, бо, спадзеючыся на Бога, верыла, што маё майстэрства лекаркі і акулісткі ведаю дасканала, а не прагну аніякіх багаццяў, толькі каб магла месца

мецъ у якім двары, і спакойна Пану Богу служыць, і свой хлеб мець, каб толькі таго не страціць, што маю з ласкі Божае. А час быў вельмі добры, і мой кавалер быў на губерні на Украіне, бо па вялікай і моцнай просьбе ўчыніў гэта яснавяльможны яго мосць ксёндз Солтык, біскуп кіеўскі, што яму даў губерню, таму мела вялікі спакой і пацеху, што мяне пакінуў і ўжо застаўся на Украіне. Але я нічога не магла дабіцца ад нашых паноў польскіх і таму была ў вялікім смутку, прыпамінаючы сабе, што мела ў чужых краях павагу, карысць і дапамогу ад імператараў ды іншых годных асоб, а тут у сваім краі кажу ўслед за панам Езусам, што «прыйшла да сваіх, а свае мяне не пазналі», і вось зусім стала адзінокаю і вялікія выдаткі мела, бо я ў Польшчы заўсёды траціла тое, што ў чужых краях набывала.

Але ж Пан Бог добры, знаходзіць нейкага князя Кантагузіна[36] ў Ясах, які меў сляпую дачку, і ён памятаў даўнюю маю эксперыенцыю: калі я жыла ў Ясах, дык шматлікім годным людзям вылечыла вочы з дапамогаю Пана Бога. І вось гэты князь Кантагузін прыслаў па мяне каляску і думаў, што мяне застане ў Камянцы альбо Смотрычы, але, паехаўшы ў Львоў, атрымаў вестку ягоны пасланец, што я ў Бярдзічаве[37], бо я была на каранацыі[38] Прачыстае Маці. І вось зяць мой, вяльможны яго мосць пан Антоні Астроўскі, адаслаў мне тыя лісты ў Бярдзічаў, і так я Пану Богу падзякавала за Ягоную ласку. Але я там каля Бярдзічава мела ў той час шмат пацыентаў і таму не магла адразу ехаць у Ясы, а толькі на той ліст дала адказ светламу князю яго мосці Кантагузіну, што ў мяне ёсць свае людзі і каляска, прыеду і сама служыць вашай княжацкае мосці ў Ясы.

Я заставалася ў спакоі ў Бярдзічаве, але прыязджае мой кавалер, які быў на Украіне ў белацар-

коўскім старостве, і быў ён ва ўкраінскім кажуху. Пытаюся ў яго: «А дзе добрыя ўборы васпана, што я раней справіла?» Мовіў: «Ужо парваліся, а на Украіне баюся гайдамакаў, дык хаджу ў кажуху». І вельмі мяне прасіў, каб я яму ўбор справіла, а ён мне абяцаў, што ўсё, зробленае ў сваёй губерні, аддасць мне. Дык я справіла яму тры пары ўбораў, даволі багатых, са срэбранымі стужкамі, і іншых шмат рэчаў, а кавалер мой знайшоў мне нейкага хлопца, пранырy, Дамініка, пра подласць якога будзе ніжэй апавядацца. І вось выехала з Бярдзічава ў Львоў, бо там быў у школах сын мой, Станіслаў дэ Пільштын, якога я хацела са школ львоўскіх забраць і ў школы камянецкія аддаць, каб быў непадалёку ад мяне, ад Ясаў, і каб я магла больш дапамагчы майму сыну, бо быў ён яшчэ малым. Так шмат надзей мела на гэтае дзіця, бо хоць з ласкі Пана Бога маю дачку Канстанцыю Гальпіроўну, якая была за яго мосцю панам Антонам Астроўскім, але гэта ўжо звычай, што бедныя маці вялікую прыхільнасць маюць да малых дзяцей, прынамсі да хлопцаў. Дык забрала свайго сына, прывезла ў Камянец-Падольскі і аддала яго ў школы, а сама паехала ў Чорнаказінец да яснавяльможнага яго мосці ксяндза-біскупа камянецкага па пэўнай сваёй справе і там застала нейкага князя Кантагузіна, старасту, які быў братам таго князя, да якога я мелася ехаць у Ясы. Я ўцешылася, што тут брата ягонага застала, і паказала гэтаму князю (які стаў католікам) тыя лісты, што мела ад брата ягонага з Ясаў, і што хутка да яго паеду. Але гэты князь, стараста Кантагузін, відаць, караю Пана Бога, перашкодзіў мне ў маім намеры, напісаўшы ў Ясы свайму брату, што я нічога не ўмею і не ведаю свайго майстэрства, хоць мяне ніколі не ведаў і не бачыў раней.

Што ж мне было чыніць? Пакінула ўвесь, які мела,

набытак, і грошы, і сына ў яе мосці пані Тарэзы Праўдзінскае, вельмі годнае і пабожнае ўдавы, каталічкі, узяла на гэта ўсё распіску і аддала яе сыну майму, Станіславу дэ Пільштыну, а гэта таму рабіла, што чалавек смяротны, а сама, узяўшы ад Пана Бога дапамогу, паехала ў Хоцін, у Турцыю.

І вось шчасліва прыехала ў Хоцін, і мяне пачалавечы прыняў Махмет-паша, які быў капітанампашою супраць мальтыйцаў, і загадаў ён мне тайн даваць; я сустрэла тут добрых пацыентаў. Адзін турак, якога звалі Сеадан Гечлі-ага, быў сляпы гадоў восем, а я яго ўдала вылечыла і шмат іншых.

У час маёй бытнасці ў Хоціне здарылася такая прыгода, што з Польшчы прыехалі два ксяндзы. Адзін францішканін, а другі кармеліт босы, і яны з намовы д'ябальскае сталі іудзеямі. Хадзіла я туды да іх, і лаяла іх, і, як магла, Святою Бібліяй даводзіла, што яны кепскае перад Богам учынілі і душы свае на вечныя мукі асудзілі. Але нічога не дасягнула, толькі габраяў, як злых духаў, разгневала, бо яны мяне за тое вельмі ўзненавідзелі і шукалі якога выпадку, каб мне нашкодзіць.

І вось так здарылася, што прыехаў аднойчы малады чалавек, не ведаю: ці з хрысціян, ці выхрыст, і ён таксама стаў іудзеем у Хоціне. Я гэтага новага шчыра пераконвала і прабірала, кажучы, што тыя іудзеі, што з католікаў сталі іудзеямі, гэта кара ім ад самога Пана Бога; бо душа іх навек праклятая будзе, і тут, у свеце, абрыдлымі жабракамі стануць. І туркі іх вельмі ненавідзяць, і калі маюць за душою шэлег, дык у іх паша забярэ, а габраі з Алацы і Хоціна іх, як злых духаў, ненавідзяць і індыкамі называюць. І колькі я ведаю ў Хоціне іх, што з хрысціян у іудзеі

пайшлі, дык усе на цялежцы[39] адною клячаю ваду возяць, а калі жонак маюць, дык яны ўбогіх янычараў каханкамі становяцца, а мужа да жонкі не дапускаюць, бо муж-індык мусіць за парогам на варце стаяць. Але, аднак, той малады католік іудзеем стаў і ажаніўся з габрайкаю.

Хутка сталася так, як я яму казала: збяднеў, бо паша ў яго ўсё забраў, і з жонкаю ягонаю таксама ўсё споўнілася, і вось прыбег ён да мяне на ратунак, просячы рады, каб мог зноў у веру нашую вярнуцца і каб яго не спалілі ў Польшчы, і я яго пераконвала, каб не баяўся, і ўзяла яго на сваю душу, што яму на тым баку нічога не зробяць, і пісала да яснавяльможнага яго мосці ксяндза Дамбоўскага, біскупа камянецкага, паведамляючы пра гэтую душу, што прагне вяртання да Бога, і вось атрымала адказ, каб нічога не баяўся, бо Касцёл — гэта Маці, якая і кепскіх, і добрых людзей прымае.

Гэтая прыгода здарылася ў час Вялікадня. Я паехала з Хоціна ў Жванец на набажэнства і стала да святое споведзі ў пакоі яго мосці ксяндза-прабошча жванецкага. На другі дзень Вялікадня пераехаў Днестр, і прыйшоў у келлю яго мосці ксяндза-пробашча той выхрыст, і там мяне знайшоў, і кінуўся мне ў ногі, і падзякаваў за мае хрысціянскія ўгаворы і навуку. І гэты хрысціянін застаўся ў сваёй святой веры ў Жванцы на польскім баку, а я пасля Велікодных святаў зноў вярнулася на турэцкі бок ў Хоцін, бо там мела сваіх пацыентаў і рэчы, пры гэтым мела намер далей ехаць у Турцыю на заробкі.

Але ж з намовы шатанскае паўсталі на мяне габраі і далі супліку яго мосці пашы, які ў той час толькі прыехаў у Хоцін на пасаду. Гэты Умер-паша,



Аблога турэцкай фартэцы Хоцін войскамі Яна Сабескага. Фрагмент гравюры пачатку XVIII ст.

мяне не ведаючы, паверыў гэтым габраям-ашуканцам і іх намове, і як толькі я на турэцкі бок пераехала, дык адразу мяне пад арышт узялі, а габраі, крычучы, і наракаючы, і хвалячыся, што ўжо сабралі шэсцьсот ок кавы і дадуць пашы, каб ён мяне пакараць смерцю загадаў за той учынак, што намовіла габрая, каб стаў каталікам. І вось, будучы арыштаванай, я не мела ніякай дапамогі ад нашых ягамосцяў палякаў, каб за мяне хто хоць добрым словам ці лістом да пашы хацеў заступіцца, а была я забытая ўсімі людзьмі, толькі на Бога свайго і Прачыстую Маці надзею мела. І цешылася ад таго, што ў гэты час не мела ні сына свайго, ні лёкая-хрысціяніна, бо такі вырок майго Бога, каб ад гэтае напасці нявінная смерць знайшла, дык ахвярую сваё жыццё Пану Езусу, абы толькі са страху які лёкай ад веры каталіцкае не адмовіўся.

У гэты час сын мой, Станіслаў дэ Пільштын, які быў пакінуты па маёй волі ў школах камянецкіх у маладым узросце, у дванаццаць гадоў, пачуўшы пра маё няшчасце, смела і адважна перабраўшыся праз Днестр, прыехаў да мяне і весела сказаў: «Спадзявайся на Бога, мілая матуля, нічога з табою не будзе. Гэтыя абрыдлыя габраі не змогуць нічога даказаць. Я сам іду да яго мосці пашы і іншых турэцкіх паноў, і ўбачыш, як Пан Езус нам дапаможа пазбыцца гэтае несправядлівае напасці». Але я страшна гневалася і наракала на свайго сына, навошта адважыўся з бяспечнага краю на турэцкі пераехаць бок і трапіць у такую бяду, бо я вельмі баялася, каб яго, барані Божа, яго мосць паша гвалтам не зрабіў туркам, бо быў ён малы хлопец, і да таго ж Пан Бог не абдзяліў яго прыгажосцю. І вось пайшоў мой сын па турэцкага пісара і прывёў яго да мяне. Я прадыктавала сама, як пісаць гэтую супліку, і, спраўна напісаную, дала ў рукі свайму сыну.

Той, па людску ўбраўшыся і ўзяўшы сабе тлумача Ліпку[40], які добра ўмеў па-турэцку і па-польску гаварыць, пайшоў да Умер-пашы, і, аддаўшы яму супліку, сам, як мог, падмацаваў доказамі маю справу, і даказаў невіноўнасць маю, і распавёў яго мосці пашы пра сіроцтва сваё, «калі ад габрайскае намовы нявінная памрэ і Пану Богу рахунак трэба будзе даць за нявіннасць матулі маёй».

І вось міласэрны Пан Бог натхніў добрым духам яго мосць пашу, і на просьбу майго сына суровасць сваю адмяніў, і ўжо тыя шэсцьсот ок кавы ад габраяў не хацеў, толькі загадаў мяне ў суд клікаць у гэты ж дзень. І вось з'явілася я да турэцкага суддзі, якога звалі Асман-эфендзі, а супраць мяне шэсць сведкаў-габраяў, што яны сваімі вачыма бачылі і вушамі чулі, што я таго габрая намовіла, каб стаў католікам, і рэчы ягоныя з турэцкага боку на польскі перавезла. Гэта прэтэнзія на дзве тысячы леваў, але Пан Бог не пацешыў непрыяцеляў маіх, бо іх суддзя не слухаў і знайшоў фальш у іхніх сведчаннях і выгнаў гэтых сведкаў і актораў гэтае справы, і вызваліў мяне Пан Бог і суд ад тае напасці, але, аднак, мусіла даць суддзі за дэкрэт трыццаць чырвоных злотых польскіх.

І вось паша даў мне чухадара, гэта значыць свайго лёкая, каб пайшоў са мною ў мой дом, дзе я ў той час жыла, і зняў пячатку, бо дом мой быў апячатаны ўвесь гэты час.

Дык мы, вяртаючыся ад яснавяльможнага пашы дамоў, па дарозе сустрэлі чалавека ў адной кашулі і ў грубым палатняным чугаі, які плакаў і наракаў на габраяў, што яго абадралі і люта пабілі за нейкі ўчынак, а цяпер няма куды яму дзецца; і меў ён жонку, а яна ад яго адмаўлялася і наракала на яго. Дык я яму мовіла: «Слухай, габраю, ахрысціся і стань католікам, дык я цябе вазьму на паслугі, і апрану,

і буду табе дапамагаць як змагу». І вось гэты габрай адразу згадзіўся на гэта, і я пайшла з ім да муселіма, гэта значыць губернатара, і пыталася, ці магу я зрабіць габрая каталікам. Мовіў муселім: «Нельга». То я мовіла: «Мілы пане, дык ты дазваляеш нашым стана-віцца іудзеямі, а іудзею не дазваляеш стаць хрысціянінам?» Ён заглянуў у Каран і дазволіў гэтаму іудзею стаць каталікам, а я падаравала муселіму колькі чырвоных злотых, узяла дакумент і пайшла з Імем Божым са сваім сынам, з чухадарам і з гэтым хрысціянінам у свой дом. Адразу ж паслала яго да цырульніка, дала яму на галенне барады і пейсікаў і назвала яго Ян Дабравольскі. Стаў ён служыць у мяне і быў у мяне колькі тыдняў. Пасля зноў тыя паганыя габраі паслалі супліку яго мосці пашы, і жонка Яна Дабравольскага паслала супліку на мяне, бо я намовіла зноў габрая і хачу зрабіць яго каталікам. У карысць таго: «бараду і пейсы загадала пагаліць, і ўжо свініну есць з імі», але ўжо гэта нічога не дапамагло тым злым і няверным габраям, бо хоць Яна Дабравольскага пасадзілі былі ў вязніцу, але сядзеў ён толькі дзень, а я яго з-пад арышту выкупіла і адаслала ў Польшчу, каб там ахрысціўся.

Хутка прыехаў зноў мой кавалер да мяне, яго мосць пан *I. M. C. Z.*, бо ўжо сваю губерню страціў, якую я яму выстаралася, і хацеў зноў каля мяне пажывіцца, але ж я падумала пра свае гады, і Пан Езус умацаваў мяне, і ўжо нічога больш не дала яму.

Тым часам збавіцель Пан Бог намовіў нейкага добрага чалавека, які добрыя словы пра мяне казаў у Стамбуле перад вялікім янычар-агою, што я надзвычай добра валодаю лекарскім майстэрствам, а дачка роднае сястры вялікага янычар-агі стамбульскага была замужам за вялікім панам турэцкім, якога звалі Абды-бей, гэта значыць князь, а тая пані звалася

Аішэ Ханум. У маладым веку стала яна сляпою, дык той янычар-ага адправіў пасланца-эфендзі па мяне з ферманам, гэта значыць ардынансам, і прыслаў мне пяцьсот леваў на дарогу, і васьмёрку паштовых коней, і трох годных туркаў, ясакчыяў, гэта значыць, каб яны мяне суправаджалі.

І купілі мне пару добрых коней, і, маючы двух сваіх людзей, паехалі мы ў Жванец, дзе дала царкоўны зарок, гэта значыць залатое парчы на алтары, і дала я на імшу святую, і на той імшы прычасцілася. Пасля святога прычасця, развітаўшыся з сынам і добрымі маімі прыяцелямі, выбралася ў тое стамбульскае падарожжа.

І вось, выехаўшы з Хоціна ў Ясы, мы спыніліся ў Фуксанах[41], у зямлі мультанскай, але ў той час татары лютавалі і гэтае начы напалі на гэты горад, на Фуксаны, дзе мы начавалі, і рабавалі татары тае начы і людзей у няволю пабралі; і вось назаўтра прачынаюся, аж мне людзі мае кажуць пра гэтую бязрадасную навіну. Тыя людзі, што па мяне прыехалі, з коньмі паўцякалі, і такою воля Божая была, што мае туркі хутка ў маю каляску коней запрэглі, а ў калёсы — чужых коней, што ў людзей гвалтам адабралі, і так вось мы шчасліва ў манастыр уцяклі, але ж у манастыры тым шмат людзей абодвух полаў, дзяцей засталі, што ледзь уціснуліся гвалтам і месца сабе знайшлі, як зачынілі манастырскую браму. І тут напала на горад колькі тысяч татараў і, акружыўшы горад, манастыр штурмавалі; горад дашчэнту абрабаваўшы, мужчын, белагаловых і дзяцей у няволю пабралі, нават жывёлу, коней, авечак і іншае, а большую палову горада спалілі, але было колькі соцень туркаў у манастыры, якія зачыніліся разам з намі, і вельмі мужна яны абараняліся. Гэтая бітва доўжылася дзён дзевяць. А я ўвесь гэты час удзень і ўначы

ў калясцы сваёй прасядзела, вельмі баялася выйсці з каляскі, бо розных людзей там было і маглі некаторыя мае рэчы ўкрасці.

Пасля сабралі мы дзве тысячы чырвоных злотых і каня вельмі добрага, два з чыстага золата гадзіннікі і колькі кавалкаў футра чорна-бурае лісіцы і собаля ды паслалі праз пасланца султану Бешлі-агу, дык той абяцаў адступіць са сваім войскам.

Тым часам пачалі пакрысе людзі выходзіць з манастыра. Цяпер пазнаёмілася я з ігуменам гэтага манастыра, і быў ён мне вельмі рады і шкадаваў, што я дзесяць дзён такія невыгоды мела, і ўжо пачаў мне таін даваць: хлеб, мяса, віно, каву, сена, фураж, і шмат і так шчодра, што я магла рэштаю шмат іншых людзей накарміць. Як супакоіліся тыя татары, дык мы з Імем Божым выехалі з Фуксан у Бозеў[42], у Бухарэст, у Гіяргеву і перабраліся праз Дунай у Рушчук, а адтуль вальным трактам паўз Адрыянопаль шчасліва даехалі да Стамбула.





Раздзел чацвёрты

ДРУГІ ПРЫЕЗД У СТАМБУЛ

Прыехаўшы ў Стамбул, мы трапілі ў Ені Бахчы[1] ў дом Дуду Хасан-эфендзі Башкеседара, бацькі Аішы Ханум, лячыць вочы якой я і прыехала; мяне па-чалавечы прынялі тут, у бацькі Аішы Ханум. У доме Абды-бея ў горадзе Эюпю таксама мяне добра прынялі, дык, асвоіўшыся за тры дні, пачала я лячыць Аішу Ханум і лячыла яе сорак дзён, ды так яе шчасліва ад старое слепаты вылечыла з дапамогаю Пана Бога, што яна так добра і дасканала бачыла, нібыта ніколі і сляпою не была.

Калі я хутка вылечыла Аішу Ханум, дык мне шмат добрых пацыентаў трапілася, напрыклад, Мустафа-ага (жыве ў Тахта Кала, дзяржаўны скарбнік), Кадык-ага і Хусейн-ага, Емін-улу, Тарапхан Яніны, што кіруе тым горадам, дзе золата робяць, а ён не бачыў адным вокам гадоў трыццаць, а другім — сем, і я яго з дапамогаю Пана Бога так удала вылечыла, што ён так добра бачыць, што чытаць і пісаць можа. Заплаціў ён за маё лячэнне семсот леваў.

Пасля пачала я лячыць Шэхімулле, вельмі старога чалавека, і яго з ласкі Пана Бога так удала вылечыла,

што мог таксама чытаць і пісаць, а затым ён стаў Урумелі Казаскерам (гэта значыць, не раўнуючы, святым пастырам), і ён мне за маю працу даў пяцьсот леваў, і мела я ад яго вялікую пашану, і ласку, і вялікі доступ, ды той толькі паверыць зможа ў гэта, хто ведае, што гэта за пасада Урумелі Казаскер.

Шмат яшчэ іншых пацыентаў мела, якія мне сумленна заплацілі і адзін аднаму рэкамендавалі, і разбагацела я хутка на колькі тысяч злотых польскіх.

У маю бытнасць даў Пан Бог султану Мустафе, што быў на троне ў Стамбуле, дачку Эметулу, а гадоў сорак не нараджаліся нашчадкі ў султанскім доме, хоць за гэтыя сорак гадоў ужо чатыры султаны памерлі. Дык у час урачыстасцей у гонар нараджэння гэтай Эметулы (гэта значыць надзея ад Бога) увесь Стамбул і Пера[2] і ўсе вялікія і малыя вуліцы, дамы, камяніцы, лаўкі і крамы так былі прыбраныя, як у нас у Польшчы алтары на свята Божага Цела ўпрыгожваюць, аздоблены вышыванымі золатам тканінамі, кілімамі і дыванамі, і таксама ўвесь Стамбул так быў упрыгожаны зялёным самшытам, такім вялікім, высокім і тоўстым, як звычайныя дрэвы ў лесе, бо самшыт турэцкі не такі малы, як у польскіх садах, і таксама лаўровым дрэвам быў увесь горад засаджаны і размаітымі кветкамі ў вазах, што нельга было на возе праехаць, і таму мусіла я сабе каня добрага купіць, збрую і сядло, і мела амазонскую сукню, і два ўбраныя лёкаі мае ішлі за мною пешу, а я на кані ехала там, дзе мне падабалася, паглядзець на звычаі, ілюмінацыі, музыкаў і размаітыя танцы, скокі.

Розныя людзі ў розных строях цешыліся, а хоць цягнулася ўсё гэта доўгі час, а менавіта дзён сорак,

але без сварак і без крыві, і ўвогуле ўсё спакойна закончылася.

Адзін купец у Стамбуле, католік, зваўся ён Мусіані, зрабіў з васьмідзесяці ок найлепшага жомчугу харугву перад сваёй лаўкаю, і назвалі яе Індзілі Байрактар, гэта значыць жамчужная харугва. Усе людзі і хрысціяне са сваімі цэхамі штодзень да султанскага палаца ішлі, напрыклад, кушнерскі цэх меў харугву з собалем, якая была ля кушнерскае лаўкі, была яна ацэнена ў сто кес. А дзе былі краўцы, дык на сваіх харугвах нажніцы, прасы, локці і дарагія тканіны вешалі. Хто памаранчы, памаграны[3] прадаваў, дык харугву меў з памаранчаў, з цытрынаў, з яблык і іншага і з дарагіх штангерак[4], паясоў, хто толькі якім майстрам быў, такую харугву мусіў паставіць.

А якія феерверкі на моры, а што за дзіўныя паркі, якія палацы і масты былі, якія гулянкі і ілюмінацыі пры ўдзеле вялікае колькасці людзей розных народаў! Цяжка апісаць тое відовішча, якое было на моры. Цэх залацільшчыкаў такое паказваў: чатыры тысячы самых лепшых людзей, усе мелі новыя аксамітныя жупаны, кунтушы з гішпанскага сукна, паясы з чыстага золата, дыяментамі ўпрыгожаныя, сінія, новыя чырвоныя фэзы на галовах, у адной руцэ з чыстага золата кадзідла з кадзеннем *lignum aloes*, а ў другой — кубак з чыстага золата альбо са срэбра, добра пазалочаны, напоўнены ружоваю гарэлкаю; і гэты цэх залацільшчыкаў віншаваў султана Мустафу з нараджэннем дачкі Эметулы, скакалі яны свае танцы і атрымалі ад султана падарунак — дзве тысячы чырвоных залатых.

Прыйшлі зноў аратыя да султанскага палаца, вялікая грамада маладых хлопцаў, прыгожа і багата ўбраных. Яны мелі срэбраны пазалочаны плуг з шасцю вельмі прыгожымі валамі, рогі якіх былі пазалоча-

ныя, і шэрсць таксама пазалочаная. Кожны чалавек меў на сабе на залатым галуне пацэпленую скрынку, а ў гэтых скрынках было рознае насенне, напрыклад, пшаніца, ячмень і іншае збожжа; і вось адзін араў сваім плугам на валах, і іншыя са скрынак насенне сеялі і спявалі, паводле свайго звычаю, а найяснейшы султан Мустафа, зверху гледзячы на тое, як яны аралі і сеялі, высыпаў аратым у іх баразну колькі тысяч чырвоных злотых.

Калыска той султаніхі была з чыстага золата, упрыгожаная дыяментамі. Раней чым у яе дзіцё палажылі, паслалі ў эюпскую джамію[5] пасвянціць, бо тут, як усе тутэйшыя хрысціяне мовяць, ляжыць святы Іова, і ў гэтай джаміі кожнаму султану, што на трон уступае, прычапляюць шаблю, і там гэтая калыска была пасвянцона з вялікаю пышнасцю ў прысутнасці высокага стану людзей, а менавіта: муфты[6], Урумелі Казаскер, Анадол Казаскер, Стамбул эфендзі[7] і Шэхімулла з найгоднейшага духавенства, і прынесена гэтым разам пяцьсот бараноў у ахвяру, і значная сума грошай убогім дадзена; і вось сталі ад эюпскае джаміі аж да джаміі Айя-Сафіі[8] шарэнгаю янычары, узброеныя і слічна апранутыя, а тую калыску на галаве няслі з вялікаю пышнасцю з почтам султанавых прыдворных і шматлікіх султанавых паноў, шмат было конных: увесь двор візіра і янычарагі.

Кожны з вялікіх паноў турэцкіх падарыў гэтаму новаму дзіцяці па адной нявольніцы. Нават найгоршая была куплена за дзесяць кес грошай, і надзвычай багата прыбрана, і каштоўнымі камянямі прыздоблена, каб служылі і калыхалі гэтую Эметулу. Гэтых нявольніц было чатырыста.

Маці гэтай султаніхі, як хрысціяне кажуць,— дачка аднаго грэчаскага духоўніка, і калі гэты духоўнік

памёр, ягоная жонка засталася ўдавою з пяццю дзяцьмі, і ўсіх гэтых дзяўчат бедная ўдава не магла пракарміць, і падаравала адну дзяўчынку султанавай дачцэ, роднай сястры цяперашняга (у 1759 годзе) султана Мустафы. І гэта таму зрабіла, каб дачка ейная хрысціянкаю заставалася, бо туркі не прымушаюць нікога да веры, ды хацела тая ўдава, каб ейная дачка ў цноце жыла, бо той толькі можа ведаць і верыць, хто бачыў, як султанавыя дочкі асобна жывуць, а асабліва паненкі і ўдовы, бо аніводзін мужчына ніколі ў іх не бывае. Яны маюць арабаў-кастратаў, каб хадзіць у горад, маюць таксама шмат карлікаў, таксама кастратаў, дзеля прыслугоўвання і дзеля пацехі, і таму тая маці падаравала дачку султанісе. Прыгожая і пабожная дзяўчына ў цноце жыла, як добрая хрысціянка, і была мілай у вачах Аішы-султаніхі, і тая падаравала яе свайму брату, султану Мустафе, і нарадзіла яна султану гэтую чаканую ўжо сорак гадоў спадкаеміцу Эметулу.

Пасля родаў пытаўся ў яе султан: «Што ты хочаш, каб я дзеля цябе зрабіў? Усё рады зрабіць, ні ў чым табе не адмоўлю, каханая жонка мая». Дык яна адразу папрасіла дапамогі сваёй маці і сёстрам. Загадаў султан вялікую суму грошай паслаць у Ізмер[9] маці і сёстрам ейным, бо там у той час жылі яны. Пасля мовіў ёй імператар: «Дарую за тваё каханне ўсім хрысціянам даніну і падаткі на ўвесь год» (што складае за год трынаццаць мільярдаў кес). Але гэтая пабожная пані прасіла, што Пан Бог дапаможа хрысціянам тыя падаткі выплаціць, бо толькі адзінаццаць тынфаў кожны чалавек даць мусіць, а прасіла, каб дазволіў цэрквы і касцёлы ставіць. Так і сталася, што дазволіў. Вось хто пра гэта хадайнічаў па поклічы сэрца хрысціянскага, бо я сама бачыла надзвычай велічную царкву, за вялікі кошт пабудаваную і аздобленую,

прыгожыя срэбраныя лямпы, з чыстага золата люстры і ліхтары і абразы, апраўленыя ў золата, дыяментамі і размаітымі каштоўнымі камянямі ўпрыгожаныя і жомчугам аздобленыя, што цяжка распавесці пра тое багацце, што бачыла ў цэрквах у час Велікодных свят.

Праз тры месяцы пасля нараджэння султаніхі Эметулы хацеў яе бацька, султан Мустафа, зашлюбіць з адным прыдворным Селіхтарам. Ён займаецца тым, што чапляе шаблю султану. І там у султанскім двары павінна быць найлепшых мужоў трыццаць дзевяць, разумных, і вучоных, і з твару слічных, і да вайны і да ўсіх мужчынскіх спраў прыдатных, і ўсім добрым і чалавечым звычаям навучаным без «але». А саракавы сярод тых трыццаці дзевяці сам султан, і называюцца яны на султанскім двары «Сорак мужоў».

Пасля ўзялі тую малую султаніху з жаночых рук і, багата прыбраную ў каштоўныя камяні ў звычайным дзіцячым строі, занеслі ў пакоі да бацькі, султана Мустафы, і там паставілі ў адным месцы, падрыхтаваным дзеля яе *ad instar* троне, трымаў яе сам султан, а тыя трыццаць дзевяць мужоў цалавалі ёй ногі і Селіхтар-эфендзі, муж ейны, і ўсе жадалі ёй шчасця, і адразу пасля гэтага шлюбу павінен гэты муж яе апранаць і забяспечваць усе ейныя патрэбы і ўсяго ейнага двара.

Яго мосць султан Мустафа ўсіх сясцёр сваіх, удоў, вельмі добра замуж павыдаваў за пашоў, а адну за візіра, даўшы ім вялікія грошы, каштоўнасці, палацы, і вялікія пенсіі ім прызначыў, бо пры іншых ранейшых імператарах былі гэтыя сёстры забытыя, і дазволіў ён сваім сёстрам часта бываць у яго і гутарыць з ім. Калі якая сястра ехала са свайго палаца ў палац брата, султана Мустафы, дык з вялі-

кім шыкам, на калясках, запрэжаных шасцерыкамі, у атачэнні вялікай колькасці прыдворных, і цешыўся ён з імі.

Ёсць у Стамбуле месца, Эскі Сарай[10], гэта значыць, дзе жонкі і пакаёўкі ранейшых султанаў жывуць; яны на гэтым свеце сапраўдныя нявольніцы, бо да смерці там сядзець мусяць.

І такі гэты палац prасторны і велізарны, што саміх мужчын, арабаў-кастратаў, жыве чатырыста: кожны мае два пакоі, а белагаловых, старых і маладых, налічваецца тры тысячы трыста. Маюць яны і малых дзяцей, бо кожная мае вялікія грошы, ёй ідзе пенсія штомесяц, гатовыя сукні, ежа, напоі, дровы, а выдаткоўваць няма на што сваіх сум, дык купляюць яны малых дзяцей-нявольнікаў і гадуюць. Калі дзяўчына — выгадаваўшы, замуж аддаюць і вялікія багацці ёй перадаюць, а хлопчыкаў толькі да сямі гадоў трымаюць, а пасля іх з белагалоўскага палаца ў мужчынскія школы аддаюць, і становіцца ён вучоным чалавекам, паводле звычаю турэцкага. Тая, што яго з няволі выкупіла, становіцца яму маці, і ўвесь набытак, што яна мае, аддае сыну, а той, калі мае здольнасці, можа з часам пашою альбо янычарагою стаць. Але тыя белагаловыя з Эскага Сараю ніколі нікога не бачаць і ніколі не выходзяць. А цяперашні султан такі ўважлівы і ласкавы, што да гэтага Эскага Сараю часта ездзіць, і бавіцца з імі цэлы дзень, і дазваляе гэтаму фраўцымеру смела з ім размаўляць, і кожная — чаго хоча — просіць, і пытаецца, калі каторая хоча замуж ісці, можа гэта смела сказаць, і выдае яе замуж з вялікім пасагам. Іншыя ж, што замуж не хочуць, дык кажуць: «Даволі нам шчасця, што мы былі пакаёўкамі бацькі вашае



Палац султана Сулеймана
ў турэцкай сталіцы.
Гравюра XVIII ст.

султанскае мосці, а цяпер цешымся, бачачы шчаслівае панаванне вашае султанскае мосці». Дык і гэтыя белагаловыя маюць вялікія выгады, падарункі і пенсію.

Звычай такі ў султанавых сыноў, што, напрыклад, турэцкі султан мае дзевяцьсот дзевяноста дзевяць жонак ад цара Саламона, які меў тысячу жонак, па-

водле гісторыі турэцкае і габрайскае, і быў царом ерусалімскім; такім чынам, султан турэцкі так мовіць: «І я з ласкі Божае ерусалімскі цар, толькі што не сын Давідаў, таму не магу мець тысячу жонак, а толькі дзевяцьсот дзевяноста дзевяць — адну менш». Каб гэтыя жонкі, напрыклад, кожная, мела сына, дык гэты сын, пакуль не мае трынаццаці гадоў, можа вольна па Стамбуле ездзіць і дзе хоча ў пашане хадзіць, а пасля трынаццаці гадоў адсылаюць тых сыноў у спецыяльны палац, дзеля іх даўно змураваны, і там яму даюць лёкаяў для паслуг і вялікую выгаду ў ежы і пакоях, уборах і што трэба чалавеку, даюць ім іхнія мамкі, што іх малых грудзямі кармілі, і адну белагаловую ў гадах, каб ужо дзяцей не нарараджала, а як каторы з гэтых маладых сыноў стане султанам і мае дзевяцьсот дзевяноста дзевяць жонак, дык тую першую старую жонку, што з ім у зачыненым гарэме жыла, мусіць адправіць у Эскі Сарай, каб там сядзела, пакуль жывая. Але цяперашні султан Мустафа, пры двары якога я цяпер, у 1760 годзе, прыдворная лекарка і акулістка, ні ў якім разе не хацеў адсылаць ад сябе свае старое жонкі, але муфта (не раўнуючы, як у нас святы ойча) прыехаў да яго з Каранам, гэта значыць з кнігаю, дадзенаю ім Магаметам, у якой усе дагматы веры і законы султанскія, і забараніў яму, каб жыў са старою сваёй жонкаю, а гэта таму, што праз пачуцці, якія ён меў да яе, не мог бы з іншымі белагаловымі мець зносіны, а трон без нашчадка быць не можа. І таму мусіў султан сваю старую жонку ў Эскі Сарай адправіць з вялікім плачам і незадавальненнем сваім, аднак ён часта бывае ў яе і, наведваючы, яе запэўнівае, што сэрца сваё, якое ён аддаў у свае маладыя гады, гэта сэрца ёй адной належаць будзе, пакуль жывы[11]. І даказаў сваё цяперашні султан, дык сваю старую жонку ўзяў да сябе, у палац, і старэй-

шаю прызначыў над усімі белагаловымі, але яна мудрая, нікуды не ўмешваецца, бо ёсць ахмістрыні, яна толькі дзеля свайго спакою выгод шукае, і таму яна мілая ў вачах султанскіх і ўсяго ягонага двара.

Цяперашні імператар султан Мустафа, як я сама ведаю добра і дакладна, толькі дзве жонкі мае, хоць яму дазволена кожную пятніцу панну мець, аднак устрымліваецца і так мовіў: «Калі мне Пан Бог нашчадкаў дасць, дык і ад гэтых дзвюх жонак буду мець». І вось цяпер тая першая зноў цяжарная.

У час маёй бытнасці ў султанскім двары захварэла сярэдняя сястра султана, султаніха Аіша, што была цяжарная, на гарачку, і вельмі цяжка, кашаль і страшэннае ванітаванне, была яна безнадзейная, лячылі яе лекары, але без усякае палёгкі. І вось я, не ведаю кім, была рэкамендаваная яе мужу, што добрая лекарка, і мяне адразу ў палац ейны паклікалі, які на Тэйраку. Прыехаўшы да яе, я была па-людску прынята, і не далі мне і хвіліны пастаяць, а, пасадзіўшы, разумную гутарку яна вяла і прасіла мяне дапамагчы ёй, на што я адказала: «Ёсць тут у Стамбуле мудрэйшыя і больш дасведчаныя лекары прыдворныя ў яснавяльможных паслоў». Але яна адказала мне на гэта, што мае да мяне добрае сэрца і сваё жыццё смела складвае на маё сумленне і дасведчанасць. Дык я, перастаўшы баяцца, узяўшы Божую дапамогу, загадала пусціць ёй кроў з рукі і дала ёй піць колькі кропель *0 0 cynamomi*[12], а таксама *agua cynamomi*[13], *balsam kopaiba, spiritum nitri dulcisanizati*[14], а на крыж *unguentum comitis*[15], *oleum de nucis muschati*[16], *oleum mentha*[17] і размаітыя спосабы падмацавання і супакаення кашлю і жару. Я заставалася ля яе тры дні

і тры ночы, але ў час посных дзён: пятніцы і суботы, таму далікатныя посныя стравы дзеля мяне загадалі з кухні прыносіць — з рыбы, з цукру, сочыва, а ўсё шкадуючы мяне, што няма чаго мне есці. І якая выгодная пасцель, асобны пакой, ціхі і выгодны!

Шмат бачыла багацця і ў палацах пакоі прыгожыя ў імператарскай Вене, калі там была два гады, альбо ў Пецярбурзе ў найяснейшае яе мосці царыцы таксама гады два, але багацце ў султаніхі Аішы, султанавае сястры, у Стамбуле на Тэйраку перавышала ўсё іншае. Той палац стаіць на пагорку, адкуль увесь Стамбул і мора як на далоні відаць, ён вельмі прасторны і мае тры паверхі. На ніжнім паверсе жывуць нявольніцы і кастраты, на сярэднім — яна сама з фраўцымерам сваім, а на верхнім — дачка ейная пятнаццацігадовая, якая была заручана з адным султанавым прыдворным. У самое гэтае дачкі чатырыста душ на паслугах, а менавіта: нявольнікі-кастраты, спявачкі, бандурысты, карлікі і да размаітых пацех дасведчаныя белагаловыя і дзяўчаты. І вось захацеў найяснейшы султан Мустафа мець у сябе сваю сястру султаніху Аішу з ейнаю дачкою эфендзі Ханум, каб, паводле звычаю, блаславіць яе на шлюб.

Там жа бачыла я падарункі, якія прыслаў кавалер дзеля эфендзі Ханум: брыльянтавы канак[18] на шыю, а другі — на галаву, брыльянтавы пояс, аздоблены гадзіннік з ланцужком у крамны локаць (бо ў іх да гадзіннікаў доўгія ланцужкі даюцца), люстэрка і дванаццаць з чыстага золата пудэлачкаў, шчодра аздобленых брыльянтамі з бабовае насенне, а найменшы, як вялікі гарох. Нават такія драўляныя чаравікі, як у нас айцы бернардыны ходзяць, былі з дрэва *lignum aloes*, у чыстае золата апраўленыя, рубінамі аздобленыя, залатая медніца з наліўкаю, клеткі з чы-

юкамі, канарэйкамі і салавейкамі — усё ў залатых клетках, упрыгожаных дыяментамі. І была такая ўрачыстасць, што было восемдзесят запрэжаных шасцерыком калясак, а ў кожнай калясцы па чатыры і па шэсць белагаловых, вельмі багата ўбраных, а янычарскае войска са старэйшымі і начальнікамі было прыгожа пастроена адзін ля аднаго, падабраныя людзі суправаджалі ад палаца султаніхі Аішы аж да султанскага палаца, а двор султанавы і султаніхі Аішы атачаў на спраўных конях у каштоўнай збруі, сёдлах і дыўдыках[19]. Нічога ў жыцці маім шыкоўнейшага я не бачыла.

Пасля шлюбу маладое малжонства вярнулася ў палац свае маці. Там былі пакоі так багата аздобленыя, што ўзгалоўе і тыя кілімы, па якіх хадзілі, у шасці вялікіх пакоях былі засланыя аксамітам, масыфам[20] гафтаваныя і аздобленыя жомчугам з дробны гарох. Той пакой, што быў для малжонства, высланы зялёным аксамітам, і ў залатых кадзідлах курылі *ud agaczy*, а па-лаціне *lignum aloes*, такі каштоўны, што за кожны лот[21] трэба даць чырвоны злоты. Вялікія кандэлябры ўверх на чатыры крамныя локці брыльянтамі ўпрыгожаныя, люстэрка ад долу да бэлькі ў залатой раме апраўлена і залаты стол, місы ж з парцаляны, бо з залатога посуду есці ў іх не зазвычаена. Другі пакой быў кармазінавым аксамітам высланы, таксама масыфам гафтаваны, тут маладая панна прыбіраецца. Трэці пакой быў блакітным аксамітам вымасланы і масыфам гафтаваны, тут маладая панна моліцца. Чацвёрты пакой быў жоўтым аксамітам абабіты, тут малжонства будзе першы раз есці, і ён таксама белым масыфам гафтаваны і ядвабам розных колераў на здзіўленне майстэрскаю работаю аздоблены. Пяты пакой быў пунсовым аксамітам абабіты і высланы, залатым пазументам абшыты, пандэшпанам[22] дзіўнае

сіметрыі выкладзена форма, як у нас у Польшчы парцьеры над ложкам, а пакой прасторны, бо кожны з іх мае дванаццаць вокан і трое дзвярэй. Гэты пакой быў каб прымаць госця. Шосты пакой быў абабіты і высланы фіялетавым аксамітам, нібы гранатавы, вельмі прыемнага колеру, абшыты срэбраным масыфавым пазументам, па якім ядвабныя кветачкі раскінуты. Гэты пакой быў надзвычай вялікі, як зала. Там былі і крэслы аксамітныя, залацістымі фрэндзелямі і пазументам абшытыя, люстэркі вялікія і крыштальныя люстры ў срэбранай аправе, кандэлябры і гадзіннікі з курантамі. Гэты пакой быў абстаўлены для танцаў і скокаў, спеваў, пацехі і свецкіх забаў.

Пасля тую паненку аддалі ейнаму мужу з блаславеннем маці ейнае і айчыма Селіхтар-пашы. Назаўтра прыслаў ёй імператар дванаццаць таблаў, гэта значыць срэбраных круглых пліт вялікіх, розныя прыгожыя кветкі, устаўленыя ў залатыя збанкі, і размаітая садавіна, што на свеце знайсці можна, а менавіта: памаранчы, цытрыны, памаграны, разынкі, міндаль, фігі, яблыкі, грушы ды іншае. Усё ў асобных залатых вазах, і дзвесце жамчужных шнуроў, як вялікі гарох, заплятаць ёй валасы. Апрача гэтага тысячу кес гатоўкаю на шпількі і штомесяц пастанавіў султан даваць нябозе сваёй сорак кес на яе выдаткі і ўсяго ейнага двара і ейнага мужа. У маці ейнай, султаніхі, Аішы, у палацы таксама такая аздоба ў пакоях. Пра пекнасць ейнае лазні цяжка распавесці, бо яна такая багатая, такім вялікім коштам адбудаваная і пышна аздобленая.

Сарокі, чыюкі і шпакі як пачнуць шчабятаць, дык прыносяць асалоду людзям, а салавейкі, канарэйкі і розныя вучоныя птушкі, якіх пад флейту вучаць спяваць! Божа мой, тут чалавек думае: гэта зямны рай.

Была я і ў двары малодшае султанавае сястры, якую завуць султаніха Асма. Яна замужам за Мунсул-улу-пашою і ў мяне лячылася. Яна таксама мае палац ля мора ў Стамбуле непадалёку Арнаўт Кёю[23], вельмі пышны, багата абстаўлены, чатырыста белагаловых на паслугах, таксама арабаў-кастратаў сорак і колькі карлікаў, і шмат бастандзыяў, чухадараў за брамаю для іх паслуг. А сама гэтая султаніха Асма, султанавая сястра, незвычайнае прыгажосці і вялікае дабрыні, не маючы ў сабе ні ганарыстасці, ні пыхі, зямным анёлам з'яўляецца, ніколі не адмовіць тым, хто просіць, каб за іх заступілася перад султанам. Убогім штодзень адну кесу грошай яна раздае, і штодзень пяцьсот авечак і дзесяць валоў, тысячу ок рысу, масла, мёду, цукру, курэй і іншага птаства — усё гэта на кухню ейную дае султан, і найбольшую частку яна ўбогім загадвае раздаваць і сама раздае. Сама ж ціха жыве як удава, бо мужа ейнага дома не было, а яна вельмі кахае яго. Ейнага мужа паслаў султан у адну правінцыю з вялікім войскам уціхамірыць мяцеж, і яна так мне мовіла: «Мая мілая пані лекарка, ты не можаш пацешыцца ў маім доме чым-небудзь, бо я напалову мёртвая ад смутку па каханым мужу, які быў да мяне ласкавы».

Пасля мяне ўзялі з ласкі Пана Бога ў вялікі гарэм султана Мустафы за прыдворную лекарку ў ягоны фраўцымер, і добра мне там жылося, без усялякіх «але».

Тым часам дайшлі весткі, што з Польшчы маецца сюды прыехаць пасол яснавяльможны Юзаф Падоскі[24], цяперашні ваявода плоцкі, чаму я моцна ўзрадавалася, бо ўбачу паноў і шляхту свайго краю. Але ж амарат мой каханы, што застаўся ў Польшчы, пакі-

нуўшы сваю службу, насуперак мне быў у Камянцы, ведаючы, што сын мой там у школах і маёмасць мая, з вялікаю цяжкасцю набытая, захоўваецца ў яе мосці пані Праўдзінскае дзеля дзяцей маіх. Я добра прадчувала тое, што гэты чалавек не мае сумлення, што ён сваімі фальшывымі словамі і здрадліваю ліслівасцю ашукае майго сына і забярэ мой дэпазіт, запісаны на яго, а шматлікія клятвы заўсёды дарэмныя, марныя, толькі на абразу Бога. Так і сталася, хоць я і папярэджвала: не братайся з ім, не вер яму, бо ён цябе ашукае, і распавяла пра шматлікія ягоныя ашуканствы. Напрыклад, як я жыла некалі ў Львове і захварэла без надзеі ачуняць. Я, бачачы, што няма нікога ў мяне са сваякоў, ні дарослых дзяцей, бо дачка мая была ў маладым веку ды і тая далёка ад мяне — у двары яснавяльможнае Патоцкае, кашталяніхі брацлаўскае, дык я баялася, каб усё тое, што маю, не расхапалі чужыя людзі пасля мае смерці. Дык, значыцца, мовіў мне мой кавалер, уздыхаючы і спачуваючы мне: «Не бойся, каханая пані, за сваіх дзяцей. Я іх не пакіну: дачку выдам замуж, а сыну дам належную адукацыю». Я, дурніца, паверыўшы гэтаму ідалу, будучы ледзь жывою, напісала такі тастамант сваёю рукою, што яго я прызначаю апекуном маіх дзяцей і даю распіску на дзвесце чырвоных злотых, маўляў, я яму вінная, а гэта таму, каб ён смела мог забраць сабе мой набытак, нібыта за свой доўг, і каб пасля, у свой час, маім дзецям аддаў. Але гэтую распіску я не дала яму ў рукі, а чакала паляпшэння здароўя. Тым часам з дапамогаю Пана Бога я ачуняла, а кавалер мой тую распіску ў мяне ўкраў, а пасля ў свой час меў намер дамагацца ад мяне перад людзьмі нібыта свайго доўгу. Чыніў сабе пашану і распавядаў перад людзьмі, што быццам бы я вінна яму. Але я смяялася з гэтага, бо кожны

ведаў, што ніколі гэты кавалер і двухсот злотых сваіх не меў.

А аднаго разу, калі я была ў Кіеве, прыехаў мой кавалер да мяне, а ў той час была ў мяне патрэба адправіць пасланца ў Камянец, ды ў Кіеве такі звычай, што без пашпарта нікога не выпускаюць і пашпарт не даюць, а хто хоча атрымаць, той дае супліку ў губернскую канцылярыю,і павінен быць там подпіс просьбіта, і гэтую супліку аддаюць генералу-аншэфу, губернатару кіеўскаму. Толькі тады генерал дае пашпарт, і з тым пашпартам можаш выехаць з Кіева куды хочаш. Я, і не думаючы пра ашуканства гэтага фальшывага кавалера, узяўшы аркуш чыстае паперы, распісалася як належыць і прасіла майго кавалера, каб з гэтым подпісам пайшоў у губернскую канцылярыю і на гэтым аркушы паперы, дзе маё прозвішча напісана, казаў пісару супліку генералу-аншэфу напісаць, просячы, каб даў мне для майго чалавека пашпарт на выезд з Кіева ў Камянец. Але гэты фальшывы і надзвычай апрыклы кавалер узяў той бланк, што я падпісала на супліку, і напісаў на мяне пазыковы абавязак на трыста чырвоных злотых, а сам, узяўшы іншую паперу, распісаўся за мяне і аддаў пісару. Пісар, думаючы, што гэта мой почырк, напісаў адпаведную супліку па-маскоўску, і па гэтай супліцы атрымаў кавалер мой пашпарт на выезд за мяжу, у Польшчу.

Пасля, калі ў хуткім часе забраў ён мой кроўны набытак, патаемна ўцёкшы, як я вышэй апісала, разам з Себасцьянам Завадскім, дык перад людзьмі распавёў, што я вінна яму, але разумныя людзі яму не верылі. І мне Пан Бог дапамог, бо па ардынансу яснавяльможнага гетмана вялікага кароннага Каятана Браніцкага, майго дабрадзея, і па ягонай усемагутнай пратэкцыі ўсё ж такі крыху адабрала ад яго.

Я ўжо пра яго апрыклыя ўчынкі шмат пісала. Аднак ён не спыніўся на тых даўніх махлярствах, але яшчэ распавядае людзям, якія непрыемнасці мне прынёс. Бачачы, што я ў Стамбуле, ён сына майго (якога я пакінула ў школах, там і набытак мой, а як аніводзін чалавек не ведае гадзіны сваёй смерці, дык дала ключы ад куфраў сыну) прыслаў з паслом, выдурыўшы ў яго ўсё, што меў, а менавіта: невялікія грошы на ягоныя вялебныя карты, срэбраныя лыжкі, срэбраныя вазы, кілімы, уборы ды іншае, што толькі захоўвалася, а сына майго, адгаварыўшы ад вучобы і дабрачыннае славы Божае, паслаў у Стамбул, «а яна табе дасць і забяспечыць адпаведна твае патрэбы, бо вельмі цябе любіць, а калі табе па-добраму не дасць, дык знайсці спосаб забраць патаемна і сюды да мяне прыедзь, будзе з табою нам добра жыць. Маці ўжо ў гадах, навошта ёй грошы?» А яшчэ даў яму аднаго злачынца, жлукту Себасцьяна Завадскага, таго, з якім раней у Кіеве мяне абакраў.

Было гэта ў 1760 годзе. Забраўшы сына майго са школ, апрануўшы яго слічна і палітычна, а на дарогу яму нічога не даўшы, адправіў яго з яснавяльможным Падоскім, ваяводаю плоцкім, паслом у той час у Турцыю. І вось сын мой разам з яснавяльможным паслом сюды да мяне ў Стамбул прыехаў, але мяне моцна засмуціў ягоны прыезд, бо без паведамлення і дазволу майго кавалер такое малое дзіцё забраў са школ і пабожнасці хрысціянскае і сюды ў гэты край прыслаў, дзе заўсёды пошасць. Пасля, паклаўшыся на ласку Божую, супакоілася і хацела, каб ужо ён тут са мною быў да таго часу, пакуль я там буду. Але я пра тое не ведала, што пан кавалер усе рэчы і грошы ў сына майго выдурыў. Сын, не прызнаючыся, іншае мне распавёў, што непадобнае было на праўду. Пасля была аўдыенцыя яснавяль-

можнага пасла ў візіра. Я, апрануўшы свайго сына, дазволіла яму, каб суправаджаў яснавяльможнага пасла, даўшы яму свайго чалавека, паляка, які ўмеў добра па-турэцку, дык ён у візірскіх пакоях распавёў, што «гэта пані маёй сын». Я ж у султанавым двары добра вядомая, кожны з маіх прыяцеляў вітаў яго, і вось гэтыя прыдворныя, выбраўшы, паводле іх звычаю, каптан, далі майму сыну, памятаючы заслугі і пашану маю ў найяснейшага султана.

Пасля я раіла свайму сыну: «Калі ты сюды прыехаў, знайду я для цябе двух настаўнікаў, аднаго француза, а другога турка, вельмі вучонага эфендзі, які навучае французскіх дзяцей у палацы французскага пасла». Сын мой згадзіўся адразу, і прыходзіў вучыць той турэцкі настаўнік, і хутка, праз тры месяцы, пачаў сын чытаць і пісаць па-турэцку, адным словам, настаўнік турэцкі мовіў, што іншыя маладыя людзі за тры гады таго не разумеюць, што ён за тры месяцы вывучыў, чаму я шчыра радавалася, бо будзе пасля меў выгоды, дастатак і славу Божую, калі будзе ўмець чытаць і пісаць па-турэцку і па-французску, а што па-італьянску і па-грэчаску — лёгка пасля навучыцца, а затым з пратэкцыяю годных паноў меў бы месца гатовае ў яснавяльможнага гетмана ў справах усходніх. Дык абяцала яму даць колькі соцень чырвоных злотых на ягоныя патрэбы, але ўсё гэта інакш сталася.

Я не спадзявалася на стол яснавяльможнага пасла, у сябе дома мала затрымлівалася, бо мела шмат пацыентаў — і на тры дні ў аднаго забавіцца магла, таму наняла стол у францішканаў за пэўны, мне належны доўг,— трыццаць чырвоных злотых, і яны, узяўшы на свой стол майго сына, усялякія яму далі выгоды і пакой, і меў ён заўсёды пабожную кампанію дзеля гутаркі, адно што не хацеў вучыцца з намаў-

лення асобных прыдворных яснавяльможнага пасла, каб мяне не слухаў і не заставаўся, толькі каб, будучы ў почце яснавяльможнага пасла, назад з ім у Польшчу вярнуўся. А прыданы маім кавалерам апякун, які да гэтага сына намаўляў, быў Себасцьян Завадскі, нягоднік і жлукта. Я ў той час ад тых мук, толькі Богу ахвяраваўшы мае пакуты, даверылася яму, просячы, каб аблегчыў мой крыж.

Я, жывучы ў Стамбуле, у Эюпе, часта бывала ў Галаце[25] і ў Пежы, дзе дзеля набажэнства ёсць сем рымска-каталіцкіх касцёлаў, і вось там пазнаёмілася з асобнымі людзьмі, напрыклад, я бывала ў нямецкага пасла, у пасла ці рэзідэнта маскоўскага, у яго мосці пана Гіпша, радцу ў той час яго каралеўскае мосці, пана нашага міласцівага, у пасольскіх тлумачоў, купцоў, дзе вельмі часта бывала на абедах і тымі яснавяльможнымі пасламі была нашаму яснавяльможнаму паслу рэкамендавана, бо сваякам ягоным мела гонар служыць некалі ў Польшчы, дык яснавяльможны пасол з ласкі сваёй панскае вельмі ласкавы быў да мяне.

Але адзін мой уласны хлопец, паляк, Дамінік Гарбулінскі, які толькі сноўдаўся ля мяне, разам са мною прыехаў у Стамбул, ён прыстаў да пэўнага прыдворнага яснавяльможнага пасла і выказаў прэтэнзіі, каб я яму за тры гады заплаціла за паслугі, і той прыдворны заступіўся за яго перад яснавяльможным паслом, каб ад яго імя загадалі мне, абы я не чыніла Дамініку крыўды; так і сталася. Аднак я тлумачыла, што ён не служыў у мяне, што не маю за што плаціць, але той ягоны пан прыдворны, не заставшы мяне дома, залаты гадзіннік узяў і некаторыя іншыя рэчы. Я, на гэта мала зважаючы, бо ведала, што мае не лепшыя, загадала таго хлопца схапіць і добра пабіць. Тут яснавяльможны пасол, абражаны тым, што чала-

веку, які быў пад ягонаю пратэкцыяй, учынена крыўда, вельмі дамагаўся, каб я заплаціла Дамініку за кожны год па трыста злотых (я ж, трэба ведаць, раней жыла ў Эюпе, пасля прасіў мяне яснавяльможны пасол, каб не выдаткоўвала дарэмна на жытло дзеля сябе, і дазволіў мне спыніцца ў вольных ягоных пакоях, дадзеных султанскім дваром ягонаму двару). Дык цяпер, не жадаючы падпарадкоўвацца волі яснавяльможнага пасла, выехала з ягонага палаца і пасялілася ў Галаце ў адзін дом, за які плаціла ў месяц сорак тынфаў. Пасля хадзіла сама да яснавяльможнага пасла і праз заступніцтва дамагалася, каб аддалі мне рэчы, але не магла дабіцца ніякае справядлівасці: моцна ўсе прыдворныя таму хлопцу спрыялі, бо ён, ведаючы турэцкую мову і звычаі, быў натхняльнікам размаітых іхніх нізкіх спраў. Дык я прасіла асобных прыбліжаных яснавяльможнага пасла, каб загадаў мае рэчы аддаць, бо я хоць і бязродная шляхцянка, але буду свайго дамагацца.

Узяўшы Пана Бога на дапамогу, пайшла я ў султанскі палац і выказала свой смутак і крыўду кізляраагу[26], гэта значыць старэйшаму еўнуху ў двары ці султанскім фраўцымеры (якую ён мае ўладу і што можа ўчыніць, гэта толькі той ведае, хто быў у Стамбуле і ведае звычаі султанавага двара; ён — другі візір). І гэты кізляр-ага паслаў свайго бастандзыя да ваяводы, ці губернатара, Галаты, каб ён загадаў таго хлопца неадкладна злавіць і належна па пятах біць, а пасля на галеру аддаць, што адважыўся, гультай, дарэмна прэтэнзіі выказваць і што за яго такая спрэчка ўзнялася і мне абраза, якіх не павінна мець прыдворная фраўцымера султана Мустафы.

І вось злавілі таго Дамініка і далі яму па пятах, як быку. Ужо яму не дапамаглі махлярскія тлумачэнні. Тым часам прыбеглі асобныя маладыя з атачэння

яснавяльможнага пасла дапамагаць гэтаму Дамініку. Хацелі мяне запалохаць, але нічога не дабіліся.

Ах, шкада, што не тыя ягамосці былі, што мяне абакралі, бо ўжо былі падрыхтаваныя фалагі[27] па пятах біць. Пасля кінулі таго хлопца Дамініка ў астрог, а я пайшла на Дыван да візіра і дала супліку візіру, просячы, каб мне вярнулі мае рэчы. Там, на Дыване, быў яго мосць пан Дзюляні[28], тлумач Рэчы Паспалітае, дык ён прасіў мяне, каб я спыніла гэтую справу, і абяцаў, што мне ўсё будзе дахаты адаслана.

Пасля мяне паклікаў да сябе чаўш-паша (ён другі пасля візіра), каб я спакойна ішла дамоў, абяцаючы, што мне ўсё адашлюць дахаты.

Назаўтра сам вяльможны яго мосць Дзюляні, тлумач Кароны Польскае, да дому майго прыехаў, а за ім янычары, якія былі ясакчыямі, ці вартаю яснавяльможнага пасла; яны прынеслі ўсе мае рэчы; таксама і сам турэцкі палкоўнік прыехаў, які быў у яснавяльможнага пасла, ён і вяльможны яго мосць Гіпш прасілі, каб я ўжо большага не дамагалася, хоць у маю адсутнасць адна залатая бранзалетка за пяцьдзесят леваў і тынфаў адзінаццаць згінула.

Дамініка, таго шалапута, выпусцілі з астрога, і ён зноў пайшоў да людзей пана пасла, дык тыя пабожныя пасольскія людзі, што былі з ім у адной кампаніі, сцягнулі з таго Дамініка апошні жупан і шапку, што меў на сабе, і выгналі яго, але я пра гэта не ведала.

Гэтая спрэчка была пры самым ад'ездзе яснавяльможнага пасла, але сын мой, Станіслаў дэ Пільштын[29], падбухтораны не раз быў супраць мяне, раз з намаўлення майго кавалера з Польшчы, другі раз — Завадскага і прыдворнае кампаніі. І сам яснавяль-



Стамбул.
Брама ля ўваходу ў сераль.

можны пасол намаўляў супраць мяне. Бачу я, што гэта не жарты, што сын пакідае мяне, і такая мяне злосць і маркота агарнула, што ні тое каб плакала, але калі пайшла да султанскага палаца і як прыйшла ў пакоі фраўцымеру, дык не магла ад вялікае тугі і слова вымавіць ад плачу. Пытаюцца, чаму плачу і смуткую. Адказала, што сын мой ад мяне ад'язджае, нават не развітаўшыся. Супакоілі мяне тыя паненкі, абяцалі мне, што выпрасяць у яго мосці султана, каб майго сына не пусцілі са Стамбула, і каб ён у мяне заставаўся.

І дала мне ў той час другая жонка імператара, анёльскай пекнасці, маладая, сціплая, стройная, дзве хусцінкі, вельмі багата золатам гафтаваныя, і кажа: «Дай гэта ад мяне сыну твайму, магчыма, тады ён і не паедзе ад цябе». І вось тыя паненкі і карузлікі пабеглі ў пакой самога султана і распавялі, што «наша пані лекарка моцна плача», і прычыну плачу. Дык адразу паслаў султан да бастандзы-пашы аднаго прыдворнага, і я разам з тым прыдворным пайшла да таго бастандзы-пашы, а ён — вялікі пан, як канцлер каронны, добра мяне прыняўшы, супакоіў мяне тым, што абяцаў паслаць свайго маршалка ад імя султана да яснавяльможнага пасла і вярнуць сына майго. Так і сталася. Паехаў конна той маршалак яснавяльможнага яго мосці пана бастандзы-пашы першпаперш да вяльможнага яго мосці пана Гіпша, просячы, каб угаварыў яснавяльможнага пасла, каб той не браў з сабою ў Польшчу майго сына, пасля паехаў да вяльможнага яго мосці пана Дзюляні і таксама да самога яснавяльможнага пасла, і вось прыйшоў мой сын і ў прысутнасці яснавяльможнага пасла і маршалка бастандзы-пашы, які ад імя султана прасіў пана пасла, каб дзіця ад маці не адлучаў, бо ніхто чужы не можа так шчыра спрыяць, як родная маці, а асабліва, што яна можа з ласкі Пана Бога чужым дапамагаць, а табе трэба чужой ласкі чакаць — так мовіў маршалак майму сыну. Але, як кара Пана Бога, так ён адказаў: «Не хачу я заставацца ў Стамбуле са сваёю маці, я лепш паеду з яснавяльможным паслом у Польшчу». Дык гэты маршалак вярнуўся да майго жытла з гэтай няўцешнаю навіною. Смутак і сорам мяне агарнуў, усё б Пану Богу ахвяравала за грахі мае і за ўсе душы ў чысцілішчы. Мусіла я адну тую хустку, што мне дала другая жонка султанава, падараваць маршалку, бо інакш трэба было яму даць за

клопат, прынамсі, дзесяць чырвоных злотых, а другую хустку мусіла аддаць чарбаджы[30], турку, бо і ён шчыра ўгаворваў майго сына, каб са мною застаўся. І вось паехаў сын мой разам з яснавяльможным паслом, не развітаўшыся са мною, маркотнаю маці сваёй, а якія больш мне непрыемнасці чыніў, таго не хачу распавядаць, бо ўсё гэта з намоў легкадумных людзей.

Цяпер падаю я гэты збор маіх авантур на людскую ўвагу. Хто яго чытаць будзе, няхай зверне ўвагу, колькі разоў была я ў небяспецы, і колькі разоў Фартуна мяне ўзбагачала і даводзіла да галечы. Няхай падумае, ці мела я што добрае ад мужоў і ад агіднага кавалера, ад дзяцей і лёкаяў. І ці варта мне ў Польшчу вяртацца ў гэтым 1760 годзе, маючы з ласкі Божае сорак два гады? Хіба што, каб у мяне зноў апошняе, крый Божа, адабралі.

Але ўсё ж я думала, што сын мой апомніцца і з дарогі вернецца да мяне альбо з тым міністрам капідзі-пашою, вялікім панам, што суправаджаў яснавяльможнага пасла са Стамбула аж да Хоціна, да польскае мяжы. І з вялікім смуткам чакала вяртання таго турка, думаючы, што і сын з ім з Хоціна вернецца. Як толькі даведалася, што прыехаў назад той капідзі-паша, дык хуценька пайшла да ягонага палаца, мяркуючы, што сына майго застану, але ён нават і ліста мне не напісаў. *De novo* мяне вялікі смутак агарнуў ад гэтае весткі, і вырашыла я сабе ўжо ніколі не быць у Польшчы, дык на тым тыдні шмат раздала на славу Божую з набытку майго ўбогім хрысціянам, нават і туркам, турчанкам і турэцкім дзецям, новыя сукні справіўшы, у гонар Бога раздала. І вырашыла паехаць морам у Егіпет, каб адпачыць і паглядзець све-

ту, бо мне лягчэй жыць у чужым і далёкім краі, чым быць падкрыўджанаю, вярнуўшыся з Егіпта, мела намер з дапамогаю Пана Бога быць у Ерусаліме.

І ўжо пераканала сябе, што больш не пабачуся са сваімі дзецьмі і буду сабе асобна жыць. Хто ведае, можа, будуць хацець, каб ім у сне хоць прыснілася, а цяпер не захацеў мой сын застацца са мною ў Стамбуле і адукацыю добрую атрымаць.

Мовілі мне няраз Рэіс-эфендзі і сёстры султана, што «мы ў брата нашага султана Мустафы альбо ў візіра выстараемся рэкамендацыйны ліст да яснаяўльможнага гетмана, каб ён пра сына твайго помніў», але ён, не хацеўшы таго, сам па сваёй волі паехаў. Пасля дайшлі да мяне весткі, што і рэшту майго набытку ў Камянцы забраў мой сын з парады майго кавалера, які толькі таму ў Камянцы сядзеў, каб ашукаць, каб што выдурыць у яго. Аднаго сына праз бесчалавечнасць і недагляд пазбавіў жыцця, другога — набытку, бо што толькі пакінула ў дэпазіт, тое ўсё ў свае ўсеўладныя рукі з дапамогаю махлярства, як магнітам, прыцягнуў, сына майго намовіўшы, каб у двары яснавяльможнага пасла заставаўся і не вяртаўся да школ.

Я ж, застаўшыся ў Стамбуле пад аховаю Божаю і ў кампаніі годных людзей, хрысціян, меўшы дастатак усялякі з султанавага двара і разнаітыя заробкі ад годных пацыентаў, жыла ў тым доме, які была наняла, калі пераехала з палаца, дадзенага султанавым дварам яснавяльможнаму паслу, але не ведала прычыны, чаму яго ніхто не наймаў, а людзі баяліся, што ён вельмі стары і спарахнелы, недалёка і да няшчасця якога. Я ж, наняўшы яго, мала зважала на расколіны сцен, бо яны былі размаляваны, і нічога яшчэ невядома было. Хоць я служыла ў султанавым двары, аднак

ніколі не магла пайсці ў палац фраўцымеру, пакуль мяне не запросяць, а як прыйшла, дык першыя дзверы адчыняе адзін араб-еўнух і кажа: «Тэсцір? Маеш дазвол?» Так і ля другіх дзвярэй, і трэціх і інш., усе так пыталіся.

Аднаго дня, не спадзеючыся, што мяне паклічуць у палац, паехала я сабе да маіх пацыентаў у Стамбуле, туды, дзе мне трэба было. Тым часам у маю адсутнасць пяць разоў прыслалі па мяне чухадара, гэта значыць лёкая, каб неадкладна ехала ў султанскі палац. Ужо ноч прыйшла, а я толькі дахаты вярнулася, і хатнія мае распавялі мне, што адзін лёкай з султанскага палаца пяць разоў па мяне прыязджаў і гневаўся, што мяне не застаў, але так мовіў: хоць і ў поўнач, але каб морам у чаўне прыехала. Я, узяўшы Пана Бога на дапамогу, баючыся ноччу небяспекі, не выканала загад, а з парады Духа Святога, так сабе думала: як я ўначы морам паплыву, нават калі мяне ўдзень праз дзверы прапускаюць, дык пакуль тых шамбелянаў дачакаешся, можна ад суму памерці. Дык я, павячэраўшы, пайшла спаць. Рана-ранютка пасля набажэнства выйшла са свайго дому, замкнула яго; узяла з сабою маю дзяўчыну, якую звалі Фата Дзімітра, і лёкая, і пайшлі мы да скелі[31], а там засталі човен з чатырма людзьмі, якія мяне чакалі, і паехалі мы ў султанскі палац. Там я растлумачыла, чаму мяне ўчора не было; паказалі мне новую пацыентку і адразу далі мне на лекі сто чырвоных злотых. Дык я вярталася да свае хаты. Калі падыходзіла, людзі і суседзі мяне віншавалі, што добры Бог засцярог мяне ад нечаканае смерці, «бо ўвесь твой дом да падмурка рухнуў, як толькі ты выйшла».


Я, прайшоўшы колькі крокаў, убачыла, што гэта праўда, аднак мне вельмі маркотна было, бо ўвесь мой набытак пад руінамі, а менавіта: куфры, срэбра,

волава, медзь і іншыя хатнія рэчы, што мне Пан Бог з ласкі свае даў, але мне людзі так мовілі: «Не хвалюйся, і найдрабнейшая рэч тут не згіне». І паклікалі людзей, што руіны разбіраюць, яны завуцца хамалі, так і сталася, што нічога маё не загінула з ласкі Пана Бога Найвышэйшага, толькі адна срэбраная чарка, і то яе ўкраў мой уласны лёкай з Польшчы.

Мела я малога дзесяцігадовага хлопца, сляпога. Нічога ён не бачыў і лячыўся ў мяне ў той час, калі мой дом рухнуў. Дык вось Пан Бог пакінуў бяспечнае месца, дзе хлопец сядзеў, без усялякіх калецтваў, бо, уласна, ён на тым месцы сядзеў, дзе слуп стаяў. Дык яго мне Пан Езус збярог без усялякае шкоды. А вось як мой фраўцымер даведаўся (дзе я служыла) пра абвал дома і пра зберажэнне Богам майго жыцця, то разам са мною Богу дзякавалі.

Аднаго часу запрасіў мяне адзін турэцкі пан, якога звалі Гадзы Суліман-ага Селіхор-улу, каб вылечыла яму вочы, бо ён нічога не бачыў, але ён жыў не ў Стамбуле, а ў мястэчку Гайрабове. Да гэтага мястэчка трэба морам было плыць два дні. Узялася я вылечыць яго і задатак узяла, дык загадала свайму чалавеку наняць мне як мага лепшы і навейшы карабель, каб ехаць лячыць таго пацыента. Але ён, недасведчаны, такі наняў, які трапіўся, і рэчы мае загадаў на карабель занесці. Пасля прыйшла я сама, і мы паплылі, і толькі потым убачыла, які гэта небяспечны і невыгодны карабель, нават вада працякала з бартоў, як праз рэшата, толькі смалою залітае. Я думала, што мы за два дні даплывём, аднак неспрыяльную фартуну мелі, бо ў вялікім страху адзінаццаць дзён па моры плавалі і ледзь да горада Тэкердагі, што на беразе мора знаходзіцца, даплылі, і я адразу пакінула гэты карабель. Там мела я добрых прыяцеляў, венграў, якія засталіся пасля венгерскага караля, нябожчыка

Ракацы. Назаўтра той наш карабель загрузілі пшаніцаю і ячменем і той самы рэіз, гэта значыць шкіпер, з трыццаццю людзьмі назад паплыў у Стамбул. Толькі як ад берага адчалілі, адразу карабель на кавалкі разламаўся і ўсе людзі на ім патанулі, толькі адзін хлопец-грэк Пантэлемон выплыў і пасля ў мяне служыў. Так мяне Бог у Святое Тройцы Адзіны збярог ад неспадзяванае смерці. За гэта няхай Яму будзе слава на вякі.





Раздзел пяты

Калі я Богу на славу, а добрым людзям на пацеху чытання распавядала пра асобныя рэчы, якія бачыла альбо пэўнае пра іх чула, дык хачу апісаць тут і пра рэлігію турэцкую так, як ёсць папраўдзе (а не так, як я ў некаторых кнігах у Польшчы чытала), як з Карана мне чыталі.

Калі маці Магамета, турэцкага прарока, малога на руках насіла (так яны мовяць), дык яго анёл выхапіў з ейных рук і занёс на высокую гару, распароў яму чэрава, выняў з яго вантробы і вымыў іх, каб хрысціянскае крыві не засталося, і зноў у яго запхнуў гэтыя вантробы і зашыў зялёнымі ніткамі, і таму іміры[1]-туркі зялёныя шалікі носяць.


Калі ён вырас і, маючы восем жонак, жаніўся з дзявятаю, якая вельмі пекная была, а на тым вяселлі шмат людзей было, яны весяліліся і не хацелі дамоў ісці спаць, а пазіралі на гэтую новую пекную жонку Магамета-прарока. Дык Магамет пачаў маліцца, каб Пан Бог даў, абы з гэтага часу нельга было туркам глядзець на чужых жонак, дык хутка прыйшоў анёл і сказаў Магамету на вуха: «Вазьмі хустку і закрый твар свае жонкі». Так Магамет і зрабіў — за-

крыў твар свае жонкі. Прысутныя на тым вяселлі пыталіся, навошта закрыў твар свае жонкі. Адказаў: «Так зрабіць толькі што Пан Бог загадаў мне праз анёла, і вы з гэтага часу таксама павінны закрываць твары сваіх жонак, каб адзін твар жонкі другога не бачыў». І з таго часу турэцкія кабеты закрываюць твар перад чужымі мужчынамі.

Праз колькі год, калі ён, як звычайна, ляжаў у ложку з той улюбёнаю сваёй жонкаю, прыйшоў да яго анёл Габрыэль і забраў на сёмае неба; там ён паставіў Магамета перад дзвярыма ў Пана Бога; прарок Магамет пачаў стукаць у дзверы. Спытаўся Пан Бог: «А хто гэта стукае?» Адказаў Габрыэль: «Магамет гэта, лёкай твой улюбёны». Калі ён стаў перад Панам Богам, дык пытаўся ў яго Пан Бог: «Чаго хочаш, лёкай мой верны?» Адказаў: «Я хачу *ўхмэту мэму*, гэта значыць, каб чалавек маёй веры штодзень з чыстым сэрцам і чыстым целам сто разоў маліўся сапраўднаму Богу». Адказаў Пан Бог: «*Асун*, няхай так і будзе, як просіш». Спусціўся Магамет з сёмага неба на шостае і ўбачыў там Пана Езуса; яны ветліва прывіталіся. Ён бачыць, што Пан Езус робіць каптаны, якія завуцца гуле (гэтыя каптаны Пан Бог раздае сваім святым), і так запытаўся Пан Езус: «А што там, каханы Магамеце, у Пана Бога выпрасіў?» Адказаў: «Маім туркам выпрасіў, каб штодзень па сто разоў маліліся». Адказаў Пан Езус: «Гэтага быць не можа, каб сын Адама сто разоў на дзень маліўся. Калі я сярод людзей быў, дык сваім хрысціянам такога цяжару не задаваў такім маленнем, а яны і таго не вытрымалі. Ідзі зноў да Пана Бога і прасі зменшыць набажэнства». І вось прарок Магамет зноў пайшоў да Пана Бога і прасіў зменшыць набажэнства. І на гэта Пан Бог згадзіўся, і Магамет зноў вярнуўся да Пана Езуса. Адным словам, у тую ноч быў ён тысячу і адзін

раз у Пана Бога і тысячу і адзін раз у Пана Езуса (гэты раздзел Карана завецца па-турэцку *Bin bir Kie-lam*), Пан Езус усё яму раіў, што столькі набажэнства — шмат, і вось спыніліся на тым, што Магамету Пан Бог дазволіў, каб штодзень туркі па пяць разоў маліліся з чыстым сумленнем, чынілі ўсеагульную споведзь, гэта значыць, каб кляліся ніколі не грашыць. Турак кажа перад малітваю тры разы «*tube Estafurta*», і мые сабе рукі, твар і ногі, і становіцца на малітву на чыстым месцы, на кіліме, і каб у час гэтае малітвы ягоны непрыяцель прыйшоў і яму галаву ссек, не павінен ён ні з месца скрануцца, ні слова прамовіць. Тыя малітвы так называюцца: раніцаю *Саб намазы*, другая малітва ў поўдзень — *Уйле*, трэцяя малітва ў час вячэрні — *Кінды*, чацвёртая малітва вечарам, як у нас на пацеры звоняць — *Ахшам*, пятая малітва, ужо ў дзве гадзіны ночы — *Яцы*. Гэтыя малітвы ў іх абавязковыя, бо нават сам султан аніколі пазбегнуць іх не можа, ні цяжарныя белагаловыя, адным словам, кожны, хто толькі магаметанінам завецца, так моліцца без сумненняў. Хіба хто хворы, без сіл і без памяці, той не можа маліцца, але ачуняўшы, дык той доўг набажэнства мусіць аддаць, бо напісана ў іхнім Каране: хто не маліўся як належыць на кіліме на гэтым свеце, той мусіць маліцца на тым свеце на распаленай жалезнай блясе.

Пасля тае аўдыенцыі з Панам Богам загадаў Пан Бог анёлу Габрыэлю ўзяць Магамета-прарока і зноў у дом ягоны, у ложак, дзе забраў, туды і аднесці. Але надышоў дзень, і ўжо анёл Габрыэль не мог яго пры святле несці, дык апусціў з неба ў іншы край, за чатырыста міль ад ягонае жонкі і ад ягонага дому, а яшчэ раней даў яму Пан Бог Каран, з якім Магамет хадзіў па горадзе і людзям распавядаў: «Я, Магамет, мінулае начы быў на сёмым небе і размаўляў тысячу



Мячэць султана Ахмеда ў Стамбуле.
Тагачасная гравюра.

і адзін раз з Панам Богам, таксама столькі ж разоў і з Панам Езусам Хрыстусам на шостым небе, і даў мне Пан Бог тае начы кнігу Каран, і загадаў мне ўвесь люд навучаць».

Людзі з таго горада збегліся слухаць яго, але

Магамет не ведаў мовы, на якой у гэтым краі размаўлялі, дык адзін аднаго не разумелі, пра што казалі. Тым часам прыехалі купцы з вярблюдамі, яны мелі дзевяноста дзевяць вярблюдаў, а аднаго цалкам чырвонага. Гэтыя купцы паслухалі тую гутарку і знайшлі тлумача, што ведаў Магаметаву мову.

А вось калі анёл Габрыэль стаў перад Панам Богам, дык Пан Бог пытаўся ў анёла пра Магамета. Ён адказаў: «Апусціў яго з неба ў іншы край, за чатырыста міль ад ягонага дому». Пан Бог на анёла прыкрыкнуў: «А ці смееў ты, анёле Габрыэлю, такую непрыемнасць учыніць майму прыяцелю? Узяў яго з дому ягонага, а пакінуў у чужым краі? Я табе загадваю: спяшайся да яго і бяры яго на свае плечы і занясі ў дом ягоны, да жонкі і дзяцей. Паспяшаўся анёл Габрыэль да Магамета, узяў яго на свае плечы ў прысутнасці ўсіх людзей і тых купцоў, што мелі дзевяноста дзевяць вярблюдаў, а аднаго цалкам чырвонага. І вось паляцеў анёл з Магаметам дахаты, але і тыя купцы з чырвоным вярблюдам таксама прыехалі ў той горад, дзе жыў прарок Магамет.

І вось імгненна з'явіўся Магамет у сваім доме, але Магаметава жонка вельмі была разгневаная на свайго мужа і шмат прыкрых слоў яму мовіла: «Пракокам лічышся, а па начах цягаешся па блудніцах?!» Адказаў Магамет: «Белагаловая, не грашы, не быў я нідзе, крый Божа, што ты думаеш, наадварот, гэтае начы быў я ў самога Пана Бога і даў мне Пан Бог наказ, гэтую кніжку Каран, і апусціў мяне анёл у чужы край, дзе я іх мовы не ведаў, і распавёў ім тыя навіны праз тлумача». Жонка, аднак, гэтаму не паверыла. Тады Магамет мовіў: «Калі мне не верыш, дык праз дзевяноста дзён[2] выйдзі з горада ў поле; прыйдуць такія купцы, што маюць дзевяноста дзевяць вярблюдаў, а аднаго цалкам чырвонага, і яны табе распавядуць,

што бачылі мяне ў чужым краі за чатырыста міль адсюль, калі я вучыў сваёй веры і меў у руках Каран, і бачылі, як я на анёльскіх плячах ляцеў». Гэтаму Магаметава жонка паверыла і чакала тых купцоў, якія павінны былі прыехаць праз дзевяноста дзевяць дзён з чырвоным вярблюдам, а тым часам гэту гісторыю распавяла яна суседкам і сваякам. Пасля адзін аднаму — і цэлы горад і ўся правінцыя гэтаю весткаю напоўнілася, усе чакалі тыя дзевяноста дзевяць дзён і выйшлі за горад. Так і сталася: прыехалі тыя купцы з чырвоным вярблюдам і пыталіся пра Магамета, што з неба Каран прынёс, пацвярджаючы, «бо мы бачылі, як ён на анёльскіх плячах дадому паляцеў. Пакажыце яго нам, і мы яму дары дамо, і няхай нас вучыць Карану». З гэтай гісторыі і сведчання і ўзнікла турэцкая рэлігія.

Туркі посцяць штогод трыццаць дзён, цэлы дзень нічога не ядуць, не п'юць, нават яшчэ і тытуню не кураць, аж пакуль зорак на небе не ўбачыць. Як толькі зоркі ўбачаць, тады ядуць і п'юць, а хто хоча, дык можа і апоўначы ўстаць і есці. Маюць звычай, што ў час тых дзён шмат міласціны раздаюць і гасцей запрашаюць на вячэру, найчасцей убогіх. Напрыклад, найвялікшы паша можа з наймізэрнейшым жабраком за адным сталом сесці. Гэты пост завецца рамазан, і сам султан так посціцца, як і бязродны шляхціц. Посцяцца і дзеці, хоць і султанавыя, з сямі гадоў, а калі слабыя, дык з дзевяці, посцяцца і старыя людзі, калі ж хто хворы альбо падарожны і не можа ад слабасці пасціцца, дык у вольны і спакойны час трэба абавязкова адпасціцца.

Ёсць у туркаў тры дні святаў, што завуцца Курбан Байрам[3]. У час іх рэжуць авечак Пану Богу ў ахвяру,

кожны выкупляе сябе і грахі свае. Багаты чалавек дае дзесяць авечак альбо сто, адным словам, колькі хто можа. Гэтае мяса і шкуры раздаюць убогім, але мяса могуць і самі есці. Яны кажуць, што перад раем ёсць вялікая рэчка, а праз тую рэчку ляжыць мост, ён такі вузкі, як волас, а востры, як лязо. Калі каму Пан Бог дазволіць у рай ісці, мусіць ён праз мост ісці, а звычайным спосабам тут не пройдзеш. Дык у гэты час з'явяцца тыя ахвяраваныя авечкі, і чалавек сядае на авечку, а калі за жыццё шмат авечак ахвяраваў, дык усе на дапамогу прыйдуць і гэтага чалавека, што ідзе ў рай, пазбавяць жахаў гэтае ракі і вострага моста, перанясуць, і будзе ён у раі.

Турак ажаніцца не можа, пакуль не будзе мець у хаце пасцелі, кухоннага посуду, місак, меднага стала, свечак і іншых дробных рэчаў, якія неабходныя ў гаспадарцы. Калі мае маці, альбо цётку, ці сястру, альбо сваячку, пасылае іх, каб яму паненку ці ўдаву высваталі, і якая спадабаецца тым белагаловым, ёю і мусіць задаволіцца кавалер. І вось іх вяселле пачынаецца. Усё тое, што мае кавалер, мусіць ён у сваім доме выставіць, павесіць, каб кожны бачыў, што мае свае, а не пазычаныя рэчы. І ў паненкі таксама праз восем дзён ейныя рэчы рассцілаюць, развешваюць. Праз восем дзён (калі ў багатых, дык на конях альбо на мулах) колькі дзесяткаў коней тым дабром наладоўваюць і вязуць да пана маладога з вялікім натоўпам людзей і колькі калясак з белагаловымі, сярод якіх і панна маладая. І вось як толькі да двара прыедуць, пан малады прыходзіць да каляскі, бярэ сваю маладую панну на рукі, нясе яе ў пакоі, хоць і на трэці паверх, і садзіць яе на *ad instar* трон, для яе прыгатаваны, а ў гэты час усе белагаловыя з адкрытымі

тварамі сядзяць і стаяць, бо там лічыцца, што пан малады ў гэты час і ў думках не грэшыць, бо ягонае сэрца прывязана да панны маладое, а хутка пан малады ўцякае з грамады белагаловых, а ў час кінды ідзе пан малады са шматлікімі людзьмі ў джамію, гэта значыць у касцёл, і моліцца. Кінды — гэта вячэрняя малітва. Пасля ідуць яны дамоў у той пакой, дзе панна маладая, і пачынае імам, гэта значыць плябан з усім людам пытацца, называючы імя панны: «А ці ёсць яна тут?» Паненка нічога не адказвае, а іншая белагаловая прамаўляе за яе: «Ёсць». «А ці клянешся ты гэтаму (напрыклад, Фейзуле) вераю, каханнем і сумленнем?» Адказвае: «Клянуся аж да таго часу, пакуль воля Пана Бога будзе». І гэтымі словамі клятва завяршаецца. Адчыніўшы дзверы, заходзіць пан малады да панны маладое, а тая белагаловая, што была пры ёй, атрымаўшы які падарунак, адходзіць, і яны застаюцца адны, і пан малады падымае чырвоную кітайку[4], якою панна маладая з галавы да ног была ўкрытая (гэтая кітайка называецца дуак), і ўпершыню яе бачыць і цалуе, а панна маладая ўзаемна ў руку яго пацалуе, накладзе ў люльку тытуню і падасць свайму мужу; гэтым яна пакажа сваю паслухмянасць. Пасля загадае пан малады сваім нявольнікам і нявольніцам падысці і ягонай жонцы руку цалаваць, а пасля есці даваць. Падмацаваўшыся, стол прыбіраюць і ў залатых кадзідлах кураць у пакоі *lignum aloes.* Затым, укленчыўшы, моляцца два разы: на Ахшам і на Яцы. Пасля ідуць спаць, а назаўтра ў лазню.

Ваяваць туркам, паводле Карана, забаронена, самі вайны прагнуць не павінны, хіба што калі ім хто аб'явіць вайну. Калі ідзе на вайну, палову свайго багацця павінен з сабою ўзяць, а гэта таму, калі загіне, каб

той, хто ў яго грошы знойдзе, за іх яго пахаваў, а калі яго ў няволю возьмуць, дык яго шанаваць будуць, бо так шмат грошай забралі; а калі ў яго грошы не знойдуць, дык у свой час ён за свае грошы з няволі выкупіцца, а калі б яму выпала на вайне каго забіваць, той толькі закрычыць «*EiwaĨlaha*», адразу ж павінен турак шаблю сваю ў похвы схаваць, а калі здарыцца яму каго ў няволю ўзяць, павінен даць таму есці і піць, вопратку і пасцель, адным словам, каб таму нічога не бракавала, а праз сем гадоў павінен яго з няволі выпусціць. Яны нікога да веры сваёй не прымушаюць, толькі ці то нявольнікам, ці то суседзям-хрысціянам павінен турак тры разы сказаць: «Стань магаметанінам». А гэта таму, кажуць, што на тым свеце будуць у хрысціян пытаць: «Чаму вы туркамі не сталі?» Калі адкажуць далёкія хрысціяне, што «мы пра гэтую веру не чулі і не ведалі», дык тых хрысціян Пан Бог не будзе караць, але тых, што жывуць сярод туркаў, а туркі іх намаўлялі, а хрысціяне гэтага не слухалі, то ўжо турак не вінен перад Богам, а хрысціян караць будзе. Я бачыла сама, што нявольнікі, якіх з няволі выпусцілі, і пашамі, і агамі станавіліся.

У Турцыі нявольніка ці нявольніцу прадаць нельга (як і любога чалавека) пад пагрозай пакарання, хіба што сапраўднага нявольніка, шабляю ўзятага. Напрыклад, маскаль б'ецца з туркамі і трапляе ў палон — ён сапраўдны нявольнік, але адразу, дзе яго ўзялі ў палон, трэба ад кадыя ўзяць паперу, і на ёй павінен падпісацца муффі і паша. Гэтая папера называецца пендзык. Такога ўжо нявольніка кожны купіць смела можа.

Вайна Турцыі з Мальтаю такая: калі трапіць турак у няволю мальтыйскую, дык ужо яго мальтыйцы не выпусцяць да смерці. Калі ж мальтыец трапіць у турэцкую няволю, яго таксама туркі з няволі не выпус-

цяць, нават за найвялікшыя грошы, але гэтыя мальтыйцы, што трапілі ў палон, нявольнікі самога турэцкага султана. Яны завуцца пайзаны. Пасля, калі султану патрэбны людзі на ваенныя караблі, іх зноў на вайну пасылаюць на тых самых мальтыйцаў. Аднаго разу ў 1753 годзе сабралася тых мальтыйцаў-пайзанаў так шмат, што яны захапілі гвалтам свой карабель з капітанам-пашою, і на Мальту яго адвялі, і самі сябе вызвалілі, а капітан-пашу, свайго пана, у палон узялі, і там сядзеў ён у мальтыйцаў у няволі сем гадоў. Пасля што мальтыйцы самі хацелі, тое ім турэцкі султан мусіў даць за выкуп свайго капітана-пашы, і так яго мальтыйцы вызвалілі. Калі ён вярнуўся з мальтыйскага палону, дык лячыўся ў мяне ў Стамбуле: ён мае пекны палац у Эюпе.

Другі раз такая ж самая авантура здарылася ў 1760 годзе. Аднае пятніцы плыў карабель на мальтыйцаў каля аднаго турэцкага горада, і пачуў капітан-паша, што ў джаміі ўйле, гэта значыць, як у нас на святую імшу звоняць, дык той капітан-паша загадаў падысці да горада і, кінуўшы якар, сам з усёю сваёю світаю пайшоў у джамію на набажэнства. Тут пайзаны ўзбунтаваліся і туркаў, а было іх на караблі некалькі тысяч, перабілі, усіх левантаў, галандзыяў[5] і рэшту туркаў звязалі, якар, адрэзаўшы, пакінулі ў моры, а самі, падняўшы ветразі, на Мальту ўцяклі.

Калі хто да турэцкай веры далучаецца, пытаюцца ў яго: «Чаму хочаш стаць магаметанінам?» Адказвае адшчапенец: «Таму, што хачу добрым чалавекам быць і атрымаць збаўленне», і вось паўтарае ён наступныя словы тры разы: *«Batal Dynymde Czyktin Islam Dynymde gieldim»*, гэта значыць: «Адракаюся ад старое веры і да сапраўднага Новага Запавету далучаюся». І кажа: *«Ja Alah hil Akmenresul»*[6]. З гэтымі словамі становіцца сапраўдным туркам. Праз колькі дзён яму робяць аб-

разанне і вучаць Намазу, гэта значыць набажэнству і звычаям, і складваюцца яму, каб і ён нешта меў, адным словам, яны маюць звычай дапамагаць.

Хаўтуры турэцкія. Калі памёр той, хто раней быў хрысціянінам, а пасля стаў туркам, дык яго кладуць голага на катафалк і б'юць дубцамі паўсюль: па плячах, па чэраве і інш. і так мовяць: «*Christian Dzany Czyktin Bisulmanym Dzany lielsin*, гэта значыць: «Няхай хрысціянская душа выйдзе, а турэцкі дух няхай прыйдзе».

Звычай у туркаў у час яды. Хоць бы найвялікшы пан найвялікшы спраўляе банкет, але як найхутчэй ядуць, бо кажуць, што анёлы ля стала людзям служаць, і таму, каб анёлам не абрыднуць, каб яны доўга не стаялі над грэшным чалавекам, таму хутка ядуць, і стол прыбіраюць. Ніхто з туркаў не павінен перш есці і піць, пакуль не дасць жывёле, напрыклад, каню, курам і іншым свойскім жывёлам. Гэта з тае прычына, што так напісана: «Кожны дух хваліць Пана Бога», а калі і яны хваляць, а розуму не маюць, а нам Пан Бог і на іх долю дае, таму не павінны мы, разумныя істоты, адбіраць частку, што Пан Бог сваім стварэнням дае, і, вядома, павінны мы сумленна жыць.

Турэцкае пісьмо найцяжэйшае на свеце, бо кожную літару трэба дваццаць пяць разоў па-іншаму пісаць. Кожны добры пісар павінен дваццаціпяцізначнае пісьмо ведаць, бо хто ведае адназначнае, хто двухзначнае, але найлепшае — фарсі дывані[7]. Таму турэцкія дзеці толькі чытанню і пісанню сем гадоў мусяць вучыцца.

Туркі вераць, што ўсеагульнага суда няма, таму, хто прызначаны ў пекла, туды пойдзе, хто у рай — у рай пойдзе, але гэта будзе пасля Страшнага Суда. Але да таго часу, лежачы ў магіле, ён бачыць, бо мае акенца (калі ў пекла альбо ў чысцец прызначаны),

падрыхтаваныя яму пакуты, і таму смуткуе і ў магіле мае пекла, гледзячы на яго.

А калі хто прызначаны ў рай, дык ужо мае ў магіле рай, гледзячы на шчасце, якое яму падрыхтавана ў раі. Аднак яны шчыра моляцца, і посцяцца, і міласціну даюць, свечкі ставяць у джаміях за душы памёрлых і сцвярджаюць, што ўсё гэта выратуе іх.

Сходкі турэцкія такія. Найчасцей сходзяцца на кухуін, туды, дзе каву гатуюць, дзе спяваюць, на бандурах граюць, размовамі бавяцца. Бяруць, напрыклад, ока масла, ока мёду, мукі колькі трэба і гатуюць у катле, а як астыне, то ўсе ядуць, і гэта цеста завецца халва, і так яны па чарзе робяць: сёння адзін, заўтра другі, і гэта — іхнія прыстойныя гульні.

Туркі, калі якую гаворку вядуць пра Найяснейшую Панну, дык калі сядзяць, падымаюцца і кажуць, што яна паннаю была перад родамі, у час родаў і пасля родаў, і тым даводзяць з Карана свайго, што хрысціяне на Вялікдзень яйкі фарбуюць. Я ведаю, што не павінна так вульгарна пісаць, але каб давесці непарушную цнатлівасць Панны Марыі, я хачу распавесці і тое, як яны гэта даводзяць, як гонар і цнатлівасць яе падтрымліваюць.

Калі Пан Езус нарадзіўся, а святы Язэп мовіў: «Я не муж ёй, не ведаю жонкі», тады габраі Найяснейшую Панну спаліць хацелі, дык анёл з'явіўся да габраяў у чалавечай постаці і мовіў: «Не спяшайцеся праліць кроў гэтае святое Панны, дам я вам раду, чым выпрабаваць, што яна і пасля родаў панна». І казаў ім узяць галубінае яйка і дакнуцца да яе чыстага цела. «А калі на яйку не будзе крыві, то яе паненства пры родах страчана, а калі кроў на яйку будзе, то яна цнатлівая панна і пасля родаў».

І вось гэтыя няверныя габраі выпрабавалі, і так сталася, што яйка было ў крыві. Так туркі даводзяць,

што панна цнатлівая, што анёл Габрыэль прынёс ад Пана Бога лілію і пакланіўся ёй, і вось зачала яна ад Духа Святога, і завецца Прачыстая Маці Мэйрэм Анна.

Пана Езуса яны лічаць найвялікшым прарокам і мяркуюць, што Яго габраі не замучылі: ці ж мог бы Пан Бог дапусціць і даць такога добрага, такога нявіннага чалавека брыдкім габраям замучыць? Так смешна думаюць, што калі Пану Езусу было дваццаць пяць гадоў, дык яго габраі з гары скінуць хацелі і закідаць камянямі, але Пан Езус прайшоў між імі, а габраі яго не заўважылі і нічога кепскага яму не ўчынілі, у той час, мовяць туркі, забраў Пан Бог Пана Езуса з душою і целам на шостае неба, і там ён да таго часу будзе, пакуль перад Страшным Судом у пятніцу апоўдні не сыдзе з неба. І на тым месцы, дзе Пана Езуса закідаць камянямі хацелі, ёсць вельмі пекная джамія, і на тую гару ў джамію Ён прыйдзе і моцным голасам абвесціць Страшны Суд Пана Бога, і таму туркі ў пятніцу шэсць разоў моляцца. Гэта набажэнства завецца Нізан, і ля тае джаміі, дзе Пан Езус сыдзе з неба, заўсёды ў пэўны час вельмі добрага і ўбранага каня ставяць для паслуг Пана Езуса, каб ён на каня садзіўся і нёс па свеце Евенгелле.

Кажуць, што з таго часу, як Пан Езус на неба ўзышоў на дваццаць пятым годзе жыцця, Юда стаў тварам падобны да Пана Езуса, а габраі, думаючы, што Езуса мучаць, свайго каханага Юду замучылі і раскрыжавалі. Але гэты сакрэт Пан Бог ад Прачыстае Маці затаіў (так мяркуюць туркі), а гэта ўсё дзеля яе большае павагі, бо Прачыстая Маці сама думала, што сына яе габраі замучылі, дык была поўная смутку і тугі. Хіба толькі на Страшным Судзе Божым аб'явіць Пан Бог гэты сакрэт Прачыстай Маці і пацешыць яе, калі пакажа Пана Езуса.

На Страшным Судзе, кажуць, кожная вера будзе мець свайго патрона. Габраі — Майсея, але Майсей адрачэцца тады ад габраяў і скажа перад Богам: «Я ім даў дзесяць тваіх святых прыказанняў, але яны іх не трымаліся. Я ім таго Талмуда не даваў, тых адгаворак, таго запавету». А што Майсей загадаў, каб не кралі, а яны кралі, каб да Пана Бога дарма не звярталіся, а яны па дробязях звярталіся, таму Майсей ад іх адрокся і не хоча за іх заступацца. За туркаў стане Магамет, а за хрысціян — шматлікія патроны і патронкі, але ўсімі Пан Бог будзе пагарджаць і кожнаму назаве ягоны грэх, бо, як кажуць, што неба і зямля і тыя не без віны ў Пана Бога. Тым часам пачне Марыя, Маці Хрыстова, прасіць за хрысціян і ўгневанага Пана Бога ўпросіць і ўмоліць, што Пан Бог так ёй казаць будзе: «О, мая слічная Марыя, о, мая пекная Марыя, прасі мяне не толькі за хрысціян, але прасі мяне за ўвесь люд зямны. Ты адна без граху, ты адна ніколі мяне не засмуціла, ты адна ніколі Закон мой не парушыла». І вось Марыя прасіць будзе за ўсіх, мовячы: «Ойча мой, не судзі стварэнні твае[8], хто такі чалавек[9], каб ты з ім судзіўся. Даруй віну народу твайму за пакуты мае з пачатку жыцця майго ад тых габраяў і за пакуты сына майго, якога нявіннага на смерць асудзілі і замучылі». У гэты час Пан Бог з радасцю на твары скажа: «О, Марыя, каханая дачка мая, каб мяне гэтыя людзі і болей засмучалі і каб зноў *de novo* свет стварыў, не шкада мне было нічога дзеля цябе, і дарую ўсяму люду зямному правіну і пакаранне». І вось загадвае Пан Бог паказаць Пана Езуса Найяснейшай Панне, пякнейшага за месяц, за зоркі, за сонца, за ўсіх сыноў чалавечых і так кажа: «Езусе, прывітай цяпер Маці сваю вясёлую». А пасля кажа: «Марыя, а спытай сына твайго, ці мучылі яго калі габраі». І так кажа Пан Езус: «О мілая Маці

мая, ніколі я не пакутаваў, толькі дзеля славы твае большае Пан Бог схаваў ад цябе, каб ты думала, што мяне габраі замучылі, а ты цярпліва гэта ад Бога перанесла, таму стала годнаю быць, Маці, апякункаю і заступніцаю ўсяго народа зямнога».

Пасля выводзяць на ланцугах засмучанага Юду, здрадніка, у ранах, у плявоцінах, змучанага, і пытаецца яго Пан Бог: «Юда, а хто ж цябе так змучыў?» Адказвае: «Габраі. Я хацеў здрадзіць Езусу і выдаць яго габраям, але ж замест Езуса яны мяне замучылі». Дык вось такі дэкрэт Божы будзе: «Хто толькі верыў, што Пан Бог ёсць, што Ён можа адправіць кепскіх у пекла, а добрых у рай, што Ён справядлівы, той заступніцтвам Панны Марыі пойдзе ў рай. А той, хто цалкам не верыў, што Пан Бог ёсць, і жыў без веры і надзеі, той мусіць пайсці ў пекла, разам з Юдам, здрайцаю, габраем».

Туркі кажуць: на Страшным Судзе Божым усе стаяць будуць, а Магамет вярхом на кані ў надзвычай вялікім плашчы будзе, і будуць туркі пад ягоным плашчом хавацца. Усе святыя і надта ўлюбёныя прыяцелі Божыя будуць збоку стаяць, толькі Пан Езус і Марыя, Маці Ягоная, і Магамет-прарок будуць разам з Богам.

Туркі маюць прыказанне, што ім нельга віно і гарэлку піць і музыку слухаць, а пасля Страшнага Суда скажа Пан Бог анёлам: шмат я цярпеў ад народа чалавечага. Прыяцелі мае хочуць пацешыцца, і я з імі. І возьме ён келіх віна нябеснага, бо туркі кажуць, што чатыры рэчкі віна з раю выцякаюць, і будзе піць за Марыю, дачку сваю ўлюбёную, а Марыя кожнаму, хто на свеце не піў, дасць выпіць гэтага віна і дазволіць піць з тых чатырох рэк, а анёлы свае мелодыі заспяваюць і зайграюць. Тады туркі і ўсе людзі скакаць будуць, а з імі і анёлы. А яшчэ туркі мовяць, што Магамет будзе прасіць у Пана Бога Марыю, каб

дазволіў яму ўзяць, бо яму было прызначана мець на свеце дзесяць жонак, а ён толькі дзевяць жонак меў. І на тым вяселлі вялікая радасць будзе.

Кожны добры турак возьме ў раі семдзесят жонак анёльскіх. Як яшчэ Магамет на гэтым свеце жыў і туркам абяцаў, што ім Пан Бог па семдзесят жонак дасць, анёльскіх паненак, дык яму туркі не верылі, толькі казалі: няхай мы пабачым тых анёльскіх паненак. Дык Магамет сваёю малітваю ўпрасіў Пана Бога, каб адну паненку з раю на зямлю прыслаў паглядзець туркам. Як толькі гэтая паненка з раю на зямлю заявілася і колькі дзесяткаў тысяч туркаў пабачылі яе, дык кожны хацеў яе сабе ўзяць, і стаў вялікі гвалт між імі. Дык прасіў Магамет Пана Бога, каб гэтую паненку анёльскую зноў узяў з зямлі ў рай. І вось пайшла яна ў рай пасля малітвы Магаметавай, а тыя паненкі завуцца Гуру Кізлар.

Хоць кожны турак будзе мець у раі семдзесят Гуру Кізлар, аднак жонка ягоная першая ці то панна, ці то ўдава старэйшаю над імі будзе, і тыя Гуру Кізлар служыць ёй будуць, і гэтая ўласная жонка Панам Богам адорана будзе прыгажосцю больш за Гуру Кізлар. І кожны турак на тым свеце будзе з тымі паненкамі і са сваёй жонкаю так жыць, як тут на свеце людзі з жонкамі жывуць, і калі хто памёр і меў у той час дзвесце год, дык уваскрэсне і будзе мець толькі трыццаць тры гады і будзе без барады, толькі будзе мець зялёныя вусы.

Туркі мовяць, што коні, валы і авечкі ўваскрэснуць і будуць мець залатыя валасы ці шэрсць на сабе. Я спрачалася, што гэтага быць не можа, але мовіў мне адзін вялікі эфендзі: «Чаму гэтаму не верыш? Калі Эліаш у рай параю коней паехаў, дык гэта нябесныя коні былі». Ён даў і другое сведчанне, што ёсць авечкі ў раі: калі Абрам святы хацеў сына свайго Ісака

(а туркі мовяць: Смаіла) у ахвяру прынесці, дык яму Пан Бог з неба прыслаў барана, які заблытаўся рагамі ў гушчары, яго Абрам і прынёс у ахвяру.

Туркі едуць на адпушчэнне грахоў у Мекку, а па-турэцку — у Кіхабэ. Там няма нічога іншага, толькі адна крыніца, куды святы Абрам выгнаў Агару са Смаілам[10], які ў пустыні плакаў засмаглы, і Пан Бог вочы Агары адкрыў і паказаў крыніцу. Тая крыніца і да сённяшняга дня ёсць, але малая, а ўсіх туркаў, што туды едуць штогод, без ліку, толькі там жыве — восемдзесят тысяч. А тыя, што назад вяртаюцца, бяруць з сабою ў дзежачцы дадому тае вады, і туркі лічаць гэта за адпушчэнне грахоў, і п'юць гэту ваду перад скананнем. І гэтая вада завецца Тэм зэмса. Там у Кіхабэ ёсць магіла, па-турэцку — турбэ, Магамета. Там няма магніта, хоць і кажуць, што труна вісіць у паветры, а ён у зямлі пахаваны і зялёным сукном пакрыты, і ўся джамія выслана зялёным сукном, і шмат свечак і ахвяраванняў туды прыносяць. Тыя туркі, што туды едуць, завуцца хаджы.

Дарога, што вядзе да Кіхабэ, вельмі далёкая, небяспечная і галодная, бо ўсё па пясках. Ні травы, ні вады, ні дрэва не ўбачыш ужо за Егіптам. Ёсць там такая небяспечная пошасць, гэта значыць пакажацца на небе чорнае воблака, як талерка. З яго з дапамогаю вольнага ветру паволі ўтворыцца вялікае воблака, а ў ім — колькі дзесяткаў тысяч за волас танчэйшых гадаў. Гэтыя гады завуцца Шамеле[11]. Яны ляцяць разам з ветрам і працінаюць людзей, коней, нават скалы. Імгненна, як трапяць яны ў чалавека, той з вярблюда падае і паміраe, і там яго ў пясок заграбуць у той вялікай спякоце, але яны, гады тыя, у чалавеку не застаюцца. З часам робяцца з тых целаў муміі, якія

лекары выкарыстоўваюць дзеля сваіх патрэб, а найчасцей пры паддымку, крывахарканні і крывавым мочапусканні. Трэба ўзяць мумію, трансмарыну і чырвоны камень ад удару, па-лаціне: *lapis hematis i mastix*, узяць гэта, зрабіць парашок і даваць штодзень па тры разы, штораз чвэрць лота, ваду піць гатаваную з лакрыцаю і з аленевым рогам.

На той дарозе, якою туркі ў Кіхабэ едуць, шмат разбойнікаў-арабаў. Гэтыя арабы ўсе голыя ходзяць. Тыя ўжо культурнейшыя, калі кілімам закрываецца мужчына, а прасцінаю белагаловая. Дамоў яны не маюць (хіба якія найбагацейшыя), а пад намётамі сядзяць, усе агулам, у пясок закапаўшыся. Некаторыя, што наверсе жывуць, ніякай гародніны, ані хлеба не маюць, аднымі фінікамі жывяцца і ваду п'юць, а ніякіх хвароб не маюць, вельмі доўга жывуць, і па дзвесце гадоў, а такія здаровыя і лёгкія, што і на кані не ўцячэш ад іх; шлюбаў з жонкамі не бяруць, толькі як жывёла жывуць, хто дужэйшы, той лепшы. Дзяцей сваіх з вялікай ахвотаю прадаюць за рыс, за масла, за мёд і за іншыя прыдатныя да ежы рэчы. Сыноў сваіх малых разам па некалькі прадаюць туркам, і бацька сам адрэзвае ім іх мужчынскасць і закапвае ў пясок пад небам і сонцам; так на шчасце — хто жывы застанецца, дык добра, а каторы памрэ, там жа ў пяску і заграбе.

Гэтых арабскіх хлопцаў, кастратаў, забіраюць купцы-туркі ў Стамбул, прыгожа іх апранаюць, вучаць іх чытаць, пісаць, спяваць, на кані ездзіць, страляць — што мужчыне належыць, а пасля прадаюць іх у султанскі палац на паслугі фраўцымеру, і вельмі добра ім жывецца. Іншых прадаюць пашам і іншым вялікім панам, і ўсюды тым кастратам добра жывецца. Часам яны ўспамінаюць пра сваіх бацькоў, прывозяць іх у Стамбул з Арабіі і шмат дапамагаюць ім.

Ператвараюцца тыя прасцякі ў культурных і гжэчых людзей, я сама з імі размаўляла і ў дамах іхніх бывала. Гэтыя арабы жывуць ля тае дарогі, якою туркі ў Кіхабэ едуць, і заўсёды плаціць мусяць ім за праезд, але аднаго разу ў 1857 годзе здарылася так, што хаджы, едучы назад з Кіхабэ, праз кару прарока Магамета не хацелі арабам звычайных падаткаў даваць, а было іх разам каля васьмідзесяці тысяч, і кожны турак-хаджы меў адпаведную зброю, і быў паша між іх з некалькімі тысячамі войска. Але так смела напалі на іх арабы, аднекуль з-пад зямлі, нябачныя, як мурашы, і ўсе голыя, ледзь хто меў кілім альбо прасцірадла на сабе, толькі кій у руках, а найчасцей, нічога ў руках не маючы; сярод іх вельмі шмат было белагаловых — арабак. Заступілі дарогу арабы туркам-хаджам, колькі тысяч трупамі паклалі, а рэшту прымусілі да пакоры, у іх паадбіралі коней, грошы, сукні, зброю, нават і кашулі з плячэй, ледзь колькі дзесяткаў шчасліва ўцякло без шкоды, а гэтыя туркі-хаджы па сто міль голыя дарогаю ішлі. Ужо як у Ерусалім і Вавілон зайшлі, дык ім асобныя людзі адзенне далі. Сярод тых туркаў-хаджы былі і белагаловыя турэцкія, кадыні, бо і турчанкі на адпушчэнне грахоў ездзяць у Кіхабэ, і іх арабы распранулі і голых, як маці нарадзіла, пусцілі разам з туркамі-мужчынамі.

Прашу заўважыць, якая небяспека на той дарозе, што туркі едуць у Кіхабэ да Магамета на адпушчэнне грахоў, але яны і аднаго года прапусціць не могуць, толькі едуць хаджы, нічога іх не палохае, ні смерць, ні страх, ні такія вялікія клопаты. Дай Божа, каб мы, хрысціяне, так палымяна хацелі ў Ерусалім ехаць на адпушчэнне грахоў.

Тое, што кажуць, быццам труна Магаметава жалезная, а з чатырох бакоў стаяць магніты, што ўзні-

маюць жалеза, і таму труна вісіць у паветры, байка. Я смела заявіць магу, бо пыталася ў некалькіх соцень туркаў, і кожны з іх адно мовіць, што труна Магаметава ў зямлі ляжыць, як і кожнага чалавека. Такі цуд ёсць у Ерусаліме, што калі з неба каменне на зямлю падала, каб пакараць кепскіх людзей, дык з таго часу адзін камень у паветры застаўся, і гэты камень і да сёння вісіць у паветры, дзякуючы моцы Божай.

Пра сам жа Ерусалім, дасць Пан Бог, як сама там буду, дык з дапамогаю Пана Бога Найвышэйшага лепей напішу. А цяпер толькі тое распавяду, што ведаю дакладна; так атрымліваецца, што ўсе туркі, якія едуць у Кіхабэ на адпушчэнне грахоў, усе яны павінны быць і ў Ерусаліме на адпушчэнні грахоў.

Магіла пана Езуса такая цудоўная, што ў час Велікоднае ютрані вогненныя прамяні выскокваюць з яе. У прысутнасці праваслаўнага патрыярха, нашых айцоў бернардынаў, армянскага патрыярха, некалькі тысяч людзей хрысціян, яшчэ звечара ў перадвялікодную суботу Труну Панскую аглядае сам турэцкі паша, каб духавенства якога ашуканства не ўчыніла, каб люд хрысціянскі не ўводзілі ў зман. І вось, аглядзеўшы і пабачыўшы, што гэтая труна чыстая, нічога ў ёй няма, сам турэцкі паша загадвае прываліць яе магільным каменем і сваёю пячаткаю ў сямі месцах апячатвае і ў поўнач загадвае ўсе срэбраныя і залатыя кандэлябры патушыць, а іх некалькі дзесяткаў тысяч. Як тыя промні з Труны Пана Езуса выскачаць, дык маленькія агнёвыя струменьчыкі ідуць да свечак і ўсе свечкі самі запальваюцца. Праваслаўны патрыярх скрыжоўвае рукі з армянскім патрыярхам; яны трымаюць у руках па

пяць свечак і запальваюць іх ад таго святога промня, а ад гэтых свечак іншае духавенства запальвае свае свечкі, а пасля ўсе хрысціяне таксама запальваюць свае свечкі, не па адной, а па некалькі, бо гэтыя свечкі бяруць людзі дадому і пры сконе ў рукі даюць. Гэтыя запаленыя свечкі патрыярхі да барод сваіх прытуляюць і да сукняў, але той агонь лагодны, не гарачы і не шкодлівы. І іншыя людзі, што ад патрыярхаў свечкі запальвалі, таксама свечкі да сваіх твараў падносяць і ў запазуху кладуць, а ён іх не апякае. Але гэтая лагоднасць не доўга трывае, бо што далей, то стае ён гарачэйшы і на звычайны агонь падобны.

Потым неадкладна загадваюць хрысціянам адысці, і сам паша кажа адпячатаць Труну. Убачыўшы свае пячаткі цэлымі, а Труну чыстую, як і была,— сцвярджаюць, што той прамень моцаю Божаю нараджаецца. Шмат хворых, сляпых, кульгавых, нямых, апантаных альбо хто ў смутку, альбо ад Бога ласкі ці збаўлення хто прагне, заўсёды вымаляць сваё на гэтым святым адпушчэнні грахоў у Ерусаліме, спадзяваліся б толькі ўсім сэрцам на Бога.

Шмат хрысціянскіх народаў ёсць на свеце, і прадстаўнікоў усіх знойдзеш у Ерусаліме з дарагімі дарамі, толькі з нашае Польшчы ніхто не бывае, а з Францыі, Гішпаніі, Сіцыліі, Германіі, Італіі, Венгрыі, з Чэхіі, з Індыі, з Масковіі і іншых розных краёў пілігрымы ідуць у Ерусалім на адпушчэнне грахоў.

Чула я ад аднаго янычар-агі, турка, што там шэсць гадоў на пасадзе быў і жыў там з жонкаю сваёю і дзецьмі, і пры ім такая авантура здарылася. Адна арабка-зладзейка патаемна на акно залезла, думаючы што-небудзь украсці. І вось цудам Божым скінула яе на дол, і яна адразу памерла ў прысутнасці шматлікіх арабаў, дык арабы ўзбунтаваліся на гэты кас-

цёл, бо пан Езус белагаловую пакараў смерцю, і запатрабавалі ад духавенства дзесяць кес грошай: тая белагаловая мела сорак гадоў і штогод з пятнаццаці гадоў нараджала па двое дзяцей, а цяпер да пяцідзесяці гадоў магла б нарадзіць дваццацёра дзяцей, і за тых дзяцей, што меліся нарадзіцца, трэба даць дваццаць кес. Дык духавенства касцёл і кляштар зачынілі, бо колькі дзесяткаў тысяч арабаў збеглася. І вось янычар-ага, што ў той час жыў у Ерусаліме, як мне сам ён і ягоная жонка распавялі, памірыў з вялікай цяжкасцю тых арабаў і мусіў ім даць дваццаць кес грошай, толькі пасля гэтага адступілі тыя арабы.

Чытаў мне адзін каталіцкі ксёндз грэчаскую кнігу пра хрысціян, што завуцца якубіты. Гэта, напрыклад, як мы завёмся палякі, а іншыя — немцы, маскалі і інш., так яны завуцца якубіты. Маюць яны вельмі вялікую краіну, багатую, нікому не падпарадкаваную, моцную, ляжыць яна глыбока ў Індыі. Іх кароль ці князь завецца Ян Прэзбітар, і ён у іх за святара. Калі ж ён памрэ, дык выбіраюць другога і гэты павінен звацца Ян Прэзбітар. Ягоны двор, ці замак — невымоўнае прыгажосці і пышнасці, адным словам, срэбраная агароджа і краты вакол ягонага палаца, а пасярод — вельмі пекная царква. Гэтая царква на чатырнаццаць паверхаў, гэта значыць трынаццаць цэркваў адна на адной. У самай ніжняй царкве збройнага войска стане сорак тысяч, апрача людзей, якія моляцца. Ёсць такі звычай, што кожны месяц у іншай царкве святую імшу служыць той самы Ян Прэзбітар. Першая царква называецца царквою святога Пятра, другая — святога Андрэя, трэцяя — святога Якуба, чацвёртая — святога Яна. На кожнага апостала ёсць асобная царква, а трынаццатая царква завецца

рай. Яна прысвечаная Святой Тройцы. Якубіты маюць Евангелле і рытуал ад самога святога Пятра. Яны цалкам прытрымліваюцца габрайскае веры: абразанне, шабасы, і ўсіх дзесяці прыказанняў, і ўвесь закон Майсеяў, але не Талмуд, а Новы Запавет, святы крыж, споведзь, прычасце, і ўсіх сакрамантаў і царкоўных прыказанняў так моцна трымаюцца, што хто якое прыказанне парушыць, таго смерцю пакараюць. Шмат войнаў шчасліва вялі супраць індзіян-паганцаў. Люд вельмі прыгожы, станісты, святую ж імшу па-нашаму адпраўляюць. У гэтай краіне шмат кляштараў для абодвух полаў; гэты край бяспечны, таму ад якубітаў шмат людзей на адпушчэнне грахоў прыязджае і пешшу паломнічае ў Ерусалім.

Была свечка ў Ерусаліме над Труною Пана Езуса коштам сто тысяч кес, якую нейкі хрысціянскі кароль ахвяраваў, і вось нядаўна на Вялікдзень разгневаліся праваслаўныя, што іх ранейшую свечку, таксама вялікае вартасці, знялі і збоку павесілі, а тую, што ад каталіцкага караля, коштам сто тысяч кес, якая вісела над Труною Пана Езуса, разгневаныя праваслаўныя каменнем, кіямі, хто чым меў збівалі. Нават і дзеці, хто толькі быў у царкве на адпушчэнні грахоў, і вось скінуўшы яе, зноў сваю павесілі на тым месцы.

У Ерусалім прыязджаюць на адпушчэнне грахоў габашы[12], і па-турэцку яны таксама завуцца габашы. Іхні край такі вялікі, прасторны і людны, што турэцкі султан баіцца ім вайну аб'яўляць, а гэта край багаты, а народ вельмі мужны, ваяўнічы. Хіба што часам туркі, што побач жывуць (бо з Турцыяй мяжуюць), бяруць іх у палон, цішком уварваўшыся ў габашынскія межы. Тым жа спосабам і габашы бяруць туркаў у палон, я шмат бачыла мужчын і белагаловых габашоў у Стамбуле ў няволі ў турэцкіх

дамах, іншыя ўжо і туркамі сталі. Скура ў іх не белая, але і не чорная, а люд прываблівы тварам і вачыма. Я размаўляла з імі, пыталася, якой яны веры, называліся хрысціянамі. Тады я запытала: «Якія дні посціце?» — «Пятніцу і суботу», — кажуць. Калі я хацела дазнацца пра Святую Тройцу, адказвалі, што Святы Дух ад Бога Бацькі і Сына зыходзіць, дык зразумела, што яны каталікі, але калі спытала, ці падпарадкоўваюцца яны Рыму, Святому Айцу, дык адказаць не змаглі, бо былі гэта маладыя людзі шмат пра веру не ведалі. Выпала мне пра гэта размаўляць з адным біскупам армянскім, вельмі вучоным чалавекам, які пра тых габашоў вельмі добра ведаў, бо быў сапраўдным Адзэм. Адзы па-польску завуцца персіяне, але жывуць яны вельмі далёка ў Персіі, там, дзе іх імператар сталіцу мае, адтуль і гэты армянскі біскуп быў, і ён мовіў мне, што гэтыя габашы — прававерныя каталікі і падпарадкоўваюцца Рыму, і яны аніводнаму імператару, ні каралю не падлеглыя, я ж не ведаю, ці ёсць яны на мапах і як завецца іх кароль.

Бываюць у Ерусаліме і курды[13], а іх краіна называецца Курдзістан. Яны ўсе папісты, гэта значыць, што падпарадкоўваюцца Святому Айцу, бо яны прававерныя каталікі, але мешаныя з туркамі і тамтэйшыя туркі па-іншаму трымаюцца, як стамбульскія туркі, і бесперастанку ваююць з турэцкім султанам разам з каталікамі. Апавядаў мне адзін турак Абдулага, якому я вярнула зрок. Гэты Абдулага разам з дванаццацю іншымі ваеннымі янычарамі трапіў у палон да тых курдаў, і яны страшна іх мучылі, калі прывезлі дамоў; распрануўшы дагала, бічавалі, а пасля вяроўкаю ад галавы аж да ног да дрэва прывязалі так, як дзяцей спавіваюць, і нічога зусім есці не давалі, а па баках, дзе кішэні ў жупанах, на тым мес-

цы цела нажом прарэзваюць: гэтым бедным туркам-нявольнікам іхнія рукі ўпіхвалі ў гэтыя раны і казалі: «Вы, туркі, народ ганарысты, любіце хадзіць па рынках і рукі засоўваеце ў кішэні, дык і тут можаце фанабэрыцца, будучы прывязанымі да гэтых дрэў і ў кішэнях рукі трымаючы». І да таго часу іх звязаных трымаюць і голадам мораць, аж пакуль у пакутах не памруць, а пасля памерлых у рэчку кідаюць.

А гэты Абдулага з дапамогаю Божаю так выратаваўся. Жыло ў той вёсцы шмат хрысціян, мешаных з тымі ж курдамі, і вось адна паненка-каталічка штоноч да яго прыходзіла, па колькі кавалкаў хлеба яму ў рот клала і малаком паіла, ды так яго два тыдні падмацоўвала, а іншыя, адзінаццаць, ад пакут і голаду памерлі. А вось аднае начы яна прывяла каня пад сядлом, прынесла сукню, зброю і, адвязаўшы яго ад дрэва, так яму мовіла: чалавеча Божы, ведай, што я каталічка, Татаю мяне завуць, папісткаю, ці латынянкаю. Туркі некалі захапілі майго бацьку і брата ў палон, але іх не мучылі і праз тры гады вызвалілі. І яны здаровыя дадому прыехалі, а я цяпер замужам за адным чалавекам, католікам, але ён у часе безупынных войнаў трапіў у турэцкую няволю, але я маю вартыя даверу лісты, што ён жыве ў няволі ў добрага пана, і мы спадзяёмся, што хутка ён вольны стане і сюды да нас прыездзе, і таму я маю літасць да туркаў і хачу табе жыццё выратаваць, бо гэтаму вера мая мяне вучыць, каб кожнаму чалавеку дабро чыніла ад літасці Божае. І дала яму добрую мазь і пластыр, каб загаіць тыя кішэні, якія меў на целе. І вось гэты турак быў вызвалены паненкаю, і яна асяддала яму сама каня, і, дапамогшы яму на каня сесці, сама села на другога каня, апранутая па-мужчынску і ўзброеная, дала яму ежу: хлеба, вэнджанага мяса, сыра і інш. і сем чырвоных злотых, і адвезла на бяс-

печную дарогу, і назвала вёскі і гарады, якія ён мусіць праязджаць. І вось шчасліва даехаў той Абдулага да Вавілона, а з Вавілона да Стамбула. Але ад тых пакут у яго пачала балець галава, а пасля ён аслеп. А я яго з ласкі Пана Бога вылечыла. І чула я ад яго, што ўдзень і ўначы ён моліцца за тую паненку-курдзіянку.

Ёсць у Ерусаліме людзі, што прыязджаюць на адпушчэнне грахоў з Персіі, гюрдзы[14], прававернае каталіцкае веры, але цяпер яны зусім ні духавенства, ні царквы не маюць. Я не ведаю, чаму так сталася, але каб нашыя паслы хацелі, лёгка б ім дапамаглі, бо прыкра, што колькі дзесяткаў тысяч людзей без споведзі і без святых сакрамантаў памірае. А ім дазволілі праваслаўную веру прыняць, і нейкі капуцын ужо быў у Рыме, але мала чаго дабіўся, бо быў убогі. Я чула ад шматлікіх людзей, што той край і людзі ягоныя таму завуцца гюрдзы, што святы Юры, а па-грэчаску Георгі, каралеўскую дачку ад смерці вырataваў, цмока забіў і дзівосна цэлы край ахрысціў.

Чытаў мне адзін армянскі каталіцкі ксёндз з Ерусаліма ўсю гісторыю пра нараджэнне Пана Езуса. Больш падрабязная гісторыя, як падаецца ў нас, бо тая кніжка ў Ерусаліме яшчэ і арабскаю, і габрайскаю мовамі напісана, ненадрукаваная, але пабожныя людзі яе па-грэчаску і па-армянску перапісваюць і выдрукоўваюць у сваіх краінах. Тры вяшчуны, што бачылі тую зорку, адразу пасля зачацця заўважылі ў той зорцы Прасвятую Панну, якая трымала на руках Пана Езуса. І вось, як той цар убачыў на небе камету, дык адразу ж сабраў усіх сваіх настаўнікаў і пытаўся, што гэта можа значыць. Адказалі настаўнікі, што стагоддзі гэтую зорку бачылі, і тое спраў-

дзіцца мусіць, што Панна Сына народзіць, і гэты Сын стане на тым камені, што Адам даў шатану замест закладу ці распіскі. Бо ў гэтай самай гісторыі апавядаецца і пра жыццё Пана Езуса, і Панны Марыі, і ўсяго роду, з якога Прачыстая Маці паходзіць паводле прадказанняў Бога і прарокаў, што маецца нарадзіцца Пан Езус у доме Язэпа з дому Давіда.

Той заклад шатану быў дадзены, калі Адам з Еваю саграшылі, сарваўшы яблык, і былі выгнаныя з раю, і прыйшлі на свет, а была ноч, і цемра іх агарнула, яны баяліся цемры і плакалі, не ведаючы, дзе яны, а гэта ўжо на досвітку было. А шатан, ведаючы, што хутка будзе дзень, прыйшоў да Адама і кажа: «Што дасі мне, калі я табе дзень і святло зраблю?» Адам адказаў шатану: «Што я табе магу даць, як бачыш, нічога свайго ў мяне няма?» Шатан мовіць: «Тое мне дай, што з гэтага часу мець будзеш — нашчадкаў». Адам, не ведаючы нават, што такое нашчадкі: «Няхай мае нашчадкі тваімі будуць»,— адказаў. Шатан хацеў заклад, дык прыцягнуў камень, загадаўшы ўзяць яго ў рукі ці пакласці на яго рукі. «І гэта дай мне ў заклад». І вось узяў Адам камень у абедзве рукі і кляўся над гэтым каменем, што сваіх нашчадкаў ён аддае шатану, і тут абедзве рукі пакінулі свой след на камені. Узяўшы гэты камень, шатан кінуў яго ў рэчку Іярдан, а тым часам пачаўся дзень, і Адам думаў, што гэта шатан дзень учыніў.

Пасля ў свой час, калі святы Ян хрысціў Пана Езуса ў Іярдане, Пан Езус якраз стаў на тым камені, што Адам даў шатану ў заклад, і гэты камень пад нагамі Пана Езуса ў пыл рассыпаўся, так загінуў той заклад.

Калі Тры Вешчуны прыйшлі з дарамі да батлей-

кі, то перш-наперш аддаў дары святы Каспар Прасвятой Панне, і бачыў ён Пана Езуса ў абліччы немаўляці, а святы Мельхер бачыў маладога чалавека на руках Прасвятое Панны, а святы Балтазар бачыў Пана Езуса ў абліччы сталага чалавека на руках Прасвятое Панны, і так дзеялася тры дні, калі гэтыя Вешчуны Пана Езуса ў трох асобах бачылі: гэта азначае Святую Тройцу.

Ёсць у Арменіі такая царква, дзе захоўваецца частка альбо цэлая рука святога Георгія. Там Пан Бог такі цуд паказвае: бярэ армянскі патрыярх разам з усім духавенствам сорак кілімаў, кладзе адзін на другі і на самым версе, на саракавым кіліме, ставяць срэбраны рондаль, а ў ім — размаітыя зёлкі, кветкі і алей, ды над гэтым святым алеем дзён сорак малітоўныя спевы і набажэнствы адпраўляюць і рукою святога Георгія, армянскага патрыярха, жагнаюць той святы алей; і вось з моцы Пана Бога без агню ён кіпіць і гатуецца, і такі водар разносіцца, што прысутным людзям душы ажыўляе. Гэтым алеем дзяцей хрысцяць. Мовіў мне армянскі князь, які каталіком стаў, што сам гэты цуд бачыў і калі пальцам даткнуўся, бо не хацеў верыць, дык апарыўся; і шмат армян, якія туды на адпушчэнне грахоў едуць, усе гэты цуд бачаць.

У гэтай самай царкве пахаваны Тэрыдадэс і ягоная жонка, і шмат іншых святых. Там калі б, напрыклад, дзесяць тысяч людзей прыехала, любой нацыі, няхай, туркі, габраі і інш.,дык усім ім сытна есці і піць даюць. І хоць бы дзесяць гадоў жылі, ім рады будуць, а ім нічога больш не гатуюць, не пякуць хлеб, толькі тое, што трэба мніхам, а Пан Бог множыць тую ежу, і ўсе даволі маюць.

І такі цуд у царкве гэтай дзеецца, што толькі раз раніцою дроў у печ накладаюць, а цэлы дзень, аж да поўначы, хлеб пякуць і ежу вараць. Часам і ў печы не выграбаюць, і кухню не падмятаюць, а назаўтра ўсё чыстае знаходзяць. Калі ім вельмі хутка хлеб патрэбны, дык на чарэнь хлеб кладуць, і ён з моцы Пана Бога добра выпякаецца.

Ёсць у Персіі армянская царква, дзе захоўваюцца рэліквіі святога Яна Хрысціцеля і святога Кіркора, які, як серафім, лятаць умеў, бо калі яму ў жыцці люкдзі дакучалі, ён на вачах шматлікага натоўпу з гары на іншую гару пералятаў, і цяпер туды штодзённа вялікія натоўпы людзей на адпушчэнне грахоў едуць і ідуць, нават туркі і розных рэлігій людзі. І кожны, хто на тую магілу клаўся і Пана Бога пра што прасіў дзеля святога Кіркора, дык адразу ж, лёгка заснуўшы на гэтай магіле, у сне бачыць таго святога,які пытаецца: «Чаго хочаш?» І гэты чалавек у сне ўсё памятае, калі ёсць ласка Панская, каб ён атрымаў міласціну ад Бога, дык святы Кіркор абяцае яму ад Бога на той мове, якую хто ведае. Крануўшы пальцам, ён кажа чалавеку: «Устань і ідзі з мірам, я вымаліў табе тую ласку ў Пана Бога, але яе на дабро ўжывай». І як чалавек прачнецца, адразу на сваім целе знак убачыць, дзе яго святы крануў, і гэты знак аж да смерці не сыходзіць. Калі той чалавек, напрыклад, хацеў умець на разнастайных інструментах граць, дык цяпер людзям кажа: «Я ўжо ўмею граць». Прысутныя, не верачы гэтаму, падаюць яму разнастайныя інструменты, а ён так добра грае, нібыта вучыўся гэтаму майстэрству дзесяць гадоў. Якая мелодыя ў галаву прыйдзе, дык адразу добра і правільна яе на інструменце грае на здзіўленне ўсіх прысутных. Калі, напрыклад, хто хоча добры голас мець, то гэтую ласку атрымае тым самым спосабам, як і першы, і адразу добра спявае. І разма-

ітыя ласкі ад гэтага святога ўсе людзі атрымліваюць. Бясплодныя дзяцей нараджаюць, сляпым зрок вяртае і размаітыя хваробы лечыць, што ёсць на свеце,— усё робіць тым спосабам, толькі багацця і вялікае сілы не дае. Раней святы Кіркор і гэта даваў, але шмат людзей на зло ўжывала гэтую ласку Божую. Каго Пан Бог не хоча выслухаць і ён чалавек гэты, бачыць святога Кіркора ў сне, дык яму кажа святы Кіркор: «Устань і ідзі з мірам, не хоча Пан Бог табе даць, чаго просіш». І ўсім людзям у адной постаці з'яўляецца.

Чытаў мне адзін чалавек даўнія дзеі грэчаскае гісторыі і пра Стамбул, што калі хрысціянскі імператар фундаваў велічную царкву Айя-Сафія, такую вялікую, прасторную і дарагую, дык убачыў, што ў ягоным скарбе грошай не стала, і пачаў імператар хвалявацца, што няма чым закончыць гэтую пекную царкву, лічачы, што калі ён сам не закончыць, хто ведае, ці захочуць дзеці і нашчадкі ягоныя гэтую царкву дабудаваць, бо звычай гэтага свету такі, што дзецям ніколі не падабаецца бацькоўская фундацыя альбо рада. Тым часам, калі той імператар быў так заклапочаны, стаў перад ім вельмі станісты хлопец анёльскае прыгажосці і, пакланіўшыся імператару, сказаў: «Найяснейшы імператар, пан мой хоча вашай імператарскай мосці спрыяць і пазычыць столькі чырвоных злотых, колькі дзесяць вярблюдаў забярэ, і самі, ваша імператарская мосць, можаце наведаць майго пана, а я пакажу палац». Імператар, узрадаваўшыся гэтай добрай навіне, перамяніў свой убор, каб яго ніхто не пазнаў, узяў з сабою дзесяць адданых лёкаяў, і паехалі яны з імператарскага палаца за тым хлопцам да брамы, якая завецца Эдыку-

ле, і непадалёку ад яе заехалі да аднаго палаца, дзе імператара з ягонымі людзьмі вельмі ветліва прынялі і дзесяць вярблюдаў, чырвонымі злотымі нагружаныя, ля палаца стаялі. І вось сказаў гаспадар таго палаца: «Гэтыя грошы, што я вашай імператарскай мосці пазычаю, можаш, ваша імператарска мосць, на хвалу Бога затраціць». Дык яго мосць імператар падзякаваў за ласку і абяцаў заўсёды памятаць гэта; развітаўшыся з гаспадаром, у добрым настроі ён вярнуўся з лёкаямі і сваімі прыяцелямі ў свой палац і шчасліва закончыў тую велічную царкву Айя-Сафія.

Тут прыпамінае сабе імператар, як мог бы ён таго чалавека аддзячыць, што яму грошы пазычыў. І вось аднаго дня загадаў імператар добрага каня з сядлом, аздобленым жомчугам і дыяментамі, з такою самаю збруяю і гунькаю багатаю, і шмат іншых каштоўных рэчаў у падарунак узяць ды пайшоў сам з натоўпам люду і прыдворных, прагнучы ўшанаваць свайго прыяцеля, і былі з ім тыя прыдворныя даўнія, што разам золата бралі; паехалі проста да Эдыкуле да свайго прыяцеля з падарункамі, але так доўга і старанна шукалі той палац, ды ніяк знайсці не маглі нават падобнага да яго, і толькі цяпер зразумелі ласку Божую і святыя справы Ягоныя.


Гэтая царква, калі была дабудаваная, яшчэ на той дзень назвы не мела, дык раіўся імператар з духавенствам і добрымі прыяцелямі, пад якім тытулам свянціць яе. І ў той час, як сам імператар з усімі міністрамі быў у той царкве, адзін рамеснік забыў нейкі патрэбны інструмент на версе царквы. А тут прыехаў той хлопец, пан якога імператару грошы даў, і так сказаў таму рамесніку: «Не лезь на верх царквы па свой інструмент, бо ведаю добра, што ўпадзеш і памрэш. Заклінаю цябе гэтай царквы імем, якое яму

Прачыстая Маці дала, Айя-Сафія». Дык імператар вельмі ўзрадаваўся многім прыемным рэчам. Першае, што царкве ягонай імя дала сама Прачыстая Маці; другое, што лёкая свайго прыяцеля і дабрадзея ўбачыў і хацеў яго пекна прывітаць, па-сяброўску прыняць, запытацца пра ягонага пана, распавесці яму заўчорашняе жаданне пабачыцца і што іх палац яны старанна шукалі, узрадаваўся і мовіў: «Я хацеў са сваім дваром наведаць твайго пана». Але той хлопец адказаў: «Найяснейшы імператар, заўсёды мой пан будзе рады вашай імператарскай мосці, і палац ягоны лёгка знойдзеш, толькі яшчэ даволі часу да таго моманту, будзь пэўны, імператар». І вось у міг вока знік гэты гжэчны хлопец у прысутнасці ўсяго двара.

Перад царквою Айя-Сафія на цвінтары (што цяпер туркі ў джамію ператварылі) стаяць мураваныя слупы, надзвычай высокія, і я чула ад многіх хрысціян, якія шчыра сцвярджалі, што пад тымі слупамі павінны быць кашы з хлябамі, якімі Пан Езус, яшчэ жывучы на свеце, надзяляў народ.

Ерусалім — святое месца на зямлі, якое шануюць ва ўсім свеце, а найбольш — хрысціяне, што адусюль на адпушчэнне грахоў прыязджаюць. Тая краіна, што завецца Габешы, так далёка ад Індыі, што цэлы год мусяць морам плысці ў Ерусалім. Чула я ад надзейных людзей, якія былі ў Ерусаліме ў той год, як габешы прыехалі; яны бачылі на фэсце трох годных людзей, гутарылі з імі, і тыя мовілі, што выехала з дому восемдзесят чалавек, але ад небяспечнае дарогі і нязручнасцей семдзесят сем з іх памерлі і толькі трое прыехалі шчасліва; гэтыя трое ўжо не хочуць больш у свой край вяртацца, бо ўпадабалі сабе ў Ерусаліме

жыць, дзеля міласці Пана Бога і збавення душы свае, а таксама і пагарджаючы светам. Чаму ж туды на фэст французы, немцы, чэхі, маскалі і іншыя людзі прыязджаюць, на гэтае святое месца, толькі ніхто пахваліцца не можа, што паляка альбо польку бачыў?





Раздзел шосты

Апісанне дарогі ў Ерусалім; я, з ласкі Божае ведаючы пра гэтую дарогу, хачу праўдзіва апісаць лёгкасць падарожжа ў Ерусалім.

Напрыклад, прыехаўшы ў Хоцін на турэцкую мяжу, хто ўжо надта хоча засцерагчы сябе ад небяспекі, няхай пойдзе да пашы і, занёсшы яму які прэзэнцік, папросіць пашпарт і мензыль (гэта значыць паштовых), а паша заўсёды рады дапамагчы суседскім людзям; атрымаўшы гэта, з Хоціна за пяць дзён можа заехаць у Ясы. У Ясах, пайшоўшы да тутэйшага князя, які ў гэты час мае ўладу над малдаўскай зямлёю, таксама яго папросіць, каб даў пашпарт і паштовых у Бухарэст, і той князь лёгка гэта зробіць: дасць пашпарт і паштовых. А хто сабе хоча лепшую павагу і гонар мець, таму трэба ўзяць рэкамендацыйныя лісты ад яснавяльможнага гетмана вялікага кароннага, бо князь валошскі і князь мультанскі вельмі паважаюць польскіх паноў, і можна да іх пісаць рознымі мовамі, бо яны заўсёды маюць у дварах сваіх сакратароў, якія ведаюць лаціну, польскую, французскую ды іншыя мовы. З Ясаў у Бухарэст дарога добрая і бяспечная, вальны гасцінец. За дзён восем, не

спяшаючыся, заедзеш. З Бухарэста дзень ехаць у Гіяргева, турэцкі горад над Дунаем. Ажно да Гіяргева паштовыя служаць, а Гіяргева — сталіца фурманаў, і ёсць звычай, што за каляску з параю коней плацяць трыццаць леваў аж да самага Стамбула. Ехаць тут звычайна дзён пятнаццаць ці васемнаццаць па бяспечных і прыгожых мясцінах. Я гэтаю дарогаю з ласкі Пана Бога колькі разоў ехала яшчэ ў маладым веку, маючы трынаццаць гадоў, і заўсёды з ласкі Пана Бога добра мне было і маладых людзей пры сабе мела, ніколі нам аніводзін турак нічога кепскага, ні прыкрага не ўчыніў. Дык я кожнаму раю і ад сэрца жадаю, каб туркаў не баяліся і такіх адгаворак не мелі, што небяспечная дарога, бо гэта толькі байка. Я ў Польшчы бачыла і чула, што гайдамакі і іншыя кепскія людзі нападаюць і рабуюць, але каго Пан Бог хоча абараніць — і волас з ягонай галавы не ўпадзе.

Хто хоча морам плысці, дык яшчэ хутчэй і з меншымі выдаткамі заедзе, бо з Хоціна да горада Кіліі ля Чорнага мора толькі дзён восем дарогі, а там, сеўшы на купецкі карабель і заплаціўшы за аднаго чалавека толькі леў, у Стамбул заедзеш за тры дні. Калі хто мора баіцца, дык гэты дзіцячы страх смеху варты. Я, белагаловая, ужо колькі разоў на моры была, але са мною нічога з ласкі Найвышэйшага Бога не сталася, бо моцнаю хрысціянскаю вераю была ўзброеная, і мне нічога кепскага не стане без волі Божае. А бачыла я ў Польшчы, як два хлопцы ўтапіліся ў яме, дзе гліну капалі і пасля дажджу вады назбіралася, дык ад кары Божае хлопцы ў той лужыне патанулі ў Літве ў мястэчку Клецк.

Прыехаўшы ў Стамбул, тут шмат чаго можаш паглядзець. Весялосць, людзі розных нацый, паслы, ёсць і сем нашых каталіцкіх касцёлаў. Хто ж пошасці баіцца, дык гэта толькі непатрэбны страх і апрэхен-

зія[1]. Першае, што не заўсёды пошасць бывае, другое, што хоць і бывае, але не паўсюль. Я ў такіх зачумленых мясцінах была, хоць і ненаўмысна, а выпадкова, але ў мяне і палец з ласкі Пана Бога не забалеў. Бачыла я ў Стамбуле старых людзей, якім па сто дваццаць гадоў было, а не памерлі ад пошасці; а ад мноства дзяцей, як са школ турэцкіх выскачаць, дык ледзь па вуліцы праціснуцца можна. Пан Бог нікога без часу не звядзе, а прытым, хто хоча, можа сцерагчыся, не хадзіць у небяспечныя месцы.

Я чула ад вартага даверу турка: ён у сваім доме меў пошасць, і памерла колькі ягоных людзей, але жонка і дзеці здаровыя былі. Ён, баючыся за жонку і дзяцей, паехаў у сваю вёску, дзе ўсе былі здаровыя, але там такая пошасць пачалася, што ўся вёска вымерла, толькі два будынкі Пан Бог без заразы пакінуў. Дык гэты бедны турак, баючыся за сябе, жонку і дзяцей, вырашыў: «Паеду я сам вярхом да свайго дому і пагляджу, што там у горадзе дзеецца. Лепш няхай мая жонка з дзецьмі ў сваім доме жыве, чым у вёсцы ў небяспецы». Сеўшы вярхом на каня, паехаў у горад. Убачыўшы вельмі прыгожага, добра апранутага, узброенага, прыемнага з твару чалавека, які ішоў каля яго і побач з ім, запытаўся ў яго: «Браце, ты куды ідзеш?» Кажа: «У горад». Пытаецца: «Хто ты і чаго ідзеш?» Адказвае: «Я — чума, гэта значыць пошасць, я яшчэ маю што рабіць у горадзе» — і кажа гэтаму турку: «Не бойся, табе, жонцы і дзецям тваім нічога не будзе. Вы ў маім рэестры, які ты бачыш, што я ў руцэ трымаю». Ды так яму колькі разоў сцвярджаў, каб не баяўся і разам з ім у горад ехаў. І бачыў гэты турак, як насустрач яму колькі тысяч конных людзей прыехала, яны тую чуму на каня пасадзілі і ў горад паволі ўехалі. Турак жа той з вялікім страхам у свой дом прыехаў і цяжка захва-

рэў праз тры месяцы, але не на пошасць, а што моцна перапалохаўся, на сардэчны прыпадак. Той жа ноччу спаў адзін, турак, на двары, а другі, хрысціянін, на суседняй вуліцы, і яны бачылі тую чуму і вялікае мноства конных узброеных людзей, што ехалі праз горад. І гэтае самае начы колькі соцень людзей памерла, а тыя людзі, што на двары ляжалі і на тое цуда глядзелі, не памерлі, нават на той вуліцы, дзе войска праехала.

Дык, калі ласка, звярніце ўвагу, што без волі Пана Бога і волас з чалавека ўпасці не можа.

Са Стамбула ў Ерусалім на адпушчэнне грахоў звычайна едзе штогод колькі тысяч чалавек, усе на адным караблі. Кожны чалавек дае за сябе дваццаць пяць леваў і часам за колькі дзён заедзе, часам за тыдзень, два тыдні, а найчасцей за месяц даплыве са Стамбула да Яфы, а з Яфы да Ерусаліма — восем гадзін.

У Ерусаліме ўсё танна, усяго даволі, толькі ў самы Велікодны дзень, калі ідуць людзі на Велікодную ютрань у царкву, дык сядзіць турэцкі паша ў царкоўных дзвярах і бярэ з кожнага чалавека дзесяць чырвоных злотых.

Гэта я апісала дарогу бязродным шляхціцам і пілігрымам. А што да вялікіх паноў, дык ім можна і на калясках, запрэжаных шасцерыкамі, калі хочуць ехаць з выгодамі; гэта таксама бяспечна. Праўда, нашы палякі ў Рым ездзяць, каб атрымаць адпушчэнне грахоў, але лічу за лепшае галаве кланяцца, а не нагам альбо лёкаю.

У Ерусаліме не так, як у Рыме, што пілігрым толькі тры дні можа на хлебе святога Айца жыць, у Ерусаліме сядзі ў айцоў бернардынаў хоць цэлы год ці два

ў кляштары — ніхто табе і слова не скажа, і ты будзеш усялякую выгоду мець у ежы і пітве ды зручны пакой. І назад таксама можна лёгка вярнуцца ў Стамбул разам з людзьмі, што былі на фэсце.

Аднаго разу так сталася ў Ерусаліме, што пайшоў імам (гэта значыць капелан) у мячэць, каб паклікаць на паўдзённае набажэнства, як і ў нас звоняць на імшу. І вось толькі хацеў пачаць клікаць — убачыў расчыненае неба над Труною Пана Езуса (бо каля касцёла, па абодва бакі яго, стаяць дзве вялікія джаміі турэцкія, дзе туркі моляцца) і ў гэтым расчыненым небе ўбачыў Пана Езуса і ўсіх апосталаў ды вялікі натоўп святых і анёлаў. Дык застыў імам-турак, задумліва гледзячы ў неба, і не кліча людзей у мячэць, а туркі чакалі, калі ён пакліча, каб паўдзённае набажэнства адправіць. Тут старэйшы сын імама пайшоў у мячэць і кажа бацьку: «Чаму не клічаш на Уйле, чаго чакаеш? Ужо час». Бацька-імам мовіць: «Сыне мой, глянь у неба і падзівіся на такую слічную грамаду». І сын застыў у задуменні, гледзячы на гэта дзіва ў небе. Пасля ў мячэць прыйшоў малодшы імаў сын, наракаючы на бацьку: «Бацька мой, чаму не клічаш на Уйле?» Бацька кажа: «Не магу, сыне мой, бо мяне вельмі цешыць гэтае відовішча». І малодшы сын гэтае ж самае ўбачыў і быў усцешаны гэтым відовішчам; і вось мовіў імам сынам: «Добра было б, дзеці мае, калі б мы за хрысціянскую веру далі сябе замучыць, а пасля і мы былі б у той святой грамадзе ў раі». Малодшы сын адказаў: «Бацьку мой мілы, вядома, нас трох могуць замучыць, але маці наша, жонкі і дзеці нашы без святога крыжа ў ранейшай веры, неахрышчаныя застануцца і не будуць з намі ў раі. Лепей так, бацьку мой мілы, кліч на Уйле, паводле

звычаю, тых,хто стаіць цяпер там, а пасля мы паволі прададзім, што маем, і выедзем з маці нашаю і дзецьмі ў хрысціянскі край, ахрысцімся і станем прававерными хрысціянамі і будзем у раі». Так і сталася, як ён мовіў, трапілі ў Персію, дзе не туркі пануюць, а персідскі імператар, які Тамаз завецца, і ўсе былі добрымі і пабожнымі хрысціянамі, як гісторыя сведчыць.

Чытаў мне варты даверу чалавек з грэчаскіх хронік, што дзеелася ў Стамбуле ў хрысціянскія часы, як быў там цудоўны абраз Прачыстае Маці. Напрыклад, адзін чалавек у другога пазычыў грошы без карты і без распіскі, нават і без сведкаў. І той, што пазычаў, быў несумленны і затаіў грошы; прыйшлі абодва да абраза Прачыстае Маці, і абодва дакрануліся рукамі да абраза, і той, што быў вінен і не хацеў аддаваць, не мог руку адняць ад абраза да таго часу, аж пакуль цалкам не аддаў доўг.

Напрыклад, хацеў купец у купца купіць тавар, але баяўся, што дарага. Дык прыйшлі яны да тае цудоўнае Прачыстае Маці, паклалі тавар перад алтаром і лічылі грошы. Як грошай за тавар даволі было, дык руку сціснула, і той чалавек далей лічыць не мог. І шмат іншых цудаў было дзіўных і цяжкіх для разумення, пра што і распавесці цяжка.

Аднаго разу прайдзісвет стаў вялікім купцом і пазычыў у другога дзесяць тысяч чырвоных злотых. Прыйшоў час аддаваць грошы. Гэты хітрун, купіўшы на дзесяць тысяч дыяментаў, уклаў іх у драўляную палку, а таму чалавеку, якому ён быў вінен і не аддаваў грошы, сказаў: «Я, браце, быў табе вінен, але аддаў». Дык пайшлі абодва па ісціну да абраза Прачыстае Маці; там прайдзісвет узяў тую палку, дзе знаходзіліся дыяменты, і даў яе ў руку таму чалавеку, якому быў вінен, ды кажа: «Патрымай,

браце, палку маю!» Дык гэты добры чалавек, не ведаючы пра здрадлівую палку, узяў яе ў свае рукі і трымаў, а прайдзісвет паклаў руку на абраз Прачыстае Маці: «Прачыстая Маці, Ты бачыш, што я таму чалавеку, што палку трымае, доўг, яму належачы, аддаў». І Прачыстая Маці гэтаму прайдзісвету нічога не ўчыніла, рукі не затрымала, так вось ашуканствам і Прачыстую Маці абмануў, і ад чалавека палку з дыяментамі забраў. І з таго часу перастала Прачыстая Маці ў Стамбуле дзівы чыніць, бо яе святыя цуды для ашуканства ўжываць пачалі.

Адзін са стамбульскіх імператараў, маючы імператрыцу, ад свайго ўбоства закахаўся быў у адну грачанку, стамбульскую даму. Але тая пабожная дама, шануючы добрае сяброўства, першае — не хацела імператрыцы крыўды чыніць, а другое — дала слова аднаму кавалеру, што ейнае сэрца яму аднаму належыць, бо ў той час удавою была. Але імператара нічым адгаварыць немагчыма было, і ён толькі думаў, як яе разнастайнымі абяцаннямі да свайго жадання схіліць. Дама ж яму тлумачыла: «Найяснейшы імператар, як гэта быць можа, каб мы супраць самога Бога ішлі, каб ты клятву, дадзеную імператрыцы, парушыў, і я абяцанне, майму кавалеру дадзенае, бо хутка — дасць Пан Бог — мяркуем узяць шлюб, і я хачу, каб гэта здзейснілася. Я белагаловая паважная, уначы па вуліцах і палацах вашай імператарскай мосці валачыцца мне не пасуе, ад брамы майго палаца ключы ў сябе не трымаю, яны ў майго маршалка, які кіруе маім дваром. Я толькі сама з фраўцымерам сваім у пакоях начую, а як жа гэта можна, паважаючы вашу імператарскую мосць, уначы да маёй брамы прыходзіць, і сябе і мяне на ганьбу аддаваць». Імператар кажа: «Гэта нічога, мы зробім нешта. Я так змучаны каханнем да цябе, што і такі спосаб ужыву,

хоць ён і будзе зневажаць мой гонар». А спосаб той такі: адарыўшы даму вялікай рэгалізацыяй[2] і прызначыўшы час, сам ён загадаў зрабіць моцны срэбны кош на ядвабным шнуры і паслаў яго да свае каханае дамы ў падарунак, каб яна яго праз тое акно, што на рынак выходзіць, спусціла пэўнае начы, а імператар прыйдзе адзін, без лёкаяў, каб даму і сябе не абняславіць, і ўлезе ў гэты кош, а пакаёўкі дамы ўцягнуць яго праз акно ў пакой. Так і сталася.

Сеў імператар аднае начы ў той срэбраны кош, на ядвабным шнуры спушчаны, і пакаёўкі нашае пані пацягнулі імператара ўгору, але па загадзе сваёй пані паднялі яны яго высока ад зямлі, але да акна не дацягнулі і так яго пакінулі ў кашы на цэлую ноч і днём доўга трымалі. Дык той бедны імператар вісеў у кашы, і амаль увесь Стамбул бачыў яго. Вось як дамы чыняць упартым нахабнікам.

З гэтае самае хронікі чула я, чаму ў Стамбуле ўсяго даволі, хоць там шмат мільёнаў людзей, быдла і размаітых істот жыве, а ніколі не ведаюць голаду альбо якое нястачы. Заўсёды хапае ўсяго: даволі хлеба, віна, мяса, малака, мёду, цукру, рысу, садавіны, гародніны і розных багаццяў, чаго ў аніводным краі няма. А гэта таму такая вялікая ласка Божая над гэтым горадам, што тыя хлябы, якія Пан Езус натоўпу множыў, з кашамі закапаныя ў Стамбуле яшчэ ў часы кіравання хрысціянскіх імператараў пад адным каменным слупом непадалёку Айя-Сафіі.

У Стамбуле ад малітваў аднаго імператара ніколі вужакоў відаць не было, толькі пад адным каменным слупом вялікая яма была, і ў той яме вужакі сядзелі, але тая яма не адкрытай была, а вужака з каменя быў зроблены каля слупа на знак, што пад гэ-

тым слупам усе вужакі. Але як туркі захапілі Стамбул, дык турэцкі султан Мурат зліставаўся над тымі вужакамі, што сядзелі ў вязніцы пад слупам, і кінуў, седзячы на кані, дзіду ў таго каменнага вужаку і раскрышыў яму галаву, а з прычыны разбітае галавы сапсаваўся механізм, і ўсе вужакі распаўзліся, а той каменны вужака і цяпер галавы не мае.

У хрысціянскія часы было ў Стамбуле такое люстэрка, што, як хто ў яго зірне і захоча, напрыклад, убачыць французскага караля і дзе ён цяпер, дык адразу выразна ўбачыць яго. Ці жонка якая, што мела мужа за сто міль і хацела бачыць, што ён там робіць, ці паважны ён там і інш.,дык адразу бачыць яго ў люстэрку тым, і бачыць праўду. Альбо хто мае сына ці прыяцеля на вайне або ў дарозе — ці памёр ён, ці жывы,— адразу можа ведаць праўду. Альбо калі ў каго што ўкралі — хто ўкраў і дзе схаваў, хто толькі жаданне якое выкажа,— дык адразу ўсё ўбачыць. І таму праваслаўныя Прачыстую Маці прыраўнялі на літанні да Люстэрка Справядлівасці, бо гэтае люстэрка шчырую праўду паказвала, і было яно ў імператарскім скарбе. Але як туркі меліся захапіць Стамбул, дык яго сам імператар разбіў, каб туркам не дасталося і каб яны праўды не бачылі.

Траляліся мне часам нахабныя туркі, што хацелі намовіць мяне да свае веры. Сярод іншых аргументаў моцнае абароны свае хрысціянскае, рымска-каталіцкае веры, я тым абвяргала некаторых упартых туркаў, што «вы ж самі мне мовілі, што Пан Езус наш сядзіць на шостым небе, душою і целам жывы і жыць будзе вечна, а прарок Магамет жыў і памёр, як і кожны чалавек, і ляжыць мёртвы ў магіле. А ці не лепш мне верыць і спадзявацца на жывога Пана Езуса,

чым на мёртвага прарока Магамета, што ляжыць у магіле?»

Выпала мне раз спрэчка з габраямі пра нашую праўдзівую каталіцкую веру, у якой мне трэба было Святую Тройцу абараняць, і я з дапамогаю Святога Духа тым абараняла, што няраз загадвала, каб мне Біблію чыталі і тлумачылі, хоць я нашу польскую і нямецкую шмат разоў чытала сама, але спадзявалася на Пана Бога, што мяне не спакусяць, калі буду і габрайскую слухаць, бо яе мне тлумачыць казала. Ёсць там апісанне, як Майсей убачыў сухі куст, які гарэў, і хоць ён палаў, але не згарэў, і з таго куста пачуўся голас: «Майсей, скінь абутак твой з ног, бо тое месца, дзе ты стаіш, святое. Я — твой Пан Бог, загадваю табе, каб ішоў у Егіпет і сказаў каралю Фараону[3], няхай мне мой ізраільскі народ выпусціць з няволі» і іншае, што яму сам Пан Бог загадаў.

У другім месцы напісана, як святы Майсей выводзіў ізраільскі народ з Егіпта, з рабства, дык бачыў прыгожага юнака, які трымаў у руцэ харугву і так казаў: «Не пасланец, не анёл, але я сам сваёю моцаю выводжу народ мой з Егіпта, з дому рабства».

У трэцім месцы піша Майсей, што бачыў Пана Бога на гары Сінай у абліччы старога чалавека з барадою, і ён вучыў, як трэба маліцца; і мовіў, і напісаў сам Майсей, што той агонь, які ён бачыў у кусце, быў сам Пан Бог. У другі раз, калі яго бачыў, як з Егіпта ізраільскі народ выводзіў, у постаці юнака, што харугву ў руцэ трымаў, і гэта быў сам Пан Бог. На гары Сінай, калі атрымаў дзесяць Божых прыказанняў з рук старога чалавека з барадою, і гэта, сцвярджаў ён, сам Пан Бог. Калі ласка, звярніце ўвагу, што сам Майсей, першы прарок, якому габраі цалкам вераць, бачыў тры разы жывога і праўдзівага Пана Бога, кожны раз у іншай постаці, што, безумоўна, азначае

Святую Тройцу, і я вераю сваёй моцнаю сцвярджаю, што ў кусце ён бачыў Святога Духа, а юнак, што выводзіў з Егіпта ізраільскі народ і трымаў у руцэ харугву, я веру ўсёй душою, што гэта другая асоба Святое Тройцы. Трэці раз, калі бачыў на гары Сінай чалавека з барадою, дык, трэба верыць, што гэта быў, бясспрэчна, сам Бог Айцец; і цяпер без сумненняў маем з саміх Майсеевых кніг, што Пан Бог у Святой Тройцы Адзіны ў трох асобах, але адзін Пан Бог.

Я нікога не асуджаю. Я сама ніхто перад тварам Пана Бога, толькі тое, што ведаю і думаю, хачу, каб усе ведалі: гэтыя габраі — вялікія шарлатаны і ашуканцы. А ўсё ад Талмуда. Яны мовяць, што «нам можна хрысціян і кожнага чалавека чужой веры ашукаць, абкрасці, забраць у яго, бо габраі,— каралі і манархі гэтага свету, бо толькі дзеля іх Пан Бог свет стварыў», і гэта такім аргументам пацвярджаюць, што калі Якуб, сын Абрамаў, сын Ісакаў уцякаў ад свайго брата Ісавы, дык першы начлег яго быў у полі, і ён там бачыў такі сон. Пан Бог яму кажа: «Якубе, гэтую зямлю, на якой ты ляжыш, я дам табе і тваім нашчадкам»[4], а Талмуд тлумачыць, што Пан Бог увесь свет скруціў шчыльна ў трубку і падклаў пад Якуба, і што габраі — гэта сыны Якубавы, дык усе людзі, што жывуць на свеце, іхнія падданыя, і габраям можна, як панам гэтага свету, у падданых сваіх браць, бо яны кажуць, што ўвесь свет маюць, людзі на іхняй зямлі жывуць — іхнія падданыя. Таму Талмуд дазваляе рабаваць хрысціян. Габраі кажуць па-габрайску: *esw Bagoim muter* (гэта значыць: ашукаць хрысціяніна — гэта вялікае адпушчэнне грахоў, але толькі тады, калі хрысціянін гэтага не зразумеў), а калі хрысціянін зразумее, што яго габрай ашукаў, дык гэта ўжо грэх, бо хрысціянін скажа: «Як твая вера непраўдзівая, так і ты, габраю, непраўдзівы», і ад гэта-

га была б габрайская вера пагарджанаю, і грэх меў бы габрай за гэта, таму павінны габраі мудра ашуквацць. Трэба нам дзівіцца іх асляпленню дурному. Яны маюць самі ў малітвах Давідавых словы па-габрайску: «*Zerok lanu maim Tehorim*» і інш., што азначае: «Абмый нас, Божа, чыстаю вадою»,— шматзначна пішацца. Ці не зразумела, што прасіў Давід святога крыжа, каб яго пры жыцці ці нашчадкі ягоныя дачакаліся быць ахрышчанымі чыстаю вадою? І здаралася мне ў шматлікіх рабінаў і вучоных габраяў пытацца, што гэта значыць: *zerok lanu maim Tehorim*. Дык мне адказвалі асобныя, што, калі габрай памрэ, яго акрапляюць, разбіўшы яйка ў піве. Іншыя мне так мовілі: як хлопцу-габраю абразанне робяць, дык мачаюць пальцы ў піва і мажуць дзіцяці губы колькі разоў і кажуць па-габрайску: «*Begi maio Chaio*», гэта значыць: «Няхай цябе Бог ажывіць вадою жывою». Асобныя габраі мне казалі таксама, што некаторыя габраі і габрайкі ў халодную ваду акунаюцца з галавою, і ці гэта смешныя габраі не ведаюць, не разумеюць, што святы Давід, прынамсі, святога крыжа прасіў у Пана Бога, але ці такога, як маем мы, прававерныя каталікі? Наракаюць гэтыя дурныя габраі, што Пан Езус не павінен закона Майсеева парушаць, бо Майсей так напісаў у сваім законе, што гэты закон ніводзін прарок, ні анёл з неба парушыць не павінен. Я ім так адказала: «Калі вы, недаверкі, не верыце, што Пан Езус — Сын Божы і сам Бог, дык я дакажу вам: вы маеце ў сваіх кантычках разнастайныя Майсеевы песні. Адна песня завецца па-габрайску «*Cur mfste wolachu*» і ёсць там такія словы «*Meszyach Adonaj*», што азначае: «Месія сам Бог», якому мы заўсёды павінны пакланяцца. Дык калі ўжо так, як габраі мовяць, што Ён не Бог, а толькі добры чалавек, а маем напісанае ў кнігах прарочых, як Ісус, ізраільскі цар адразу пас-

ля Майсея ваяваў з філістымлянамі, і даў Пан Бог яму перамогу над імі, але вечар яму перашкодзіў: сонца заходзіла, і не мог ён дашчэнту пабіць і разагнаць філістымлянаў, дык закрычаў на сонца: «Стой і свяці мне насуперак звычаю і прыродзе тваёй, каб я мог адпомсціць філістрымлянам». Адказала сонца: «Я толькі свяціць мушу і не павінна цябе, Ісусе, слухаць». Адказаў Ісус сонцу: «Я магу табе загадаць, бо я — сын Божы, а ты — лёкай Божы, а сын можа лёкаю загадваць». Так сталася, што сонца шэсць гадзін насуперак сваёй прыродзе свяціла ў той дзень. Дык я мовіла габраям, што я гэтае гісторыі не чытала ў маіх каталіцкіх кнігах, бо ў нас інакш пішацца, але мела лёкая-габрая, які быў па-габрайску добры вучоны, і ён мне чытаў і слова ў слова па-польску тлумачыў. Дык я іх аспрэчыла: «Бачыце, Ісус сонцу мог загадаць і парушыць закон Божы. А чаму ж наш Пан Езус, Сын Бога жывога, Сын Панны Марыі, Бязгрэшна Зачаты, не можа габраям загадаць і іхнія, смеху вартыя законы парушаць, бо Пан Езус Хрыстус дзесяць Божых прыказанняў не парушыў і аніводнае слушнае і патрэбнае рэчы, а той смешны закон, што не варта габраям тою лыжкаю есці мясныя стравы, кою малочныя елі, дык на малочныя стравы адзін, а на мясныя — другі, а на посныя — трэці посуд маюць, а калі трапіць малочная лыжка ў мясны гаршчок выпадкам, то крычаць дурныя габраі: *treif, treif*[5] і выліваюць гэтую страву на зямлю, а посуд паляць альбо пазначаюць і раздаюць хрысціянам, бо гэтае змешванне посуду лічыцца вялікім і цяжкім грахом. А, крывадушнікі! Калі чужое, крадзеныя альбо ашуканствам набытыя рэчы ці грошы змяшаюцца, дык чаму не крычыце: *treif, treif*, а гукаеце: *kuszer, kuszer?*[6] Габраі на Вялікдзень пякуць мацу: толькі мука з вадою, на памятку таго, што Пан Бог з Егіпта, з рабства

іх вывеў, і загадаў Майсей есці гэтую мацу абавязкова, бо хто гэтага хлеба, *alias* мацы, не ўжываў, той не будзе збавёны. Як таксама ёсць у вашым пісьме, што калі б Майсей з дапамогаю Пана Бога ізраільцян не вывеў у тую, прызначаную Богам гадзіну, дык ужо ўсе пайшлі б у пекла ці, як габраі кажуць *Lesitre achre*. Але ўсё гэта пад крыжам было, бо што гэта за рабства, якое ізраільцяне цярпелі ад Фараона так шмат, нібыта ў нас у Польшчы падданыя робяць свайму пану, але гэта інакш завецца па-габрайску *Lesitre achre*, гэта азначае: «Моцаю шатанскаю на вечнае асуджэнне», чаго фараон даць не можа, што да душы і вечнасці належыць, гэта азначае, калі б Пан Езус у пэўны час не даў сябе замучыць за нас, грэшных, тады б мы сапраўды пайшлі, усе, ад Адама, на вечнае асуджэнне. А маца, што габраі ўжываюць на Вялікдзень, толькі з мукі і вады, яе ядуць дзеля адпушчэння грахоў, бо была яна пад крыжам, а мы, прававерныя хрысціяне, ужываем Святы Сакрамант, сапраўднае Цела і Кроў Пана Езуса».

Я ад таго добра вучонага габрая-лёкая, які чытаў мне Біблію і іншыя габрайскія кнігі, асобныя рэчы выпісала, і цяпер маю іх як аргументы ў спрэчках з габраямі, абараняю нашу праўдзівую веру, а габраяў сарамачу.

Даказваю я габраям з іх Бібліі, што Святы Сакрамант — сапраўднае Цела, Кроў і Душа жывыя Пана Езуса, а даказваю гэта так: пішацца ў іх, што ў царкве Саламонавай быў такі выпадак: спяклі хлеб у пятніцу, і паклаў арцыкаплан гэты хлеб на алтар, ляжаў ён ад пятніцы да пятніцы, восем дзён на алтары і быў заўсёды цёплы. Гэты хлеб зваўся *Lechem Haponym*, ён не траціў сваёй цеплыні, і лічылі яго свежым. Не мог ніхто чужы да яго дакрануцца, хіба толькі сам арцыкаплан. А ці не знак гэта, бо ў Старым Запавеце

напісана, што Святы Сакрамант — гэта Цела і Кроў Пана Езуса, калі той хлеб мог трымаць цяпло сваё восем дзён.

Пішацца ў габраяў, што калі Ціт Васпасіян[7] прыйшоў з войскам разбурыць Ерусалім і царкву Саламонавую, дык, захапіўшы ерусалімскую фартэцыю і царкву (а перад алтаром заслона, а ў алтары былі тыя каменныя таблiцы, што Майсей прынёс з гары Сінай ад Пана Бога, на якіх былі напісаны дзесяць Божых прыказанняў, і быў закон Майсееў, гэта значыць напісаная на паперы кніга, а той хлеб арцыкаплан зняў з алтара і паклаў усярэдзіну, у алтар, там дзе таблiцы Майсеевы і кніга Запавету, ці Закону Майсеева былі), Ціт Веспасіян, ускочыўшы туды, пасек заслону сваім мячом і трапіў у той хлеб, які перад гэтым быў на алтары і які габраі завуць *Lechem Haponym*, і адразу кроў пайшла з таго хлеба. Як з таго хлеба кроў пайшла праз заслону, дык перапалохаўся Ціт, думаючы, што ён забіў ерусалімскага Бога. Дык чаму ж упартыя габраі не хочуць верыць, што ў Святым Сакраманце ёсць сапраўднае Цела і Кроў Пана Езуса? Я разумею, што ў нашых кнігах не пішацца так, як у габраяў. А гэта я толькі таму распавядаю з іхніх кніг, каб іхняй Бібліяй іх пераканаць і паказаць іхнія памылкі і малавер'е.

Напісана, што аднаго разу святы Давід загневаўся на нейкага багатыра Наўла[8] і ехаў са сваім войскам забіць Наўла, але жонка Наўла паехала насустрач Давіду і дала яму ў падарунак віна ды хлеба, і так удалося ўпрасіць святога Давіда, бо ўбачыў ён хлеб і віно ў руках Авігеі.

Чаму ж упартыя габраі не хочуць сказаць праўды пра Святога Духа, трэцюю асобу Святой Тройцы? Маюць жа яны ў сваёй Бібліі: пакуль быў створаны свет, дык Святы Дух насіўся над вадою, па-габрайску:

Ruah Edunay Marachetes Alhaim. Як Саул[9] (першы сярод ізраільцян) просты чалавек, што шукаў асліц па загадзе Пана Бога быў памазаны на цара пракрокам Самуілам, дык адразу мудры стаў, і напісана ў габраяў, што казалі: «Святы дух увайшоў у Саула і зрабіў яго мудрым». Як таксама напісана ў іх, што Майсей інакш хадзіць не мог сярод людзей, як толькі з пакрытаю галавою, бо Святы Дух так моцна над ім лунаў, што ад вялікага ззяння людзі яму ў твар глядзець не маглі, і гэта завецца па-габрайску *Schyne*, гэта азначае Святы Дух.

Чаму ж гэтыя ўпартыя габраі не прызнаюць годнасці Панны Марыі, якая завецца Дзяннiцаю, ці Ранішняю Зоркаю, і ёсць у іхняй Біблii, і не прызнаюць, што Пан Бог вельмі шануе адну панну, Ён пасадзіў яе на адной зорцы ў небе, і тая зорка завецца па-габрайску *Time*. То я пыталася ў рабінаў, як заслужыла тая габрайская паненка тут на свеце, каб яе Пан Бог на зорку пасадзіў? Апавядалі мне габраі такую байку, што калі яшчэ Садом і Гамора была, дык там такі звычай быў, каб ніколі ўбогаму кавалка хлеба не даваць, аж пакуль не памрэ. Але габрайская дзяўчына, ідучы па ваду, паклала ў пусты збанок кавалак хлеба і дала аднаму ўбогаму. Калі садамляне даведаліся, што гэтая панна ўбогаму хлеба дала, дык яе дагала распранулі і, намазаўшы мёдам, паклалі ля пчол, якія яе да смерці пакусалі, і за гэтыя мукі Пан Бог пасадзіў гэтую панну на нябеснай зорцы, якая завецца *Time*.

Я не сумняваюся, што і за такі добры ўчынак мог узвесці Пан Бог тую панну на неба, але ж мы маем шмат святых нашых пакутніц, якія ў сто разоў большыя вытрымалі мукі, напрыклад, святая Барбара, святая Тэкля, святая Юльяна і безліч іншых пакутнікаў і пакутніц, але, аднак, ніхто не стаў годны

таго, каб яго Бог пасадзіў сярод зорак, толькі Прасвятая Панна, Матка Хрыстова. Толькі яна адна ласкаю Пана Бога як дачка Бога Айца і Маці Сына Божага і любая Святога Духа, толькі яна стала годнаяназвацца Ранішняю Зоркаю. Ёсць яшчэ ў габраяў і іншая кніга, дзе напісана, што бясплодная ад анёльскага Звеставання нарадзіла дачку, якая ўвесь свет напоўніла радасцю, але я гэтай кнігі дастаць цяпер не змагла, дык пісаць пра тую гісторыю не магу.

Гэтыя ўпартыя габраі святых пасадзейнічаць прасіць не хочуць і нас за тое ганяць, што мы да святых молімся, да прыяцеляў і каханых Божых, а яны, дурныя, не могуць. Бегаюць, крычаць, плачуць, каб ім тое зрабілі, аб чым іх просяць, а калі габрая павесяць, што касцёл абакраў, або коні ўкраў, або каго забіў, і гэтага злодзея ці ліхадзея хаваюць, дык габраі нябожчыку нож у рукі даюць, а гэта таму, каб ён на тым свеце помсціў хрысціянам і рэзаў іх нажом. І такіх называюць святымі, а па-габрайску *keduszym*. Іх за зладзейства забілі, дык ці варты яны таго, каб іх святымі называць? А ці не святыя каралі, князі, імператары, паненкі і ўдовы, што добраахвотна пайшлі на розныя пакуты, напрыклад, святая Анастасія, святая Вільгафорта, святы Ракоп, святы Аўстахій і шматлікія іншыя пакутнікі? Ці не павінны мы іх паважаць і шанаваць за святых?

Пра святы крыж. Гэты крыж яшчэ ў Старым Запавеце з'яўляецца. Святы Якуб, патрыярх, сын Абрамаў, сын Ісакаў, калі быў прывезены ў Егіпет сынам сваім Язэпам, якому здрадзілі родныя браты, а пасля, калі наблізіўся час смерці Якубавай, Язэп узяў дзяцей сваіх, двух сыноў — Ахрэма і Манасію[10] — і прасіў бацьку свайго Якуба, каб благаславіў сыноў ягоных. А Якуб, маючы шмат сыноў і ўну-

каў і будучы слабым, блаславіў дваіх разам, зрабіў крыж рукамі (так святога Францішка Серафіцкага малююць), паклаў правую руку на таго ўнука, што з левага боку стаяў, а левую руку на таго ўнука, што з правага боку стаяў, і так зрабіў святы крыж па нашчадках сваіх, бо добра бачыў, што з часам будуць сыны і дочкі ізраільскія паважаць і пакланяцца святому крыжу. Але калі я ў вучоных габраяў пыталася: «Бачыце, яшчэ ў Старым Запавеце святы Якуб зрабіў крыж у бласлаўленні сваім дзяцей сваіх», дык мне габраі так адказалі: «Святы Якуб быў рамай, гэта значыць ашуканец», але гэта не так: святы Якуб быў шчыры вернік і прарок, чалавек справядлівы і шляхетны.

Святы крыж Галена, маці імператара Канстанціна, зрабіць загадала (так грэчаская гісторыя апавядае і тыя, што на гэта ў той час глядзелі), і было так, што імператарава дачка, а Галеніна ўнучка, памерла, але святая Галена на Бога надзеі не траціла і загадала мёртвае дзіця пакласці на адзін крыж, але яно не ажыло. Тады на другі крыж, што быў ад другога лотра, і тут не ажыло. Калі на трэці крыж паклалі тое мёртвае дзіця, а гэта быў крыж самога Пана Езуса і Ягонаю Святою Крывёю акраплены, адразу дзіця ажыло і разам з іншымі Пана Бога хваліла.

Гэты святы крыж колькі соцень гадоў у зямлі ляжаў, у вялікай кучы гною і смецця, што з усяго горада габраі выкідалі і вывозілі, але святая Кроў, такая слічная і чыстая на крыжы засталася; адна зёлка, што завецца *па-руску васілёк*, каля крыжа расла і над ім нахілялася, таму ў праваслаўных цяпер такі звычай, што калі свянцонай вадой крэпяць, дык васільком. Тое самае я і ў Маскве бачыла, таксама кропяць гэтаю зёлкаю.

Калі ж мне выпала пра святую веру размаўляць з маскалямі, якія ад нас толькі тым адрозніваюцца, што лічаць, што нібыта Святы Дух ад Айца зыходзіць, а на Сына ўзыходзіць, а гэта таму, кажуць, што Пан Езус нарадзіўся ад Святога Духа, і калі святы Ян хрысціў Пана Езуса ў Іярдане, дык быў відаць Святы Дух з неба над Панам Езусам, і таму кажуць, што Святы Дух на Сына ўзыходзіць. Я на гэта так ім адказала: «Вы правільна мяркуеце, але калі Святы Дух на апосталаў быў пасланы з неба ў святы дзень, дык ужо Пан Езус быў у небе, а калі Пан Езус — другая асоба Святое Тройцы, дык, вядома, Святы Дух ад Айца і Сына зыходзіць».

Другое, чым праваслаўныя адрозніваюцца ад нас, што кажуць, нібыта ўсеагульнага суда няма, а толькі кепскія і добрыя людзі Страшнага Суда чакаюць. Я на гэта так адказала аднаму ігумену ў Кіеве (гэты ігумен зваўся яго мосць поп Ланцкаронскі) і самому прэфэкту: «Калі сапраўды Страшнага Суда павінны чакаць, дык у нас святых яшчэ не павінна быць. Але чаго ж вы шануеце святога Міколу, святую Барбару і шматлікіх іншых без меры, як таксама і пячорскіх святых?» І тым іх пераканала, што «навошта просіць гэтых святых садзейнічаць нам, калі яны і самі яшчэ не на небе? І ці ж не павінна святая Барбара за такія вялікія пакуты і любоў Божую быць на небе і быць раз'яднанаю з Богам? Дык натуральна бачым, што добрыя людзі на небе, а благія — у пекле, а іншыя да часу ў чыстцы, каб сплаціць доўг, а пасля ісці ў рай. Калі ж благія і добрыя людзі ў асобным месцы, як вы лічыце, і чакаюць Страшнага Суда, дык навошта бераце за набажэнствы, за малітвы і інш. грошы ад людзей? Тады не трэба за душы памерлых маліцца. Дык мы ясна бачым, што чысцец ёсць і малітвамі мы можам душам у чыстцы дапамагчы».

Асобныя маскоўскія дзівы. Чытала я кнігу пра аднаго святога пустэльніка, які зваўся святы Гапон. Гэты пустэльнік, ідучы па лесе, знайшоў чэрап і, узяўшы яго ў свае рукі, так над ім разважаў: ах, мой Божа, хто ведае, чыя гэта галава? І дзе ягоная душа? І вось ад малітваў святога Гапона і волі Пана Бога абазваўся гэты чэрап: па справядлівым судзе Божым за свае грахі я ўжо семдзесят гадоў у чыстцы. І прасіў гэты чэрап у святога Гапона маліцца за яго, і ад малітваў ягоных пайшоў у рай, а пасля аб'явіўся святому і дзякаваў за ягоныя святыя малітвы. Гэты святы Гапон быў праваслаўны, і гэтая гісторыя адбывалася ў Маскве[11], і сам ён гэта распавёў, і з ягоных слоў кніга выдадзеная была.

Другі дакумент пра чысцец ад саміх жа маскалёў такі, што адна пачцівая і вельмі пабожная багатая белагаловая ўвесь свой набытак раздала на царкву і ўбогім, а сама ў старасці ў аднаго старога, надзвычай пабожнага мніха (пра ягонае святое жыццё доўга трэба было б распавядаць), была кухаркаю і прыслужвала яму, і ў гэтага мніха пад сходамі памерла. Але пры жыцці гэтая белагаловая прасіла, каб гэты поп за яе маліўся, і поп абяцаў за яе маліцца, але загадаў ёй: куды цябе Бог пашле, каб ты мне пасля смерці паведаміла. Так і сталася. Пахаваў той поп белагаловую прыстойна. І яна аб'явілася ды з плачам прасіла, каб ён за яе маліўся ды іншых прасіў, каб за яе маліліся, бо яна ў чыстцы. Дык той поп выдаў кніжку пра гэтую прыгоду, якую я сама чытала ў Кіеве, і гэтым даводзіла ім, што ёсць чысцец.

Трэці аргумент супраць маскалёў, што існуе чысцец, такі: адзін пабожны пустэльнік, які зваўся Скемлік, не меў на сабе ніякае вопраткі, ні абутку, ні шапкі, толькі ў валасяніцы хадзіў; ён распаліў сабе ў лесе вогнішча і ляжаў уначы каля яго. Але прыйшоў да

яго чалавек высокага росту ды прыемнага твару ў імператарскім адзенні і прасіў таго Скемліка, каб дазволіў яму каля вогнішча пераначаваць, на што Скемлік з вялікаю ахвотаю згадзіўся. Апоўначы прыйшлі яшчэ два чалавекі, вельмі страшныя тварам, у надзвычай бедных апранахах і так жахліва крычалі, што вялікі страх ахапіў пустэльніка. Яны загадалі гэтаму багатаму чалавеку зняць з сябе адзенне і пачалі яго распаленымі ланцужкамі лупцаваць і розныя мукі прыдумваць. Пасля на агні яго смажылі, як на пожагу. Гэтыя пакуты доўжыліся дзве гадзіны пасля паўночы. Затым тыя дзве страшныя асобы зніклі, а той чалавек, апрануўшы зноў царскую сукню на сябе, мовіць пустэльніку: «Бачыў, браце, што са мною дзеелася?» Скемлік з вялікім страхам адказаў: «Бачыў і спачуваў вялікім пакутам тваім». Дык адказаў гэты чалавек: «Я — Пятро Аляксеевіч, расійскі імператар. Пасля таго як пакінуў гэты свет, па справядлівым судзе Пана Бога штоноч цярплю такія мукі ад пякельных шатанаў, якіх ты бачыў. Таму прашу цябе, чалавеча Божы, ідзі ты ў Пецярбург да маёй дачкі Лізаветы Пятроўны, якая цяпер на троне, і распавядзі ёй пра мае пакуты, і што я ратунку прашу, і каб у тое моцна верыла, што чысцец існуе, і публічна кнігі пра гэта загадала выдаваць». Распавёўшы пра шмат якія іншыя рэчы, ён знік.

І той пустэльнік з лесу выйшаў, хоць раней ніколі не выходзіў і ніколі з ніякім чалавекам не гутарыў, але па наказе Божым пакінуў пушчу і пайшоў па вёсках, па гарадах і па манастырах, распавядаючы тое, што бачыў, і сцвярджаў, што існуе чысцец. І вось у сваім пілігрымстве прыйшоў ён у Пецярбург, адно і тое ж распавядаючы, і дайшло гэта да вушэй самое найяснейшае яе мосці імператрыцы Лізаветы Пятроўны, і загадала яна таго пустэльніка прывесці


да яе, а ён тое самае сцвярджаў, што бачыў; быў ён з голай галавою, босы і ў валасяніцы. Дык яе мосць царыца сказала: «Выдумляеш, чалавеча, пэўна, ты католік». Але Скемлік даказваў сваю праўду, што ён нарадзіўся ад бацькі і маці, якія былі маскалямі, нават і аднаго дагмату каталіцкага не ведае. Аднак яго ўкінулі ў вязніцу за тое, што адважыўся пра бацьку яе мосці царыцы пляткарыць. Пасля прыводзілі яго да многіх мніхаў, біскупаў, архірэяў[12], але ён заўсёды адно і тое ж казаў, што тае начы бачыў, як у пушчы быў. Дык выпусцілі яго з-пад арышту і пра гэта кніжку выдалі па-расійску, якую чытаў мне адзін поп-ігумен у Кіеве. І я пыталася ў яго: «А чаму ў вашай краіне кожны іначай кажа пра Страшны Суд і пра чысцец? Чаму мы, католікі, усе разам трымаемся?» Адказаў мне ігумен: «Ужо б і ў Масковіі ў гэта публічна верылі і публічна кнігі пра гэта выдавалі, але ж у спадкаемцы Пятра Хведаравіча маці маскоўка, а бацька лютаранін, а лютаране і кальвіністы ў чысцец не вераць, а спадкаемца Пятро Хведаровіч меў у сябе ў Пецярбурзе свайго дырэктара[13], таксама лютараніна, вельмі вучонага чалавека, але працiўніка Божага, скажальніка Біблii і дагматаў веры. Гэты дырэктар стаў русінам і епіскапам, і ён праваслаўную веру псуе дашчэнту сваімі вераломнымі скажэннямі і дыспутамі ды цалкам не дазваляе, каб пашыралі, сцвярджалі і кнігі выдалі пра чысцец».

Калі б хто хацеў абурыцца і так казаць, як звычайна кажуць, што маскалям-схізматыкам — пустэльніку Гапону, белагаловай, што пасля смерці аб'яўлялася, ці пустэльніку Скемліку — такіх адкрыццяў не можа Бог даць, дык тады ніякіх пытанняў няма. Аднак жа святая Барбара мела бацькоў язычнікаў і не хрышчоная яшчэ была, але, пачуўшы голас Божы, святою стала, так і гэтыя пабожныя людзі, калі сваім

адкрыццём іншых выратаваць не могуць, дык хоць, прынамсі, сябе ўратуюць.

Выпала мне спрэчка з праваслаўнымі маскоўскімі базыльянамі[14] пра Святога Айца, папу, чаму яны не хочуць мець яго за галаву Царквы. Бо ж усе папы — гэта намеснікі святога апостала Пятра. Адказалі мне на гэта: «Але ж не адзін святы Пятро быў апостал, але ж і святы Андрэй быў апостал у Маскве, святы Марк у Персіі і гэтак далей, хто ў які край быў пасланы». Я адказваю: «Сапраўды, кожнага апостала Пан Бог і ўвесь свет шануюць, але ж Пан Езус, прынамсі, сказаў святому Пятру: ты — апірышча, на табе пабудую Царкву маю, а святы Пятро быў папаю ў Рыме, дык у Рыме і апірышча, і царква, і нашчадкі ягоныя, бо за колькі соцень гадоў пасля імператара Нерона, як мне вядома, аніводзін папа пасля святога Пятра не паміраў сваёй смерцю, а толькі пакутніцкую карону мусіў надзяваць, і сад зямнога раю так сваёю святою крывёю папы акрапілі, што ніколі ён не завяне, чаго іншыя патрыярхі так шмат не цярпелі, напрыклад, стамбульскі, ерусалімскі, александрыйскі і антыяхійскі».





Раздзел сёмы

ПРА СУБОТНІ ПОСТ

Чытаў мне адзін католік, армянін-мараніт[1], чаму мы, католікі, у суботу посцім, а праваслаўныя ў сераду: гэты суботні пост маем мы ад святога Пятра, а гісторыя была такая. У час панавання імператара Нерона (а папаю быў святы Пятро), пачаліся ганенні на хрысціян, каб яны ад веры хрысціянскае адракаліся, а старое паганскае трымаліся, на што святы Пятро адказаў: «Як я магу ад веры адрачыся, калі я вачыма сваімі Пана Езуса бачыў і вучыўся ў Яго, і бачыў святое жыццё Ягонае, і нараджэнне Ягонае ад чыстае Бязгрэшнае Панны Марыі, як і абяцаў нам раней праз пракокаў Пан Бог. І даўся Ён добраахвотна замучыць сябе, хоць лёгка мог у свае маладыя гады пазбегнуць тае лютае смерці, бо мы бачылі, што габраі ерусалімскія дамагаліся смерці Ягонае. Ён мог бы ў іншы край пайсці і там вольна жыць, але ж выратаванне нашае патрабавала, каб Пан Езус Хрыстус адкупіў нас сваёю святою Крывёю, і бачыў я Яго, як Ён на трэці дзень уваскрэс і жыў з намі на свеце сорак дзён.

І бачыў я Яго, як Ён сваёй моцаю Божай узышоў на неба».

Гэтая гаворка і прысяга святога апостала Пятра Пану Езусу адбывалася ў прысутнасці імператара і аднаго волхва-язычніка, якога звалі Сымон. Быў ён вялікі чарнакніжнік. І адказаў Сымон святому Пятру: «Калі вы, хрысціяне, таму Пана Езуса Богам лічыце, што ён сваёй сілаю на неба ўзышоў, дык і я вам такое дзіва пакажу і ўзыду сваёй сілаю на неба». І адклалі гэтае чароўнае відовішча на суботу, а ў гэты дзень шмат тысяч людзей сышлося паглядзець на тое дзіва, як чарнакніжнік Сымон будзе ўзыходзіць на неба. А святы Пятро загадаў сваёй абшчыне, прававерным католікам, каб яны ў той дзень суботні пасцілі і Пана Бога прасілі, каб Пан Бог пакараў чарнакніжніка, абы прававерным спакусы не было, бо меў ён іх у той час у Рыме толькі семдзесят двух мужчын і белагаловых.

Паслухалася абшчына загаду святога Пятра і шчыра з плачам прасіла Пана Бога, і пасцілі, і выйшлі на прызначанае месца, дзе чарнакніжнік Сымон будзе дзівы чыніць. А той Сымон быў убраны ў такі дзіўны і надзвычай багаты строй, у якіх тады ідалаў малявалі. І вось у прысутнасці імператара і вялікага натоўпу людзей пачаў ён узнімацца з зямлі і ўжо быў падняўся аж пад самыя воблакі, як Пан Бог (як таго Люцыфера анёл) штурхнуў у лоб чарнакніжніка Сымона і ўкінуў яго ў вельмі глыбокі прэвэт[2], поўны нечыстотаў, ды яшчэ рукі і ногі паламаў. І закрычаў чарнакніжнік Сымон: «Хрысціянскі Бог праўдзівы! Яму верце і давярайце, і на выратаванне ад таго Бога спадзявайцеся, у якога святы Пятро і хрысціяне ягоныя вераць!» І крычаў Сымон: «Я — хрысціянін, я — хрысціянін і вам зычу, людзі, каб усе хрысціянамі былі і гэтаму Богу

верылі!» І тут закрычалі ў адзін голас колькі тысяч людзей абодвух полаў: «Праўдзівы хрысціянскі Бог, у таго Бога мы верым, што і святы Пятро і чарнакніжнік Сымон!»

І вось загадаў імператар тых людзей, што хрысціянамі быць захацелі, у вязніцы пасадзіць, а пасля ў вялікі посуд наліваць растоплены воск, у асобны — лой, аліву, серу, смалу — і ў гэты поўны посуд людзей клалі, і галовы ім тлушчам палівалі, і з галавы запальвалі. І гарэў так чалавек, як кнот у лямпе, але аніводзін не хацеў з тае свечкі выбрацца і адрачыся ад Пана Бога. І вось палац рымскага імператара быў напоўнены тымі лямпамі, і ўвесь Рым, і вуліцы рымскія, а імператар ночы навылёт ездзіў па Рыме і цешыўся са свайго глупства і агіднага тыранства, але ніяк не мог вынішчыць хрысціян, Богам натхнёных, бо штодзень болей і болей прыходзіла хрысціян добраахвотна ў Рым да святога Пятра, каб прыняць святы крыж і святое Евангелле. Дык святы Пятро загадаў тым новым хрысціянам, каб дзень суботні пасцілі навекі, бо нас Пан Бог у суботу праз дзіва ўмацаваў, і мы, прававерныя хрысціяне, маем за галаву святога папу, які спадкаемца святога Пятра. Таму павінны мы ў суботу пасціць, бо гэта самога Пятра загад.

Я чула, што гэта дзень Прачыстае Маці. Я гэтаму не пярэчу, але праўды не ведаю. Што да серады, дык яна ўстаноўлена на саборы, калі праваслаўныя разам з намі былі. А ганенні рымскіх імператараў гадоў трыста доўжыліся, і аніводзін папа сваёй смерцю не памёр, пакутаваў, але аніводзін з папства не ўцёк, аніводзін ад папства не адрокся, толькі адзін за адным, як нявінныя авечкі, пад нож ішлі. Дык вось вера хрысціянская крывёю святых пакутнікаў заснаваная. Аднак, калі б на ўзнагароду ў небе

не спадзяваліся, дык не вельмі б пакутніцкая карона іх вабіла, бо і яны, як і мы, з душы, і з цела, і з крыві былі складзеныя. Ужо добра ведалі, якая ўзнагарода ім ад Пана Бога прыгатаваная была ў раі.

Не так як Марцін Лютар сваю секту заснаваў, скасаваўшы шлюб са сваёю Кацярынаю, і парушыў пасты, і адмовіўся прасіць у святых дапамогі, і напісаў у сваіх кнігах: калі дрэва ўпадзе, няхай ляжыць. Не трэба маліцца за душы ў чыстцы. Павінен прэдыкант мець яшчэ пекную жонку, што яму лютаране і кальвіністы даюць, каб на сваю жонку і дзяцей выдаткоўваў. Не трэба споведзі; таксама як турэцкі прарок Магамет дазваляе шмат жонак браць і сам дзевяць жонак на свеце меў і яшчэ ў раі спадзяецца семдзесят жонак мець, таксама як усе грахі спадзяецца халоднаю вадою змыць і ўсіх грахоў пазбыцца адным словам *«tobe Estafurta»*. І з такой вераю, з такімі ўчынкамі хочуць тыя рэлігіі ўратавацца! Ах, якія надзвычай шчаслівыя мы, прававерныя хрысціяне, што такую добрую і справядлівую веру маем, што нашыя малітвы, пасты, міласціна, пабожнае жыццё недарэмныя. Маем без сумненняў вялікую надзею, што будзем цешыцца ў раі, бо адчыніць нам браму Езус Хрыстус, і што маем так шмат святых пакутнікаў, якія цяпер у раі і будуць спрыяць нам перад Богам; ад святога Пятра аж да святога папы Сільвестра ўсе былі пакутнікі. Толькі святы Сільвестар сваёю смерцю памёр, і ён таксама за нас будзе маліцца.

Споведзь наша каталіцкая святая, пабожная, і патрэбная, не такая, як у няверных габраяў, у якіх, калі ў грахах хоча хто прызнацца, дык ідзе ў школу і ў прысутнасці ўсіх габраяў кажа рабіну ўголас, які грэх мае і з якою асобаю, дык адразу пра яе кепская слава разносіцца. Калі яна раней таемна з ім адным

сустракалася, дык пасля гэтае паскуднае споведзі публічнаю блудніцаю становіцца. Габраі нашу споведзь ганяць, а ў саміх у Старым Запавеце ёсць, што калі яшчэ ў школе Саламонавай прыносілі ахвяры габраі, то на шыі валоў, кароў, авечак, коз руку клалі і ў вуха жывёле свае грахі распавядалі, і так, лічылася, адпускаюцца ім грахі. Калі такое было ў Старым Запавеце, што перад жывёлаю спавядаліся ў грахах сваіх і адпускаліся ім грахі, дык яшчэ лепей, калі мы спавядаліся мудраму і пабожнаму ксяндзу, намесніку Хрыстоваму, які пабожнае пакаянне ўскладзе, прымусіць задумацца і параіць, як нам спакусы сустракаць і не грашыць, і яшчэ за нас Пана Бога просіць, і даруе нам грахі, паводле абяцання Пана Езуса, які святому Пятру абяцаў: «Пятро, што звяжаш на зямлі, тое і я ў небе, а што ты развяжаш на зямлі, тое і я ў небе».

Што кажуць пра крывасмокаў, я таму не пярэчу і не сцвярджаю, бо я ў многіх краях бывала і ўсюды інакш баюць. Пра тых вампіраў у Польшчы кажуць, што гэта бабы, якія забіраюць дзяцей і кожнае дзесятае д'яблу аддаюць.

Тут на старонцы 311 рукапісу тэкст абрываецца. Старонкі 312—366 пранумараваныя, але без тэксту. На старонцы 367:



ПЕСНЯ МАЕ КАМПАЗІЦЫІ

Ах, мой Божа, Пан неба й зямлі Усемагутны, май літасці болей
Ты нам лёсам няўдалым маім, над маёю нікчэмнаю доляй,
Бо грахі мне прынеслі столькі пакутаў,
І нястач, і нягод, і душы маёй мукаў —
І за гэта я дзякую міла.

Загадаў Ты цярпець, дык і моцы дай мне, так слабому стварэнню,
Каб я здольнай была атрымаць зноў тваё суцяшэнне.
Як жа цяжка мне тут, памажы мне, мой Пане,
У цяперашнім гэтым пакінутым стане,
Вось пра гэта прашу я Цябе.

Лепш бы мне ад чужой і далёкай пакутаваць веры,
Чым ад тых, да Цябе з кім ў адны я заходзіла дзверы.
І дарма мая шчырасць, нішто ўсё старанне,
За якое нясу я штодзень пакаранне:
Пэўна, воля Твая тут такая.
Бачыш сам жа Ты, мілы мой Божа, як шчыра я прагну спакою,
Ды шукае спажытку ворагаў зграя і злосць рыхтуе да бою,
Адбірае здароўе, набытак мой траціць,
Зневажае Цябе і чыніць кпіны радзіць,
Як пакаранне ад Бога.

А Ты, мілы мой Пане, май літасці болей над смуткам маім,
Бо ўжо маеш цяпер найвярнейшага лёкая ў почце сваім.
Не змушай, каб з-за цяжкага суму і ранаў
Залівала сваімі слязьмі акіяны:
За сваё я ўжо шмат атрымала.

Міласэрнасць Тваю хай жа зведае нават і той, хто ў грахах патанае
(Бо не хочаш Ты згубы), пазбыўшыся злосці, ён рай атрымае.
Сэрца ў скрусе, аднак я люблю Цябе, Пане,
Дык няхай жа на свеце даволі ўжо стане
Тваёй Справядлівасці.

Не малолі б лухты прасцякі пра мяне: «яна крывіць душою»,
То ж не так, Пане мой, бо заўсёды я сэрцам з Табою.
Дзеля ўсіх хрысціян не шкада мне нічога,
Не мець толькі б згрызотаў сумлення святога.
Цябе я вітаю, мой Езус!

Я гэтыя сем строф, што тут у сваёй песні скампанавала маім
кепскім розумам, ахвярую Прачыстай Маці, Панне Марыі, на
святы Абраз на памятку пра сем пакут Ейных і Пана Езу-
са Хрыстуса, каб і я ад іх нявінных пакут палёгку і
цярплівасць мела ў сваіх крыўдах і маркоце, як так-
сама на памятку пра сем радасцей Прачыстай Маці,
каб я ад Ейных пабожных сямі радасцей была
ўцешана ва ўсіх смутках і клопатах маіх
і каб мяне Бог мой хоць у апошнія дні
мае блаславіў спакойным і пабожным
жыццём, чаго я перш-наперш усім
людзям зычу, а пасля і мне дай
таксама, Божа Усемагутны,
А
М Е
N.

Каментарыі

Да ласкавага чытача

* [1] Саламея Пільштынова (Русецкая) лічыць сябе полькаю, а сваю Наваградчыну — Польшчаю. Гэта й нядзіва! У сярэдзіне XVIII ст. найменні «беларус», «беларускі» сустракаліся надзвычай рэдка.

* [2] У старабеларускай мове слова «белагаловая» ўжывалася ў значэнні кабета, жанчына.

Раздзел першы

* [1] Літвою аўтарка па тагачаснай традыцыі называе беларускія землі, што ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага, дзе беларусы мелі сваю дзяржаўнасць.

[2] *Стамбул* — (даўней Канстанцінопаль) у 1453—1920 гг. сталіца Турцыі.

[3] *Чаўш* — пасланец альбо лёкай (камердынер) турэцкага султана.

[4] *Леў* — балгарская грашовая адзінка.

[5] *Махмед* — дакладней: Махмуд I (1730—1754), у 1737 — 1739 гадах вёў з Аўстрыяй і Расіяй вайну, у якой здабыў Малую Валахію і паўночную Сербію.

[6] *Дэкокт* — адвар з лекавых зёлак.

[7] *Супліка*— прашэнне.

[8] *Візір — (тур.Vezier)* тытул міністраў і найвышэйшых саноўнікаў у колішняй Турцыі. Тут гаворка пра вялікага візіра, які быў намеснікам султана, старшынстваваў у Дыване і кіраваў усёй адміністрацыяю дзяржавы.

* [9] *Паўлокаць* — даўняя мерка даўжыні. Локаць роўны 576 мм.

[10] *Сакет* — насілкі.

---

* Каментарыі, пазначаныя «зорачкай», зроблены Міколам Хаустовічам.

[11] *Дыван* — найвышэйшы суд у Турцыі, а таксама сход, аўдыенцыя.

[12] *Кінды* — вячэрняя малітва ў мусульман.

[13] *Рэспонс* — адказ.

[14] *Дахвадзыямі* — *Da'wā* азначае скаргу ў цывільным альбо крымінальным працэсе; адсюль дахваджы (?), відаць, гэта абвінаваўца, той, хто скардзіцца.

[15] *Турэцкая кеса* — грошы. Паводле слоўніка Ліндэ мела вартасць 333 і адну траціну франка.

[16] *Тынф* — даўняя манета Рэчы Паспалітае вартасцю 18 срэбраных грошаў. Назва паходзіць ад прозвішча манетчыка Тымпфа з часоў Яна Казіміра (каля 1662 г.).

* [17] *Фансека Даніэль* — лейб-медык султана Ахмеда III. Лячыў у Бендэрах шведскага караля Карла XII, які пацярпеў паражэнне ў Палтаўскай бітве. Пасля стамбульскіх падзей, якія апісвае С. Пільштынова (Русецкая), пераехаў у Парыж, дзе сустракаўся з Вальтэрам.

[18] *Нападнікі* — фальшывыя абвінаваўцы.

[19] *Паша-капысы* — (*kapuči* — вартаўнік, брамнік.) Даводцамі *kapučich* былі так званыя *Kapuči* Bashi, нешта накшталт прыдворных шамбелянаў ці падкаморых.

[20] *Бруса* — (*тур. Bursa*) сталіца турэцкай правінцыі ў Малой Азіі.

* [21] Радкі, змешчаныя ніжэй (да раздзела «Мая другая авантура ў Стамбуле»), у рукапісе былі напрыканцы раздзела «Падарожжа і прыгоды ў Рушчуку».

[22] *Кавяр* — прадавец кавы.

[23] *Соп* — кій, палка.

[24] *Янычар-ага* — начальнік, палкоўнік янычараў, вайсковы камендант горада.

[25] *Вывіндыкаваць* — забраць назад, вярнуць.

[26] *ad instar* — (*лац.*) падобна на; на ўзор.

[27] *Гадвахта* — (*ням. Hauptwache*) гаўптвахта.

[28] У рукапісе: нянавісць.

[29] *salvo honore* — не кранаючы гонар. Тут: даруйце, перапрашаю.

[30] *Тарпас* — вязніца.

[31] *syropus violarum* — братковы сіроп.

[32] *de novo* — тут: зноў.

[33] *balsam kopaiba* — *balsam copaivae*, капайскі бальзам.

* [34] *Шатны* — лёкай, што клапоціцца пра гардэроб султана.

[35] *lignum aloes* — альяс. Апрача медыцны, альяс ужываўся пры кадзенні, бо меў моцны пах.

[36] *Цыбук* — *(тур. tschubuk)* трубка да люлькі.

[37] У рукапісе: пад сваю сальвацыю (лячэнне).

[38] *Батачы* — (Балат?) можа, у ваколіцы Балат Капу, гэта значыць стралецкае вежы (брамы).

[39] *Фенер* — (Фанар) раён Стамбула.

[40] *Манеле* — бранзалеты; бранзалет, які надзяваюць на плячо альбо прадплечча.

[41] *Кульцы* — завушніцы.

[42] *Янычары* — жаўнеры турэцкае пяхоты, якія ў мірны час станавіліся турэцкай міліцыяй. У асноўным гэты былі дзеці хрысціян, якіх прымусілі прыняць мусульманскую веру.

[43] *Эгіп* — (Эюб) паўночны раён Стамбула.

[44] *Кадыні* — тут, відавочна, у значэнні: гаспадыні, пані.

[45] *Апрахандавала* — гэта значыць адчувала, што нешта кепскае хаваецца ў тых словах, прадчувала абман.

[46] *Ферман* — (ці фірман) ардынанс, пісьмовы загад султана.

[47] *Патынак* — чаравік, боцік.

[48] *Апрахензія* — неспакой.

[49] *Эстыма* — гонар, павага.

[50] *Вышальбераваў* — выдурыў, украў.

[51] *Інкаўст* — атрамант, чарніла.

[52] *Адрыянопаль* (Одрын, Эдзірнэ) — горад у еўрапейскай частцы Турцыі над ракой Марыцаю.

[53] *valoris* ...5 — вартасцю 5 чырвоных злотых.

[54] *a parte* — *(лац.)* асобна.

[55] Гэтая кніга не захавалася.

[56] *Хаджы* — так называюць магаметаніна, які наведаў Ерусалім альбо Мекку.

[57] *Біліград* — Бялград, сённяшняя сталіца Югаславіі, альбо Бялаград (Акерман).

[58] *Відынь* — невядома, пра які горад гаворка: пра Вену ці пра Відзін. Аўтарка тут, як у іншых месцах, не разрозніла іх, напрыклад, у Відыню імператарскім (г. зн. Вене) і ў Відыню турэцкім (Відзіне).

[59] *Апрахензія — тут: роспач, адчай.*

* [60] *Словы напісаны па-беларуску.*

[61] *Ямбул* — (Ямбол) горад у Балгарыі.

[62] *Татар-Пазарджык* — горад у Балгарыі над ракою Марыцаю (зараз Пазарджын).

[63] *Эфендзі* — пан, высокі турэцкі чыноўнік.

[64] У аўтаркі: *ryzu*.

[65] *Урумель* — Усходняя Румынія, урадлівая раўніна між

Балканамі і гарамі Радопі, Бештэпе-Даг і Істранджа-Даг у Балгарыі са сталіцаю Філіпапалем.

[66] *Філіпбей* — Філіпапаль (Плоўдзіў), горад у Балгарыі над ракою Марыцаю.

[67] *Мерыч* — Марыца, рака на Балканах.

[68] *Назыр* — (арабс. *nâssir)* наглядчык, тут: намеснік.

[69] *Паша* — валадар, турэцкі намеснік альбо палкаводзец.

[70] *Хасекі* — намеснік бастанджы-пашы.

[71] *Бастанджы-паша* — (літаральна: садоўнік) высокі палацавы чыноўнік турэцкіх султанаў. Валадар Адрыянопаля меў тытул бастанджы-пашы, як кіраўнік корпуса 1500 бастанджаў.

[72] *Муселім* — губернатар.

[73] *Супаша* — бурмістр, гарадскі войт.

[74] *alias (лац.)* — ці; альбо.

[75] Пятага сына аўтарка прапусціла.

[76] *elixir proprietatis — (elixir proprietatis Paracelski)* квасны эліксір альясу (альяс, міра, шафран, сярністая кіслата, вінны спірт).

[77] *Карлава* — горад у Балгарыі.

[78] *Кампасія* — спачуванне, літасць.

[79] Вышэй аўтарка пісала пра 30 вершнікаў.

[80] *Суфіцыенцыя* — (літаральна: дастатак) утрыманне, забеспячэнне.

[81] *Кюпру-улу* — хутчэй за ўсё з роду Кёпрёлю, магчыма, сын Ахметшах-задэ Гусейна, што памёр у 1702 г.

[82] *Вайна з маскалямі* — вайна, якую вяла Расія з 1735 г., прынесла ёй Азоў, Перакоп, Бахчысарай. У 1739 г. пасля перамогі пад Славучанамі рускія захапілі Хоцін, перайшлі Прут, асадзілі Ясы, заглыбіліся аж да Дуная.

Бабадагіо — у Дабруджы (правінцыя Румыніі).

[83] *Карл VI* (1658—1740) — апошні спадкаемца Габсбургаў па мячы, з 1711 г. на імператарскім троне. У 1718 г. атрымаў па пасаровіцкім (пажаравацкім) мірным дагаворы Банат, частку Сербіі, Босніі і Валахіі. У 1739 г. у выніку няўдалай вайны з Турцыяй страціў пераважную частку здабытага.

[84] *Ныса* — (Ныс) горад у Югаславіі (Сербія).

[85] *Зекендорф Фрыдрых Генрых* (1673—1763) — аўстрыйскі фельдмаршал і дыпламат. Пасля няўдалай вайны з Турцыяй ён, як даводца арміі, у 1739 г. быў пасаджаны ў астрог.

[86] *Таін* — плата прадуктамі.

[87] *Мінеральныя воды* — у Сафіі шмат сярністых крыніц.

[88] *Кантрактуры* — скрыўленне часткі цела ў выніку хваравітых курчаў, хранічных боляў суставаў і інш.

* [89] *Фраўцымер* — прыдворныя дамы, фрэйліны.

[90] *Merkuriusz solwacja — Mercurius solvatio*, ртутная вадкасць.

[91] *Раковым лекарам* — тэрміновым, па кантракце.

[92] *Concordancia* — відаць, гэта слова з лексікона народнай медыцыны.

Mulerisztal — невядомае слова.

Minsycht — гаворка пра кнігу: Адрыян Мінзіхт... *Thesaurus et armamentarium medico-chymicum in quo selectissimorum contra quosvis morbos pharmacorum conficiendorum secretissimaratio aperitur, una cum corundem... usi et dosi...* Ратгамагі, 1651. (Было некалькі выданняў, між іншым, і нямецкі пераклад: Штутгарт, 1682).

Гербарый — кніжка пра лекавыя зёлкі.

[93] *Смірна* — (тур. Ізмір) сталіца правінцыі на захадзе Малой Азіі.

[94] *Лёгорна* — Ліворна(?)

[95] *Фрыкасэ* — далікатэсы(?)

[96] *Відынь (Відзін)* — горад у Балгарыі над Дунаем.

[97] *Хан* — карчма, аўстэрыя.

* [98] *Дамніц* — нічога пэўнага пра гэтага генерала невядома. Польскія даследчыкі лічаць, што аўтарка пераблытала Дамніца з Леапольдам Даўнам (1705—1766), выдатным палкаводцам з часоў Марыі-Тэрэзы.

* [99] *Рэгімент* — вайсковае падраздзяленне, полк.

[100] *Краёва* — сталіца акругі на Валахіі. У 1737 г. аўстрыйцы пацярпелі тут паражэнне.

[101] *Гэмайн — (ням. gemeiner Soldat)* просты жаўнер.

* [102] *Будым* — назва нерасшыфраваная.

[103] *Легуміна* — тут: прадукты.

[104] *Грац* — (Граз, Градзец) сталіца Штырыі (Аўстрыя).

Штаермарк — княства Штырыі ў паўднёвай Аўстрыі.

Карніёлія — Карынція, край у паўднёвай Аўстрыі. Паўднёвая частка яе цяпер належыць Славеніі (Югаславія).

Лайбах — напісанне гэтага слова ў аўтаркі рознае, што абцяжарвае месцазнаходжанне намі гэтага горада. Апісаная пазней дарога паказвае, што Лайбах — гэта Любляна, сталіца Славеніі.

[105] *Юзаф Ракацы* (1700—1738) — сын Францішка II Ракацы. Выхоўваўся ў Аўстрыі, уцёк у Францыю (1734). У час усходняе вайны (1737—1738) туркі вылучалі яго як кандыдата на венгерскі трон. Ягоны бацька (1676—1735), народны венгерскі герой, у барацьбе супраць Габсбургаў прасіў у 1717 г. дапамогі ў Турцыі. Памёр у Радосце.

[106] *Тэкірдаг* — горад на беразе Мармуравага мора ў еўрапейскай частцы Турцыі, сёння Радоста.

[107] *Чакі* — можа, Імрэ Чакі, граф, святар і пісьменнік (1672—1732).

[108] *Мустафа III* (1757—1773) — турэцкі султан, нарадзіўся ў 1717 г. У 1768 г. пачаў вайну з Расіяй у абарону вольнасці Рэчы Паспалітай.

* [109] *Кармазынавы* — ярка-чырвоны.

* [110] *Амарантавы* — малінавы ці цёмна-чырвоны.

[111] *Рушчук* — (балг. Русе) горад на Поўначы Балгарыі, з XVII ст. моцная турэцкая крэпасць.

[112] *Вечны мір з туркамі* — на аснове карлавецкага міру ў 1699 г.

* [113] *Катаплазмы* — прыпаркі.

[114] *Азоў* — горад ля Азоўскага мора. У 1696 г. захоплены Пятром І. У 1711 г. адваяваны туркамі, але ў 1739 г. зноў захоплены рускімі.

[115] *Магілёў* — (Магілёў-Падольскі) горад на Украіне.

[116] *Бар* — горад на Падоллі на захад ад Вінніцы.

Раздзел другі

[1] *Дубна* — павятовы горад на Валыні.

[2] *Сангушка* — пэўна, Павел Караль Сангушка (пам. 1759), маршалак вялікі літоўскі, астрожскі ардынат.

[3] *Алыка* — горад на Валыні, з 1589 г. цэнтр алыцкае ардынацыі князёў Радзівілаў.

[4] *Радзівіл* — Міхал Казімір Рыбанька, ваявода віленскі і вялікі гетман літоўскі (1702—1762). (Аўтарка памылкова называе яго польным гетманам.)

[5] *Нясвіж* — павятовы горад у Наваградскім ваяводстве, з 1586 г. цэнтр нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў.

* [6] *Рынкрага — (ням. Ringkragen)* металічная пласцінка з выявою герба, якую насілі на грудзях.

* [7] *Масква* — Расійскую дзяржаву ў тыя часы вельмі часта называлі Масквою ці Масковіяй.

[8] *Інстанцыяльны ліст* — рэкамендацыйны, заступніцкі ліст.

[9] *Анна Іванаўна* (1693—1740) — дачка Івана V, жонка курляндскага князя, пасля ягонае смерці кіравала тым краем з дапамогаю свайго фаварыта Бірона. Пасля смерці Пятра II (1730) партыяй баяраў на чале з Даўгарукімі і Галіцынымі была ўзведзена на расійскі трон. Вяла вайну з Турцыяй і здабыла Азоў.

[10] *Лопат* — Станіслаў Лопат. стараста бабруйскі ў 1748 г.,

пісар наваградскі і стражнік польны літоўскі (1758). Памёр каля 1769 г.

[11] *Радзівілава* — невядома пра каго ідзе гаворка, бо ў той час наваградскімі ваяводамі былі: Ян Мікалай Радзівіл (1709—1729), Мікалай Фаўстын Радзівіл (1729—1746), Юры Радзівіл (1746—1754). Магчыма, гэта была ўдава ваяводы Юрыя.

[12] *Дуніна* — князёўна Рэгіна Трубяцкая, жонка Антона Дуніна, спадкаемца Тутава ў Віцебскім ваяводстве.

[13] *Царэвіч* — спадкаемца трона, пэўна, Іван VI Антонавіч (1740—1741), сын прынца Антона-Ульрыха Брауншвейг-Люнебургскага і кніягіні Анны Леапольдаўны, прызначаны Аннай Іванаўнаю спадкаемцам трона, у 1740 г. абвешчаны царом. У 1741 г. пасаджаны разам з маці ў вязніцу, дзе быў больш за дваццаць гадоў. Замардаваны ў 1764 г.

[14] *Кароль* — Аўгуст III Сас.

[15] *Біржы* — (цяпер Біржай) горад у паўночнай Літве, уласнасць Радзівілаў.

[16] *Белая Царква* — горад на Украіне.

[17] *Бісмарк* — Людольф Аўгуст фон Бісмарк (1683—1750), расійскі генерал, швагер Бірона.

[18] У аўтаркі Ніва.

[19] *Юзаф Патоцкі* (пам. 1752 г.) — у 1702 г. стаў кіеўскім ваяводаю. У 1704 г. перайшоў на бок Станіслава Ляшчынскага, з рук якога атрымаў булаву польнага, а пасля і вялікага гетмана. Пасля Палтаўскае бітвы быў даводцам антырасійскае эміграцыі. Пагадзіўшыся з Аўгустам III, стаў у 1735 г. вялікім каронным гетманам. На сеймах дамагаўся памяншэння колькасці войска.

[20] *vice versa* — у адказ.

[21] *Нарва* — крэпасць і горад у Эстоніі.

[22] *Пятро I Вялікі* (1672—1725), расійскі імператар.

* [23] *Тарас Абрамавіч Шацілаў (нар. 1686)* — зрабіў кар'еру пры Пятру Вялікім. У 30-я гады быў камендантам у Нарве. У 1841 г. атрымаў адстаўку ў чыне генерал-маёра.

* [24] *Каравулаў Сямён Юр'ервіч* — Каравулавы, дваранскі род, продак якіх — пасол хана Залатое Арды ў Маскву Ямгурэй-Каравул — застаўся на Русі і прыняў хрост. С. Ю. Каравулаў прымаў удзел у захопе Ачакава, за што быў узнагароджаны чынам брыгадзіра. Пазней ён быў членам Ваеннае Калегіі.

[25] *Інкурсія* — наезд. Гаворка пра маскоўскі наезд у сувязі з выбраннем на польскі трон Аўгуста III Саса ў 1735 г.

* [26] *Князь Чаркаскі* — род князёў Чаркаскіх бярэ пачатак ад кабардзінскага валадара Інала. Аляксей Міхайлавіч Чаркаскі (1680—1742) спрыяў выбранню Анны Іванаўны на трон, за

што быў прызначаны ёю адным з трох кабінет-міністраў, а ў 1840 г.— канцлерам. Гісторыкі адзначаюць, што быў ён паслухмяным выканаўцам волі Бірона.

* [27] *Княгіня Чаркаская* — Марыя Юр'еўна Чаркаская (1696—1747), другая жонка А. М. Чаркаскага, была статс-дамаю пры двары Анны Іванаўны.

[28] *Лізавета Пятроўна* (1709—1762) — дачка Пятра I і Кацярыны I. У 1741 г. захапіла расійскі трон, арыштаваўшы рэгентку Анну і маладога цара Івана VI.

[29] *Бірон* — Эрнест Ян Бірон (1690—1772), усеўладны фаварыт Анны Іванаўны. З 1737 г. курляндскі герцаг, у 1740 г. арыштаваны і высланы ў Сібір Мініхам, вярнуўся ў 1741 г. У 1763 г. вярнуў сабе Курляндыю.

[30] *Анна спадкаеміца* (1718—1746) — Анна-рэгентка, дачка мекленбургска-шверынскага князя Карла Леапольда і Кацярыны Іванаўны. У 1739 г. выйшла замуж за Антона-Ульрыха; маці Івана VI. Пасля смерці царыцы Анны Іванаўны яна была названа рэгенткаю і была ёю да арышту ў лістападзе 1741 г.

[31] *Камер-лёкай* — камердынер, лёкай.

* [32] *Князь Галіцын* — Галіцыны, княскі род, што бярэ пачатак ад вялікага князя літоўскага Гедыміна. Міхал Аляксеевіч Галіцын, па мянушцы Кваснік (1697—1775), блазан Анны Іванаўны. Пра ягонае вяселле ў Ледзяным доме з любімаю калмычкаю царыцы Аўдоццяю Іванаўнаю Бужанінаваю ведала ўся Еўропа.

[33] *Лізавета фон Вольфенбытэль* — Эльжбета Браўншвейг-Вольфенбютэль (1691—1750), дачка князя Людвіка Рудольфа.

[34] У аўтаркі: судадзел — судовы чыноўнік.

[35] *Рагоўка* — жаночая сукня, пры вырабе якое выкарыстоўваўся кітовы вус.

[36] *На староныы 64* — так у рукапісе, у нас на старонцы 60.

[37] *Кірасійскім* — відаць, кірасірскім.

[38] *Лейб-кампанія — (ням. Leibkompanie)* прыдворныя царскія войскі.

[39] *Кізерлінг* — Герман Карл Кайзерлінг (1697—1764), расійскі дыпламат, па паходжанні курляндскі шляхціц.

[40] *Остэрман* — Генрых Еган Остэрман (1687—1774), граф, расійскі дыпламат, па паходжанні вестфалец. На расійскай службе з 1703 г., з 1734 г.— першы міністр Анны Іванаўны, а ў 1742 г. высланы Лізаветай Пятроўнаю ў Сібір.

Валынскі — Арцём Пятровіч Валынскі (1689—1740), расійскі дыпламат, з 1738 г.— міністр.

[41] *Кулянт — (фр. coulant)* упрыгожанне, што вешаюць на ланцужку на шыі.

[42] *et mobilia (лац).* — і рухомыя рэчы.

[43] *Ульрых князь Гальштынскі* — Фрыдэрык Карл Гольштэйн-Готтарп, бацька цара Пятра III.

[44] *Справа Даўгарукіх* — Васіль Лукіч Даўгарукі (1670—1739) пасля смерці Пятра II, унука Пятра I, склаў фальшывы тастамант маладога цара. Пазней ён спрыяў абранню на расійскі трон Анны Іванаўны (1730), даючы ёй на подпіс акт, які абмяжоўваў царскую ўладу. Анна Іванаўна арыштавала Даўгарукага, а ў 1739 г. судзіла за фальсіфікацыю тастаманту Пятра II, і па выроку суда Васіль Даўгарукі быў пакараны смерцю. Разам з ім былі асуджаныя на смерць Іван Аляксеевіч Даўгарукі, а таксама Васілёў брат Сяргей Даўгарукі.

[45] *Князь курляндскі* — відаць, Фердынанд Кетлер, княжыў у 1698—1709 і 1711—1737, апошні з дому Кетлераў.

[46] *Эгзентэраваць* — ускрываць труп.

* [47] *Сіпахі* — вайскоўцы з султанскага кавалерыйскага корпуса.

[48] *У Нарву* — памылка аўтаркі. Трэба: да Рэвеля (Таліна).

* [49] *Цухны (чухонцы), ці маймісты* — так у прастамоўі раней называлі фінскія плямёны эйрэмейсетаў і савакотаў, што жылі ў былых Пецярбурскім, Шлісельбургскім, Пецяргофскім і Царскасельскім паветах.

[50] *dubium (лац.)* — сумненні. Тут: пра намеры якога і не падазравалі.

[51] *Руіна* — тут: напад, наезд.

[52] *Дысымулявалі* — былі асцярожнымі; не паказвалі, што іх няшмат альбо што яны баяцца.

[53] *Вількамір* (Укмерге) — літоўскі горад, на паўночны ўсход ад Коўна.

[54] *Лахва* — мястэчка, а цяпер вёска ў Лунінецкім павеце.

[55] *Бендэры* — горад у Бесарабіі.

[56] *Аднаго сына* — Аляксея Пятровіча (1690—1718), жанатага з Каралінаю Вольфенбютэль з Браўншвейгу, сястрою аўстрыйскае імператрыцы Лізаветы. Выступаў колькі разоў супраць бацькі. Праз надуманую дзяржаўную здраду быў асуджаны на смерць і памёр у час катаванняў ці, як кажуць, быў замучаны ўласным бацькам. Пакінуў сына Пятра, пазнейшага Пятра II.

[57] *Марыя-Тэрэза* (1717—1780) — рымска-нямецкая імператрыца, каралева Чэхіі і Венгрыі, дачка апошняга з Габсбургаў імператара Карла VI. У 1736 г. выйшла замуж за латарынгскага герцага Францішка Стэфана. У 1772 г. брала ўдзел у Першым падзеле Рэчы Паспалітае.

[58] *Вайна... са шведамі* — Пятро I у 1700 годзе падпісаў мір з Турцыяй, забяспечыўшы сабе Азоў, і разам з Даніяй і Аўгустам II пачаў вайну супраць Швецыі. Здолеў захапіць шведскія прыбалтыйскія ўладанні, дзе заснаваў у 1703 г. Пецярбург.

[59] *Кацярына* — Кацярына I Аляксееўна (1684—1727), з беларускага роду Скаўронскіх; у 1702 г. захоплена ў палон, стала каханкаю Меньшыкава, пасля Пятра I, які ўзяў з ёю шлюб у 1712 г. Пасля ягонае смерці кіравала дзяржаваю, абмежавала ўладу сенату, заснаваўшы найвышэйшы Тайны Савет.

[60] *Першую* (жонку) — Аўдоцця Хведараўна Лапухіна, першая жонка Пятра I (з 1689), маці Аляксея, у 1698 г. была зняволеная ў манастыры. Вызвалена пасля ўступлення на трон Пятра II.

[61] *Градэтур — (фр. gros de Tours)* від шчыльнае ядвабнае тканіны, якую выраблялі ў французскім горадзе Тур.

[62] *Кампанкі* — званочкі, бомы.

[63] *Аінорас* — Святая гара, навагрэчаская назва гары Афон, якую праваслаўныя лічаць за другі Ерусалім. Цяпер гэта манаская праваслаўная рэспубліка, што складаецца за 20 манастыроў, 12 вёсак і шматлікіх пустэльняў. Тут захоўваюцца выратаваныя манахамі мастацкія каштоўнасці і манастырскія бібліятэкі, якія пасля захопу Канстанцінопаля туркамі былі ў небяспецы. У апошні час там адкрыта шмат невядомых дасюль славянскіх рукапісаў.

[64] *Ачакаў* — мястэчка на Украіне (зараз у Нікалаеўскай вобласці). Ачакаў з 1492 г.— моцная турэцкая крэпасць. У 1737 г. яго захапілі рускія.

Хоцін — горад у Бесарабіі на правым беразе Днястра. Пад Хоцінам адбылося некалькі бітваў, у час якіх туркі былі разбітыя.

[65] *Бахчысарай* — горад у паўднёвай частцы Крыма; даўней рэзідэнцыя крымскіх ханаў. Упершыню захоплены Расіяй у 1736 г.

[66] *Анна* — Анна Пятроўна, маці Пятра III.

[67] *Сына* — пазнейшага імператара Пятра III (1728—1762), мужа Соф'і фон Ангальт-Цербст, пазнейшай імператрыцы Кацярыны II, якая скінула яго з трона. Замардаваны ў 1762 г. Аляксеем Арловым.

[68] *Мойка* — тут: адзін з раёнаў Пецярбурга.

[69] *Кірыла* — аўтарка памыляецца. Фаварытам Лізаветы Пятроўны быў Аляксей Разумоўскі (1709—1771), сын рэестравага казака Разума з Украіны. Ён удзельнічаў у палацавым пераводе ў 1741 г., у выніку якога Лізавета стала царыцаю. Ягоны брат, Кірыла (1728—1803), апынуўся ў царскім двары толькі ў 1743 г. і

прайшоў шлях ад непісьменнага да прэзідэнта Пецярбургскае Акадэміі навук.

[70] *Мазепа* — Ян (Іван) Мазепа (1644—1709), казацкі гетман (сапраўднае прозвішча — Каладзінскі). Езуіцкі выхаванец, быў пажам Яна Казіміра. Пакінуўшы з-за інтрыг двор, асеў у 1665 г. у дзедзічнай вёсцы на Валыні. Пасля апісанае тут авантуры ўцёк у Задняпроўскую Украіну і выслужыў сабе тытул гетмана. У 1689 г. зблізіўся з Пятром І, удзельнічаў у ягоных паходах на Азоў і Рэч Паспалітую. Пасля, убачыўшы небяспеку, якая пагражала казацкай вольнасці з боку Масквы, зблізіўся з Карлам XII і Станіславам Ляшчынскім. Пасля няўдалага казацкага паўстання ў 1708 г. і Палтаўскае бітвы ўцёк у Турцыю, дзе і памёр. Праваслаўная царква аддала яго анафеме.

[71] *Пячорск* — раён Кіева са слынным Пячорскаю Лаўраю, праваслаўным манастыром, заснаваным у XII стагоддзі.

[72] *Брагілоў* — Браіла, горад у Румыніі.

[73] *Бранкаван* — Канстанцін Бранкавану быў валашскім гаспадаром у 1688—1714 гг.

[74] *Эды Куле* — (у рукапісе: віндыкула) Замак Сямі Вежаў у Канстанцінопалі.

[705] *Батурын* — горад на Украіне, сядзіба Мазепы.

[76] З funditu — (правільна: *funditus*) дашчэнту.

[77] *Пятро Фёдаравіч* — Пятро III Фёдаравіч, сын Анны Пятроўны і князя Карла Фрэдэрыка фон Гольштэйн-Готарп.

[78] *Навагрод* — відаць, Ніжні Ноўгарад.

Кітай-горад — раён Масквы вакол Крамля.

[79] *Кітай* — тут: тонкае баваўнянае палатно кітайскага паходжання; танная тканіна.

[80] *Сак, султана* — жаночыя строі.

[81] *Асамблея* — (*фр. assemblée*) сход.

* [82] *Касцюрын* — Іван Іванавіч Касцюрын, генерал-аншэф, обер-камендант Пецярбурга, пазней сенатар.

* [83] *Глебаў* — Іван Фёдаравіч Глебаў (1707—1774), генерал-аншэф, сенатар. З 1751 па 1756 гг. знаходзіўся ў Новай Сербіі, дзе дапамагаў І. С. Харват-Аткурцічу.

[84] *Новая Сербія* — назва, якая ўжывалася ў XVIII стагоддзі ў дачыненні да паўночнае часткі Херсонскае губерні, дзе былі ваенныя пасяленні сербаў.

* [85] *Харват* — Іван Самойлавіч Харват-Аткурціч (пам. 1780 г.) — генерал-паручык, ініцыятар перасялення сербаў (пасля іх канфлікту з Марыяй-Тэрэзаю) у Расію. За злоўжыванні высланы ў Волагду.

[86] *Каятан Браніцкі* — хутчэй за ўсё Ян Клеменс Браніцкі

(1689—1771), з 1735 г. гетман польны, з 1751 г. вялікі гетман каронны.

87 *aqua plantaginis — (Plantago lanceolata)* трыпутнікавая вада.

88 *Мулефікацыя* — памякчэнне, давядзенне да стану мяккасці з дапамогаю невядомых нам спосабаў лячэння.

89 *Гектыка* — хвароба, якая характарызуецца моцным павелічэннем тэмпературы ўвечары і рэзкім падзеннем раніцаю.

90 *Пайпер* — бедны шкаляр, вучань, які жыве на касцельную дапамогу і міласціну.

91 *Мантыка* — буркун, няўклюда; чалавек, які сам не ведае, чаго хоча.

92 *Раскольнікі* — праваслаўныя (стараверы), якія адышлі ад афіцыйнае расійскае царквы. Раскол адбыўся ў 1654 г. у выніку рэформаў патрыярха Нікана.

93 *Грэкі* — тут: праваслаўныя.

94 *Чарнец* — праваслаўны манах.

95 *Авантаж — (фр. avantage)* заробак.

96 *Жолква* — горад непадалёку ад Львова.

97 *Імператарская дзяржава* — Аўстрыя.

* 98 *Гажа* — жалаванне, аклад.

99 *Шчытава* — жонка Крыштафа Шчыта, кашталяна смаленскага ў 1713—1720 гг.

100 *Алава* — горад у Ніжняй Сілезіі.

Ныса — (ням. Neisse) горад у Ніжняй Сілезіі.

Брын — (ням. Brünn) Брно Мараўскае.

Нікальсбург — (ням. Nikolsburg) Мікулаў, горад у Маравіі.

101 *Ніжняя і Верхняя Карніёлія* — Ніжняя і Верхняя Карынцыя.

102 *Леапольд* — нямецкі імператар Леапольд I Габсбург (1658—1705).

103 *Леапольдштад* — мястэчка, сёння раён Вены.

«bain rotyn resyl» — (ням. beim roten Rössel?) пад чырвоным коннікам.

104 *auf ale Weise Madam Fähnrichin...* — безумоўна, пані харунжыха...

105 *Яе мосць імператрыца* — Ельжбета фон Вольфенбютэль.

106 *Jhre Gesundheit Engelsche Madam* — за тваё здароўе, пекная пані.

107 *Кавалертафель — (ням. Kavaliertafel)* стол для шляхты на імператарскім двары.

108 *Маріаш* — даўняя венгерская манета з выяваю Панны Марыі; роўная 17 крайцарам.

109 *in die Leopoldstadt* — у Леапольдштад.

[110] *Штоф* — расійская мера вадкасці, дзесятая частка вядра, каля 5 квартаў.

[111] *Францішак I Стэфан* (1708—1763) — у 1729 г. стаў латарынгскім князем, у 1738 г. змяніў Латарынгію на Тасканію. У 1736 г. ажаніўся з Марыяй Тэрэзаю. У 1745 г., сам каранаваны, усклаў дзяржаўныя справы на жонку, а сам заняўся апекаю навук, мастацтва, гандлю і рамёслаў у Аўстрыі.

[112] *Ейная сястра* — Марыя-Амалія, дачка імператара Іосіфа I, з 1722 г. жонка баварскага электара Максіміліяна I Эмануэля.

[113] *Эрцгерцагіня* — аўстрыйская князёўна.

[114] *Сапега* — Міхал, сын Казіміра Паўла, віленскага ваяводы. Літоўская шляхта, разгневаная гвалтамі ваяводы, учыніла супраць Сапегаў канфедэрацыю. Пасля бітвы пад Алькенікамі (Валькінінкай у Літве) сын ваяводы, Міхал быў замардаваны шляхтаю ў вязніцы.

[115] *Біскуп* — Канстанцін Казімір Бжастоўскі (1644—1722), з 1687 г. віленскі біскуп. З прычыны канфліктаў між ім і Сапегамі наклаў у 1694 г. анафему на гетмана Казіміра Паўла Сапегу. Але яна не мела аніякага выніку, бо на баку гетмана была частка духавенства, прынамсі, езуіты.

[116] *Іосіф* — Іосіф I Габсбург (1678—1711), імператар.

[117] *Генюш* — князь Яўген Савойскі (1663—1736), палкаводзец, аматар навукі і мастацтва.

[118] *Олміц — (ням. Olmütz)* Аламунец, горад у Маравіі.

* [119] *Дэпазіт* — рэчы, аддадзеныя на захаванне.

[120] *Характа́ры* — чарадзейскія знакі.

[121] *Пруські кароль* — відаць, Фрэдэрык II Вялікі (1712—1786). Аўтарка памыляецца: гэта мог быць не 1739, а 1740 г.

[122] *Гіхаймерот — (ням. Geheimrat)* таемны радца.

[123] *Бранёўскі* — Адам Бранёўскі, падчашы брэсцка-куяўскі.

[124] *З Баліч* — відаць, вёска.

* [125] *Аршэнік* — белы мыш'як.

[126] *Жванец* — мястэчка непадалёку ад Камянца-Падольскага.

[127] *Вадзіцкі* — можа, нехта з сыноў Ваўжынца Вадзіцкага. Міхал (1687—1764) быў у 1746 г. падканцлерам каронным. Пятро, ягоны брат, быў бецкім кашталянам у 1744—1752 г.

[128] *Патоцкая* — Канстанцыя з Даніловічаў Патоцкая, парчэўская старасцянка. Удава Яна Патоцкага, кашталяна брацлаўскага ў 1729—1744 гг.

[129] *Смотрыч* — мястэчка непадалёку ад Камянца-Падольскага.

* [130] *Рэгіментатар* — намеснік гетмана.

[131] *Бякерскі* — Дамінік Ігнацы Бякерскі (пам. 1750), жаўнер і палітык з часоў Аўгуста II і Аўгуста III. Быў некалькі разоў паслом у Турцыі. З 1739 г. камендант Камянецкай фартэцыі.

[132] *Перамітка — (укр.)* хустка.

[133] *rad. tormentilla — radix* (альбо *rhizoma*) *tormentillae* — карэнне кураслепу.

rad. caramphilat — корань невядомага зёлка.

rad biszorta — *radix Bistortae* карэнне рачыкаў.

[134] *Ясы* — горад у Румыніі, даўняя сталіца малдаўскіх гаспадароў.

* [135] *Societatis Jesu* — езуіта.

[136] *Мультаны* — даўняя назва Валахіі.

[137] *Сілістра* — горад і фартэцыя ў Румыніі.

* [138] *Шустак* — дробная срэбраная манета. Была роўная 12 медным грошам.

* [139] *Круціца* — караткаствольны пісталет.

[140] *Разград* — горад непадалёку ад Русе.

[141] *Гіяргева* (Джурджу) — горад у Румыніі.

[142] *Ферэдза* — верхняя сукня, якая не падпяразваецца.

Яшмак — накідка (чадра) заможных турчанак.

[143] *Галач* — горад у Румыніі.

[144] *Маўрыкадайкі* — Канстанцін Маўракардато (1711—1769), сын Аляксандра, быў некалькі разоў (на перамену з братам Янам) гаспадаром Малдаўскага і Валашскага княстваў.

[145] *Чорнаказінец* — мястэчка ў Камянецкім павеце.

[146] *Дамбоўскі* — Мікалай Дамбоўскі (пам. у 1757 г.), сын Фларыяна, суддзі плоцкай зямлі. Прызначэнне на камянецкае біскупства атрымаў у лістападзе 1741 г.

Раздзел трэці

[1] *Абшыт — (ням. Abschied)* тут: звальненне.

[2] *Патоцкі* — Антон Міхал Патоцкі (пам. 1765 г.) належаў да самых адукаваных людзей сваёй эпохі. У 1744 г. выдаў працу: «Да паноў абодвух станаў», дзе акрэсліў смелую праграму рэформаў, прагнучы дапушчэння мяшчан да ўдзелу ў дзейнасці сейма і рады. Адначасова падбухторшчык і інтрыган, што служыў чужым дварам, зрываў сеймы (гродзенскі сейм у 1744 г.).

[3] *Броды* — павятовы горад у даўнейшым Цярнопальскім ваяводстве (зараз Львоўскае вобласці).

[4] *Акопы* — Акопы Святое Тройцы, вёска ў Баршчоўскім павеце.

* [5] *Афіцэр з лановых* — з войска, што складалася з сялян-рэкрутаў каралеўскіх маёнткаў.

[6] *Каліноўская* — Людвік Каліноўскі, староста вінніцкі (да 1754 г.), быў жанаты двойчы: з Соф'яй Патоцкаю і з Эльжбетаю Панінскаю. Тут гаворка пра другую жонку.

[7] *Пяткоўскі* — Пяткоўскія, шляхта з валынскае зямлі. Ян, Ежы і Станіслаў падпісалі элекцыю (дамову) у 1733 г. Магчыма, нехта з іх і быў вышэй успомненым старастам.

[8] *Белая Царква* — тут у XVI—XVII ст.ст. адбыліся колькі бітваў Рэчы Паспалітае з татарамі і казакамі.

[9] *Любамірскі* — князь Бенядыкт Любамірскі, сын ваяводы кракаўскага, староста барскі, казімірскі і ліпінскі (1727), маршалак радамскага трыбунала (1743), у 1754 г. мечнік каронны. Памёр у 1761 г.

[10] *Палонна* — горад на Украіне.

[11] *Кандысброд* — паліты цукрам хлеб.

[12] *Залошцы* — (трэба Залочаў) горад у Львоўскай вобласці.

[13] *Мнішак* — Юзаф Вандалін Мнішак (пам. 1748 г.) быў кашталянам кракаўскім з 1742 г. Да гэтага — маршалак вялікі каронны.

[14] *Алеява* — вёска ў Злачоўскім павеце.

[15] *multum* — шмат.

[16] *Мітук* — гунька.

* [17] *Антал* — старадаўняя мера аб'ёму, дзежачка, чвэртка дзежкі, каля 79 л.

* [18] *Гіцаль* — сабачнік; чалавек, што ловіць сабак.

[19] *Камень* — старадаўняя мера вагі, 32 фунты.

[20] *Стрый* — горад у цяперашняй Львоўскай вобласці.

[21] Аўтарка пераблытала паняцці: *inkluz* (талісман) і *intruz* (чужаніца). Тут гаворка пра апошняе.

[22] *Брусілаў* — горад на шляху з Кіева ў Жытомір.

[23] *Серак* — род сукні.

[24] *Чарніца* — праваслаўная манашка.

[25] *Звозчык* — рамізнік.

[26] *Соцюш* — таварыш.

[27] *Парэнтэлят* — чалавек высокага роду, пан з паноў.

[28] *Babовіч* — Мікадзім Казімір Варовіч, падкаморы кіеўскі, а з 1748 г. кашталян кіеўскі.

[29] *Патоцкі* — Мікалай Базыль Патоцкі (каля 1712—1782), барскі канфедэрат, дзівак і авантурыст, зневажаў слабейшых.

[30] *Жытомір* — сталіца Валыні на Украіне. З 1667 да 1793 г.— сталіца кіеўскага ваяводства.

[31] *Патоцкі* — відавочна, Аўстахій, староста львоўскі, генерал артылерыі літоўскай. Памёр у 1768 г.

* [32] *Дваццаць почтаў* — тут: атрад у дваццаць жаўнераў.

[33] *I. M. C. Z.* — *відаць, Iego Mość Cześnikowicz Zbaraski*, г. зн. сын збаражскага чэсніка.

[34] *Солтык* — Каятан Солтык (1715—1788), у 1749 г. стаў каад'ютарам кіеўскага біскупства, на якое быў прызначаны ў 1756 г. Кракаўскае біскупства заняў у 1759 г. У 1767 г. па загадзе Рэпніна быў незаконна вывезены ў Расію (у Калугу).

[35] *Жавускі* — Вацлаў Жавускі (1706—1779), гетман польны каронны з 1752 г. Спачатку прыхільнік Ляшчынскага, пасля аб'яднаўся з саскім дваром і атрымаў булаву польнага гетмана. Кансерватар, удзельнік Радамскае канфедэрацыі, пасля, аднак, стаў у апазіцыю да Расіі і быў адным са стваральнікаў Барскае канфедэрацыі. Разам з Солтыкам і Залускім вывезены па загадзе Рэпніна ў Калугу. Літаратар, аўтар некалькіх трагедый і камедый — наследаванняў Карнеля, Расіна і Мальера.

[36] *Кантагузін* — Кантагузенас, грэчаскі княжы род. Невядома, пра каго з гэтага роду ідзе гаворка.

[37] *Бярдзічаў* — горад на Украіне на поўдзень ад Жытоміра.

[38] *Каранацыі* — (у рукапісе памылкова: *kuracji*), каранацыю Абразу Маці Божае ў Бярдзічаве праводзіў Каятан Солтык 6 ліпеня 1756 г.

[39] *На цялежцы* — на фурманцы.

[40] *Ліпка* — з літоўскіх татар. Перайшлі на турэцкую службу, нападалі на сваю былую айчыну. Дасканала ведаючы край, мову, звычаі, даваліся ў знакі мясцовым жыхарам і гарнізонам.

[41] *Фуксаны* (Факшаны) — горад у Малдавіі.

[42] *Бозеў* — Бузаў, горад у Румыніі.

Раздзел чацвёрты

[1] *Ені Бахчы* — раён Стамбула.

[2] *Пера* — раён Стамбула.

[3] *Памаграны* — плады граната.

[4] *Штангерка* — вышытая золатам і срэбрам жаночая хустка на шыю.

[5] *Джамія* — мячэць.

[6] *Муфта* — муфці, найвышэйшы духоўнік і суддзя турэцкі, што тлумачыць Каран.

[7] *Стамбул эфендзі* — другі тытул ка́дзі (суддзі) Стамбула.

[8] *Айя-Сафія* — колішні сабор св. Сафіі, пабудаваны ў 532—537 гг. Цяпер найвялікшая і найпрыгажэйшая мячэць у Стамбуле.

[9] *Ізмер* — Смірна.

[10] *Эскі Сарай* — гарэм дзеля імператаравых наложніц. Сёння на тым месцы палац з той самай назваю.

[11] Наступны сказ у рукапісе не закончаны.

$_0{}^0{}_0$ — знакі, якія ўжываліся ў рэцэптах у часы алхімікаў, калі лекарскае і звязанае з ім аптэкарскае майстэрства былі аслоненыя таямніцаю. Знак азначаў назву лекаў і быў зразумелы толькі дасведчаным людзям.

$_0{}^0{}_0$ — эфірны алей (oleum aethereum).

$_0{}^0{}_0$ *cynamomi* — карыцавы алей (oleum cinnamomi).

[13] *aqua cynamomi* — карыцавая вада (магчыма, адвар з карыцы).

[14] *spiritus nitri dulcis anizti* — *spiritus nitri duecis* — гэта сінонім *spiritus aetheris nitrosi*, спіртовага раствору этылавае азотнакіслае солі. Тут — з дадаткам анісавага алею.

[15] *unguentum comitis* — незразумела. Магчыма, *ung. commune*, мазь, якая складаецца са свінога тлушчу, тальку, жоўтага воску і звычайнага свінцовага пластыра.

[16] *oleum de nicis muschati* — *oleium myristicae expressum*, мускатны алей.

[17] *oleum menha* — мятны алей (ol. ntenthae).

[18] *Канак* — каштоўны нашыйнік.

[19] *Дыйдык* — багатая доўгая гунька.

[20] *Масыф* — незразумела. Магчыма, у гафтаванні ўжывалася нітка з каштоўнага металу.

* [21] *Лот* — старадаўняя мера вагі, роўны 12,8 г.

[22] *Пандэшпан* — від іспанскіх карункаў.

[23] *Арнаўт Кёй* — (літаральна: албанская вёска), відаць, вуліца ці раён Стамбула, дзе жылі албанцы.

[24] *Падоскі* — Юзаф Антоні Падоскі, бабраўніцкі стараста, з 1750 г. кухмайстар Вялікага княства Літоўскага, з 1761 г. ваявода плоцкі. Памёр у 1778 г.

[25] *Галата* — раён Стамбула.

[26] *Кізляр-ага* — «бог дзяўчат», начальнік варты імператарскага гарэма, старэйшы еўнух у двары султана. На ўрачыстых цырымоніях займаў месца пасля візіра.

[27] *Фалагі* — драўлянае прыстасаванне з пастронкамі дзеля сціскання ног чалавека, якога караюць біццём па пятах.

[28] *Дзюляні* — Францішак Дж'юляні, леванцінец, драгаман (тлумач усходніх моў) пры польскім пасольстве з 1736 г. Браў удзел у пасольстве Падоскага да Стамбула ў 1760 г.

[29] Станіслаў Пільштын пазней быў кур'ерам польскага пасольства. У 1766 г. кароль Станіслаў Аўгуст накіраваў яго ў школу арыенталістаў у Стамбуле. З часам (1779) ён стаў першым

драгаманам пасольства. У 1786 г. быў пагранічным тлумачом у Камянцы. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай перайшоў на расійскую службу. Памёр каля 1820 г.

[30] *Чарбаджы* — назва палкоўніка рэгіменту (орта) янычараў, а таксама нобілі ў турэцкіх правінцыях, якія былі абавязаны прымаць у сябе падарожных чужаземцаў.

[31] *Скела* — відаць, прыстань.

Раздзел пяты

[1] *Іміры* — правадыры.

* [2] Ніжэй аўтарка будзе гаварыць пра дзевяноста дзевяць дзён.

[3] *Курбан Байрам* — мусульманскае свята, якім заканчваецца пост і ў якое ахвяруюць на святыню.

[4] *Кітайка* — гл. заўвагу 79 да другога раздзела.

[5] *Леванты* — леванцінцамі называлі народжаных у Леванце (мясцовасць у Малой Азіі) нашчадкаў еўрапейцаў.

Галандзяў — магчыма, выхадцы з мясцовасці Гёл.

[6] *Ia Alah hil Akmen resul* — дакладней: *La Illaha il Allach и Muhammed Arrasul Ullah*, Бог адзіны, а Магамет яго прарок.

[7] *Фарсі Дывані* — назва стараперсідскага пісьма, якое захавалася ў Турцыі.

[8] *Не судзі стварэнні твае* — недакладная цытата з Псалтыра, Псалом 142,2.

[9] *Хто такі чалавек* — частка верша з Псалтыра, Псалом 8, 5.

[10] *Агару са Смаілам* — Абрам выгнаў сваю наложніцу-егіпцянку з сынам Ізмаілам у пустыню (Быццё, 21).

[11] *Шамеле* — самель у яўрэяў азначае: д'ябал, злы дух. Тут гаворка, відаць, пра самуме, гарачы і сухі вецер арабскіх пустынь.

[12] *Габашы* — арабская назва абісінцаў.

[13] *Курды* — іранскія плямёны, што жывуць у Курдзістане.

[14] *Гюрдзы* — грузіны.

Раздзел шосты

[1] *Апрэхензія* — праз меру вялікі клопат пра сябе.

[2] *Рэгалізацыя* — відаць, падарункі.

[3] *Фараон* — аўтарка бярэ тытул егіпецкага цара за ўласнае імя.

* [4] Быццё, 28.

* [5] *treif* (ст. габрайскае) — трэфнае, г. зн. забароненае ўжываць у ежу.

* [6] *kuszer* (ст. габрайскае) — кашэрнае, г. зн. тое, што дазволена ўжываць у ежу.

[7] *Ціт Васпасіян* — Ціт Флавій Веспасіян (39—81), сын цэзара Васпасіяна. У вайне з яўрэямі захапіў і разбурыў Ерусалім у 70 г. У 79 г. ён стаў рымскім цэзарам.

[8] Першая Кніга Царстваў, 25.

[9] Першая Кніга Царстваў, 11.

* [10] Быццё, 48.

[11] *У Маскве* — тут гаворка пра краіну, а не горад.

[12] *Архірэй* — так у праваслаўных; у каталікаў — арцыбіскуп.

[13] *Дырэктар* — тут: апякун, выхавацель.

[14] Аўтарка памыляецца. Бадыльяне — уніяцкі манаскі ордэн. Гаворка ў тэксце ідзе аб праваслаўных манахах.

Раздзел сёмы

[1] *Мараніты* — паслядоўнікі манаха Яна Марона. У XVI ст. далучыліся да каталіцызму.

[2] *Прэвэт* — клаака, прыбіральня.

Змест

Незвычайныя авантуры наваградскай лекаркі. *Адам Мальдзіс* — 5

Да ласкавага чытача — 19

Раздзел першы — 20

Першае падарожжа ў Стамбул — 20
Мая другая авантура ў Стамбуле — 35
Трэцяя авантура ў Стамбуле. 1735 год — 38
Цуд, які мне воля Божая на пачатку лекарскае практыкі дзівосна паслала — 43
Што я мела ад сляпых па волі Божае — 49
Габрай-купец у Адрыянопалі — 51
Падарожжа Філіпбея ў Сафію — 54
Я прыехала ў Сафію — 60
Князь Ракацы — 71
Падарожжа і прыгоды ў Рушчуку — 75
Смешны выпадак здарыўся ў Рушчуку — 82

Раздзел другі — 86

Я другі раз іду замуж за яго мосць пана Пільштына — 86
Выезд з Нясвіжа ў Пецярбург — 89
Да Рыгі — 96
Выезд з Рыгі ў Нарву — 102
Зайздрасць лекарская — 109
Авантура ў маю бытнасць з адным князем. Князь Галіцын з адною дамаю з Вены — 111

Вяселле яго мосці пана Кізерлінга — 120
Авантура князёў Даўгарукіх — 123
Гісторыя кіравання Анны Іванаўны — 126
Авантура ў дарозе на начлезе — 138
Пра Бірона — 154
Авантура Мазепы — 155
Авантура Кірыла Разумоўскага — 158
Авантура аднаго габрая — 179
Секта раскольнікаў — 182
Гісторыя пра аднага нібыта чарнакніжніка, маладога і вельмі вучонага чалавека ў горадзе Олміц — 198

Раздзел трэці — 224

Авантура з яго мосцю панам Бякерскім — 224
Пра майго кавалера — 240


Раздзел чацвёрты — 270
Другі прыезд у Стамбул — 270

Раздзел пяты — 298

Раздзел шосты — 331

Раздзел сёмы — 354
Пра суботні пост — 354
Песня мае кампазіцыі — 359

Каментарыі. *Пераклад Міколы Хаустовіча* — 361



Литературно-художественное издание

ПИЛЬШТЫНОВА СОЛОМЕЯ (РУСЕЦКАЯ)

АВАНТЮРЫ МОЕЙ ЖИЗНИ

Роман


Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

ПІЛЬШТЫНОВА САЛАМЕЯ (РУСЕЦКАЯ)

АВАНТУРЫ МАЙГО ЖЫЦЦЯ

Раман



Рэдактар У. А. Арлоў
Мастак В. А. Губараў
Мастацкія рэдактары В. А. Губараў, А. І. Цароў
Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч
Карэктар Я. Ф. Харко
ІБ № 3555

Здадзена ў набор 05.07.90. Падп. да друку 26.04.91. Фармат 70 ×108¹/₃₂. Папера афс. № 1. Гарнітура кудрашоўская энцыклапедычная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 16,80. Ум. фарб.-адб. 34,83. Ул.-выд. арк. 16,04. Тыраж 5 000 экз. Зак. 532. Цана 25 р.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11. Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Пільштынова С.

П 32 Авантуры майго жыцця: Раман Пер. з польскай мовы М. Хаустовіча; Прадм. А. Мальдзіса; Камент. М. Пялчынскага. Мн.: Маст. літ., 1993.— 381 с.:

ISBN 5-340-00762-6

Пильштынова С. Авантюры моей жизни: Роман.

Успаміны наваградскай лекаркі Саламеі Пільштыновай (Русецкай) зместам нагадваюць прыгодніцкі раман. За сваё жыццё, поўнае нечаканасцей і авантураў, аўтарка наведала шматлікія краіны і гарады, мела доступ да двара турэцкага султана, расійскае імператрыцы Анны Іванаўны, аўстрыйскага імператара, князёў Радзівілаў, Патоцкіх, Сангушкаў. Прыродны розум, смеласць і знаходлівасць дазвалялі ёй з гонарам выходзіць з самых неверагодных і небяспечных сітуацый.

П $\frac{4702510100-044}{М 302(03)-93}$ 124—91 ББК 84(2)1 + 84 Бел 1

25 р.




















Генерал




Гетман Юзеф Потоцкі


Князь




Пан


Марія